ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВЫ І МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

# Родное слова

2008/4
(244)
красавік

ЗАСНАВАЛЬНІК:
МІНІСТЭРСТВА
АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ
БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА
«РЭДАКЦЫЯ ЧАСОПІСА
“РОДНАЕ СЛОВА”»

Часопіс выходзіць
з 1988 года
(у 1988 – 1991,
№№ 1 – 48,
выдаваўся пад назвай
**“Беларуская мова
і літаратура ў школе”**)

**Рэдакцыйная калегія**

доктар філалагічных навук М. Прыгодзіч (намеснік)
доктар філалагічных навук В. Максімовіч (намеснік)
доктар мастацтвазнаўства Т. Габрусь
доктар філалагічных навук У. Гніламёдаў
доктар мастацтвазнаўства В. Дадзіёмава
доктар філалагічных навук В. Іўчанкаў
доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры А. Лакотка
доктар філалагічных навук А. Ліс
доктар філалагічных навук А. Лукашанец
доктар мастацтвазнаўства У. Мартынаў
доктар філалагічных навук І. Казакова
доктар філалагічных навук А. Ненадавец
доктар філалагічных навук В. Новак
доктар мастацтвазнаўства В. Нячай
доктар філалагічных навук В. Рагойша
доктар філалагічных навук І. Роўда
доктар філалагічных навук І. Саверчанка
доктар філалагічных навук В. Старычонак
доктар філалагічных навук М. Тычына
доктар філалагічных навук І. Чарота
доктар філалагічных навук Т. Шамякіна
доктар педагагічных навук М. Яленскі

**Навуковыя кансультанты**

Г. Адамовіч, Р. Аладава, М. Аляхновіч,
Г. Арцямёнак, А. Багданава, З. Бадзевіч,
Т. Казакова, В. Карамазаў, У. Каяла,
В. Лемцюгова, І. Лепешаў, А. Лойка,
Е. Лявонава, В. Ляшук, В. Ляшчынская,
А. Макарэвіч, У. Мархель, З. Мельнікава,
П. Міхайлаў, М. Мішчанчук, А. Міхневіч,
М. Мушынскі, М. Новік, В. Рагаўцоў, В. Русілка,
У. Рынкевіч, У. Сенькавец, А. Солахаў, А. Станкевіч,
П. Сцяцко, Т. Тамашэвіч, Н. Усава, І. Штэйнер

**Рэдакцыйная рада**

Р. Бабашка, М. Бубешка, М. Жуковіч,
Р. Ільіна, В. Кажура, Л. Лазарчык,
Н. Левічава, З. Падліпская, А. Панфіленка,
Т. Прадзед, А. Тарайковіч, І. Таяноўская

Галоўны рэдактар
кандыдат
філалагічных навук,
дацэнт
**Уладзімір КУЛІКОВІЧ**

Над нумарам працавалі рэдактары:

**Людміла Бохан** (*Алімпіяды. Конкурсы. Іспыты:* У дапамогу абітурыенту; *Падзея:* Тыдзень беларускай мовы),

**Віктар Жыбуль** (*Літаратура і час:* Плыні і постаці, Віншуем!),

**Крысціна Пучынская** (*Літаратура і час:* На скрыжаванні культур, З юбілеем!, Майстэрства творцы; *Нацыянальная і сусветная культура:* Імгненне і вечнасць, Мастацкая галерэя; *Крыжаванка*; *Каляндар памятных датаў і юбілейных дзён*),

**Аляксандр Радзевіч** (*Алімпіяды. Конкурсы. Іспыты:* Рыхтуемся да тэсціравання),

**Ларыса Сагановіч** (*Мовы рысы непаўторныя:* Жывое слова, Кірунак сказаў, Свет моў і святло мовы, ВНУ – школе, Функцыянальная стылістыка, Прапануем план-канспект, Да Свята пісьменства і друку, Крытыка і бібліяграфія; *Алімпіяды. Конкурсы. Іспыты:* Рыхтуемся да тэсціравання),

**Тамара Саўчук** (*Літаратура і час:* Светлыя імёны Беларусі; *Мовы рысы непаўторныя:* Праблемы двухмоўя, Мова маёй зямлі; *Калі закончыўся ўрок:* Даніна памяці),

**Мікола Трус** (*Літаратура і час:* Новае прачытанне, Імя ў школьнай праграме, Літаратура ў кантэксце жыцця; *Мовы рысы непаўторныя:* Моўнае аблічча планеты; *Будні педагога:* Педагагічная майстэрня; *Нацыянальная і сусветная культура:* Спадчына),

**Наталля Шапран** (*Мовы рысы непаўторныя:* Прафільнае навучанне, Шматграннасць слова; *Калі закончыўся ўрок:* Да Дня Перамогі; *Нацыянальная і сусветная культура:* З гісторыі беларускага дойлідства, Дыялог з карцінай, Беларускія мудрагелінкі, Народныя святы)

намеснік галоўнага рэдактара — **Людміла Бохан,**
адказны сакратар — **Дзмітрый Літвіненка,**
дзяжурны рэдактар — **Крысціна Пучынская,**
літаратурны рэдактар — **Алена Высоцкая,**
камп’ютэрны набор — **Надзеі Бышкі,**
тэхнічны рэдактар — **Канстанцін Лісецкі,**
галоўны бухгалтар — **Святлана Яфімчык,**
вядучы бухгалтар — **Вікторыя Вальковіч,**
загадчык рэдакцыі — **Галіна Сташэўская.**

Фота на 3-й старонцы вокладкі **Надзеі Бышкі.**

---

У папярэднім нумары на 2-й старонцы вокладкі была дапушчана прыкрая памылка ў подпісе пад ілюстрацыяй. Трэба чытаць: Леў Гумілеўскі. Развітанне. 2007 г. Бронза, ліццё. Рэдакцыя часопіса просіць прабачэння ў Льва Мікалаевіча Гумілеўскага.

# Змест


### ЛІТАРАТУРА І ЧАС

**Адамовіч Галіна.** Жыццё і творчасць Максіма Багдановіча як прыклад "адарванасці": Вопыт міждысцыплінарнага даследавання ... 3
**Максімовіч Валерый.** Праявы акмеізму ў творчасці Максіма Багдановіча ... 8
**Вострыкава Алена.** Бажэна Немцава – першая жанчына-пісьменніца ў чэшскай літаратуры ... 12
**Трус Мікола.** "Угаварыць яго выступіць – гэта майстэрства": Янка Купала ў Пешцянах ... 15
**Бугаёў Дзмітрый.** Праўдалюбства сілкавала яго талент: Асаблівасці прозы і драматургіі Івана Чыгрынава ... 20
**Шамякіна Таццяна.** Сумленнасць і вернасць: Людміла Карпава ... 23
**Карпава Людміла.** Прыёмы псіхалагічнага напаўнення вобразаў у рамане "Млечны Шлях" Кузьмы Чорнага ... 26
**Масарэнка Алесь.** "Душа мая – мой абярог": Вершы ... 29
**Грыдзюшка Тамара.** "Жыціе Еўфрасінні Полацкай": Урок засваення новых ведаў. IX клас ... 30

### МОВЫ РЫСЫ НЕПАЎТОРНЫЯ

**Садоўская Анжаліка.** Фразеалогія ў кантэксце культуры: Этналінгвістычны падыход да вывучэння ... 35
**Шыманская Вольга.** "Агонь душы і сэрца жар": Сінестэзія як прадуктыўная мадэль метафарызацыі ... 40
**Вакуліч Людміла.** Назоўнікі з мадыфікацыйным значэннем суб'ектыўнай ацэнкі ў рускай і беларускай мовах ... 42
**Каўрус Алесь.** Словы ад Цішкі Гартнага: *Крынічанне, завуалены, багажня* ... 46
**Важнік Сяргей.** Маленькія ключыкі да паспяховай камунікацыі: Сітуацыі прыцягнення ўвагі, просьбы / прапановы, падзякі ... 48
**Міхневіч Арнольд.** Стракатая лінгвістычная энцыклапедыя ... 51
**Кошчанка Уладзімір.** Мовы Славеніі ... 52
**Саламевіч Алена.** Кантамінацыя і сумежныя з ёю з'явы як прычыны парушэння сінтаксічных сувязяў у маўленні ... 55
**Старасценка Таццяна.** Навуковы стыль: Тэма 2 ... 57
**Мароз Святлана, Ржавуцкая Марына.** Нататка-разважанне ў газету пра ўдзел вучняў у азеляненні школьнай тэрыторыі, вуліцы, двара: Урок развіцця маўлення ... 62
**Рамашка Алена.** Беларуская лексіка паводле паходжання. Стылістычны падзел лексікі: Урок у X класе ... 65
Барысаў: Дыдактычны матэрыял *(працяг)* ... 69

### АЛІМПІЯДЫ. КОНКУРСЫ. ІСПЫТЫ

**Бабіч Юрый.** Кантрольныя тэсты для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання ў 2007/2008 навучальным годзе: Культура мовы ... 72
**Арцямёнак Генадзь.** Кантрольныя тэсты для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання ў 2007/2008 навучальным годзе: Марфемная будова слова. Словаўтварэнне ... 76
**Дзіско Уладзімір.** Кантрольны тэст № 1 для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання ў 2007/2008 навучальным годзе ... 80

### КАЛІ ЗАКОНЧЫЎСЯ ЎРОК

**Буланда Вера.** "Мы захаваем для нашчадкаў мір!": Сцэнарый вечарыны, прысвечанай Дню Перамогі ... 84
**Драгун Жанна.** У нашых сэрцах – памяць аб кожным чацвёртым: Урок мужнасці ... 89

### БУДНІ ПЕДАГОГА

**Лойка Алег.** У пошуках майстэрства выкладання ... 92
**Быкаў Аляксандр.** Пародыі: Вясёлы перапынак ... 95

### НАЦЫЯНАЛЬНАЯ І СУСВЕТНАЯ КУЛЬТУРА

**Новік Мікола.** "Не обчым яким языком, але своим власным права списаные маем": Да 420-годдзя трэцяга Статута ВКЛ ... 96
**Пыко Аляксандр.** Шлях святых апосталаў з Італіі на Беларусь: Скульптурна-дэкаратыўны ансамбль касцёла Архангела Міхаіла ў Міхалішках ... 98
**Карамазаў Віктар.** Бярозавы шлях ... 102
**Жыбуль Віктар.** Рэдкі здымак Ядвігі Бяганскай ... 103
**Шычко Алена.** Выявы класікаў айчыннай літаратуры і іх твораў у эстампах беларускіх графікаў. 1980-я гг. ... 104
**Казакова Ірына.** У чаканні Вялікадня ... 107
**Авярчук Наталля.** *Вялікдзень* ці *Пасха?*: Да пытання аб найменні святаў ... 109

### ПАДЗЕЯ

**Радзевіч Аляксандр.** Свята роднага слова ... 111

***Крытыка і бібліяграфія.*** **Тамашэвіч Т.** У цэнтры ўвагі – культура слова: Пра кнігу "Культура маўлення" *І. Лепешава* (71).
***Наш каляндар:*** Ганна Базыленка (54).
***Паэтычная старонка.*** *Масарэнка А.* "Боль…Хаваю боль…" . "Скрыжалі памяці навечна…" . Просьба гулагаўца, 1950. "Купаецца ў сінечы маіх сноў…" . "Ужо каторы год няўдачы не трывожаць…" (29). *Купала Я.* А хто там ідзе? (66). *Быкаў А.* Маладзільны вянок. Змітракоўскі землятрус. Касмічны Лойка. Вясковая ідылія (95).
***Каляндар памятных датаў і юбілейных дзён на 2008 год:*** Чэрвень (22).
***Аўтарам і падпісчыкам!***: Патрабаванні да афармлення матэрыялаў (79).
***У дапамогу абітурыентам***: **Саўчук Т.** Пра новыя дапаможнікі для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання (83).
***Крыжаванка.*** **Целеш Л.** Каляндар народных святаў (112).



У адпаведнасці з Законам аб друку аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных у артыкуле фактаў і звестак.
Рэдакцыя пакідае за сабой права друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Новае прачытанне*

Галіна АДАМОВІЧ

# ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА ЯК ПРЫКЛАД “АДАРВАНАСЦІ”

## ВОПЫТ МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

“Як ад роднай галінкі дубовы лісток / адарваны, / Родны Мінск я пакінуў, нямецкай / бамбёжкаю гнаны...” (А. Куляшоў), або “Адзінокі колас жыта / Рос замкнёна і забыта, / Адарваны ад загона” (Я. Колас), “Ад родных ніў, ад роднай хаты...” (М. Багдановіч) – метафара “адарванасці” натуральная для паэтычнага радка, паколькі сам феномен “адарванасці” – з’ява даволі распаўсюджаная.

“Адарванасць – адсутнасць сувязі з кім-н., чым-н., адзінота, адчужанасць. *А. ад роднага дома”* [1, с. 31]. **Ключавымі паняццямі** феномена або таго неардынарнага, незвычайнага, што абазначаецца ім, з’яўляюцца наступныя: па-першае, паняцце “сувязі”, дакладней, **адсутнасці сувязей**, іх парушэнне, страта, скасаванне, па-другое, **адчужанасць, адзінота, самота**. У феномене “адарванасці”, такім чынам, можна вылучыць два кампаненты, якія акрэслены двума матывамі, скразнымі ў літаратуры, – матывам парушэння / адсутнасці сувязей і матывам адзіноты / адчужанасці (“чужы”, “чужаніца”, “на чужыне” – яго варыянты).

Матыў парушэння сувязей мадыфікуецца праз розныя віды гэтых сувязей. Пералічым іх: сувязь паміж чалавекам і (*іншым, другім*) чалавекам, сувязь паміж чалавекам і прыродай, сувязь паміж чалавекам і светам, сувязь паміж складовымі кампанентамі самой асобы чалавека. Таму, разглядаючы феномен “адарванасці” ў дачыненні да той ці іншай асобы, варта, найперш, даследаваць яго адносна гэтых чатырох узроўняў сувязей (або скасавання сувязей).

Матыў адзіноты аналізуецца тут прымяняльна да ўласна творцы, таму звернемся да філасофскай структуры чалавека. У апошнія дзесяцігоддзі XX ст. сталі вылучаць тры яго пачаткі-ўзроўні: біялагічны (прыродны) складнік, сацыяльны пачатак і той узровень асобы, які звязаны з яе псіхічным светам. Бясспрэчна, што чалавек – складаны біяпсіхасацыяльны арганізм.

Даследуючы феномен “адарванасці”, у якасці крытэрыяў аналізу прымем, такім чынам, філасофскую структуру асобы, а таксама наяўнасць (або адсутнасць) рознага віду сувязей, якія злучаюць (або адасабліваюць) чалавека з (ад) існуючым (існуючага) у свеце. Вывучэнне гэтай праблемы на прыкладзе жыцця і творчасці М. Багдановіча дапаможа знайсці адказы на пытанні, якія маюць не толькі вузка навуковае значэнне, у прыватнасці літаратуразнаўчае. “Праблемны” пункт гледжання, у якім спалучаюцца пытанні філасофіі, псіхалогіі, гісторыі, культуралогіі, нават медыцыны, выводзіць у шырокую сферу міждысцыплінарных даследаванняў. Падобны памежны падыход з апорай на прыклады з літаратуры можа спрыяць у практычным вырашэнні задач, сфармуляваных у розных навуках, знайсці пераканальныя адказы, новыя думкі, нечаканыя прапановы.

Тлумачэнне “адарванасці” даў француз Анры Бергсон, які заклаў падмурак філасофіі інтуітывізму, адной з крыніц дэкадансу. Тыпалагічныя адзнакі светаўспрымання дэкадэнтаў – наяўнасць двух сусветаў (“вышэйшай”, “другой” рэчаіснасці ў адрозненне ад “першай”, звязанай з зямным існаваннем), “адарванасць” аднаго свету ад другога, прыналежнасць або выйсце творчай асобы ў “другую” рэчаіснасць, што і з’яўляецца, на думку некаторых, асноўнай перадумовай мастацкай творчасці. Размежаваўшы два сусветы, А. Бергсон адасабляе два тыпы бачання: утылітарнае (дзе рэч успрымаецца з мэтай яе выкарыстання) і мастацкае (у аснове якога – захапленне прыгажосцю самой рэчы, без жадання мець з яе нейкі матэрыяльны прыбытак). Ён таксама адрознівае творчае спазнанне ад навуковага, мастацкую мову ад мовы стандартызаваных, уніфікаваных зносін, а творцу – ад прадстаўніка рацыянальнага, навуковага мыслення.

Зварот да філасофіі дапамагае сучаснаму літаратуразнаўству выйсці на больш агульны ўзровень бачання асобнай праблемы, карэктна вызначыць кола пытанняў, якія ўваходзяць у яе склад, знайсці заканамернасць у функцыяніраванні той ці іншай з’явы. Так, у працы “Пытанні філасофіі і псіхалогіі” А. Бергсон пісаў: “Але час ад часу дзякуючы шчасліваму выпадку нараджаюцца людзі, якія сваімі пачуццямі або свядомасцю менш прывязаныя да жыцця. Прырода забыла звязаць іх здольнасць успрыняцця з іх здольнасцю дзеяння. Калі яны глядзяць на рэч, яны яе бачаць не для сябе, а для яе самой. Яны ўспрымаюць не для таго, каб дзейнічаць; яны ўспрымаюць, каб успрымаць, – дзеля нічога, дзеля задавальнення. Вядомай іпастассю сваёй сутнасці, свядомасцю ці сваімі пачуццямі, **яны нараджаюцца АДАРВАНЫМІ** (вылучана намі. – ***Г. А.***); і мяркуючы па тым, датычыцца гэтая адарванасць таго ці іншага пачуц-



***Галіна Яўгенаўна Адамовіч*** *– даследчыца літаратуры. Кандыдат філалагічных навук (1983). Закончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1977) і аспірантуру пры гэтай установе (1980). Дацэнт, загадчык кафедры беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка. Аўтар кніг "З крыніц сусветнай літаратуры" (1998), "Літаратура – кантэкст – тэзаўрус" (2003), сааўтар падручніка "Беларуская літаратура. XI клас" (1999).*

ця або іх свядомасці, яны будуць жывапісцамі або скульптарамі, музыкантамі або паэтамі. Такім чынам, тое, што мы знаходзім у розных мастацтвах, ёсць не што іншае як больш прамое, больш непасрэднае бачанне рэальнасці..." [2, с.13].

"Адарванасць" разглядаецца ў А. Бергсона як дадзеная ад прыроды асаблівасць, таму яна выступае як філасофская праблема экзістэнцыі, што звязана з пошукам асобай свайго прызначэння ў жыцці і яе ўласным выбарам. Менавіта ў гэтай плоскасці прынята бачыць адну з перадумоў мастацкай творчасці. Незвычайны талент, атрыманы чалавекам ад прыроды, часцей адгароджвае яго ад астатніх і з'яўляецца прычынай адарванасці асобы і ў іншых аспектах ("Сляпы музыкант" У. Караленкі, "Янка-музыкант" Г. Сянкевіча, "Сымон-музыка" Я. Коласа і інш.). Таму "адарванасць" мы вывучаем у цэлым комплексе праблем, звязаных з асобай чалавека і спецыфікай яго ўключэння ў жыццё грамадства і навакольнага свету.

"Адарванасць" мае непасрэднае дачыненне да філасофскай структуры асобы, адпаведна тром пачаткам якой яна і праяўляецца. 1. **У сацыяльным плане** вылучым *матыў "адарванасці" чалавека ад грамадства* – парушаюцца, страчваюцца сувязі паміж чалавекам і светам, паміж чалавекам і "*іншым*". У літаратуры гэты матыў уключаецца ў структуру сюжэтаў пра лішняга чалавека, страчаныя ілюзіі, суадносіны творцаў і соцыуму, праблемы багацця і беднасці і інш. 2. Феномен "адарванасці" мае **прыродны, біялагічны пачатак** (пра што піша А. Бергсон). У гэтым выпадку *парушаюцца сувязі паміж чалавекам і прыродай*, што знаходзіць увасабленне ў адпаведным матыве (асабліва ў часы глабальных кліматычных змен), які можа ўключацца ў больш шырокае кола сюжэтаў – пра невылечную хваробу, пра каханне і смерць, пра пошукі неўміручасці (як асобнага чалавека, так і цэлага народа або ўсяго чалавецтва) і інш. 3. "Адарванасць" разглядаецца таксама як **праява псіхічнага стану**, калі парушаюцца сувязі ўнутры чалавека як цэласнай асобы, сувязі паміж яе складовымі кампанентамі (*матыў разбурэння цэласнасці чалавека, матыў адзіноты* і інш.), што мае розныя крыніцы паходжання. Напрыклад, калі разбурана гармонія чалавека з самім сабой – у сюжэце пра самагубства ("Пакуты маладога Вертэра" І. В. Гётэ, вершы М. Багдановіча "Самнамбула", "Дзве смерці"). Найперш "адарванасць" як праява псіхічнага плану распрацоўваецца ў сюжэтах пра (непадзеленае) каханне, пра каханне і смерць, а таксама ў творах іншай тэматыкі, у тым ліку пра змову чалавека з д'яблам – дзеля паўнаты ўласнага існавання, рэалізацыі сваіх патэнцыяльных магчымасцей, свайго "богападабенства" і інш.

Відавочна, што абмежаваць праблему "адарванасці" яе прыналежнасцю толькі да філасофіі і літаратуры дэкадансу недакладна: гэтая з'ява ахоплівае сацыяльны, псіхічны, біялагічны складнікі чалавека, што з'яўляецца прадметам вывучэння і адлюстравання як у нерэалістычнай мастацкай плыні, так і ў літаратуры і мастацтве рэалізму. Практычная ж значнасць вывучэння гэтага феномена выходзіць далёка за межы ўласна літаратурнай творчасці і літаратуразнаўства – у шматузроўневы міждысцыплінарны кантэкст.

Верагодна, што такі комплексны (з улікам розных навуковых парадыгмаў) аналіз, праведзены на прыкладзе жыцця і творчасці М. Багдановіча, дапаможа зрабіць цікавыя і актуальныя для нашага часу высновы.

1. **Сацыяльны аспект** "адарванасці" вызначаны жыццёвым лёсам М. Багдановіча, спецыфікай яго ўспрымання Бацькаўшчыны, а таксама асаблівасцямі яго зносін з грамадствам, з блізкімі і знаёмымі. "Адарванасць" як *парушэнне сувязей* выклікана падзеямі асабістага жыцця М. Багдановіча: гэта "адарванасць" ад "малой радзімы", ад роднага кутка (нарадзіўся ў Мінску, жыў у Гародні), ад Радзімы-Бацькаўшчыны (жыў у Яраслаўлі, у Ніжнім Ноўгарадзе). Вярнуўся ў Мінск, але мусіў паехаць у Ялту. Хацеў быць пахаваны на радзіме, але апошні прыстанак знайшоў на чужой зямлі, на якой і васількі ("цвяток радзімы") не растуць. Парушэнне, страта сувязей з "малой радзімай", з Бацькаўшчынай узмацнілі ў вышэйшай ступені жаданне чалавека вярнуцца на радзіму. Разам з тым яно было сублімавана ў духоўным напрамку, рэалізавалася найперш праз творчасць, а потым і ў жыцці М. Багдановіча, хоць і не ў поўнай меры, калі паэт з Расіі прыехаў у ваенны Мінск.

Матыў "адарванасці" прысутнічае найперш у тэме чужыны, якая распрацоўваецца ў вершах паэта "На чужыне", "Эміграцкая песня". Лірычны герой вершаў сумны і адзінокі ("маркотна між іх я хаджу адзінок" [3, с. 201]) – прысутнасць матываў суму, адзіноты натуральная ў вобразнай структуры твораў. Разам са сваім героем паэт шукае і знаходзіць тыя вобразы, што дапамагаюць вярнуць страчаную радзіму: у першым вершы "наш родны, забыты ў цяні васілёк" (с. 201), у другім – "нам маячыцца вёсачка, Нёман / І агні партавыя Лібавы" (с. 272). У далёкім краі нешта незаўважанае, непатрэбнае іншым, як і ўспаміны пра родныя краявіды, выратавальныя для лірычнага героя. "Васілёк", "вёсачка", "Нёман" з'яўляюцца для Максіма Багдановіча вобразнай асновай, магічнымі словамі, каб аднавіць страчаныя сувязі, "вярнуць" радзіму.

Феномен "адарванасці" ў кантэксце страты сувязей чалавека з радзімай знаходзім у вершах адкрытага сацыяльнага гучання, напрыклад "Слуцкія ткачыхі". Слуцкія ткачыхі гвалтам адарваныя "ад родных ніў, ад роднай

хаты" (абагульненасць вобразаў – у рэдакцыі зборніка "Вянок", с. 90) і "ім не пабачыць роднай хаты, / Не ўчуць ім дзетак галасы" (у 2-й рэдакцыі, с. 413, дзе "адарванасць" – ад чаго – канкрэтызуецца, звязваецца з больш "цёплымі", прыватнымі абставінамі жыцця).

Лірычныя героі вершаў, а праз іх аўтар знаходзяць адзінае магчымае выйсце – у наладжванні іншага роду – духоўных, душэўных – сувязей з родным домам: "думкі мкнуцца мімаволі", "тчэ, забыўшыся, рука..." Зноў паэт імкнецца ў вершы аднавіць страчаныя повязі, падкрэсліць непарыўнасць зносін "чалавек – Бацькаўшчына".

Выразна матывы парушэння сувязей і, як правіла, матывы адзіноты, закінутасці прысутнічаюць у творах сацыяльна-палітычнай тэматыкі. Так, у вершы "Мяжы" паэт дакладна фармулюе прычыну страты сувязей, чужаніцы, адзіноты, на што ўказваюць ключавыя вобразы твора – "*мяжы*, *ірвы, тыны*... / Хаваўся ў іх як *ліс у норы*, / І жыў пужліва сам – *адзін*... / Для ўсіх чужы, зусім *чужы*" (выдзелена намі. – ***Г. А.***, с. 274). Адзін з найбольш выразных вобразаў, звязаных з гэтымі матывамі, – вобраз закінутай вёскі ("Краю мой родны..." і інш.). "Адарванасць" выяўляецца і ў проціпастаўленні "вярхоў" і "нізоў" грамадства: "Вы, панове, пазіраеце далёка... / Загляніце жа... / К тым, каго жыццё зациснула глыбока / Ўніз..." (с. 130). Разам з тым паэт прапаноўвае "вярхам" не забываць пра існаванне "нізоў", глядзець уніз, каб бачыць "іншых", "закінутых" і праяўляць хоць які клопат аб іх.

Такім чынам, перажываючы ў асабістым жыцці "адарванасць", канстатуючы яе наяўнасць у жыцці тагачаснага грамадства, бачачы яе ў гістарычным лёсе беларускага народа, паэт шукае формы скасавання "адарванасці", імкнецца ператварыць "мінус-сувязі" (тэрмін Ю. Лотмана), чужынства, адзіноту чалавека ў нешта прынцыпова іншае. Такой формай процістаяння ў жыцці паэта стала творчасць. Праз творчасць (гл. таксама верш пра слуцкіх ткачых), праз наладжванне духоўных повязей "адарванасць" у сваіх розных праявах можа быць скасаваная.

***Формулай зваротнай сувязі***, аб якой пастаянна думаў паэт, з'яўляецца, на нашу думку, радок **"А сэрца ўсё імкне да бацькаўскага краю"** ("У вёсцы", с. 144) – формула вернасці, адданасці, любові. З дапамогай думак, пачуццяў, адлітых у вершаваныя радкі, у іншыя формы творчага плёну, чалавек можа перайначваць складаныя перыпетыі жыццёвага лёсу, не столькі змяняючы самі абставіны, колькі перастараючы іх, адольваючы іх сілай свайго духу, маральнага процістаяння, сублімуючы адсутнасць сувязей у рэальных, аб'ектыўных абставінах у наладжванне сувязей суб'ектыўнага плану. Маральныя высновы, да якіх прыходзіць аўтар, выяўляюцца таксама ў наступным: чалавек больш адчувае еднасць са сваёй зямлёй, любоў да яе, калі аказваецца на чужыне. Адчуванне таго, што зямля прыцягвае да сябе, што зямля – маці, дакрананне да якой, жыццё на якой абуджае ў чалавека сілы, дае яму моц, энергію для незвычайных здзяйсненняў, выказана таксама ў вершы "Калі звалiў дужы Геракл у пыл Антэя..."

2. Наступнай мадыфікацыяй феномена "адарванасці" з'яўляецца **ўзровень прыроднага, біялагічнага існавання чалавека** і звязаная з ім адчужанасць, адзінота. Найперш у жыцці М. Багдановіча яна выклікана яго невылечнай хваробай, гэтаксама як і смерцю блізкіх паэту людзей. У выніку М. Багдановіч адчуваў, што яму адмераны кароткі адрэзак жыцця. Таму – насуперак хваробе, насуперак дадзенаму яму ад прыроды лёсу – ён імкнуўся зрабіць сваё жыццё надзвычай ёмістым, багатым на пачуцці, перажыванні, укласці ў яго столькі падзей, зрабіць так шмат, што іншаму не хапіла б для гэтага ста гадоў звычайнага жыцця.

"Адарванасць" ад іншых, здаровых, ад самога жыцця, якое ў любы момант, вельмі хутка магло назаўсёды абарвацца, падштурхнула паэта да людзей, надала гэтаму малому кавалачку зямнога існавання, што павінна было стаць яго жыццём, надзвычайны сэнс, нарадзіла вялікае пачуццё асабістай адказнасці за кожнае пражытае імгненне, за свой – таксама дадзены ад прыроды – талент. Хворы паэт узяў на свае плечы такі цяжар, усклаў на свой талент такія задачы...

Матыў "адарванасці" ў біялагічным, прыродным, аспекце – скразны матыў творчасці М. Багдановіча: "Даўно ўжо целам я хварэю.." (с. 118), "Я, бальны, бесскрыдлаты паэт..." (с. 219), "Ян і маці" (с. 83), "Ой, чаму я стаў паэтам..." (с. 117), "Цемень" (с. 214) і інш.

Спынім увагу на вобразе музы́кі, які анталагічна, традыцыйна "адарваны". У асобе М. Багдановіча знаходзім таксама прамую залежнасць і сувязь паміж постаццю носьбіта народнай культуры і жыццёвым лёсам хворага паэта. У вершы "Цёплы вечар, ціхі вечер, свежы стог..." вобраз лірычнага героя з'яўляецца адной з яго мадыфікацый, а ў тагачасным кантэксце ён набліжаецца да Сымона-музы́кі Я. Коласа. Як прызнаецца герой М. Багдановіча: "Чую ў цішы, як расце трава..." (с. 62), і герой Я. Коласа "...знае, як травінка / Сваю думае думу, / Што гаворыць жытні колас, / І аб чым шуміць ячмень...", "то-ж спявае з кветкай кветка..." [4, с. 298, 300]. Пантэістычнае *зліццё чалавека з прыродай, гарманічны стан іх суіснавання* знаходзім у абодвух паэтаў: "з прыродай зліўшыся душой" (М. Багдановіч, с. 62) і "чуў ён, чуў душою, / Сэрцам чуткім і жывым / У тым звоне штось такое, / Што жыло і ў ім самім" (Я. Колас [4, с. 297]).

Гэты ж матыў узмацняецца міфалагічным кантэкстам: "Калі звалiў дужы Геракл у пыл Антэя..." (с. 119). У вершы падкрэслена *неабходнасць сувязі* паміж зямлёй і тым, што народжана на ёй, паміж Геяй і яе сынамі і дочкамі. Сувязь з зямлёй, з роднай зямлёй – абавязковая ўмова сілы чалавека, рэалізацыі дадзеных ад прыроды здольнасцей, выканання сваіх абавязкаў.

У вершы "Цемень" ("Я сяджу без агню...") адчужанасць, адзінота героя пераадольваецца на нейкае імгненне ("Ажываеш, здаецца, душою гарыш"), калі маланка "асвячае"-асвятляе "ясны вобраз Хрыста" (с. 214). Так, побач з вобразамі язычніцкімі, старажытнымі з'яўляюцца вобразы хрысціянскія, і яны дапамагаюць чалавеку пераадолець сваю "адарванасць", падключыцца да зямлі, да багатай традыцыі, да таго

трывалага, што было закладзена продкамі, што нячутна, ненавязліва працягвае жыць побач з чалавекам, – набыткі культуры, духоўнай спадчыны.

Некалі старагрэчаскі паэт Мімнерм, убачыўшы сівыя валасы на сваёй галаве, запытаўся: дык што ж ёсць трывалае ў жыцці чалавека? Так, пакутуючы ад таго, што вайна разбурае ўсё, што існуе і жыве на нямецкай зямлі, паэты эпохі Трыццацігадовай вайны шукалі тое трывалае, што нельга спаліць, нельга зваяваць, нельга зжыць са свету.

*"...И до чего ж охота*
*Средь бренности найти незыблемое что-то,*
*Что не могло б уйти, рассыпаться, утечь,*
*Чего вовек нельзя ни утопить, ни сжечь…"* [5, с. 195], –

пісаў Марцін Опіц у вершы "Слова суцяшэння сярод бедстваў вайны". Вечнае, нязменнае паэт знаходзіць у мужнасці, несмяротнай душы чалавека, дзе ёсць прыстанак для Бога. Звяртаючыся да гэтага матыву, паэт Паўль Флемінг найперш выказвае шчырую веру ў Бога-пакутніка, які дае чалавеку надзею і жыццё. Гэтаксама ў чалавеку ёсць нейкая трывалая душэўная сіла, у самім сабе ён здольны знаходзіць процістаянне хуткаплыннасці жыцця і бедствам вайны (санет "Да самога сябе": "И счастье и несчастье / Лежат в тебе самом!.. Свои поступки взвесь!" [5, с. 218]).

"Адарванасць" смяротна хворага М. Багдановіча ад самога жыцця, узмоцненая смерцю яго блізкіх, духоўна пераадольвалася і ў гэтым напрамку – у напрамку адчування сваёй еднасці з прыродай, з зямлёю. Паэт шукае і знаходзіць формы і сродкі процістаяння. Такой ***формулай повязі чалавека з прыродай*** з'яўляюцца словы паэта **"з прыродай зліўшыся душой... / Чую ў цішы, як расце трава**..." (с. 62). "Адарваны" ад права на жыццё, паэт найперш імкнуўся наладзіць трывалыя повязі з самой прыродай, з тым, што жыве і квітнее на зямлі. У многіх вершах паэт выказвае сваё шчырае ***захапленне – прыродай*** ("Падвей", "Здароў, марозны, звонкі вечар!" і многія іншыя), ***дзяўчынай*** ("У вёсцы", "Вераніка": "Скланіўся я душой маёй, / Натхнёнай, радаснай такою..." , с. 152, і многія іншыя), ***маці*** ("Цёмна неба начное...": "Я паняў. Я каленямі стаў / Прад табой...", с. 156).

Відавочна, што "адарванасці" процістаіць неўтаймаваны творчы дух паэта, яго сіла волі, гарачая любоў да культуры свайго народа і чалавецтва, шчырае жаданне пакінуць свой плён, і не толькі беларусам, але і ўсім народам прынесці "свой дар".

3. **"Адарванасць"** выступае і як асаблівасць **псіхічнага свету** чалавека. На гэтым узроўні знаходзім парушэнне сувязей унутры цэласнай асобы чалавека, іх дысгарманічнасць, а таксама адсутнасць сувязей з навакольным светам, што адбіваецца на яго ўнутраным стане. Адсюль матывы суму, адзіноты, адчужанасці, трагічнага разладу з самім сабой, што знаходзіць адлюстраванне ў творчасці М. Багдановіча.

А. У творах інтымнай тэматыкі. Найперш матыў парушэння сувязей паміж людзьмі і матыў адзіноты прадстаўлены ў вершах пра каханне – пра безнадзейнае каханне, пра каханне без адказу. Гэта вершы на сюжэты фальклорнага або літаратурнага паходжання, узоры аб'ектываванай лірыкі. Метафара "адарванасці" ўзята з фальклору: "дарожка, траўкай зарастае" (с. 81), дзяўчына атруцілася "і, як месяц далёкі, блядна / Ў дамавіне ляжала яна" (с. 249), каралеўна "маркотна глядзіць" і ў садзе спявае, "што ёсць і вясна, і каханне" (с. 305).

Будучы па сваёй прыродзе "адарваным", М. Багдановіч асабліва выразна бачыў і блізка да сэрца ўспрымаў "адарванасць" іншых: у яго адзінокія "тэлеграфны стоўп", які па сваім прызначэнні павінен звязваць людзей (с. 99), каліна на магіле, як і сама магіла (с. 196), лясун адзінокі (с. 215), "дачка самотная суседзяў", Вераніка, "яна ўсягды была сама, адна" (с. 148, с. 150)... "Адарванасць" як скразны матыў, прычынна і часава дэтэрмінаваны або пададзены без якой-небудзь вытлумачальнай прычыны, прысутнічае ў многіх творах М. Багдановіча.

Разам з тым два вылучаныя намі матывы ў межах феномена "адарванасці" сустракаюцца і ў вершах інтымнай тэматыкі суб'ектыўнага плану. Гэтыя вершы прысвечаны дзяўчатам, прыгажосцю якіх захапляўся паэт (Клаве, Кіціцынай, Ганне Рафаілаўне Какуевай і інш.).

У любоўнай лірыцы разглядаюцца розныя матывы, прычыны і формы "адарванасці" герояў. Адна з іх – расстанне. Падобнага тыпу "адарванасць" можна пераадолець, калі каханне будзе доўжыцца, нягледзячы на адлегласць. Формай такога пераадолення з'яўляецца пошук агульнасці, таго, што злучае або можа злучыць закаханых – у прасторы, у часе. І М. Багдановіч знаходзіць шмат такіх сродкаў або формаў пераадолення. Адна з іх – зорка Венера.

Зорка Венера з'яўляецца, відавочна, універсальнай, сімвалічнай для паэзіі М.Багдановіча формай або ***"формулай пераадолення"***: "Глянь іншы раз на яе,– у расстанні / Там з ёй зліём мы пагляды свае..." (с. 78). Гэта значыць, сувязі паміж людзьмі не парушаны, нягледзячы на адсутнасць непасрэднага кантакту паміж імі, і адзінота пераадольваецца шляхам духоўнай еднасці, праз думкі, пачуцці, якія працягваюць жыць. Сімвалам, эмблемай гэтай непарушнасці, момантам сімвалічнага ўз'яднання закаханых у дадзеным вершы становіцца **"зорка Венера"**.

Феномен "адарванасці" ўзнікае і з нараджэннем дзіцяці ў выпадку, калі маці памірае, "каб жыццё дзіцёнку даць!" (с. 165, вершы цыкла "Каханне і смерць"). Страта жыцця маці ***пераадольваецца праз нараджэнне новага чалавека***. І ў гэтым факце паэт бачыць універсальны закон прыроды. Яшчэ адна ***"формула пераадолення"*** ствараецца з дапамогай лексічнага паралелізму: "Так *крохкая, пушыстая багатка* / Пад ветрам аблятае, каб магло / Яе насенне узрасці і кветнуць, / І толькі кволае сцябло пасля / Гаворыць *аб жыцці, дзіцям адданым*" (с. 163).

***Матыў нараджэння дзіцяці*** – адзін з адказаў паэта на неабходнасць замацоўваць сувязі, у тым ліку паміж мінулым і сучасным, паміж сучасным і будучым, што працягваецца ў творах на іншую тэматыку.

Б. "Адарванасць" прысутнічае і ў вершах на гістарычную тэматыку. Адзін з яе вобразаў – вобраз летапісца, які "свой век канчае... у манастырскіх мурах. / Тут ціша, тут спакой, – ні шуму, ні клапот" (с. 411) ці перапісчыка – "няма куды спяшыць", "нячутна дзень праходзіць" (с. 88). Праца дапамагае пераадолець "адарванасць" асабістага лёсу герояў. Дзякуючы працы перапісчыка будуць таксама звязаныя часы, гады, "і добрыя... і кепскія дзяла". У гэтай працы знойдзе

адбітак "што тут чынілася ў даўныя гады, / Што думалі, аб чым спрачаліся тады, / За што змагаліся, як баранілі веру..." (с. 411).

У асветніцкім жа напрамку пралягае і шлях паэта, які адраджае старыя формы верша: "Ёсць чары ў забытым, старадаўным..." (с. 143). **Злучаць мінулае з сучасным дзеля будучыні** – абавязак, справа летапісца, перапісчыка, паэта, як і адна з ***"формул пераадолення"***, выведзеная ў творчасці М. Багдановіча.

Г. У творах філасофскай праблематыкі ( "Ты быў, як месяц, адзінокі...", с. 260, "Шмат у нашым жыцці ёсць дарог... / для чаго мы... / Адзінока йшлі ў край невядомы?", с. 134) "адарванасць" асэнсоўваецца як феномен глыбока драматычны, універсальны, анталагічны. Уключаны ў "свет і людны, і шырокі" (с. 260), чалавек часам адчувае гэтую бязмежнасць свету і не знаходзіць тых повязей, якія маглі б яго злучыць з усім і ўсімі: "Хоць свет і людны, і шырокі, – / Ты быў, як месяц, адзінокі..." і "Калі ціха паўзушчы чарвяк / Ўсё ж дагнаў нас ля самай магілы" (с. 134). Падобную "адарванасць" можна назваць татальнай, усёабдымнай, ад яе часам не могуць пазбавіць ніякія думкі, падзеі, намаганні, раз ад разу яна ўзнікае ў жыцці і свядомасці ці не кожнага з людзей.

Але ў часы асаблівай роспачы паэт імкнецца хоць нейкім чынам **узгадаваць у сваёй душы "надзеі зёрны"** (с. 132).

Д. "Адарванасць" як парушэнне сувязей з беларускай культурай, "адарванасць" ад вытокаў, каранёў духоўнай спадчыны народа (у тым ліку моўнага характару) успрымалася М. Багдановічам як глыбока асабістая, як праблема экзістэнцыі, значыць, уласнага існавання і свайго жыццёвага выбару.

З гэтага становішча паэтам былі зроблены важныя высновы. **"*Формуламі пераадолення*"** можна назваць наступныя: 1) вярнуцца да крыніц роднай мовы (і знаходзячыся ў Расіі, паэт піша па-беларуску) – **"І бліснуў ярка верш пануры мой"** (с. 143); 2) да вытокаў роднай культуры, аднаўляючы старыя паданні, фальклорныя вобразы, вершаваныя формы і памеры, даследуючы старажытнасць, іншанацыянальныя ўзоры ў навуковых працах, – **"ёсць чары у забытым, старадаўным..."** (с. 143); 3) "адарванасць" ад сусветнай літаратуры пераадоленая паэтам: ён шмат перакладае, перапрацоўвае, інтэрпрэтуе, пераказвае. Даволі складана пералічыць усе віды сувязей і ўзаемадзеянняў, прадстаўленых у творчай спадчыне М. Багдановіча, – **"Каб хоць душой у прошлым патануць. / Таму вярнуўся я к рандо, санетам..."** (с. 143).

Страта сувязей. Адзінота. Гэтыя два матывы складаюць аснову "адарванасці".

Страта сувязей у сацыяльным плане – з "малой радзімай", з Бацькаўшчынай, з блізкімі і сябрамі, з папярэднікамі і паплечнікамі і г. д. – у спадчыне М. Багдановіча пераадольваецца праз творчасць, праз наладжванне духоўных повязей. ***Формуламі зваротнай сувязі*** сталі радкі: **"А сэрца ўсё імкне да бацькаўскага краю", "Радзімая зямля, прынікнуў я к табе...".** Паэт вяртаецца на радзіму ў думках ("Усё мне бачыцца вёсачка, Нёман..."), з дапамогай мастацкага слова, творчасці ("І тчэ, забыўшыся, рука..." і інш.).

Адсутнасць сувязей у прыродным, біялагічным плане пераадольваецца, калі лірычны герой адчувае сваё зліццё з прыродай, з усім навакольным жыццём, калі паэт узнаўляе гарманічны стан суіснавання чалавека і прыроды: "Прывет табе, жыццё на волі!.. / Той дзень, што мае нарадзіцца, / І знікшы дзень" (с. 60). ***Формула пераадолення:*** "**з прыродай зліўшыся душой"**. Гэтая ж формула ўзнаўляецца ці ўдакладняецца кожны раз, калі паэт выказвае сваё захапленне – прыродай (**"Здароў, марозны, звонкі вечар!"**, с. 72), дзяўчынай (**"Скланіўся я душой маёй, / Натхнёнай, радаснай такою..."**, с. 152), маці (**"Я паняў. Я каленямі стаў / Прад табой..."**, с. 156). Адзінота знікае з наладжваннем новых повязей, з адчуваннем сваёй еднасці з людзьмі, навакольным светам.

Страта сувязей як з'ява псіхічнага свету чалавека, пераадольваецца, калі доўжыцца, нягледзячы на перашкоды, каханне (яго форма – пошук агульнасці, таго, што злучае закаханых: **"зорка Венера... /** Светлыя згадкі з сабой прывяла... / Там з ёй зліём мы пагляды свае... / Каб хоць на міг уваскрэсла каханне, / Глянь іншы раз на яе..."), калі нараджаецца дзіця і жыццё працягваецца (**"каб жыццё дзіцёнку даць!")**. Злучаць мінулае з сучасным дзеля будучыні – абавязак, справа летапісца, перапісчыка, паэта, які таксама здольны ўзгадаваць у сваёй душы **"надзеі зёрны"**, што могуць стаць трывалай асновай для душэўнай раўнавагі, для аптымізму, светлай веры ў будучыню.

"Ёсць чары у забытым, старадаўным... / Каб хоць душой у прошлым патануць. / Таму вярнуўся я к рандо, санетам, / І бліснуў ярка верш пануры мой..."

Паэт сублімуе тое, што спрыяла яго "адрыву", у своеасаблівыя ***формулы пераадолення*** – вобразы новых сувязей, сумоўя, зносін, якія ўстанаўлівае, фарміруе, развівае сам паэт. Гэта сувязі з родным краем, з прыродай ("з прыродай зліўшыся душой", чаму ён у сваіх вершах прысягнуў на верную службу), з мінуўшчынай і будучыняй, з новымі пакаленнямі (праз нараджэнне дзіцяці, праз зварот да каранёў народнай гісторыі і культуры), з іншымі народамі, з якімі ён уступае ў дыялог з дапамогай мастацтва слова, з цэлым Сусветам.

Хочацца верыць, што шляхі пераадолення "адарванасці" выяўлены М. Багдановічам не толькі з прычыны прыроднай здольнасці быць музы́кам слова, каб паслужыць беларускаму слову, айчыне, паэзіі або дзеля асабістай самарэалізацыі. Дзякуючы паэту яны становяцца выразна бачнымі, а ўзнаўляючы гэтыя шляхі-сувязі, чалавек можа істотна ўзбагаціць сваё жыццё.

**Спіс літаратуры**

1. **Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы.** – Мінск : БелЭн, 1996.

2. **Бергсон, А.** Собр. соч. / А. Бергсон. – Спб., 1914. – Т. 4.

3. **Багдановіч, М.** Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. (У тэксце спасылкі на гэтае выданне даюцца без указання парадкавага нумара ў круглых дужках.)

4. **Колас, Я.** Поўны збор твораў : у 7 т. / Я. Колас. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1952. – Т. 4 : Новая зямля. Сымон-музыка.

5. **Европейская поэзия XVII века** ("Библиотека всемирной литературы". Серия первая). – М. : Худож. лит., 1977.

Валерый МАКСІМОВІЧ

# ПРАЯВЫ АКМЕІЗМУ Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

У багдановічазнаўстве стала замацавалася думка пра спрычыненасць паэта да розных культурнагістарычных кантэкстаў, мастацкіх плыняў і кірункаў, шырока распаўсюджаных у еўрапейскіх літаратурах з канца XIX – пачатку XX ст. (імпрэсіянізм, эстэтызм, сімвалізм, неарамантызм, неакласіцызм). Пры выбудоўванні цэласнай сістэмы эстэтычных поглядаў М. Багдановіча неабходна ўлічваць кожны са складнікаў, які паўплываў на фарміраванне яго ўласнай мастацкай канцэпцыі жыцця. Пагаджаючыся з наяўнасцю многіх літаратурных кантэкстаў, каардынат і параметраў, якія тым або іншым чынам праявіліся ў яго творчасці, варта ўсё ж пагадзіцца з тым, што мастацкія прыярытэты, схільнасці і сімпатыі паэта маюць глыбінныя, унутрана-псіхалагічныя вытокі. Механічнае, імітатарскае выкарыстанне клішыраванага ўзору, прынятага мастацкага канона для М. Багдановіча абсалютна выключана. Яго зайздросная гісторыка-культурная эрудыцыя, філалагічная абазнанасць найперш служылі надзейным базісам для выпрацоўкі новых аўтэнтычных мастацкіх ідэй, для стварэння універсальнай паэтычнай карціны свету. Падкрэслім: зыходным, першасным варта ўсё ж прызнаць унутраную, генетычна запраграмаваную дамінанту, характар светаадчування і светасузірання, што выяўляецца ў мастацкай палітры праз задзейнічанне адпаведных фармальна-стылістычных элементаў, паэтычных фігур-маркёраў і г. д.

Заўважана: паэтычны свет Максіма Багдановіча надзіва канкрэтны, рэальны, адчувальны. Больш за тое, ён як бы па-сямейнаму асвоены, прыручаны. Містычная іншасказальнасць, затуманенасць, абстрактная, ускладненая метафорыка, няпэўнасць і цякучасць слова, уласцівая перадусім для паэтыкі сімвалізму, – не прэрагатыва М. Багдановіча. Для паэта важна адчуць матэрыяльную рэчыўнасць свету з усімі яго пахамі і гукамі, убачыць выразную акрэсленасць яго абрысаў і межаў. "Захапленне формай і патрабаванне дасканаласці формы як абавязковай умовы мастацтва, яснасць і дакладнасць вобразнасці, пераважна прадметнай, захапленне антычнай культурай" [10, с. 69] – адметныя складнікі творчай майстэрні М. Багдановіча. У шмат якіх вершах паэта можна назіраць нанізванне бездакорна адчаканеных прадметных рэалій, дзе над усім пануе ціхая, святляная – звычаёвая – радасць жыцця на зямлі, радасць існавання ў свеце:

*Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог,*
*Улажылі спаць мяне вы на зямлі.*
*Не ўстае стаўпом пыл светлы ўздоўж дарог,*
*Ў небе месяца праглянуў бледны рог,*
*Ў небе ціха зоркі расцвілі* [2, т. 1, с. 62].

Праецыраванне пачуццяў на рэаліі і аб'екты нежывой прыроды ўзмацняецца да такой ступені, што апошнія здаюцца адухоўленымі, надзеленымі чалавечымі пачуццямі і адчуваннямі. У канкрэтна-рэчыўным, матэрыяльным М. Багдановіч заўсёды імкнуўся распазнаць яго духоўную сутнасць, "высокую красу". Ёсць усе падставы сцвярджаць, што і тая самая захопленасць паэта Антычнасцю, і яго наўздзіў абвостраная цікаўнасць да падрабязнасцяў побыту і быцця прадыктаваныя надзвычайнай патрэбай у канкрэтнай людской і, больш за тое, касмічнай цеплыні і нейкай матэрыяльнай, як бы ахоўнай, абалонцы, што засцерагала б жывы сусветны арганізм ад выстуджвання.

Перавага прадметнага значэння слоў дазваляе знайсці агульныя пункты судакранання вобразнага ладу вершаў М. Багдановіча з мастацкай практыкай акмеістаў. У творчасці апошніх яскрава назіраецца асаблівы піетэт да зямнога, звычайнага, рэчыўна-матэрыяльнага, закаханасць, гаворачы словамі М. Кузьміна, "в прелесть и пустяки мирного жития". Пры гэтым прадметы, дэталі, выявы, што важна, набываюць ідэязначны сэнс. Рэчыўна-малюнкавы, пластычны свет не проста ўспрымаецца як фонавы, дэкарацыйны, дапаможны "матэрыял", а набывае шматфункцыянальнае значэнне. Ён выступае ў якасці своеасаблівага карэлята, сімвалічнага адпаведніка лірычнай эмоцыі, пачуцця, настрою, больш за тое, выконвае важную асацыятыўна-псіхалагічную ролю. І часам бывае цяжка вызначыць: ці рэчы выступаюць выявамі душы, ці душа "прасвятляе" іншую, схаваную ад вачэй, сутнасць рэчаў. Каштоўнасць і сэнс чалавечага жыцця, паводле М. Багдановіча, заключаецца не ў гатоўнасці здзейсніць нейкі геройскі ўчынак, подзвіг, а ў самім штодзённым побыце, у здольнасці знайсці радасць у кожнай драбніцы, у кожнай праяве жыцця.

Калі знаходзіць пункты судакранання паэзіі М. Багдановіча з творчымі ўстаноўкамі прадстаўнікоў акмеізму, варта адзначыць і такую немалаважную акалічнасць, як прысутнасць у іх творчасці тэмы "цяпла", "дамашняй утульнасці", "свойскасці". Кожнаму прадмету, самай, здавалася б, нязначнай побытавай праяве, прадмету, рэчы, аксесуару ў мастацкай палітры акмеістаў надавалася значная ўвага. З другасных, дапаможных, як бы пазбаўленых права на іменнасць, асабістую прыручанасць, яны пераходзілі ў разрад ледзь не сакраментальных, свяшчэнных – ачалавечаных, адухоўленых, здольных напоўніць сэнсам і ўнутраным цяплом адзінокае і тужлівае існаванне чалавека на зямлі. Рэчы ў кантэксце паэтычнай стратэгіі і прадстаўнікоў акмеізму, і самога М. Багдановіча набываюць адзнаку сувязных часу, жывых сведкаў дзён, падзей, людскіх узаемаадносін, наяве выступаючы часткай іх жыццёвай філасофіі, нораваў, густаў, звычак і г. д. А ў сукупнасці гэта – магутны сродак повязі мінулага і сучаснага, сродак запаўнення, урэшце, касмічнай пусткі, безыменнасці, безжыццёвасці матэрыяльнымі тварэннямі прыроды і чалавека, з замілаваннем і любоўю асвоенымі, абжытымі людзьмі ў працэсе іх жыццядзейнасці.

Акурат тонкая, філігранная абмалёўка, апісанне рэчаў, прадметаў навакольнага свету збліжае Максіма Багдановіча з Восіпам Мандэльштамам у ідэі ўладкавання жыццёвага побыту на прынцыпах "асабечанай утульнасці", "усясветнага дому", ці, гаворачы словамі В. Мандэльштама, "мировой домашности". І тая самая ўстаноўка на дэталёвае, скрупулёзнае вымалёўванне, як бы ўнутранае асвойванне кожнай рэчы, дэталі, разам з захаваннем незвычайнай меры, адпаведнасці ў межах паэтычнага цэлага дазваляюць знайсці новы ракурс у Багдановічавым разуменні сутнасці паэзіі як рамяства, карпатлівай працы над кожным словам, радком, формай верша. Існым крэда паэта сталі наступныя радкі з верша "Песняру":

*Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш,*
*Абрабіць яго трэба з цярпеннем.*
*Як ударыш ты ім, – ён, як звон, зазвініць,*
*Брызнуць іскры з халодных каменняў* [2, 1, с. 126].

Максіму Багдановічу, калі мець на ўвазе спецыфіку разумення ім творчага акта, імпанавала больш паэзія, заснаваная не на звышпачуццёвай інтуіцыі, а на рэальным псіхалагічным вопыце. Паэт свядома прытрымліваўся прынцыпу «"сальерызму" ў мастацтве, калі натхненню і ірацыянальнасці творчага працэсу супрацьпастаўляецца *"мерны, нудны труд"*» [1, с. 174]:

*Сальеры ў творчасці усё хацеў паняць,*
*Ва ўсім упэўніцца, усё абмеркаваць,*
*Абдумаць спосабы, і матар'ял, і мэту,*
*І горача любіў сваю свядомасць гэту.*
*У творчасці яго раптоўнага няма:*
*Аснова да яе – спакойная дума* [2, т. 2, с. 263 – 264].

Беларускі паэт, несумненна, быў добра знаёмы з творчасцю прадстаўнікоў акмеізму, у прыватнасці Мікалая Гумілёва як заснавальніка і кіраўніка гэтай новай літаратурнай плыні, а таксама з творчасцю французскіх паэтаў-парнасцаў. У якасці доказу спашлемся хоць бы на неаднойчы згаданую рэцэнзію М. Багдановіча на гумілёўскі пераклад кнігі "Эмалі і камеі" славутага французскага паэта Тэафіля Гацье. Сімптаматычна, што беларускі "пясняр чыстай красы" цытуе тую страфу з яго верша-маніфеста "Мастацтва" (1857), да якой часта звярталіся акмеісты для падмацавання сваіх праграмных заяў:

*Искусство тем прекрасней,*
*Чем взятый матерьял*
*Бесстрастней:*
*Стих, мрамор иль металл…* [2, т. 2, 361].

Той жа зварот самога М. Багдановіча да класіцыскіх ідэй і формаў мастацтва, да парнаскай традыцыі класічнай сувымернасці, урэшце, да сведчанняў чалавечай гісторыі – гэта свайго роду адчайная спроба вярнуць і захаваць гармонію, суладнасць, паўнату жыцця ў самых разнастайных яго праявах, спыніць вечнасць, працягнуць радасць спазнавання і спасціжэння універсальных знакаў культуры. Наяве ілюзія вяртання залатога веку сродкамі мастацтва, фантазіі і напружанай унутранай работы. Адсюль – неспатольныя і неадольныя настальгічныя згадкі пра экзатычны і надзвычай прыцягальны перыяд у чалавечай гісторыі, калі жылі і стваралі Анакрэон, Рафаэль, Парні і інш. Дамінантным, сэнсаўтваральным фактарам у вершах М. Багдановіча антычнай скіраванасці выступае ідэя вяртання каштоўнасцяў еўрапейскай антычнай культуры ў рэальнасць "гістарычнага сягоння" праз сумяшчэнне гістарычнага часу і ахроннай "вечнасці". Расійскі філолаг Віктар Жырмунскі, запазычваючы выраз нямецкага філосафа Фрыдрыха Шлегеля, назваў вершы В. Мандэльштама "паэзіяй паэзіі" – "паэзіяй, якая мае сваім прадметам не жыццё, непасрэдна ўспрынятае самім паэтам, а чужое мастацкае ўспрыманне жыцця" [6, с. 123]. Думаецца, гэтыя словы з поўным правам можна аднесці і да М. Багдановіча.

Ідэя не толькі цэласнасці і ўзаемазалежнасці ўсяго жывога на зямлі, але і сувязі вякоў і эпох пранізвае кнігу М. Багдановіча "Вянок" (1913). Прычым – пры наяўнасці шматлікіх быццёвых карэляцый – у бязмежнай стракатай карціне свету М. Багдановіча, як падаецца, больш прываблівае не так сучаснае, жывое, пульсоўнае жыццё, як *"краскі, свежыя калісьці"* – засушаныя, захаваныя на паперы, ператвораныя ў гербарый. Паэт не стамляецца ім захапляцца: як бы ў статычным, застылым імгненні яму ўдаецца пранікнёна разгледзець кожную асобную выяву і дэталь, адчуць эстэтычную асалоду ад магчымасці працягнуць-затрымаць судакрананне са спыненай у часе і прасторы прыгажосцю, красою. Храналагічны, тэматычны і жанравы дыяпазон вершаў, згрупаваных у адпаведныя нізкі, цыклы, дастаткова шырокі: ад часоў Сярэднявечча, Рэнесансу да дзён сучасных, да перажыванага моманту (вершы "Летапісец", "Перапісчык", "Кніга", "Безнадзейнасць" і інш.). Акурат уласныя рэфлексіі паэта абуджаюцца векапомным Акропалем культуры, якому нададзена асаблівая дакументальнасць, урэчаіснасць.

Структура "Вянка", размеркаванне нізак і цыклаў, як вядома, добра прадумана паэтам і падначалена задачы рэцэптыўнага – поліфанічнага, полігенезіснага – пашырэння сэнсавага гарызонту кнігі. Апошняе дасягаецца рознымі сродкамі і прыёмамі: пачынаючы ад манеры спавядальнасці лірычнага героя да вар'іравання тэматычных структураўтваральных цыклаў і жанравага дыяпазону. У выніку ствараецца дзіўны эфект не проста дэманстрацыі прыгажосці абраных паэтычных формаў і жанраў (санет, трыялет, рандо, актава, верлібр, танка, рубаі і г. д.), а як бы іх наўмысная акумуляцыя, музеізацыя, гербарызацыя, а значыць – увекавечанне з мэтай наступнага перманентнага паўтарэння-вяртання ў вечным кругабегу вершатворчасці і – шырэй – жыццятворчасці.

Па словах літаратуразнаўцы Евы Лявонавай, М. Багдановіч надзвычай высока цаніў "сімвалізм ад рэчаіснасці" [9, с. 119], а не адцягнены, абстрактны. Сваю прыхільнасць да простасці і немудрагелістасці паэтычнага выказвання паэт дэманстраваў неаднойчы. Так, у невялікай нататцы пра паэзію Рабіндраната Тагора чытаем наступнае: "*... символика Тагора реалистична, одета живою плотью и кровью, она всегда имеет некоторый реальный, конкретно-житейский смысл; но сквозь него постоянно просвечивает иное содержание*



***Валерый Аляксандравіч Максімовіч*** *– літаратуразнаўца. Доктар філалагічных навук. Закончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1989) і аспірантуру пры ім (1992). З 1992 г. працаваў у БДУ дацэнтам кафедры беларускай літаратуры XX ст. У 2003 – 2006 гг. – першы прарэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. З 2006 г. – в. а. дырэктара Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук. Цяпер ён в. а. намесніка дырэктара Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі.*
*Даследуе беларускую літаратуру пачатку XX ст. Аўтар манаграфій "Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку XX ст." (2000), "Беларускі мадэрнізм: эстэтычная самаідэнтыфікацыя літаратуры пачатку XX ст." (2001) і іншых, шэрагу дапаможнікаў.*

*с границами, трудно определимыми, а потому без конца влекущими и расширяющими мысль*" [2, т. 2, с. 359]. Указваючы на канкрэтныя прычыны-стымулы мастацкага поспеху Уладзіміра Самійленкі, М. Багдановіч вылучае здольнасць украінскага паэта "*смотреть на жизнь как бы со стороны, взором не столько участника событий, сколько их наблюдателя, что давало ему возможность уловить наиболее характерное, в частном обнаружить типичное или даже прямо обратиться к обобщению, так любимому им*" [2, т. 2, с. 312]. Прыведзеная заўвага яскрава пераклікаецца з акмеістычнай устаноўкай на распрацоўку "апасродкаванага лірычнага сюжэта" (Л. Гінзбург). У сувязі з гэтым да месца прывесці сведчанні ўжо згаданага В. Жырмунскага. У артыкуле "Преодолевшим символизм" (1916) даследчык адзначыў характэрную рысу новай школы – акмеізму: "...точную, мало искаженную субъективным душевным и эстетическим опытом передачу раздельных и отчетливых впечатлений преимущественно внешней жизни, а также и жизни душевной, воспринимаемой с внешней, наиболее раздельной и отчетливой стороны" [6, с. 131]. "Чароўная яснасць" акмеізму, аплодненая пазітывісцкім духам папярэдніх эпох, самадастатковая каштоўнасць, важкасць свету – прасторы, часу, рэчыва – свету зямнога, а не ўяўнага, выдуманага, – праглядваюцца ў многіх вершах самога М. Багдановіча.

Беларускі творца даволі талерантна гаворыць пра сузіральнасць У. Самійленкі, пра "*обдуманность и неторопливость*" яго вершаў, "*тихий прибой лиризма*", заўважаючы пры гэтым, што "*мысль... у него проста, человечна и культурна*", што дазваляе гаварыць аб нечым "*более сложном и значительном: о целостном поэтическом мироотношении*" [2, т. 2, с. 306]. Прыведзенае выказванне можна трактаваць не толькі як тэарэтычнае абгрунтаванне новых прынцыпаў эстэтыкі і паэтыкі, заснаваных на прадуманасці, руплівай шліфоўцы, даводцы кожнага твора, але і як своеасаблівае дэкларацыянне крытэрыяў уласнай філасофска-эстэтычнай сістэмы. У аснову гэтай сістэмы клаліся тыя самыя прынцыпы "сальерызму" – старанное давядзенне думкі да лагічнага завяршэння, яе глыбокая прадуманасць, успрыманне літаратурнага твора як эстэтычнага феномена. Для нас прыведзеныя разважанні Багдановіча-крытыка важныя яшчэ і тым, што ў іх аўтар упершыню так зацікаўлена падымае праблему, звязаную з псіхалагічным тыпам творчасці, з псіхалогіяй творчасці ўвогуле.

Заўважым, што ў дадзеным выпадку нельга атаясамліваць псіхалагічны тып творчасці з эстэтызацыяй індывідуалізму. Рыгор Бярозкін у сувязі з гэтым заўважае: «Вышэйшая ацэнка, якую Багдановіч дае ўкраінскаму паэту Самійленку: "Ён не выключны". Гэту "невыключнасць" Самійленкі Багдановіч ставіць у цесную залежнасць ад яго маральна-эстэтычнай пазіцыі. <...> Адчуваецца, што гэта тая пазіцыя, той стыль чалавечых і творчых паводзін, якіх трымаецца сам Багдановіч: індывідуалізаваная, вылучаная асоба, якая стараецца ўнікнуць усякай выключнасці і таму арыентуе сваю лірычную думку на матэрыялізаваны ў шматвяковых мастацкіх традыцыях вопыт "шэрагу пакаленняў"» [4, с. 524 – 525]. Вось чаму каштоўнасць чалавека (лірычнага героя У. Самійленкі), паводле М. Багдановіча, вымяраецца яго сувяззю з прыродай, з рэчаіснасцю, яго далучанасцю да "широкого культурного пути". Нездарма ў артыкуле так шырока закранута пытанне літаратурных уплываў як аднаго з найважнейшых, дзейсных фактараў фарміравання творчай індывідуальнасці У. Самійленкі. Гэта, паводле Багдановіча-крытыка, з'яўляецца адным з важных складнікаў псіхалагічнай арыентацыі творцы. Сляды гэтых уплываў бачацца аўтарам, з аднаго боку, у рэальным уздзеянні "великорусской", з другога – "древнегреческой и романских литератур" [2, т. 2, с. 307]. "*В благородной простоте его писательской манеры, в изяществе стиха, выдержанного и законченного, во всем строе его мысли,* – падкрэсліваў Багдановіч, – *везде чувствуете вы, что это возникало и вырабатывалось в атмосфере влияния многих и многих культурных миров*" [2, т. 2, с. 309].

Пры адчувальным уплыве розных мастацкіх стыляў і школ, кірункаў і плыняў, эстэтык і формаў паэзія самога М. Багдановіча, на што ўжо звярталася ўвага, выглядае даволі стройнай, адмыслова структураванай сістэмай, дзе ёсць свая мастацкая логіка, апраўданасць, завершанасць, дзе самыя разнастайныя гісторыка-культурныя феномены злучаюцца ў гарманічнае адзінства, у высокую эстэтычную дасканаласць. Максім Багдановіч з'яўляецца сапраўдным спалучальнікам супрацьлегласцяў. Праявай універсалісцкіх памкненняў бачыцца спроба пошуку аб'яднальнага пачатку ў сферы пачуцця, ідэалу, нават калі гэты ідэал знаходзіцца ў рэтраспектыве. Гэты аб'яднальны пачатак М. Багдановіч бачыў не ў рэлігійным, боскім, а ў адкрытай культурнай секулярызацыі "боскай святасці", у набыцці ёю канкрэтнага, "цялеснага", блізкага – адчувальнага сэнсу, які ствараецца дзякуючы сапраўднай, жывой, а не эфемернай агульнасці пачуццяў. Духоўнае прасвятленне і сапраўды магчымае праз любоў і красу, дадзеныя чалавеку ў пачуццях. Багдановічаўская "*высокая краса*", "*жывы абраз ядыны*", "*выгляд мацеры ды з воблікам дзяўчыны*" не маюць нічога агульнага з якімі

б там ні было догмамі або афіцыйнымі прадпісаннямі, з трансцэндэнтнасцю. Паэту блізкі, усцешны свет быццёвай, зямной гармоніі, матэрыяльна існага "тут і цяпер", хай сабе і ў далёка не дасканалым выглядзе, але адчувальна спасцігнуты, перажыты ў рэальным жыцці ідэал, дзякуючы якому адбываецца пераўтварэнне, перайначванне духоўнага свету. Багдановічаўская "краса і сіла" нараджаецца з непахіснай і радаснай жыццесцвярджальнай надзеі на вечнае сузіранне зямной, а не іншабыццёвай чароўнасці, – чароўнасці ў межах звычайнага штодзённага – *пачуццёвага* – жыцця, без нагнятання штучнага аскетычнага напружання.

Паэтычная спадчына Максіма Багдановіча пераконвае ў тым, што цэнтр цяжару ўсёй эстэтычнай праблематыкі ён перанёс з аб'ектыўнай сферы ў суб'ектыўную, скіраваўшы сваю ўвагу на характар суб'ектыўнай дзейнасці мастака, на здольнасць чалавечай душы культываваць пачуццё прыгожага, імкненне "к трогательному и прочувствованному", у чым, несумненна, па-свойму выявіўся імператыў маральнай ацэнкі. Адпраўным пунктам філасофска-эстэтычнай сістэмы М. Багдановіча з'яўляецца прызнанне дыялектыкі думкі і пачуцця, рацыянальнага і эмацыянальнага, пачуццёвага ў мастацтве і ў межах эстэтычнага ўспрымання мастацкага твора. Эстэтычныя і тэарэтыка-метадалагічныя погляды М. Багдановіча сыходзяцца менавіта на патрэбе гарманічнай суладнасці рацыянальнага і пачуццёвага. Важна пры гэтым не выпусціць з поля зроку адзін момант: «…тое, што паэт у сваіх праграмных вершах падкрэсліваў неабходнасць "спакойнай думы", а таксама і напружанай працы, абумоўлена больш палемічным запалам, чым рацыяналізмам яго паэтычнага мыслення» [7, с. 131]. Доказам таму можа служыць і адна красамоўная заўвага ў згаданай ужо рэцэнзіі на кнігу "Эмалі і камеі" Тэафіля Гацье: «*Разбираемая книга*, – адзначаў Багдановіч, – *имеет один убийственный недостаток: то, что в ней искусно, в то же время и весьма искусственно. В ней очень много мастерства и очень мало поэзии. В ее тщательно отточенных стихах не чувствуется "веяния духу живого", все они красивы, но холодны*» [2, т. 2, с. 360], што дало падставу крытыку назваць кнігу ахвярай на алтар бяздушнай прыгажосці.

Сама формула "мастацтва для мастацтва" была яму адначасова блізкай і чужой – чужой з-за сваёй адарванасці ад жыцця. Эстэтычнае вымярэнне літаратуры было для М. Багдановіча не самадастатковым, а з неабходнасцю звязаным з нейкім ідэальным варыянтам грамадскага жыцця. Тая самая краса для яго выступала сінонімам духоўнасці, высокага этычнага, адухоўленага ідэалу. Больш за тое, у сістэме каштоўнасных арыентацый Багдановіча-крытыка краса, прыгожае ў мастацтве ўсвядомлены як катэгорыі, непасрэдна суаднесеныя з выяўленнем "проснувшегося национального сознания", з ідэяй слугавання грамадскім інтарэсам, г. зн. у канечным выглядзе як катэгорыі спазнавальныя і этычныя. Але гэта акурат той момант, дзе эстэтычная канцэпцыя самога М. Багдановіча ўступае ў супярэчнасць з ідэяй грамадскага абавязку, што можна вытлумачыць не светапоглядными акалічнасцямі, а эпохай і сфарміраваным ёй разуменнем маральнай нормы. Паводле М. Багдановіча, нацыянальнае пачуццё таксама ёсць спецыфічная форма праяўлення прыгожага ў мастацтве, бо пры гэтым мастацтва заключае ў сабе маральную ідэю, цесна звязаную з яго эстэтычнай прыродай. Усё станавілася на месца: чым больш дасканалы, г. зн. прыгожы, твор мастацтва, тым вышэй яго маральны і эстэтычны патэнцыял.

Праведзены аналіз, думаецца, дазваляе бачыць сувязь паэзіі М. Багдановіча з паэтыкай і эстэтыкай акмеізму. Пра гэта сведчыць і падкрэслены рацыяналізм, інтэлектуалізм яго паэзіі, трансфармацыя ім вобразных, змястоўных мадэляў розных эпох, татальны панэстэтызм, культ Красы і інш. Паэт свядома звяртаўся да класічна-дасканалай (парнаскай), амаль рафінаванай паэтычнай формы верша. Неакласіцысцкія штудыі М. Багдановіча, у адрозненне, прыкладам, ад авангардысцкіх, не насілі дэструктыўнага характару, не мелі на мэце поўнага адмаўлення папярэдняга культурнага досведу, а былі своеасаблівай формай яго кансервацыі, кананізацыі. Неакласіцызм творчасці М. Багдановіча выявіўся перадусім у спосабе мадэрнізацыі культуры шляхам культурнага кансерватызму, адаптацыі ў межах нацыянальнай традыцыі паэтычных формаў, амаль невядомых ёй. З улікам гэтага можна казаць не толькі пра своеасаблівую школу паэтычнага майстэрства, але і пра факт унутранай эвалюцыі мастацкай сістэмы паэта, пра адметнасць яго эстэтычных прынцыпаў. Мастак арыгінальнага таленту, Максім Багдановіч здолеў па-майстэрску сінтэзаваць на нацыянальнай глебе культурныя здабыткі розных народаў, узняць мастацтва беларускага слова да найлепшых узораў сусветнай літаратуры, адкрыць шырокія магістралі для ідэйна-эстэтычнага ўзвышэння беларускай паэзіі. Усё гэта лішні раз сведчыць пра наватарскі, універсальны характар яго паэзіі, дазваляе глыбей спасцігнуць ролю паэта ў развіцці нацыянальнай літаратуры.

**Спіс літаратуры**

1. **Багдановіч, І**. Авангард і традыцыя : Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Багдановіч. – Мінск : Бел. навука, 2001.

2. **Багдановіч, М.** Поўн. зб. тв. : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск : Бел. навука, 1992 – 1993. – Т. 1 – 2.

3. **Баршчэўскі, Л.** Беларуская літаратура і свет : ад эпохі рамантызму да нашых дзён / Л. П. Баршчэўскі, П. В. Васючэнка, М. А. Тычына. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006.

4. **Бярозкін, Р.** Свет Купалы. Звенні / Р. Бярозкін. – Мінск : Маст. літ., 1981.

5. **Гирин, Ю.** Вопрошание как форма культуры (Об испаноамериканском модернизме) / Ю. Гирин // Iberica Americans. Механизмы культурообразования в Латинской Америке. – М. : Наука, 1994.

6. **Жирмунский, В.** Теория литературы. Поэтика. Стилистика / В. Жирмунский. – Л. : Сов. писатель, 1977.

7. **Кабаковіч, А.** Паэзія Максіма Багдановіча (Дыялектыка рацыянальнага і эмацыянальнага) / А. Кабаковіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978.

8. **Келдыш, В.** Русская литература "серебряного века" как сложная целостность / В. А. Келдыш // Русская литература рубежа веков (1890-е – начало 1920-х годов). Книга 1. – М. : Наследие, 2001.

9. **Лявонава, Е.** Сімвалізм у літаратурна-крытычнай рэцэпцыі М. Багдановіча / Е. А. Лявонава // Матэр. Міжн. нав.-практ. канф. "Максім Багдановіч і іншанацыянальныя літаратуры". – Мінск, 2003.

10. **Тарасюк, Л.** Апалогія красы : Кніга пра беларускую паэзію / Л. К. Тарасюк. – Мінск : Права і эканоміка, 2003.

Алена ВОСТРЫКАВА

# БАЖЭНА НЕМЦАВА – ПЕРШАЯ ЖАНЧЫНА-ПІСЬМЕННІЦА Ў ЧЭШСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Бажэна Немцава (1820 – 1862) увайшла ў гісторыю чэшскай літаратуры і культуры як сапраўдная наватарка. Разам з Карлам Гінакам Махам і Ёзафам Каэтанам Тылам яна стала адным з пачынальнікаў жанру апавядання. Менавіта ад гэтых аўтараў працягнулася непарыўная літаратурная традыцыя. Б. Немцава стала адным з першых пісьменнікаў-рэалістаў у чэшскай літаратуры, ёй належыць заслуга стварэння апавяданняў на сялянскую тэму. Раман, шэраг аповесцяў, апавяданняў, нарысаў класіка чэшскай прозы ўзніклі на нацыянальным матэрыяле. Немцава паказала багацце ўнутранага свету звычайных людзей – сялян, рабочых, рамеснікаў. Добра ведаючы жыццё розных сацыяльных слаёў, яна выкарыстала ў сваіх творах шмат сродкаў жывой гутарковай мовы, што дае падставу лічыць пісьменніцу заснавальніцай мовы сучаснай чэшскай прозы.

Яе асабісты лёс засведчыў поўнае непрыняцце сентыментальнага разумення кахання жанчынай у чэшскім грамадстве, пакорлівасці ў шлюбе і поўнага падпарадкавання сваёй волі мужавай. Немцава, жанчына рацыянальная і пачуццёвая адначасова, была чалавекам самых шырокіх інтарэсаў і захапленняў: яна вывучала рускую, нямецкую і балгарскую мовы, цікавілася гісторыяй, этнаграфіяй і геаграфіяй чэшскага народа, займалася анатоміяй і медыцынай, штудзіравала батаніку. Яна добра разумела, як і паэты-мужчыны яе пакалення, сэнс і значэнне тагачасных грамадска-палітычных і культурных тэндэнцый. Пісьменніца мела смеласць пражыць сваё жыццё паводле законаў уласнага ўнутранага свету, нашмат апярэдзіўшы этычнае развіццё грамадства.

Немцава была знаёма з выбітнымі дзеячамі чэшскай навукі, літаратуры і культуры – Францішкам Палацкім, Ёзафам Юнгманам, Паўлам Шафарыкам, Францішкам Ладзіславам Чалакоўскім, Ёзафам Каэтанам Тылам і многімі іншымі. Яна вяла шырокую асветніцкую работу сярод насельніцтва вёсак, прапагандавала патрыятычныя ідэі. Пісьменніца стойка і самааддана змагалася з буржуазна-мяшчанскімі забабонамі ў поглядах на ролю і месца жанчыны ў сям'і і грамадстве. Ідэалам для яе былі Жэрмена дэ Сталь і Жорж Санд.

Як пісьменніца Бажэна Немцава спалучае рысы сентыментальна-рамантычнага бачання шляхоў удасканалення грамадства, якое павінна жыць у згодзе з прыродай, і рэалістычна дакладныя назіранні за жыццём.

Бажэна Немцава нарадзілася ў Вене. Яе маці-чэшка, Тэрэза Новатна, служыла кастэлянкай у герцагіні Заганьскай. Бацька-немец, Ян Панкл, працаваў фурманам. Бацькі Бажэны ўступілі ў шлюб толькі пасля нараджэння дзіцяці. Дзяцінства і юнацтва будучай пісьменніцы прайшлі ў вёсцы Раціборжыцэ ў хаце каля панскага замка. У сям'і было трынаццаць дзяцей. Маці пастаянна занятая працай, бацька часта быў у ад'ездзе, таму клапацілася аб малой Барунцы бабуля з боку маці Магдалена Новатна. Старая сялянка выхоўвала ў дзяцей любоў да роднай чэшскай мовы, чэшскай гісторыі, народных казак і песень. Яна прывіла ім нацыянальную свядомасць. На дзяўчынку вялікае ўздзеянне аказала і навакольная прырода, а таксама паркавая культура панскага маёнтка.

Бажэна Немцава скончыла сельскую школу ў Скаліцы, з 1830 г. у Хвалковіцах вывучала нямецкую мову і шляхетныя паводзіны. Вярнулася яна адтуль начытанай, захопленай рамантычнай літаратурай. У семнаццаць гадоў паводле матчынага жадання, аднак без асабістай схільнасці яна выйшла замуж за Ёзафа Немца, чыноўніка фінансавага ведамства, які быў на пятнаццаць гадоў старэйшы за яе. Муж Немцавай быў чалавекам адукаваным, энергічным, патрыятычна настроеным, але грубым і неўраўнаважаным. Разам з мужам яны падзялялі захопленасць ідэяй нацыянальнага і славянскага адраджэння.

У 1838 – 1842 гг. Немцава нарадзіла чатырох дзяцей. Гэта каштавала ёй здароўя. Яна так і не ачуняла да самай смерці.

З 1842 да 1845 г. Немцавы жылі ў Празе. Гэты час пісьменніца лічыла знакавым у сваім духоўным жыцці. Неўзабаве мужа перавялі па службе ў Дамажліцы, дзе Немцава вывучала жыццё і гісторыю чэшскіх *ходаў* (жыхароў памежных раёнаў), вяла актыўную асветніцкую працу. З 1850 г. разам з дзецьмі яна жыла ў Празе, час ад часу наведвала Венгрыю, дзе працаваў муж, вандравала па Славакіі.

Матэрыяльнае становішча сям'і было вельмі цяжкім, асабліва пасля 1854 г., калі з-за рэвалюцыйных поглядаў мужа звольнілі са службы. Немцава была вымушана прасіць дапамогі ў сяброў. Такія абставіны жыцця былі для яе вельмі скрушнымі. Адносіны з мужам пагаршаліся з кожным годам. Бажэну Немцаву, прыгожую, таленавітую, кахалі многія знакамітыя мужчыны таго часу. Але гэтыя эмацыянальныя сяброўствы заканчваліся заўсёды расчараваннямі. Немцава з падрэзанымі крыламі вярталася да жорсткага, нелюбімага мужа. Літаратурная творчасць і выхаванне дзяцей былі для яе асноўнай крыніцай натхнення і тым гаючым сродкам, да якога яна заўсёды звярталася ў жыццёвых нягодах. У 1853 г. Бажэна Немцава страчвае свайго любімага сына Гінака. У 1861 г. яна згаджаецца з прапановай падрыхтаваць збор сваіх твораў, дзеля гэтага едзе ў Літамышль. Там яна вельмі пакутуе ад хвароб і нястачы. Пасля вяртання ў Прагу Немцава ў хуткім часе памірае, заўчасна састарэлая і моцна падкошаная жыццёвымі клопатамі.

Літаратурная дзейнасць Бажэны Немцавай пачыналася з патрыятычнай паэзіі, сентыментальных

вершаў пра каханне. Ранняя лірыка стваралася пад уплывам паэзіі В. Нябескага. Паступова Немцава ўсвядоміла, што яе прызванне – гэта ўсё ж такі проза.

Адной з першых у чэшскай літаратуры яна звяртаецца да жанру казкі. У 1845 г. з'яўляецца зборнік "Народныя казкі і паданні", які спалучае вольную гульню пісьменніцкай фантазіі, фальклорныя матывы, этнаграфічную дакладнасць. Адчуваецца ў ім і ўплыў нямецкай літаратурнай школы. Побыт у Дамажліцах, успаміны з жыцця ў родных Раціборжыцах, практычны і эмацыянальны вопыт збірацелькі фальклору – усё гэта паспрыяла таму, што яскравая вобразнасць, рамантычны тон казак захапілі і чытачоў, і крытыкаў. Загаварылі пра арыгінальны талент Бажэны Немцавай. Усяго за наступныя тры гады выходзіць шэсць зборнікаў чароўных, побытавых і сатырычных казак аўтаркі. Адчувальна цудоўнае пачуццё мовы Немцавай. Яе творы вылучаюцца лаканізмам, жывасцю, што адрознівала яе ад многіх тагачасных чэшскіх пісьменнікаў. Казкі насычаны прыказкамі, прымаўкамі, якія арганічна зліваюцца з аўтарскай мовай.

Далей з-пад пяра чэшскай пісьменніцы выйшлі цыклы нарысаў "Карціны дамажліцкіх ваколіц" (1845 – 1846), "Лісты з Францішкавых Лазняў" (1846), "З Дамажліц" (1847). Творы змяшчалі ў сабе багаты этнаграфічны матэрыял. Бажэна Немцава засяродзіла сваю ўвагу на духоўным развіцці сялян, з лёсам якіх яна звязвала будучыню чэшскай нацыі. Пісьменніца гаворыць пра паэтычны вобраз мыслення, шчырасць, працавітасць, вальналюбства ходаў. У сваіх нарысах Немцава абапіралася на жывую народную мову. Аповед пра гісторыю і эканоміку краю чаргуецца з апісаннямі побыту, прыроды, нацыянальных характараў, з жывымі жанравымі сцэнамі і згадкамі пра казкі, паданні і легенды. Казкі і нарысы прадэманстравалі тэндэнцыю да рэалістычнага адлюстравання рэчаіснасці і сталі своеасаблівай літаратурнай майстэрняй, этапам на шляху да прозы 50-х гг. XIX ст.

Апавядальніцкая проза Немцавай пачынаецца з невялікіх навелістычных замалёвак, матэрыял для якіх яна брала з уражанняў ад побыту ў Дамажліцах. У сваіх апавяданнях пісьменніца праявіла назіральнасць, незвычайную пачуццёвасць, разуменне складанасці чалавечай натуры. Немцаву цікавіць не толькі тое, які ёсць чалавек, але і чаму ён такі, як паўплывалі на яго пэўныя абставіны, асяроддзе. Чэшская аўтарка адной з першых спрабуе сілы ў жанры рэалістычнага апавядання пра вёску, некаторыя яе персанажы нагадваюць герояў казак. Трэба прыгадаць апавяданні "Доўгая ноч", "Вясковая карцінка", у якіх Немцава свядома пазбягае стварэння сентыментальна-рамантычных вобразаў, паэтызуе ўсё жывое і яскравае ў народзе, выкарыстоўвае дакладныя рэалістычныя дэталі.

Бажэна Немцава прадставіла ў сваіх творах шмат запамінальных жаночых вобразаў. У аповесці "Барушка" (1853) на фоне жыцця вялікага горада даецца гісторыя дзяўчыны з цёмным сацыяльным мінулым. Аповесць "Сёстры" (1854) – гэта шчымлівы аповед пра лёс сялянскай дзяўчыны, якую спакусіў пан. Тыповы для старой вёскі канфлікт вырашаецца ў межах рамантычнай схемы: супрацьпастаўляюцца два сацыяльныя асяроддзі, дзве псіхалогіі. Прысутны і матыў помсты. У "Разарцы" (1855) распавядаецца пра няшчасную, абдзеленую жыццём дзяўчыну з надзвычай беднай сям'і. Гераіня, аднак, не скарылася перад лёсам, яна мае высакароднае сэрца. Аповесць "Карла" (1855) будуецца на незвычайным сюжэце: сялянка дзеля таго, каб выратаваць сына ад рэкрутчыны, выдае яго за дзяўчынку. Адпаведна ўзнікае шэраг драматычных сітуацый. Аповесць "Дзікая Бара" (1856) узнікае пад уплывам "Маленькай Фадзеты" Жорж Санд. У творы паказаны канфлікт паміж Барай, дачкой рана аўдавелага пастуха, і прымхлівымі сялянамі, якія вераць, што Бару падкінула яе матцы міфалагічная "палудніца". Бара паказана вольнай ад забабонаў, блізкай да прыроды асобай. Пад уплывам такіх жыццёвых абставін у яе фарміруецца моцны і незалежны характар. Немцава праз вобраз сваёй гераіні паказвае ідэал чалавека, вольнага ад патрыярхальных забабонаў і ў той жа момант не закранутага буржуазнамяшчанскімі недахопамі.



***Алена Уладзіміраўна Вострыкава*** *– літаратуразнаўца, перакладчык. Кандыдат філалагічных навук (1998). Дацэнт кафедры славянскіх літаратур Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Закончыла філфак БДУ (1994) і аспірантуру пры гэтай навучальнай установе (1997).*

У згаданых творах чэшскай пісьменніцы шмат сумных і трагічных карцін, але ўсё ж такі перамагае светлы пачатак, што можна патлумачыць канцэпцыяй аптымізму нацыянальнага жыцця Немцавай. Яна была ўпэўнена, што аснову гісторыі складае менавіта жыццё народа, ад якога і залежыць будучыня ўсёй нацыі. Яна свядома паэтызуе народныя характары, бачыць у чалавеку з народа носьбіта нацыянальнай ідэі, увасабленне гуманізму і маралі. Названыя аповесці насычаны фальклорна-этнаграфічнымі дэталямі. У мове персанажаў скарыстоўваюцца дыялектныя асаблівасці, што сведчыць пра багацце і разнастайнасць прымененых рэалістычных прыёмаў.

Бажэна Немцава была прыхільніцай мірнага адраджэння сваёй краіны. Яе творы сведчаць пра захапленне утапічнымі сацыялістычнымі ідэямі. У 1848 г. яна нават уступіла ў "Чэшска-мараўскае брацтва", заснаванае манахам Клацэлам, які верыў у магчымасць спалучэння ўсеагульнага шчасця і нормаў евангелічнай маралі.

У часы цяжкіх матэрыяльных нягод і жыццёвых выпрабаванняў, калі Немцава сама цяжка хварэла, калі яна страціла сына Гінака, была жорстка расчараваная ў людзях, у 1853 – 1854 гг. пісьменніца малявала суцяшальныя малюнкі свайго дзяцінства, роднага краю, дзе ў цэнтры ўсяго быў вобраз яе бабулі. Наведванне род-

ных мясцінаў спрыяла ўзмацненню прыродаапісальнага складніка твора. Захапленне этнаграфіяй і фальклорам у дамажліцкі перыяд увасобілася ў рамане "Бабуля", у якім даюцца карціны вясковага жыцця, апісваюцца ўсе народныя святы і звычаі на працягу каляндарнага года. Кніга ўбачыла свет у 1855 г. "Бабуля" – адна з самых вядомых кніг у гісторыі чэшскай літаратуры. Яна перакладзена амаль на ўсе славянскія, а таксама на нямецкую, англійскую, французскую і венгерскую мовы. У 2007 г. намаганнямі беларускай перакладчыцы Ніны Барысаўны Рашэтнікавай "Бабуля" з'явілася ў цудоўным перакладзе на беларускую мову.

Твор пісаўся пад уплывам ідэалізаваных успамінаў пісьменніцы пра лёс сям'і Панклавых у Раціборжыцах, пра яе бабулю Магдалену Новатну, пра замкавае атачэнне. Адносіны Барункі да бабулі, стаўленне самой бабулі да навакольнага свету, людзей у рамках гадавога колазвароту і звязаных з ім народных звычаяў вызначаюць дзеянне рамана. Дарэчы, у даследчыкаў няма адзінай пазіцыі наконт вызначэння жанру твора – аповесць або раман. Эмацыянальны фон кнігі цалкам светлы і аптымістычны. Чэшская пісьменніца прадставіла ў "Бабулі" шэраг незабыўных вобразаў, галерэю чалавечых тыпаў, сцэн з народнага жыцця. Паказана шчымлівае стаўленне сялян да роднай прыроды. Рамантызм Немцавай увасобіўся ў апісанні постаці Вікторкі, драматычны лёс якой надае своеасаблівую дынаміку аповеду. Арыстакратычныя, шляхецкія слаі грамадства паказаны праз вобраз княгіні, які падаецца як дастаткова ідэалізаваны. Адначасова трэба адзначыць акцэнтаваны аўтаркай маральна-выхаваўчы ўплыў бабулі на княгіню і цёплае, прыязнае стаўленне апошняй да людзей з народа. Твор уяўляе сабой не маналітную цэласнасць, а, хутчэй, вольнае спалучэнне шэрагу выяў. У "Бабулі" Бажэна Немцава па-майстэрску спалучыла сваю творчую індывідуальнасць і эпічную аб'ектыўнасць, прадэманстравала цікавыя этнаграфічныя назіранні і дынамічнае дзеянне, моўную віртуознасць і народную аўтэнтычнасць, маляўнічыя карціны чэшскай прыроды і незвычайнае веданне чалавечага сэрца і пачуццяў.

"Бабуля" – класічны твор чэшскай літаратуры, у якім намаляваны лірычны і велічны вобраз Чэхіі. Сучаснікі пісьменніцы ўспрынялі раман як заклік да любові і адданасці сваёй радзіме. Менавіта народ паказаны як тая сіла, што здольная адрадзіць Чэхію ў змрочныя часы нацыянальнага прыгнёту. У рамане ўвасобілася ідэя гуманнай улады, якая абапіралася б на волю народа. Гэтая вера пісьменніцы раскрываецца паказам адносін княгіні і бабулі, аповедам пра іх сумесную дзейнасць у вырашэнні мясцовых канфліктаў. Бабуля становіцца ў рамане ўвасабленнем патрыятычнага ідэалу. Гэта наватарскае рашэнне Немцавай, паколькі ніколі да таго ў чэшскай літаратуры ў цэнтры твора не стаяў вобраз простай сялянкі. Псіхалагічны аналіз у вобразе бабулі спалучаецца з апісаннем народна-нацыянальнай стыхіі. Шмат месца ў творы займаюць карціны сялянскай працы, паказаныя чэшскай пісьменніцай згодна са зменамі пор года. Падрабязна і з веданнем справы Немцава распавядае пра дажынкі, масленіцу і іншыя святы. Удалымі з'яўляюцца масавыя народныя сцэны. Не абмінула ўвагай аўтарка і драматычныя бакі жыцця: пахаванне, провады рэкрутаў.

У вобразе бабулі Немцава падкрэслівае вялікую жыццёвую мудрасць, цвярозы розум. Дэталёва падаецца партрэт старой жанчыны, яе звычкі, будзённая абстаноўка, у якой яна жыве, апісваюцца сябры і знаёмыя. Чытач разумее жыццёвую філасофію і душэўныя зрухі галоўнай гераіні. Характар бабулі раскрываецца ва ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі. Можна сцвярджаць, што вобраз падаецца ў развіцці. Падрабязна адлюстравана, пад уплывам якіх жыццёвых перыпетый склалася асоба гэтай жанчыны. Пра гэта распавядае сама бабуля. Пры стварэнні цэнтральнага персанажа Бажэна Немцава звярнулася да розных сродкаў сацыяльна-побытавай і псіхалагічнай тыпізацыі.

Поспех кнігі на радзіме пісьменніцы і прызнанне яе таленту за мяжой сведчаць пра асаблівую значнасць гэтага светлага і надзвычай добрага твора, які ўзбагачае жыццёвым вопытам, адкрывае прыгажосць, мудрасць і праўду ў чалавечым жыцці.

Пасля напісання "Бабулі" Бажэна Немцава звярнулася да стварэння цэласнай канцэпцыі рамана, які спалучаў бы характарыстыку народа і апісанне рэфармісцкіх грамадскіх тэндэнцый. Такім з'явіўся раман "Горная вёска" (1856). У ім прадстаўлены славацкія сяляне, чэшская шляхта і ходскі люд. У творы вырашаецца праблема адносін народа і шляхты. У цэнтры рамана – памешчык-патрыёт, асветнік і сацыяліст. Ён увасабляе ідэальны тып правіцеля. Шырока прадстаўлены народныя звычаі і фальклор славакаў.

Апошнія творы пісьменніцы больш сціплага памеру і маштабу. У іх уздымаюцца сацыяльныя праблемы, якія ў гэтыя часы надзвычай хвалявалі Немцаву. У аповесці "У замку і яго наваколлі" (1856) паказаны антаганізм паміж народам і панствам. Вялікая аповесць "Бедныя людзі" (1857) распавядае пра жыццё маленькага правінцыйнага гарадка. Твор прасякнуты духам хрысціянскага даравання. Шырокую панараму гарадскога жыцця малюе пісьменніца ў аповесці "Добры чалавек" (1858). У аповесці "Хаціна ля гор" (1858) адбіліся свежыя ўражанні Немцавай ад яе другога вандравання па Славакіі. Апошняй завершанай працай пісьменніцы стаў твор "Пан настаўнік" (1860). Настаўнік надзелены найлепшымі рысамі чэшскага асветніка эпохі нацыянальнага адраджэння. У творы Немцава ўвасобіла свае погляды на народную асвету.

Пасля сябе першая чэшская пісьменніца пакінула шэраг незавершаных твораў. Яна планавала напісаць некалькі раманаў, хацела выдаць казкі славянскіх народаў, распачала некалькі аповесцяў. Пакінутыя запісы сведчаць пра тое, што талент Немцавай быў на ўзлёце. Нават няскончаныя творы дэманструюць жывасць эпічнага аповеду, маляўнічасць апісанняў, шырокі моўны дыяпазон, тонкі гумар і пяшчотную паэтычнасць.

Сёння Бажэна Немцава працягвае вабіць праўдай і гуманізмам, любоўю да Радзімы і літаратурным майстэрствам. Яна належыць да тых творцаў, якія ўвабралі і віртуозна паказалі ў сваіх творах душу народа.

Мікола ТРУС

# *“УГАВАРЫЦЬ ЯГО ВЫСТУПІЦЬ – ГЭТА МАЙСТЭРСТВА”*

## ЯНКА КУПАЛА Ў ПЕШЦЯНАХ

Горад Пешцяны (*Piešťany*, пры кірылічнай транслітарацыі назвы гэтага населенага пункта сустракаюцца таксама варыянты *Пішцяны, Піешцяны, П’ешцяны*) знаходзіцца на беразе ракі Ваг, за 80 *км* ад сталіцы Славацкай Рэспублікі Браціслявы. Ва ўсім свеце Пешцяны вядомыя перш за ўсё дзякуючы курорту, які ў розныя часы наведвалі венцаносныя асобы Еўропы, індыйскія магараджы і арабскія шэйхі, славутыя дзеячы палітыкі і культуры.

Карыснае ўздзеянне пешцянскай вады і гразяў было заўважана яшчэ ў глыбокай старажытнасці. Агульнаеўрапейскую вядомасць гэта унікальная мясцовасць атрымала ўжо ў XVI ст., калі Юрай Вернгер расказаў пра будучы курорт у сваёй кнізе “Сказ пра дзівосныя воды Венгерскага каралеўства” (1549).




**Гатэль “Thermia Palace”.**

Першым дыфірамбам на лаціне “Saluberrimae Pistinienses Thermae” (“Вельмі карысны пешцянскі курорт”, 1642) праславіў тутэйшыя дары прыроды паэт Адам Траян (*Adam Trajan*, каля 1586 – ?). Сёння яго імем названа адна з крыніц тэрмальнай мінеральнай вады.

Новы час існавання Пешцян прынята адлічваць ад 1889 г., калі ўласнікі курорта Эрдэдзі, прадстаўнікі венгерскай знаці, здалі яго ў арэнду заможнай сям’і Вінтэр. Вінтэры мадэрнізавалі курорт, пабудавалі гатэлі і бальнеатэрапеўтычныя аддзяленні ў адпаведнасці з еўрапейскімі патрабаваннямі. У пачатку XX ст. паўсталі будынкі-візітоўкі курортных Пешцян: “Kursalon”, галоўная рэпрэзентатыўная гасцініца “Thermia Palace” і курортны дом у стылі мадэрн “Irma”.

Сама прырода парупілася пра спакой курорта: ён знаходзіцца па-за межамі горада, на востраве, утвораным рукавом ракі Ваг. Такая асаблівасць стала вельмі дарэчнай для прыцягнення багатых, рэспектабельных кліентаў, і не толькі для аздараўлення: у 1917 г. на тэрыторыі курорта сустрэліся аўстрыйскі імператар Карл I, кайзер Германіі Вільгельм II і балгарскі цар Фердынанд I. Тры манархі рахавалі над лёсам Першай сусветнай вайны. Галоўнае пытанне, якое тады іх займала, – актывізацыя ролі падводных лодак у ходзе вайсковых дзеянняў, вынікам якой стала ўступленне ў вайну ЗША. Да таго часу адносіцца і палітычная карыкатура, што зберагаецца ў фондах пешцянскага бальнеалагічнага музея, – Вільгельм II у ваннай, пэўна, калі падпісвае дакумент аб абвастрэнні вайны пад вадой.

Сапраўдны размах набыло жыццё курорта пасля Першай сусветнай вайны і ўзнікнення ў 1918 г. Чэхаславакіі. Людавіт і Імрых Вінтэры сканцэнтравалі ўвагу на новых інвестыцыях, маркетынгавай дзейнасці. Пабудавалі каланадны мост праз раку Ваг – славацкі ўзор функцыяналізму, добраўпарадкавалі парк. У тэрмальных азерцах набыла пастаянную прапіску далікатная госця з Паўднёвай Амерыкі, мара батанічных садоў, кветка вікторыя рэгія, якая стала прыгожай любіміцай курорта.

Істотна пабольшаў спіс выдатных гасцей пешцянскага курорта: лаўрэатка Нобелеўскай прэміі пісьменніца Сельма Лагерлёф, дыпламат Ян Масарык, кампазітар Франц Легар, пісьменнік Яраслаў Гашак і многія іншыя. Пастаянны госць Пешцян сусветна вядомы мастак, класік мадэрну Альфонс Муха на знак удзячнасці за лячэнне дачкі ў 1932 г. падараваў курорту сваю карціну пад назвай “Слаўся, добраславёная крыніца здароўя!”, яна і зараз упрыгожвае рэстаранную залу гатэля “Thermia Palace”.

Славацкая інтэлігенцыя хутка зразумела, што Пешцянам недастаткова быць толькі добрым курортным горадам. Гасцям, дастаткова заможным і даволі ўплывовым, трэба прапанаваць цікавае і годнае баўленне часу. Паколькі тутэйшыя гаючыя мясціны ўжо даўно аблюбавалі людзі з усёй Еўропы, у горадзе склаліся выдатныя ўмовы для ўмацавання міжнароднага супрацоўніцтва, папулярызацыі нацыянальных культурных здабыткаў. У Пешцянах атабарылася так званая мастацкая калонія, прадстаўнікі якой (Янка

*Звесткі пра аўтара змешчаны ў № 1.*

*З леташняга красавіцкага нумара “Роднага слова” друкуецца цыкл матэрыялаў Міколы Труса пра паездку савецкіх пісьменнікаў і журналістаў у Славакію. Удзельнічаў у той паездцы і Янка Купала. Чытачы пазнаёміліся з артыкуламі “Янка Купала ў Славакіі. Пачатак знаёмства” (2007, № 4), “Браціслава вітае ганаровых гасцей” (2007, № 10), “Янка Купала і Людавіт Штур: рэха знаёмства са славацкай Модрай” (2008, № 3).*



***Альфонс Муха*. Слаўся, добраславёная крыніца здароўя!** Пачатак 1930-х гг.

Алексы, Людавіт Ілечка і іншыя) арганізоўвалі выставы новага славацкага мастацтва.

У кастрычніку 1935 г. Пешцяны рыхтаваліся сустрэць місіянераў міру з краіны, што ў змененым пасля Першай сусветнай вайны свеце адыгрывала адну з ключавых роляў.

Нягледзячы на тое, што візіт дэлегацыі савецкіх журналістаў і пісьменнікаў і так праходзіў на дзяржаўным узроўні, пешцянцы выявілі высокі краёвы патрыятызм і арганізаванасць.

Газета "Ľudový denník" 16 кастрычніка 1935 г. паведаміла пра тое, што народная сацыялістычная арганізацыя "Страж свабоды" (*Stráž slobody*) выступіла з заклікам да ўсіх сацыялістычных партый, у тым ліку камуністычнай, аб'яднаць сілы, каб годна сустрэць савецкіх пісьменнікаў і журналістаў. "Страж свабоды" прапанаваў прывітаць гасцей перад муніцыпальным будынкам, каб як мага больш жыхароў Пешцян маглі паўдзельнічаць ва ўрачыстым мерапрыемстве, паколькі для ўлад і кіраўніцтва курорта ўжо даўно стала заганнай звычкай прыхоўваць сваіх ганаровых кліентаў ад вачэй паспалітага люду адразу на курортным востраве. Адной з культурна-асветніцкіх ініцыятыў была таксама арганізацыя лекцыйнага вечара ў гонар гасцей з Савецкага Саюза, куды планавалі запрасіць і прадстаўнікоў чэхаславацкай арміі. Для сустрэчы майстроў пяра абралі дэпутацыю працоўных.

"Ľudový denník" у гэтым самым нумары надрукаваў таксама прывітанне савецкім гасцям ад работніка чыгункі ўчастка "Жыліна – Горна Штубня". Яго імя не называлася. З ліста прадстаўніка славацкага пралетарыяту цытаваліся наступныя радкі: "*Гэтым разам прыедуць да вас пісьменнікі і журналісты з СССР, перадайце ім таварыскае прывітанне ад нашага краю. Нас вельмі парадавала б, каб яны глыбей пазнаёміліся з нашым краем, і тады яны адчулі б крык сацыяльнай беднаты Славакіі*".

20 кастрычніка 1935 г. названая газета давала справаздачу пра арганізацыю сустрэчы. Сярод іншага паведамлялася: «*Ужо тыдзень перад прыездам савецкіх гасцей праходзілі вялікія прыгатаванні, і гэта не толькі прыгатаванні тых, каму належала афіцыйна прывітаць гасцей, але і ўсёй прагрэсіўнай інтэлігенцыі і працоўных. Нашым гасцям не бракавала гарачага вітання. Ужо ў панядзелак вечарам у гонар гасцей быў наладжаны лекцыйны вечар пра літаратуру і міралюбную палітыку СССР. У перапоўненым тэатры чыталі свае паведамленні пісьменнік Гейза Вамаш, інж. Фігуш і праф. Ант. Недвед. Моцнымі воплескамі віталіся высновы ўсіх выступоўцаў, якія пераканальнымі фактамі даказвалі магутнасць сацыялістычнай справы.*

*У сераду ад абеду ў горадзе напагатове чакалі масы працоўных, каб прывітаць сваіх гасцей. Да апошняй хвілі ніхто не ведаў, калі і як яны прыбудуць, таму працоўныя занялі ўсе падыходы да курортнага вострава.*

*Калі госці толькі пад'язджалі, то былі здалёк пазнаныя, і пакуль аўтобус даехаў да Термія Паласу, там ужо сабраліся натоўпы людзей, з грудзей якіх вырываўся "Інтэрнацыянал", а пазней і магутныя авацыі з выкрыкамі "Няхай жыве Савецкі Саюз!", "Няхай жывуць савецкія пісьменнікі і журналісты!" і г. д. Расчуленыя госці адказалі на прывітанні, а потым іх адабралі для афіцыйнага вітання. Да гасцей звярнуўся пан Краус і пісьменнік др. [доктар] Вамаш. Узрушаны настрой працоўных працягваўся аж да адыходу дэлегацыі*».

Пагасцяваўшы ў Святым Юры і Модры, савецкія журналісты і пісьменнікі прыбылі ў Пешцяны ўжо зацемна, на 2 гадзіны пазней, чым запланавалі. Афіцыйная сустрэча праходзіла ў зале гатэля "Thermia Palace". Гасцей прывітаў стараста горада Шындэлар (*Šindelár*). На прывітальныя словы адказаў кіраўнік дэлегацыі Кальцоў. Потым госці агледзелі дастапомнасці курортнага вострава. Як пісала газета "Slovenské národné noviny", "*асаблівую ўвагу прыцягнуў новы мост. Яны заўважылі, што дагэтуль у Расіі не маюць падобнага моста з такім выдатным архітэктанічным рашэннем, але абавязкова прымуць захады да яго пабудовы*".

Госці з савецкай краіны, ахопленай рэвалюцыйным духам сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, не маглі абысці ўвагай сімвал курорта, установлены ля ўваходу на каланадны мост з боку горада, – мужчына, што ломіць кастыль. Савецкім гасцям не магла не імпанаваць рашучасць і радасць чалавека, які, хоць і з лекавай дапамогай курорта, перамог сваю хваробу.

Падчас экскурсіі госці параўноўвалі Пешцяны з каўказскімі сернымі крыніцамі, вельмі пахвальна выказваліся наконт дасканалай арганізацыі курорта.

Увесь час не згасала цікавасць і ўвага да майстроў пяра з СССР з боку працоўных Пешцян. Газета "Ľudový denník" пісала: "*Дзе толькі маглі гасцей заўважыць, радасна іх віталі. Работніцы чакалі моманту, каб хоць яшчэ раз убачыць пісьменніцу Караваеву,*

*якая падчас прыезду горача адказвала на іх прывітанні, і падрыхтавалі ёй менш чым за паўгадзіны прыгожы букет кветак. Калі яна з'явілася на каланадным мосце, паціснуць ёй руку пацягнуліся дзесяткі мазолістых далоняў. Усіх вітаючых яна горача абдымала і цалавала са слязьмі радасці на вачах. Аб 11-й гадзіне ночы моладзь разбеглася па горадзе, каб сабраць для гасцей некалькі памятак ад пещцянскага пралетарыяту".*

Сяргей Траццякоў пасля пещцянскага і ўвогуле чэхаславацкага гасцявання прадставіў сваю версію падзей. Аналіз курортнай сістэмы краіны ён спалучыў з аналізам сацыяльна-палітычнай сітуацыі: *"Калі гаворыш, што Чэхія – гэта краіна, пад якой варушацца вулканічныя сілы, звычайна прымаюць гэта за палітычны жарт. Але ў сапраўднасці сённяшняя геалогія Чэхіі няўстойлівая і бурная. Схаваная ў недрах вулканічная энергія не толькі б'е 70-градуснымі гейзерамі Карлсбада, яна бурліць і ў Маравіі падводнымі кратэрамі на дне ракі Ваг, замешваючы гарачую цёмна-шэрую гразь знакамітаму курорту Пішцянам, на гербе якога адлюстраваны малады атлет, які ломіць аб калена ўжо непатрэбны кастыль. Гаючы глей высцілае тут дно басейнаў. <…> У спецыяльнай вітрыне стаяць палкі, кастылі, бандажы і гіпсавыя карсеты тых, для каго яны перасталі быць патрэбнымі пасля Пішцян. Гэтую рэкламную калекцыю адкрываюць кастылі знакамітай германскай кінаактрысы Жэні Портэн.*

*Амаль ва ўсіх курортных месцах Чэхаславакіі, побач з першакласнымі, разлічанымі на багатую публіку, сваю і замежную, гатэлямі і санаторыямі, вырастаюць больш простыя, але ўсё ж добра абсталяваныя здраўніцы сацыяльнага страхавання, дзе хворыя могуць атрымаць стол, пакой і лячэнне за адносна невысокую плату. Але і гэтая плата па кішэні нямногім у той час, калі доўжыцца крызіснае беспрацоўе.*


*Вось чаму пустуе не толькі шыкоўны апартамент, дзе жыў, лечачыся, цар Фердынанд балгарскі, але і многія пакоі таннай здраўніцы".*

Кіраўніцтва курорта ў гонар гасцей давала вячэру. На ёй ад імя акругі вітаў прысутных намеснік акруговага начальніка, камісар паліцэйскага ўпраўлення Мінарык. Ад імя браціслаўскага філіяла Сіндыката чэхаславацкіх журналістаў слова трымаў краёвы дэпутат Корман. Пісьменнік і мастак Янка Алексы ў сваім выступленні засяродзіў увагу на гісторыі сувязяў славакаў і рускіх. Пісьменнік Эла Шандар падзякаваў за візіт у Славакію прадстаўнікам украінскага і беларускага народа, г. зн. Мікітэнку, Тарану і Купалу.



**У першым радзе сядзяць (злева направа) Л. Вінтэр, Г. Васількоўскі, М. Кальцоў, А. Талстой, жонка М. Кальцова (?), Г. Караваева, С. Траццякоў. За С. Траццяковым стаіць Я. Алексы. У трэцім радзе другі злева Э. Шандар, Я. Купала – у другім радзе ў цэнтры, за А. Талстым.**
Здымак з фондаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

У пераказе дэталяў урачыстай вячэры газета "Slovenský deník" заняла палітэсна вытрыманую, стараннюю пазіцыю: *"Ад імя дэлегацыі слова мелі 7 выступоўцаў. Пісьменніца Караваева зноў адзначыла стараннасць славацкага народа, выказала ўдзячнасць пещцянскаму курорту і прапанавала тост за далейшае развіццё ўзаемных сувязяў. Пісьменнік Фадзееў прапанаваў тост за пісьменніка Алексы. Аляксей Талстой прапанаваў тост за чэхаславацкіх жанчын, якія нараджаюць працавіты, прыстойны народ. Намеснік старшыні загранічнага камісарыяту Барыс Міронаў – за пані Паўлаву і самога пасла Паўлава. Старшыня дэлегацыі Кальцоў прапанаваў тост за дзяржаўных суправаджальнікаў дэлегацыі. Пісьменнік*



**Урачыстая вячэра ў рэстаране гасцініцы "Thermia Palace". Янка Купала ў глыбіні залы па другі бок стала. Леваруч ад яго Г. Вамаш, Г. Васількоўскі (чытае паперу).**



**Каланадны мост праз раку Ваг.**

*Мікітэнка ў сваім пешцянскім выступе жадаў, каб не забываліся, што Савецкі Саюз – гэта не толькі Расія, яго ствараюць і іншыя народы, якія цяпер, у параўнанні з царскай Расіяй, свабодныя і раўнапраўныя. Па-беларуску сказаў тост пісьменнік Купала".*

Іншыя выданні пры апісанні нюансаў вячэры былі больш раскаваныя. На асаблівую ўвагу фельетаністаў пашанцавала пісьменніку і мастаку Янку Алексы, культавай асобе славацкай культуры міжваеннага перыяду, аднаму з ініцыятараў стварэння ў Пешцянах "мастацкай калоніі": *"Тут нам мастак і літаратар нарэшце прадставіўся як гісторык. Савецкія журналісты, магчыма, не праявілі вялікай цікавасці да гэтай нашай гісторыі, але нам, аднак, карысна запомніць яе для сябе".*

Аляксея Талстога, відаць, яшчэ з пачатку падарожжа па Чэхаславакіі асабліва палюбілі за каларытнасць фігуры, дасціпнасць гумару. Калі аўтар гэтых радкоў знаёміўся з газетнымі матэрыяламі таго часу, у яго склалася ўражанне, што журналісты, па сутнасці, "палявалі" на яго досціпы. Так было і гэтым разам: *"Ну, а скончылася вітаннем славацкіх жанчын. Зноў вызначыўся гэты наш дарагі Талстой, які ў Пешцянах прапанаваў тост за здароўе чэхаславацкіх жанчын, каб і надалей радзілі вялікіх сыноў".*

Надзвычай жывое апісанне ўрачыстага вечара прапанавала чытачам газета "Slovenské národné noviny": *"Вячэра, якую давалі ў гатэлі "Тэрмія", была вельмі вясёлай. Да стварэння адпаведнага настрою спрычыніліся цыганская музыка, Эла Шандар і Міхал Корман. Госці папрасілі выканаць славацкія песні і закупілі вялікую колькасць нот. Некаторыя з іх танцавалі і чардаш. Іх выступленні былі гарачымі. Найбольшае ўражанне зрабіла прамова Івана Мікітэнкі, пісьменнік сказаў, што хоць яны не доўга ў Славакіі, але адчуваюць тут сябе як дома, і ўсё дзякуючы сардэчнаму прыёму, што быў такі, як толькі можна пажадаць: без вялікіх пышнасцяў і фармальнасцяў, гасціннасць была шчырай – сапраўды славянскай. На вячэры слова меў і паэт-беларус Янка Купала, якога ўгаварыць выступіць, як казалі астатнія ўдзельнікі, – гэта майстэрства".*

Перад самым ад'ездам працоўныя горада перадалі кіраўніку дэлегацыі М. Кальцову вышываную карціну, адна работніца падаравала прыгожую пешцянскую вышыўку, а для пешцянскага пралетарыяту дэлегацыя пакінула ў падарунак гліняны збан з надпісам "Слава труду!".

А 24-й гадзіне дэлегацыя на цягніку адправілася ў Высокія Татры.

Праз 2 тыдні пасля дэлегацыі савецкіх журналістаў і пісьменнікаў курорт у Пешцянах наведаў інкогніта былы балгарскі цар Фердынанд са світай. Апошні раз ён быў тут 18 гадоў таму разам з кайзерам Вільгельмам II і імператарам Карлам I. Невядомы журналіст газеты "Slovenský deník" у сваёй рэтраспектыве былых гістарычных падзей з гэтай нагоды не без іроніі напісаў: *«У памятнай кнізе гатэля "Thermia Palac" ёсць ад таго часу тры подпісы: "Vilhelm Rex Imperator", "кароль Карл" і трэці подпіс "граф Муранскі". Калі б графолаг гэтыя подпісы падверг экспертызе, то абавязкова б ахарактарызаваў дрыжачы рукапіс Вільгельма як сейсмограф душэўнай буры і патрасенняў. Пад яго подпісам сціпла мнуцца подпісы Фердынанда і Карла, нібы хочуць адысці ў цень. 21 лютага Фердынанд запісаў у кнізе: "Важны час – цяжкае цярпенне". Зараз гэтую кнігу яму зноў паднеслі: задуменна глядзеў на подпісы пасля 18 гадоў».*


Падчас прагулак Фердынанд наведаў пешцянскі музей, дзе захоўваліся памяткі пра яго візіт у 1917 г., найперш карыкатура, на якой Вільгельм паказаны ў ваннай. Былы цар звярнуў увагу на славацкую этнаграфію. Фердынанд выказаў жаданне мець у сваёй калекцыі славацкі строй, папрасіў мастака, каб той намаляваў для яго партрэт славацкай дзяўчыны. Доўга затрымаўся, разглядаючы памяткі пра генерала Штэфаніка. Паглядзеў багатую музейную калекцыю. Але найбольшым захапленнем былога правіцеля, як аказалася, былі кветкі, таму яму паказалі і пешцянскі батанічны сад. Фердынанд быў шчыра здзіўлены, што вікторыя рэгія распускаецца і цвіце ў тую пару, позняй восенню.

Пасля Пешцян былы правіцель Балгарыі адправіўся ў Вену. Пэўна, у такія моманты і прыгадваецца лацінскае выслоўе "Sic transit gloria mundi" ("Так праходзіць слава свету").

А ў Пешцянах усё ішло сваім парадкам. Газета "Slovenská politika" ў канцы лістапада паведамляла пра арганізацыю падчас сезона наступнага года выстаў дакументаў да жыцця і творчасці, а таксама канцэртаў твораў трох каралёў музыкі – Л. Бетховена, Ф. Ліста, В. А. Моцарта. У Пешцянах у 1936 г. было запланавана правесці і з'езд славацкіх і венгерскіх пісьменнікаў.

Аўтар гэтых радкоў, узнаўляючы дакладнасць падзей кастрычніка 1935 г., правёў пошукавую працу непасрэдна ў Пешцянах. Вялікую дапамогу ў гэтай працы мне аказалі менеджэр курорта пані Яна Обертава (Jana Obertová), а таксама дырэктар бальнеалагічнага музея пан Уладзімір Крупа (Vladimír Krupa).

Сапраўдным адкрыццём і знаходкай стала памятная кніга гатэля "Thermia Palace" (у нашай традыцыі – кніга запісаў ганаровых гасцей). Які скарб! Яна была падрыхтавана да рэстаўрацыі, але для мяне было зроблена выключэнне, каб пазнаёміцца з ёй і зрабіць неабходныя фотаздымкі. Тут і аўтографы прэзідэнта Чэхаславакіі Эдуарда Бенеша (у кастрычніку 1935 г. ён быў яшчэ міністрам замежных спраў краіны), і славутага спевака Фёдара Шаляпіна, і прадстаўнікоў генералітэту Савецкай Арміі ў першыя дзесяцігоддзі пасля Другой сусветнай вайны, адным словам – гісторыя Еўропы ў імёнах. На адной са старонак знаходзяцца подпісы членаў дэлегацыі савецкіх журналістаў і пісьменнікаў, у тым ліку Янкі Купалы. Гэтая кніга – адна з чарговых – распачатая ў 1928 г. Тытульную старонку да яе аформіла мастачка – дачка прэзідэнта Чэхаславакіі Масарыка.



**Аўтографы дэлегацыі савецкіх журналістаў і пісьменнікаў у памятнай кнізе гатэля "Thermia Palace".** Публікуецца ўпершыню.

Пешчанскія падзеі зафіксаваны ў фотаздымках. У 2007 г. на старонках газеты "Культура" і часопіса "Полымя" ўбачылі свет публікацыі вядомага даследчыка-славіста Івана Чароты. Вольга Кухтава, дачка ўдзельніка падзей пісьменніка Эла Шандара, перадала яму шэраг фотаздымкаў пра паездку дэлегацыі савецкіх журналістаў і пісьменнікаў па Славакіі ў кастрычніку 1935 г. Некалькі фотаздымкаў яшчэ раней В. Кухтава падаравала музею Янкі Купалы ў Мінску. Матэрыялы артыкулаў паважанага прафесара аказаліся сапраўды сенсацыйнымі. Іх адкрыццё і публікацыя прыйшліся акурат на юбілейны год песняра. Да таго ж яны падкрэслілі адзін важны момант установкі даследчыцкага пошуку: няма кірункаў даследавання факультатыўных, вычарпаных, як радовішча, кожны можа таіць нечаканыя, сапраўдныя адкрыцці.

Сёння ёсць магчымасць устанавіць час і выданне першых публікацый некаторых фотаздымкаў, прынамсі аднаго. Трэці здымак, прыведзены ў гэтым артыкуле, можна ахарактарызаваць як афіцыйны, на якім члены савецкай дэлегацыі разам са сваімі славацкімі калегамі, прадстаўнікамі дыпламатычных службаў і мясцовых улад зняты ля ўваходу ў "Thermia Palace". Упершыню гэты здымак апублікаваны ў газеце "Slovenský deník" 22 кастрычніка 1935 г. Пад ім зроблены наступны запіс: *"Савецкія журналісты ў Пешцянах. Дэлегацыя савецкіх журналістаў завітала і ў Пешцяны, дзе яны былі гасцямі кіраўніцтва курорта. На нашым здымку ў першым радзе пасярэдзіне Ал. М. Талстой, каля яго справа кіраўнік дэлегацыі рэд. Кальцоў, а злева яго жонка. Апошні справа ген. дырэктар Л. Вінтэр"*.

Інтэр'ер рэстараннай залы гатэля "Thermia Palace" і сёння захоўвае першапачатковы выгляд, ашчадна зберагаюцца і іншыя дастапомнасці славутага на ўвесь свет пешчанскага курорта. Не пашчасціла толькі каланаднаму мосту – у гады Другой сусветнай вайны яго моцна пашкодзілі. Сёння ён узноўлены з некаторымі адхіленнямі ад першапачатковай аўтарскай задумы.

Аўтару гэтых радкоў быў аказаны гонар пакінуць свой запіс у чарговым, новым экземпляры памятнай кнігі. З думак, што не ўвайшлі тады ў мой тэкст, хочацца зафіксаваць наступнае: такія мясціны, як курортныя Пешчаны, акрамя цудоўнага ўздзеяння на арганізм чалавека, маюць яшчэ адну унікальную асаблівасць – карэкціраваць, узнаўляць забытыя асклепкі гістарычнай памяці народа.

*Працяг будзе.*

**Спіс літаратуры**

**Чарота, І.** Неспадзяваная рэтраспекцыя замежнай паездкі песняра / І. Чарота // Культура. – 2007. – 1 – 7 верасня. – С. 20 – 22.

**Чарота, І.** Янка Купала ў Славакіі / І. Чарота // Полымя. – 2007. – № 7. – С. 114 – 118.

**Третьяков, С.** Страна-перекресток / С. Третьяков // Огонёк. – 1936. – № 21. – С. 8 – 10.

**ak.** Dva dni so sovietskymi novinármi // Slovenský deník. – 1935. – 19. okt. – S. 2.

Ako rozhodli osud svetovej vojny traja monarchovia v salóne piešťanského hotelu Thermia // Slovenské národné noviny. – 1935. – 9. nov. – S. 3.

**ak.** Veľké prípravy Piešťan na sezónu 1936 // Slovenská politika. – 1935. – 28. nov. – S. 4.

**ak.** Veselý večer s ruskými spisovateľmi // Slovenské národné noviny. – 1935. – 19. okt. – S. 4.

Bulharský excar na Slovensku. (Z jeho pobytu v Piešťanoch) // Slovenský deník. – 1935. – 9. nov. – S. 4.

Encyklopédia slovenských spisovateľov. Zväzok 1 – 2. – Bratislava : Obzor, 1984.

Malá Encyklopédia Slovenska. – Bratislava : Veda, 1987.

Pozdrav robotnika sovietskym spisovateľom // Ľudový denník. – 1935. – 16. okt. – S. 1.

**rk.** Cesta ruských novinárov a spisovateľov po Slovensku // Slovenský deník. – 1935. – 18. okt. – S.1.

Ruskí hostia v Bratislave // Slovenský deník. – 1935. – 17. okt. – S.1.

Slovník slovenských spisovateľov 20. storočia. – Bratislava : Slovenská národná knižnica, 2001.

Sovietski hostia v Piešťanoch // Ľudový denník. – 1935. – 20. okt. – S. 2.

Sovietski novinári v Piešťanoch // Slovenský deník. – 1935. – 22. okt. – S.3.

**Uhrin P.** Literárny sprevodca po Slovensku. – Bratislava : Šport, vydavateľstvo SV ČSTV, 1966.

Za dôstojné vitanie sovietských hosťov // Ľudový denník. – 1935. – 16. okt. – S. 1.

Дзмітрый БУГАЁЎ

# ПРАЎДАЛЮБСТВА СІЛКАВАЛА ЯГО ТАЛЕНТ

## АСАБЛІВАСЦІ ПРОЗЫ І ДРАМАТУРГІІ ІВАНА ЧЫГРЫНАВА

Іван Гаўрылавіч Чыгрынаў належыць да пісьменнікаў глыбінных, тых, якія глядзелі на народнае жыццё без афіцыёзнай прадузятасці, бачылі ў ім і вялікія патэнцыі, і праявы бязладдзя, якое ішло ад чыноўніцка-бюракратычнага ўладарства над чалавекам працы. Пра ўсё гэта Іван Чыгрынаў імкнуўся пісаць рэалістычна, пазбягаючы прасталінейнасці і спрашчэння. Гэтага вымагала ягонае праўдалюбства, вельмі арганічнае і добра прыкметнае ва ўсёй знешне някідкай чыгрынаўскай творчасці.

Галоўным пісьменніцкім набыткам у прозе Іван Чыгрынаў лічыў свае буйныя творы пра жыццё і барацьбу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны – раманы "Плач перапёлкі", "Апраўданне крыві", "Свае і чужынцы", "Вяртанне да віны" і "Не ўсе мы згінем".

Разважаючы пра тое, як яны ў яго нарадзіліся, пісьменнік зазначаў, што ў літаратуры пра вайну ён бачыў *"мала народнага жыцця, якое тады было"*. Не хапала ў ёй *"жывога жыцця, жывых людзей"*. А ў выніку ўзнікла трывалае ўсведамленне: *"Маю нейкае права, нейкі доўг, абавязак і перад маімі землякамі, і перад усім маім народам – паказаць гэты народ, расказаць пра яго, расказаць не спяшаючыся, шырока і грунтоўна, галоўнае – праўдзіва"*. Гэтую задачу ён выканаў вельмі паспяхова. Нездарма ж М. Танк казаў, што ў чыгрынаўскіх раманах *"праўда вайны і змагання з ворагам выяўлены глыбінна, на філасофскім узлёце думкі і мастацкага пісьма"*.

Але праўдалюбства накіроўвала пісьменніцкае пяро і ў самых ранніх празаічных творах, якія вызначаюцца сваёй рэалістычнасцю, скіраванасцю на адлюстраванне сапраўднага жыцця ў яго натуральных праявах.

А яго пісьменнік удумліва пазнаваў яшчэ з дзяцінства. Яно ў Івана Чыгрынава было вельмі нялёгкім. Хлопец нарадзіўся 21 снежня 1934 г. у вёсцы Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна. (У чыгрынаўскіх творах яна падаецца пад назвай Верамейкі. Сапраўдныя Верамейкі таксама ёсць. Яны – у Чэрыкаўскім раёне.) Іванаў бацька быў старшынёю сельсавета. Заняты грамадскімі справамі, пра сям'ю ён клапаціўся мала, а потым і зусім пакінуў яе. Дзяцей гадавала маці, Хадоска Ігнатаўна, Гаўрыліха ці старшыніха, як яна называецца ў раманах пісьменніка. Яна зберагла дзяцей і ў час гітлераўскай акупацыі, калі небяспека падсцерагала людзей на кожным кроку.

Тады хлапчук у дадатак да ўсяго захварэў на брушны тыф. Іванка *"выжыў, але змены, якія адбыліся ў арганізме, засталіся назаўсёды"*, – прыгадала, спасылаючыся на дактароў, жонка пісьменніка Людміла Прохараўна. Яна ж падкрэслівала, што хлопцу нямала давялося пабедаваць і ў цяжкія пасляваенныя гады: *"Іван хадзіў у школу босы да самай зімы. Піліпаўкай толькі абуваўся ў лапці"*.

Вучыўся ён спачатку ў Вялікім Бары, дзе скончыў сем класаў, потым у Саматэвічах. Там ён завяршыў сярэднюю адукацыю і ў 1952 г. паступіў у Белдзяржуніверсітэт на філфакаўскае аддзяленне журналістыкі. Пасля БДУ працаваў на рэдактарскіх пасадах у выдавецтве Акадэміі навук Беларусі, у часопісе "Полымя", у 1975 – 1986 гг. уваходзіў у склад кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў Беларусі. З 1986-га да 1990-га быў дэпутатам Вярхоўнага Савета рэспублікі. З 1987-га да канца сваіх зямных дзён (смерць скасіла яго 5 студзеня 1996 г.) – кіраўнік Беларускага фонду культуры. У 1989 г. стаў яшчэ і галоўным рэдактарам часопіса "Спадчына". У складзе беларускай дэлегацыі прымаў удзел у рабоце XXXIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1978). У тыя гады і трохі пазней шмат ездзіў па свеце, бачыў, па ягоных словах, *"мноства рэк, такіх, як Ніягара, Гудзон, Вісла, Дунай, Днепр, Амур і Усуры"*. Ён быў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі рэспублікі (1974), народным пісьменнікам Беларусі (1994), ганаровым доктарам БДУ (1995).

Літаратурную працу пачынаў з вершаў. Яшчэ школьнікам друкаваў у раённай газеце свае паэтычныя творы. Іх чытаў яго зямляк, выдатны беларускі паэт А. Куляшоў. І яны падабаліся яму. У студэнцкія гады чыгрынаўскія вершы публікаваліся ў абласной газеце "Магілёўская праўда" і ў рэспубліканскіх перыядычных выданнях.

Але паэтычны сверб у Івана Гаўрылавіча надоўга не зацягнуўся. Сваё сапраўднае прызванне ён знайшоў у прозе і драматургіі. Ужо ў 1961 г. у перыядычным друку з'яўляюцца яго апавяданні. А потым выходзяць і кнігі вельмі арыгінальных і глыбокіх твораў гэтага жанру – "Птушкі ляцяць на волю" (1965), "Самы шчаслівы чалавек" (1967), "Ішоў на вайну чалавек" (1973). Чыгрынаўскія апавяданні вызначаюцца рэалістычнасцю, увагай пісьменніка да жыцця простых людзей, разуменнем іх штодзённых клопатаў і турбот, а яшчэ псіхалагічнай насычанасцю, гуманістычнай скіраванасцю, адметнасцю моўнага каларыту з выразнымі слоўнымі фарбамі Магілёўшчыны.

Некаторыя майстры беларускай прозы называлі Івана Чыгрынава самым лепшым нашым апавядальнікам. У такіх вызначэннях заўсёды ёсць прысмак суб'ектыўнасці. Але тое, што цэлы шэраг чыгрынаўскіх апавяданняў мае ўсе прыкметы класічнай бездакорнасці, не выклікае сумненняў.

Высокай дасканаласцю вызначаецца і апавяданне "Дзівак з Ганчарнай вуліцы". Яго першапачатковая назва – "Птушкі ляцяць на волю". Упершыню яно апублікавана ў газеце "Літаратура і мастацтва" 28 ліпеня 1961 г. Такім чынам, з надрукаваных гэта самае першае чыгрынаўскае апавяданне. Напісана яно бадай што бездакорна. Хораша намаляваны тут вобраз старога лесніка Дземідзёнка, праз лёс якога ўзнаўляюцца балючыя рэаліі мінулай вайны, яе незагойныя раны. Дземідзёнак знешне выглядае звычайна, можна сказаць – непрэзентабельна. Ён зведаў нямала пакут. У ваенныя гады быў звязаны з партызанамі. Спачатку даваў ім прытулак у сваёй леснічоўцы, а з наступленнем халадоў наведваўся да іх у зямлянкі, выкапаныя за возерам, якое чамусьці

***Дзмітрый Якаўлевіч Бугаёў*** *– крытык, літаратуразнаўца. Прафесар філалогіі (1989). Закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1952), аспірантуру пры Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага (1955). Працаваў старшым выкладчыкам Мазырскага педагагічнага інстытута (1955 – 1959), малодшым, а потым старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларусі (1959 – 1964). З 1964 г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце на пасадзе дацэнта, з 1987 г. – прафесара кафедры беларускай літаратуры (цяпер беларускай літаратуры і культуры).*

*Аўтар шматлікіх артыкулаў у розных выданнях, у тым ліку замежных, кніг "Шчодрае сэрца пісьменніка" (1963), "Паэзія Максіма Танка" (1964, 2-е выд. 2003), "Уладзімір Дубоўка" (1965, 2-е выд. 2005), "Максім Гарэцкі" (1968, 2-е выд. 2003), "Шматграннасць" (1970), "Зброяй сатыры, зброяй праўды" (1971, 2-е выд. 2004), "Вернасць прызванню" (1977), "Талент і праца" (1979), "Чалавечнасць" (1985), "Васіль Быкаў" (1987), "Арганічнасць таленту" (1989), "Праўда і мужнасць таленту" (1995), "Спавядальнае слова" (2001), "Служэнне Беларусі" (2003) і інш.*

*Удзельнічаў у стварэнні навуковай гісторыі беларускай літаратуры, выдадзенай у 1960-я гг., падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па беларускай літаратуры для студэнтаў ВНУ і вучняў сярэдніх школ. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1961 г., Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1984).*



называлася Мёртвым. Гітлераўцы даведаліся пра ягоныя кантакты з партызанамі і запатрабавалі, каб стары ляснік паказаў іх лагер. Мужны чалавек адмовіўся. Два тыдні катаванняў не зламалі яго волі. Фашысты ўрэшце адпусцілі старога. Але за гэты час бясследна прапала яго ўнучка Аленка, якую напярэдадні акупацыі прывяла да дзеда Дземідзёнкава гарадская дачка, спадзеючыся, што малая перабудзе ліхія часы ў лясным зацішку. Спадзяванні аказаліся марнымі: у сваёй халоднай леснічоўцы Дземідзёнак знайшоў толькі скалелую сініцу. Яна ў яго свядомасці асацыіруецца з вобразам згубленай унучкі. Таму Дземідзёнак не можа бачыць птушак у клетках. Ён ужо пасля вайны купляе іх за грошы са сваёй пенсіі і выпускае на волю. Так людское высакародства сутыкаецца з карыслівасцю тых, хто птушак прадае, адлоўліваючы іх для гэтай мэты.

Дземідзёнак любіць прыроду, імкнецца жыць у гармоніі з ёю. Ён прыхільна ставіцца да народных традыцый, любіць працу, парадак ва ўсім. На новым месцы жыхарства (старое пакінута, каб не вярэдзіць штохвілінна сардэчную траўму з-за страты ўнучкі) *"корпаецца то ў гародчыку, то двор падчышчае, ды і на вуліцы насупраць"*.

У апавяданні добра паказаны і стракаты бежанскі паток у пачатку вайны: *"Людзей збіралася так многа, што часам нават думалася, ці не зрушыла гэта з месца цэлага паўсвету. Людзі ішлі і ехалі ў копаці і пыле – бежанцы, чырвонаармейцы"*. Леснікова старожка *"ў тыя дні была поўна раненых"*.

Выразным атрымаўся і вобраз аўтара-апавядальніка. Ён тонка адчувае *"ціхае харастао прыроды"*, кароткімі, але яскравымі штрыхамі малюе пейзажы з зіхаценнем сонца, пахам красак у летнім паветры, ледзь чутным калыханнем блакітных званочкаў, зменлівасцю ў шуме хвояў з набліжэннем восені. Сама апавядальная манера і тут у Чыгрынава вельмі натуральная, знешне някідкая, але здольная схоплівацъ многае і ў прыродзе, і ў чалавеку, найбольш задаволеным, калі яму не перашкаджаюць быць самім сабой, радавацца жыццю.

Асобныя матывы апавядання "Дзівак з Ганчарнай вуліцы" выкарыстаны ў аднайменнай чыгрынаўскай драме, якая мае падзагаловак "Аповесць для тэатра". У канцы гэтага твора згадваецца Дземідзёнак. Ён, як і ў апавяданні, купляе птушак, выпускае на лугавым прасторы і з дзіцячым захапленнем назірае за іх вольным палётам, нібы маладзеючы ў такія хвіліны і вызваляючыся ад сваёй звыклай панурасці.

Іван Гаўрылавіч любіў драматургію, прызнаваўся, што цяга да яе жыла ў яго пастаянна. Ён выдаў ёмістую кнігу драматычных твораў "Звон – не малітва" (1993). Яна адкрываецца аднайменнай п'есай пра далёкую мінуўшчыну, пераходныя часы ад язычніцтва да хрысціянства. Гэта падкрэслена і загалоўкам. Звон жа сапраўды не малітва, але малітву ён прадвяшчае, а то і кліча на яе. Пісаў жа М. Танк у вершы "Ave Maria": *"Звон кафедральны кліча на ave"*.

З язычніцтва ў хрысціянства ідуць і дзейныя асобы чыгрынаўскага "Звона". Хрысціянства прымае вялікі князь кіеўскі Уладзімір Святаслававіч. З яго асобай звязаны ці не найбольш драматычныя павароты ў жыцці полацкай князёўны Рагнеды Рагвалодаўны. Гэта яму, яшчэ язычніку, тады ноўгарадскаму князю, які намагаўся падпарадкаваць сабе і полацкія землі Рагвалодаў, ганарыстая Рагнеда на прапанову стаць яшчэ адной з многіх яго жонак адказала: *"Не стану разуваць сына рабыні, хачу за Яраполка"*.

Яраполк – брат Уладзіміра па бацькоўскай лініі. Але *"маці ў іх былі розныя, нават з розных земляў"*, – у адпаведнасці з гістарычнай праўдай піша І. Чыгрынаў. Уладзіміра нарадзіла рабыня Малуша, а Яраполк – сын жанчыны свабоднай. І ён вёў з Уладзімірам барацьбу за кіеўскі пасад, які пэўны час і займаў. За зяця хацеў мець Яраполка і бацька Рагнеды Рагвалод. Дык Уладзімір абразы не сцярпеў. Ён забіў бацьку і маці Рагнеды, яе малых братоў, а самую прымусіў стаць жонкай. Пра гэты прымус у чыгрынаўскай драме напрамую не гаворыцца, але ён увесь час маецца на ўвазе.

Згадваецца ў творы і няўдалая спроба Рагнеды забіць жорсткага і нялюбага мужа. Яна падаецца не ў натуральных рэалістычных фарбах, а ўзнаўляецца ў свядомасці жанчыны як фантасмагорыя, насланнё.

Асаблівы драматызм гэтай падзеі надае гістарычна дакладны паварот – нечаканая абарона маці малым Ізяславам: *"Заступаючыся за маці, малы крычыць на бацьку, тупае малымі ножкамі. Здзіўлены Уладзімір адхінаецца, адступае, а тады выходзіць з усёй світай са спальні"*, у якой ён ужо наважыўся забіць жонку. Гэтую выратавальную для яе сцэну Рагнеда, якая пазбегла смерці толькі дзякуючы заступніцтву сынка, прыгадвае шмат разоў.

Вядома, Уладзімір не даравaў жонцы той яе замах. Ён пабудаваў горад на самым краі захопленай Рагвалодавай зямлі, назваў яго Ізяславам (цяперашняе Заслаўе) і пасяліў там Рагнеду з сынам. Калі Ізяслаў падрос, бацька зрабіў яго полацкім князем, прымусіўшы

прыняць хрысціянства. Ізяслаў на ўсё пагадзіўся дзеля княскага стальца ў Полацку, ужо залежным ад Кіева. Так што цану давялося заплаціць вялікую. Ды Ізяслава гэта мала бянтэжыць. Ён фактычна адмаўляецца і ад маці, якой дарогі ў Полацк няма. Што ж, прага ўлады – вялікая сіла. Была яна такой здаўна…

Моцна напісана ў Чыгрынава і лінія, звязаная з адлюстраваннем язычніцкага свету. Тут найбольш хвалюе гісторыя чыстай, цнатлівай дзяўчыны Анеі, якую язычніцкія верхаводы прыносяць у ахвяру паганскім багам. Яна мужна прымае вызначаную ёй долю, мяркуючы, што так далучаецца да святасці, ідзе да багоў…

У тэксце драмы гучыць і трошкі зменены варыянт загалоўка: "Звон – яшчэ не малітва". Гэта паварот на гаворку ўжо не пра непазбежнасць хрысціянства, а пра моц язычніцтва, якое таксама мае глыбокія карані ў народнай свядомасці. Вось слушныя думкі Рагнеды наконт гэтага: *"Святары новых рэлігій дарэмна ганяць нас, язычнікаў, маўляў, і такія мы і гэтакія… Быццам толькі і робяць, што гібеюць у дзікунстве. А нашы карагоды, нашы язычніцкія святы, напрыклад Купалле… Хто яго забудзе? Не… народ гэтага ніколі не забудзе!"* Чыстая праўда. Але і Рагнеда па загадзе князя Уладзіміра павінна прыняць веру новую, хрысціянскую. Так і да сёння хрысціянства суіснуе ў людской свядомасці з элементамі язычніцтва.

Плённа працаваў І. Чыгрынаў і як літаратурны крытык. Ягоныя крытычныя працы сабраны ў кнігах "Новае ў жыцці, новае ў літаратуры" (1983) і "Паміж сонцам і месяцам" (1994). Тут, у другой кнізе, змешчаны дзённікавыя запісы, публіцыстычныя артыкулы, аўтабіяграфія, а таксама вельмі цікавыя інтэрв'ю.

Іван Гаўрылавіч зусім слушна высока ставіў свае здабыткі на ніве літаратурнай крытыкі. Ён казаў: *"Не ацаніць належным чынам дзве свае крытычныя кнігі мне не выпадае. Вельмі карысныя кнігі для нашай літаратуры. Гэта толькі здаецца, што сёння нікому не патрэбна ні крытыка, ні сама мастацкая літаратура. На самой справе яны патрэбны і сёння, і заўтра спатрэбяцца яшчэ больш"*. Па сваім агульным узроўні крытычныя працы Івана Чыгрынава нікольк не саступаюць працам самых уедлівых навукоўцаў, а ў стылёвых адносінах, па жывасці выкладання і эмацыянальнай насычанасці пераўзыходзяць іх.

Я добра ведаў Івана Гаўрылавіча, сябраваў з ім. І гэтае сяброўства расцэньваю як адну з найбольшых удач у маім жыцці. Зберагаю цэлы шэраг кніг Чыгрынава з прыязнымі дарчымі подпісамі. Захоўваю і некалькі ягоных лістоў. Яны пераважна дзелавога характару. Але ў адным з іх ёсць і такое звернутае да мяне прызнанне: *"Мне пад табой смялей жывецца і пішацца"*. Гэткія словы прыемна перачытваць. Але ж мушу падкрэсліць, што чыгрынаўскі ўплыў на маю працу ў літаратуры быў намнога большы, чым мой на працу ягоную. Падтрымка з боку Івана Чыгрынава для мяне заўсёды была выключна важнай. Я і цяпер у складаных варунках часта ўспамінаю дабрыню і чалавечнасць Івана Гаўрылавіча, яго душэўную чуласць, уменне падбадзёрыць спагадлівым словам, пасадзейнічаць у канкрэтнай справе. І яшчэ вось што трэба адзначыць. Сам моцна хворы, ён адчуваў людскі боль вельмі востра і спяшаўся на дапамогу, калі меў магчымасць яе аказаць. А пры яго дзелавітасці і пісьменніцкай аўтарытэтнасці ён мог зрабіць і рабіў многае. Такое не забываецца.

А галоўнае, што не старэюць, не пакрываюцца пылам забыцця глыбінна праўдзівыя творы Івана Чыгрынава. Яны і сёння актыўна працуюць на ўмацаванне духоўных традыцый народа.

## КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТАЎ І ЮБІЛЕЙНЫХ ДЗЁН на 2008 г.

### ЧЭРВЕНЬ

**1 чэрвеня** – 70 гадоў з дня нараджэння Канстанціна Перапяліцы, акцёра, заслужанага артыста Беларусі

**3 чэрвеня** – 75 гадоў з дня нараджэння Васіля Давыдзенкі (1933 – 1987), празаіка

**9 чэрвеня** – 205 гадоў з дня нараджэння Адольфа Міхала Валяр'яна Юліяна Янушкевіча (1803 – 1857), падарожніка, пісьменніка

**13 чэрвеня** – 125 гадоў з дня нараджэння Натана Рубінштэйна (1883 – ?), музыканта, дырыжора, педагога, музычна-грамадскага дзеяча

**15 чэрвеня** – 70 гадоў з дня нараджэння Васіля Чайкі, мастака манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, жывапісца

60 гадоў з дня нараджэння Анатоля Бутэвіча (псеўд. Максім Валошка), дзяржаўнага дзеяча, дзіцячага пісьменніка, перакладчыка, публіцыста, крытыка

**18 чэрвеня** – 95 гадоў з дня нараджэння Фёдара Куляшова (1913 – 1993), літаратуразнаўцы і крытыка

90 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Шахновіча, майстра разьбы па дрэве

**19 чэрвеня** – 80 гадоў з дня нараджэння Васіля Ганчарэнкі (1928 – 1983), спевака, заслужанага артыста Беларусі

**20 чэрвеня** – 80 гадоў з дня нараджэння Гаўрылы Вашчанкі, жывапісца, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, народнага мастака Беларусі

70 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Аўласевіча, мовазнаўцы

**21 чэрвеня** – 100 гадоў з дня нараджэння Ігната Дзядовіча (1908 – 1937), акцёра

100 гадоў з дня нараджэння Сцяпана Майхровіча (1908 – 1981), літаратуразнаўцы, крытыка, публіцыста

100 гадоў з дня нараджэння Паўла Шыдлоўскага (1908 – 1992), дзеяча самадзейнага мастацтва, кампазітара, заслужанага дзеяча культуры Беларусі

**22 чэрвеня** – 125 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Цвікевіча (1883 – 1937), палітычнага дзеяча, гісторыка, філосафа, публіцыста

95 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Авечкіна (1913 – 1980), празаіка, дзіцячага пісьменніка

**26 чэрвеня** – 50 гадоў з дня нараджэння Таццяны Мушынскай, журналісткі, тэатральнага крытыка

**27 чэрвеня** – 95 гадоў з дня нараджэння Юрыя Рудзько (1913 – 1948), празаіка, драматурга, нарысіста

**28 чэрвеня** – 75 гадоў з дня нараджэння Юрыя Пашкіна (1933 – 1992), тэатразнаўцы

*Паводле картатэкі БДАМЛМ.*

*З юбілеем!*

Таццяна ШАМЯКІНА

# СУМЛЕННАСЦЬ І ВЕРНАСЦЬ: ЛЮДМІЛА КАРПАВА



Мы з Людмілай Уладзіміраўнай Карпавай не толькі аднагодкі і сяброўкі з нашых трох гадоў (яна нарадзілася 11 красавіка 1948 г.) – мы выхоўваліся аднолькава, паводле адных прынцыпаў, кожная – чатырма (!) бацькамі замест дваіх, мы шмат часу жылі ў адным доме, разам вучыліся ў школе, у ВНУ, у аспірантуры, разам працавалі і працуем.

Вядзецца наша знаёмства з пачатку 50-х гг. XX ст. Яе бацька Уладзімір Барысавіч, старэйшы за майго (і абодва яны – ветэраны Вялікай Айчыннай), ужо быў рэдактарам аўтарытэтнага часопіса, апекаваў маладога аўтара – Івана Пятровіча Шамякіна; дзякуючы бацькам пазнаёміліся і сем'і. Людзіна матуля Марыя Міхайлаўна да сёння ўспамінае сваю задушэўную сяброўку Машу – маю маму Марыю Філатаўну, ужо даўно нябожчыцу, моліцца за яе кожны дзень.

Людзіны бацькі працавалі, а яе прыводзілі гуляць да нас, у тагачасную нашу кватэру на рагу вуліцы Камсамольскай і праспекта Сталіна, у дом, дзе размяшчаецца кнігарня "Цэнтральная". Вечарамі па сястру прыходзіў Валодзя, старэйшы за яе на дзесяць гадоў, а Люда хавалася пад стол – не хацела ісці дадому, бо заўсёды Валодзеў прыход перапыняў нашу цікавую гульню.

Памятаю сакавік 1953 г., дзень смерці Сталіна, разгубленасць бацькоў, слёзы родзічаў, нязвыклую абыякавасць да нас, малых, а мы ўпершыню адчуваем нешта велізарнае, невядомае і небяспечнае па-за межамі нашага ўтульнага дзіцячага свету.

З перасялення ў "пісьменніцкі" дом па вуліцы Карла Маркса, 36 пачаўся наш залаты век, што супаў і з залатым векам Саюза пісьменнікаў. Нам па шэсць гадоў. Запомніліся суботнікі ў двары – навасёлы высаджваюць дрэвы і кусты. У нашых маладых вясёлых маці работа літаральна гарыць у руках. Я не хвалюся – яны сапраўды вылучаліся актыўнасцю, маладым задорам, весялосцю ды, шчыра кажучы, прыгажосцю. Марыя Міхайлаўна – больш завадатарка, мая мама – больш выканаўца, але нязменна абедзве прыцягвалі ўвагу выключнай абаяльнасцю, радасцю жыцця, што струменілася з вясёлых вачэй, – шчаслівыя маці добрых дзяцей, жонкі таленавітых мужоў.

У Карпавых – лепшы густ у абсталяванні кватэры, большы жыццёвы вопыт, багацейшая фантазія. Мае бацькі цягнуцца за імі, нешта пераймаюць. Мне заўсёды больш падабалася кватэра Карпавых, чым наша, прытым што наша па метражы перавышала. У іх – сонечная, больш утульная. Праўда, сам Уладзімір Барысавіч крытыкаваў яе вуснамі аднаго з персанажаў рамана "За годам год". Сапраўды, у двух пакоях – па шэсць ці восем вуглоў. Але затое выгляд з акна – пэўна, найпрыгажэйшы ў тагачасным Мінску: на дзецішча Лангбарда Акруговы дом афіцэраў, танк на пастаменце, Тэатральны сквер, тэатр імя Янкі Купалы, будынак ЦК КПБ. Неўзабаве Карпавы выйшлі, што і нязручныя вуглы ў пакоях можна неяк прыстасаваць. За шафай знайшоўся таямнічы куток, куды маглі пралезці толькі мы з Людай. Там, нікому не перашкаджаючы, мы на чамаданах гулялі з ляльками, шылі ім адзенне, майстравалі міні-інтэр'еры. Люда ўжо тады вызначалася выключна багатай фантазіяй і ўмелымі рукамі. Яна заўсёды была выдумшчыца: прыдумляла новыя гульні, прагнула незвычайнасці, рамантычнасці ў жыцці. Усё спрыяла гэтаму: таленавітыя бацькі, сямейная багатая бібліятэка, наш пісьменніцкі дом-камуна, агульная атмасфера жыцця, нават раён, дзе мы жылі.

У тым раёне мы пражылі незабыўныя пятнаццаць гадоў, бадай, найбольш шчаслівых у жыцці.

Наш дом, у якім большасць кватэр займалі пісьменніцкія сем'і, тады нам здаваўся велізарным, а быў усяго толькі пяціпавярховы, на тры пад'езды. Паміж другім пад'ездам, дзе я жыла на чацвёртым паверсе, і першым, дзе аказалася шмат маіх сяброў, у тым ліку Люда, можна было прайсці не толькі па двары, але і па гарышчы, і нават па падвале. Сярод нас, дзяцей, найбольшым авантурызмам і прагай прыгод вызначаўся сусед Люды, сын пісьменніка Тараса Хадкевіча, Лёня. Пад яго кіраўніцтвам мы і асвойвалі гарышча і падвал, прыдумваючы адначасова мноства гісторый пра шпіёнаў, разведчыкаў, бандытаў і розныя містычныя жахі.

У доме першапачаткова былі пліты, якія паліліся дровамі. Дрывотнікі размяшчаліся ў двары – там, дзе сёння знаходзіцца кінатэатр "Піянер". У адной з павецяў мы стварылі свой штаб (захапляліся "Цімурам і яго камандай" А. Гайдара), а атаманам у нас быў той самы Лёня Хадкевіч. Колькі неверагодных гісторый мы там напрыдумлялі! Але, між іншым, і дзей-



**Верныя сяброўкі: Людміла Карпава і Таццяна Шамякіна.** 1997 г.

нічалі – дапамагалі старым, ветэранам. Калі правялі газ і пабурылі пліты ў кухнях, то знішчылі і павеці, пачаўшы будаваць кінатэатр.

Сёння наш былы дом, які часткова заходзіць і на вуліцу Энгельса, сапсаваны "пячорай" – уваходам у метро на станцыю "Купалаўская", а тады там размяшчалася кнігарня, займаючы большую плошчу, чым сёння. Па дыяганалі да ўвахода ў кнігарню – Дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, у нашым маленстве ён якраз перабудоўваўся і ў выніку набыў той самы выгляд, які мае цяпер. Пісьменнікі і акцёры паміж сабою сябравалі, часта бывалі ў нас у гасцях, таму мы асабіста ведалі многіх знакамітых творцаў. Квартал насупраць нашага дома і адначасова насупраць тэатра, абмежаваны з чатырох бакоў вуліцамі Маркса, Энгельса, Леніна і праспектам у сярэдзіне 1950-х гг. быў амаль закончаны, толькі ўжо пасля нашага ўсялення дабудоўваўся кінатэатр "Навіны дня", цяпер гэта Малая сцэна купалаўскага тэатра. Праз вуліцу – уваход у Тэатральны сквер, афармлены неяк больш прывабна, чым цяпер. У скверы, як ні дзіўна, мы, дзеці, не вельмі часта і гулялі – ён быў залішне для нас рэспектабельны. У студэнцкія гады – іншая справа. А ў маленстве менавіта двор захоўваў шмат прывабных таямнічых мясцін. Які ж ён сёння – застаўлены машынамі – нецікавы, прымітыўны, убогі!

За скверам і тэатрам, праз дарогу, – высокая чыгунная агароджа, што акружала тэрыторыю, якая прымыкала да гмаха ЦК КПБ, а за ёю – двухпавярховы, з ніжнім цокалем, будынак тагачаснага Саюза пісьменнікаў Беларусі. Тут працавалі нашы бацькі, лепш сказаць, гэта быў іх родны – без перабольшання – дом. Будынак у нейкім сэнсе гістарычны: у ім падчас акупацыі Алена Мазанік забіла гаўляйтэра Кубэ. Пасля вайны дом перабудавалі і аддалі пісьменнікам. Таму і жыллё для іх пабудавалі побач – наш жылы дом быў амаль насупраць саюза.

Надзіва ўтульны быў саюз у той час, прыцягальны для пісьменнікаў – тады было іх няшмат, не больш за сто чалавек. Тут праходзілі шматлікія і надзвычай цікавыя мерапрыемствы, куды запрашалі розных знакамітых людзей. Арганізоўвала сустрэчы, канцэрты і кінасеансы жонка выдатнага паэта Аркадзя Куляшова Аксана Фёдараўна, дзелавая, выключна энергічная і захопленая сваёй справай жанчына. Дарэчы, шмат было святаў і для пісьменніцкіх дзяцей: ранішнікі, лялечныя спектаклі, нават вечары дзіцячай самадзейнасці, у якіх і мы з Людай бралі ўдзел.

Да адкрыцця ў 1957 г. будынка музея Янкі Купалы яго экспазіцыя размяшчалася на плошчах Саюза пісьменнікаў. А мы з Людай, малодшыя школьніцы, ідучы са школы, заўсёды заходзілі ў музейныя залы з іх паэтычнай атмасферай – ужо тады для нас выключна прыцягальнай, як быццам прадчувалі свой будучы прафесійны лёс. Гэта быў рытуал, наш уласны звычай – наведванне сакральнага месца, дзе нас любілі і прыветна сустракалі. Мы настолькі прызвычаіліся да экспазіцыі музея менавіта ў памяшканні саюза, што нам цяжка было бачыць тыя самыя рэчы, бюсты і партрэты ў іншым доме. Часта ўдава Янкі Купалы Уладзіслава Францаўна займалася з намі – хто яшчэ з нашых калег можа гэтым пахваліцца! Мы ўсаджваліся на падлогу (дыван пасярод залы), і яна нам распавядала пра дзяцінства песняра або чытала яго дзіцячыя вершы.

У сярэдніх класах пачаліся паходы ў Дзяржаўны мастацкі музей па вуліцы Леніна, ад нас – зноў-такі літаральна за два крокі. Мы наведвалі ўсе шматлікія тэматычныя лекторыі, якія там праводзілі ў той час, рэгулярна абыходзілі залы, ведалі іх настолькі добра, што намнога пазней, калі ва універсітэт прыязджалі замежныя госці, я вадзіла іх замест экскурсавода. Так, я захапілася гісторыяй мастацтва настолькі, што гэта нават стала адной з маіх спецыяльнасцей, хоць і ў плане тэарэтычным, затое Люда ўмее шмат чаго рабіць на практыцы – прыдумаць цікавы рытуал, сказаць прыемныя, прачулыя словы юбілярам, спячы смачныя пірагі, зрабіць адмысловыя сувеніры, звязаць прыгожыя рэчы. Якую цудоўную, шыкоўную хустку яна звязала ў падарунак маёй маці! Ды ўрэшце і піша яна выдатна – на самым высокім узроўні прафесіяналізму і адначасова надзвычай сардэчна.

Наша дзяцінства і юнацтва праходзіла, акрамя іншых блізкіх вуліц – цэнтральных у Мінску (Леніна, Кірава, Маркса), – у значнай ступені на вуліцы Энгельса: кожны дзень са школы – у школу, у гурткі Дома піянераў, часта ў Тэатр юнага гледача, а калі пабудавалі "Піянер", мы амаль кожны дзень наведваліся ў кіно. Асабліва запомніліся летнія вечары ў нашы ўжо падлеткавыя гады, калі ад гарачыні адкрываліся дзверы ў кінатэатр і я са свайго пакоя, вокны якога выходзілі якраз на кіназалу, чула захапляльную музыку з "Няўлоўных мсціўцаў": кінастужка ішла, памятаю, асабліва доўга, а з выхадам дзвюх наступных серый іх паўтаралі ўсе разам зноў і зноў.

Рамантыка (няхай і спрэчная) "Няўлоўных…", з аднаго боку, і грынаўскіх "Пунсовых ветразяў", асабліва папулярных у тыя гады, – з другога, захапленне турыстычнымі паходамі, падарожжы ў дзікія, неасвоеныя мясціны, спрэчкі "фізікаў" і "лірыкаў", кнігі фантастыкі, бардаўскія песні, першыя палёты ў космас… Усё гэта нашы школьныя гады. Гэтым і яшчэ шмат-шмат чым іншым – не менш захапляльным і цікавым – мы жылі.

Першая палова 1960-х гг. – дзіўны, фенаменальны ў сваёй супярэчлівасці час. Пра яго гавораць – хру-

шчоўская адліга. Цудоўная эпоха для нашага асабістага лёсу ды і лёсу бацькоў таксама. Атмасферу нашага жыцця вызначалі зусім не хрушчоўскія рашэнні, а нешта іншае: хутчэй за ўсё, захаваны яшчэ з вайны дух сяброўства, узаемадапамогі, памяці пра сумесна перажытую бяду. Захавалася інерцыя ўсеагульнага энтузіязму і пад'ёму, тон і тэмп жыцця, узятыя ў 40 – 50-я гг. XX ст. Нельга забыць на пастаянныя будоўлі тых гадоў, што рабілі ўсё больш прыгожымі навакольныя вуліцы, праспект, парк імя Горкага, куды мы любілі хадзіць; пасадкі дрэў на вуліцах (расліннасці тады было намнога больш – сёння яна саступіла месца машынам); частыя суботнікі, ад якіх не бурчэлі, не кпілі з іх, як сёння, а куды ўсе ахвотна выходзілі, дзе працавалі дружна, весела (а як яшчэ можна было так хутка адрадзіць абсалютна разбураны горад!). Асаблівы дух жыў і ў нашым доме. Усё ж прыналежнасць да адной карпарацыі шмат што вызначыла ў побыце, у выхаванні дзяцей. Дзверы ў той час не зачыняліся! Прыйшоўшы са школы і не застаўшы родных дома, мы спакойна маглі ісці абедаць да суседзяў, асабліва да тых, у каго былі свае дзеці; хадзілі і "на тэлевізар", і папрасіць кнігі. Дарослыя не шкадавалі часу, каб распавядаць нам розныя гісторыі, чытаць, вадзіць на рыбалку. Былі і выхаваўчыя акцыі, скажам, з боку Янкі Брыля ў адносінах да майго брата Сашы: той трымаў на гарышчы галубоў і вылазіў часам на дах дома, што, натуральна, было небяспечна.

Юнакі і дзяўчаты з дзесятка кварталаў, усе, хто вучыўся ў школах № 2 і № 4, а значыць, жыў недалёка, цудоўна ведалі адзін аднаго. Цэлымі дварамі мы гулялі ў "казакі-разбойнікі", бегаючы непасрэдна па вуліцах, бо машыны тады па іх праязджалі надзвычай рэдка. Да нас у двор, дзе было шмат дзяўчат, прыходзілі хлопцы з іншых дамоў гуляць у валейбол. Разам ездзілі на трамваі купацца і плаваць на чаўнах па Камсамольскім возеры – тады гэта была далёкая ўскраіна горада (сёння – амаль цэнтр). Пастаянна абменьваліся кнігамі.

Успамінаючы маленства і юнацтва, не магу не адзначыць адну вызначальную асаблівасць нашага існавання: дух цікаўнасці, захопленасці дасягненнямі навукі і тэхнікі, прагу ўсё спазнаць, авалодаць рознымі ўменнямі, займацца з жывёламі, будаваць мадэлі, фатаграфаваць, падарожнічаць. Характэрна, што і дарослыя жылі з такім самым настроем: самі спасцігалі свет і нас заахвочвалі, прывучалі. Памятаю, як на трох уласных машынах Шамякіны, Карпавы і Хадкевічы ездзілі ў падарожжа па Беларусі. Нам з Людай было тады гадоў па 12, Лёні – гадоў 14. Настрой у нас быў надзвычай рамантычны, з прагай таямнічых прыгод. Таму бацькі імкнуліся паказаць як мага больш – самыя прыгожыя і загадкавыя мясціны Беларусі; у Белавежскай пушчы нават начавалі.

Неаднаразова бацькі адпраўлялі мяне разам з Карпавымі або ў Дом творчасці пісьменнікаў у Каралішчавічы (па Магілёўскай шашы) – звычайна зімою, на канікулах, – або летам нават на курорт, у Дубулты на Рыжскім узмор'і. Там аднойчы быў Іван Якаўлевіч Навуменка, і мы з Людай, шчыра кажучы, трохі пасміхаліся з яго, бо ён нязменна на пляжы ў спякоту з'яўляўся апрануты ў цёплы джэмпер. Ведалі б мы, што Іван Якаўлевіч у будучым – наш прафесар, кіраўнік нашых дыпломаў і дысертацый! Студэнткамі і аспіранткамі чым больш яго слухалі, чым больш чыталі яго працы, тым больш паважалі, здзіўляючыся моцы творчай думкі. Бацькі найперш выхоўвалі ў нас уменне гэта цаніць…

Людміла Уладзіміраўна рана страціла бацьку, а неўзабаве і брата Валодзю. І тады ўжо мае бацькі – пакуль былі жывыя – не пакідалі без увагі Марыю Міхайлаўну і Люду. Апошнія гадоў дваццаць пяць здароўе Марыі Міхайлаўны трымаецца выключна на пастаянным клопаце і любоўным доглядзе з боку Людмілы Уладзіміраўны, якая не ведае ні выхадных, ні адпачынкаў у сваім даччыным абавязку.

Калі адным словам вызначаць галоўную рысу характару Людмілы, я сказала б – ***вернасць***. Вернасць памяці блізкіх, на магілы якіх яна ездзіць да гэтага часу ледзь не кожны тыдзень, ніколі не забываючы наведаць месца апошняга прытулку і майго бацькі… Вернасць маці, якую столькі гадоў падтрымлівае сваёй любоўю і клопатам… Вернасць старэйшым калегам-пенсіянерам, якім часта тэлефануе і якіх падтрымлівае сваёй увагай… Ды і мне: памятаю, як яна імчалася з Літвы, каб толькі паспець на маё вяселле, – і паспела ж такі! Як ніхто з нас, хто жыў у пісьменніцкім доме, Людміла Уладзіміраўна захоўвае вернасць сяброўкам, з кім разам мы раслі, – Тані Зарыцкай, Наташы Брыль, Галі Скрыган, захоўвае вернасць традыцыям дому, яго атмасферы, яго, так бы мовіць, вобразу… Можа, таму так любяць студэнты, калі яна распавядае пра дом-камуну або водзіць туды на экскурсію – у кватэру Уладзіміра Караткевіча, дзе пляменніца Уладзіміра Сямёнавіча заўсёды шчыра адгукаецца на просьбы Анатоля Леанідавіча Вераб'я ці Людмілы Уладзіміраўны Карпавай паказаць кабінет славутага пісьменніка. Нарэшце, юбілярка верная, нягледзячы на ўсе драматычныя перыпетыі лёсу, сабе, укаранёнай сямейнай сціпласці, далікатнасці, немагчымасці нешта для сябе патрабаваць, шукаць палёгкі ў працы, абсалютнай немагчымасці дэкларваць свае правы, бегаць да начальства з-за амбітных прэтэнзій, немагчымасці адмовіць у просьбах, хоць бы ў дробязі падвесці калег і студэнтаў.

На працягу многіх гадоў Людміла Уладзіміраўна на нашай кафедры – прафгрупорг. Яна ўмее стварыць тую душэўную атмасферу, у якой асабліва добра працаваць і жыць, – атмасферу ўзаемнай павагі і добразычлівасці, калі чалавечыя кантакты вывяраюцца не ўзаемнымі разлікамі, а выключна патрэбамі сэрца.

Шчыра кажучы, і мне, і ёй цяжка ў сучасным свеце: залішне разыходзяцца тыя ідэалістычныя прынцыпы, паводле якіх нас выхоўвалі, з тым, што мы бачым вакол сябе, што мы міжволі, сцяўшы зубы, вымушаны цярпець, каб існаваць – нават не дзеля сябе, а дзеля блізкіх. І мне нішто так не імпануе ў асобе Людмілы Уладзіміраўны, як яе імкненне ***захаваць*** вернасць гэтым прынцыпам, ***затрымаць***, а па магчымасці і ***перадаць*** наступным пакаленням тую рамантычнасць бачання свету, якая зрабіла нашых бацькоў пісьменнікамі, той народны погляд на рэчы

і народную мараль, што надавалі выключную абаяльнасць нашым маці.

Праводзіць, скажам, наша кафедра міжнародную канферэнцыю – гасцей у перапынках паміж пасяджэннямі неабходна пакарміць. Іншыя кафедры часта абыходзяцца якім-небудзь пячэннем і кавай – гэта нармальная практыка. У нас Людміла Уладзіміраўна з уласнай ініцыятывы пачынае рыхтавацца за тыдзень: едзе на рынак, марынуе мяса, сама соліць рыбу, пячэ і смажыць, накрывае стол, падобны да банкетнага. Усё не проста арыгінальнае і смачнае, але і прыгожа прыгатаванае – ажно да спецыяльна падабраных сурвэтак, ажно да абавязковых кветак на стале. І справа не толькі ў выключным клопаце пра гасцей – гэта само сабой, але і ў тым выхаваўчым уздзеянні (нават неўсвядомленым), якім пазначаны ўсе яе ўчынкі: я ўпэўнена, што маладзенькія аспіранты і магістранты, што дапамагалі Людміле Уладзіміраўне накрываць сталы, хоць і былі здзіўлены яе бескарыслівасцю (сапраўды, дзіва ў наш час ды з нашымі заробкамі), не маглі ў душы не захапіцца, не маглі не занатаваць у памяці асаблівае стаўленне выкладчыка да сваіх абавязкаў.

Мне здаецца, што чалавечы энтузіязм намнога больш эфектыўны, карысны для справы, чым фармальнае, але бяздушнае выкананне пунктаў працоўнага кантракта. І я заўсёды больш давяраю энтузіязму і чыста чалавечым стасункам, чым бяздушнай літары інструкцыі, вернасцю якой часам так ганарацца некаторыя нашы калегі, застаючыся абыякавымі да ўсяго астатняга. Дзякуй Богу, што ёсць яшчэ такія шчырыя энтузіясты, як Людміла Уладзіміраўна Карпава, якая, сама не пішучы вершаў (ці проста не друкуючы іх праз заўсёдную сціпласць), робіць паэтамі сваіх студэнтаў; якая захоўвае спадчыну народнай памяці, знітаванай з найлепшымі традыцыямі бацькоў-інтэлігентаў; якая сцвярджае ў жыцці дабро, прыгажосць і такую на сёння рэдкую, а таму асабліва каштоўную сумленнасць.

*Майстэрства творцы*

Людміла КАРПАВА

# ПРЫЁМЫ ПСІХАЛАГІЧНАГА НАПАЎНЕННЯ ВОБРАЗАЎ У РАМАНЕ “МЛЕЧНЫ ШЛЯХ” КУЗЬМЫ ЧОРНАГА

Унікальнай з’явай у развіцці нашай нацыянальнай прозы справядліва лічыцца раман “Млечны Шлях” Кузьмы Чорнага, дзе вобразы-тыпы, як і ў творчай практыцы Анарэ дэ Бальзака, па сваім абагульненні набліжаюцца да ўзроўню сімвалаў, дзе персанажы – носьбіты пэўнай ідэі-жарсці, як і ў раманах-эксперыментах Фёдара Дастаеўскага, дзе аўтарскай “звышзадачай” стаў паказ народаў у вайне, спасціжэнне, кім можа зрабіцца чалавек у свеце смутку, гвалту і забойстваў, а таксама вызначэнне межаў выбару кожнай асобы і яе сацыяльнай адказнасці за тое, што нормай на Зямлі стала паляванне на падобнага да сябе.

У філасофскае сілавое поле рамана празаік увёў вобраз былога студэнта, былога чырвонаармейца, былога вязня канцэнтрацыйнага лагера Уладзімера Ярмаліцкага. Яго споведзь займае цэнтральнае месца ў творы, з’яўляецца яго залатым ядром і нясе надзвычай важную ідэйную нагрузку. Ды і ўвогуле маналогі-споведзі набываюць выключнае значэнне ў псіхалагічным аналізе К. Чорнага. Героі прызнаюцца ў самым патаемным і запаветным або пятляюць, круцяць, хітруюць, і іх вартасць раскрываецца з граніч-най выразнасцю.

Сярод бадзяг-абдзіранцаў, што натрапілі ў лесе на здзічэлага быка, Ярмаліцкі найбольш знясілены, хоць і самы малады, яму гадоў дваццаць шэсць. На твары ў яго сляды перажытых нясцерпных пакут. Разам з тым ён найбольш непасрэдны з усіх. Ужо ў першых прамоўленых ім словах насуперак усяму гучыць радасць, і ён не баіцца выказаць яе. Здавалася нават, што ён увогуле не можа апамятацца ад нейкага нечаканага шчасця і перажывае радасць, *“якая з’явілася перад ім як дар чалавеку ад усяго свету”*[1]. Нягледзячы на тое, што ён ушчэнт знясілены і галодны, *“тонкі, як травінка”*, Ярмаліцкі пакладаецца на ласкавасць і яснасць свету, на тое, што сваю радасць чалавек можа знайсці ў кожнай маленькай раслінцы. Твар у яго прывабны, як вытачаны, лоб высокі, вочы ціхія, глядзяць яны на сустрэтых натапыраных, падазроных незнаёмцаў дапытліва, нібы шукаюць таго, каму можна паверыць. Ён першы здабывае давер і сімпатыю гаспадара хаты, куды трапляюць бадзягі; першы адгукаецца на просьбу Сямагі памагчы хаваць нябожчыцу; першы адчувае ў таўсматым небяспечнага чалавека і бярэ яго пад свой кантроль; ён першы адкрыта заяўляе пра сваю нянавісць да фашыстаў – тупых, ілжывых, бесчалавечных, якія прысвоілі сабе чужое і абвяшчаюць сябе *“лепшымі за ўвесь свет”*; ён абяцае выхоўваць такую самую нянавісць у сваіх будучых дзецях. *“Немец і чалавек. Вось яны два, адзін аднаму напроці”* (210), – кажа ён. Бо фашысты-захопнікі адабралі ў яго радасць, загналі ў аглоблі і не дазволілі яму быць і далей мяккім і добрым, літасцівым і *“лагодным перад чужой пакутай”*.

Адкрытая, даступная кожнаму душа, Уладзімер не можа таіць у сабе тое, што адкрылася яму ў часы пакут. Яго расказ пра лагер поўны жахаў, ён уражвае сілай пачуцця, што пранізвае яго. Ярмаліцкі гаворыць, як, упрэжаны ў аглоблі, возячы ў бочцы ваду, пачаў траціць веру – думаць, *“што навекі будзе без роду і без радзімы, без волі і сваіх жаданняў”*, што ўладары-захопнікі *“ўсё ўдушаць, абязвечаць і вырвуць з душы”*.

Перад ім зноў і зноў паўстаюць карціны нявольніцкага жыцця, калі трэба было ўставаць з сонцам, каб рабіць цэлы дзень, а ўвечары – класціся спаць, каб зранку зноў устаць на катаржную працу. Аўтарская інтэрпрэтацыя вобраза вязня, адгароджанага ад усяго свету жахлівымі сценамі казармы, яшчэ больш узмацняе трагедыйнасць таго, што адбываецца на зямлі, бо заключае ў сабе пратэст не толькі супраць гвалтоўнага разбурэння, знішчэння жыцця ўвогуле, але і супраць казарменнага ладу жыцця, злачыннага эксперыменту, паводле якога людзі вымушаны пад Млечным Шляхам, што лучыць іх у адзіную сям'ю, імя якой Чалавецтва, паслухмяна падпарадкоўвацца законам таталітарных рэжымаў – фашысцкіх, сталінскіх ці якіх іншых. Кожны ж чалавек, паводле К. Чорнага, гэта цэлы свет, які, вядома, не можа быць абмежаваны ніякімі рамкамі. Пісьменнік выкрывае антыгуманную сутнасць такога эксперыменту над чалавекам і становіцца абаронцам яго, *"казарменнага"*.

Нястомны творчы пошук шляхоў псіхалагічнага напаўнення вобразаў прыводзіць празаіка да выкарыстання ў спавядальнай форме прыёму рэтраспектыўнай характарыстыкі псіхалогіі персанажа. Падзеі з ранейшага жыцця героя падаюцца менавіта праз прызму яго свядомасці, у непарыўны ланцуг сплятаюцца разважанні і ўспаміны дзейнай асобы, а факты суседнічаюць з палкімі эмоцыямі. Споведзі ўключаюцца ў тэкст не паводле прынцыпу сюжэта ў сюжэце, іх хутчэй можна палічыць за плынь свядомасці. Такі прыём дазваляе раманісту пашырыць уяўленне чытача не толькі пра жыццёвую біяграфію героя, але і пра біяграфію яго духоўнага сталення. Пры гэтым для мастака прыдатным аказваецца як досвед Ф. Дастаеўскага ў адкрыцці "глыбіні душы чалавечай", так і лейтматыў талстоўскага адлюстравання – "цякучасці псіхалогіі асобнага чалавека"[2].

У аснову "Млечнага Шляху" пакладзены маральны эксперымент – стварэнне экзістэнцыяльных па сваёй прыродзе стрэсавых сітуацый, выйсце з якіх чалавек павінен шукаць і знаходзіць, мабілізуючы толькі ўласныя сілы. Таму характарыстыка душэўнага стану Ярмаліцкага складаецца паступова і падрабязна (зараджэнне ідэі; яе развіццё і працягласць у часе; канцэнтрацыя ўсіх душэўных рэсурсаў, калі *"пачуццё рвецца ў буру"*; нарэшце, яе рэалізацыя). І паколькі працэс гэты вельмі складаны, то К. Чорны імкнецца адзначыць як мага больш знешніх праяў унутранага жыцця асобы, каб скласці са шматлікіх мікрадэталяў адзінае і непаўторнае цэлае.

Пісьменнік дасягае ўстойлівага двухадзінства розных узроўняў арганізацыі мастацкага свету твора – сюжэтнага і псіхалагічнага. Па меры расшыфроўкі сюжэтнага кода чытач расшыфроўвае і код псіхалагічны, высвятляючы не толькі тое, кім з'яўляецца персанаж, але і тое, на што хварэе яго душа.

Ва ўмовах гвалтоўнай ізаляцыі ў страшным, жудасным месцы, у становішчы напаўжывёльнага існавання, калі прытупляюцца ўсе натуральныя чалавечыя жаданні, Ярмаліцкі, аднак, сцвярджае сябе як асоба, здольная да адраджэння, асэнсавання сваёй сапраўднай місіі ў д'ябальскім часе вайны.



**Выступае Алег Лойка.**
**У 1-м радзе сядзяць Кузьма Хромчанка, Уладзімір Навумовіч, Вольга Казлова, Таццяна Шамякіна, Людміла Карпава, Маргарыта Яфімава, Аліса Шыловіч.** 1986 г.

Вострая засяроджанасць антымілітарысцкага пачуцця героя, ды і самога аўтара, найбольш выяўляецца ў надзвычай трагічных словах Ярмаліцкага пра дзяцей, пра дачку, якую могуць загадаць яму, нявольніку, мець гаспадары-захопнікі. Функцыянальна апраўданым пры абмалёўцы вобраза дзяўчынкі-нявольніцы, перадачы пакут бацькі рабыні ўяўляецца чаргаванне ў тэксце свядомай затрымкі аўтарскай увагі на паасобных экзістэнцыяльных момантах стану асобы (рэтардацыі) і "кароткіх паведамленняў пра нейкія падзеі, сумарнае абазначэнне прадметаў, што стварае эфект моцнага эмацыянальнага ўражання" (генералізацыі)[3]. Паводле сілы эмацыянальнага ўздзеяння споведзь Ярмаліцкага нагадвае славутую легенду Ф. Дастаеўскага пра Вялікага Інквізітара, дзе, дарэчы, будучыня таксама апрабоўваецца на дзецях і таксама ставіцца праблема: чалавек і неабходнасць, чалавек і яго заўтрашні дзень.

Дух Вялікага Інквізітара, згодна з Ф. Дастаеўскім, "можа з'яўляцца і дзейнічаць у розных абліччах і розных формах, ён у найвышэйшай ступені здольны да пераўвасаблення"[4]. Чорнаўскі вялікі злодзей і ёсць, па сутнасці, той самы Інквізітар, дух якога гэтым разам дзейнічае ў абліччы фашызму, што перакрэслівае ўсе Божыя запаветы і чалавечыя законы быцця. Вялікі Інквізітар абвяшчае: "Мы пераканаем іх [людзей], што яны тады толькі і стануць вольнымі, калі адмовяцца ад свабоды сваёй"[5]. Адпаведную антыхрысціянскую ідэю праводзілі супраць славянскіх народаў і гітлераўцы.

Пагадзіцца ж з такой перспектывай Ярмаліцкі, вядома, не можа. Імкненне героя (прадвызначэнне якога – быць вольным на роднай зямлі, разамкнуць прасторавую абмежаванасць, выбрацца з-за калючага дроту лагера) зразумелае аўтару-гуманісту. Таму чорнаўскі псіхалагізм у дачыненні да гэтага вобраза вельмі абвостраны, як абвостраны пачуцці героя, што дае магчымасць празаіку зазірнуць не толькі ў душэўныя глыбіні асобы, але і ў глыбіні духоўныя, гэта значыць, імкнуцца спасцігнуць нават не псіхалогію, а анталогію чалавечай прыроды. *"Мая нянавісць да фашыстаў,* – прызнаецца Ярмаліцкі, *– роўная майму замілаванню да мае маці. <...> Я ніколі не памірыся з тым, што можна забыцца і дараваць хаму, які прывалокся і наступіў ботам табе на горла"* (210).

Характэрна, што маналогі-споведзі ў "Млечным Шляху" найчасцей выключаюць аўтарскі каментарый. Пісьменнік змушае чытача самастойна сачыць за рухам пачуцця чалавека, даведзенага да найвышэйшага моманту перажывання, адноўленага яго памяццю. Тое, што набіралася, канцэнтравалася ў душы і свядомасці і не магло раней быць выказана іншай асобе ці асобам, вырываецца на паверхню ў выглядзе слоў, заглушае ўсе адчуванні, бо само па сабе вельмі моцнае, бунтоўнае, усёпаглынальнае.

І толькі калі наступае палёгка пасля выказанага чалавекам, калі адбываецца *"выяўленне пералому ў яго псіхіцы"* (213), К. Чорны зноў дазваляе сабе ўважліва фіксаваць і вытлумачваць праявы наступнага стану і рэакцыю самога прамоўцы і яго слухачоў, ствараючы другі, невербальны, дыялог, які дапамагае захаваць сітуацыю зносін ва ўсёй яе складанасці, натуральнасці і цэласнасці.

Так, бясконцая *"прыгнечанасць душы"* Ярмаліцкага *"плыве на спад"*, *"надзея прыносіць веру, а вера – радасць і ўздым"* (213), ён ужо без усялякай *"асцярогі і боязі"* паглядае на суразмоўцаў, бо яны ж *"разам клалі таго быка і разам злеглі хворыя"* (214). Ды і ўвогуле, яму няма чаго баяцца: *"Няхай яго баяцца каму трэба!"* (214). Тым часам каля Ярмаліцкага пачынаюць групавацца адзінадумцы (падсунуўся бліжэй да яго Сямага, за ім таксама сеў побач чэх Новак). Баючыся прапусціць хоць адно слова, апухлы *"так угнуўся наперад, што, здавалася, ён зараз грымнецца вобземлю"* (214). Таўсматы, магчыма, слухаў, *"а можа і драмаў"*. Паляк жа яшчэ *"больш абвяў"*.

Дзякуючы паглыбленаму псіхалагічнаму даследаванню ўнутранага стану персанажаў, што няспынна вядзецца ў рамане, чытач канчаткова ўпэўніваецца, што ўсе, хто выпадкова апынуліся тут разам, – "асобы пакуты" (І. В. Гётэ) у брыдкім, не вартым чалавека часе.

У першай частцы рамана "Пошукі будучыні" К. Чорны стварае, па сутнасці, час ідылічны, звычайна звязаны з любоўнай ці сямейнай ідыліяй у спалучэнні з земляробча-працоўнай[6] (на вачах чытача адбываецца нараджэнне кахання Волечкі і Кастуся; у родную вёску вяртаецца стары Нявада; Шрэдара-старэйшага, трэба меркаваць, таксама чакае сустрэча з роднымі; у гармоніі з людзьмі і прыродай жыве фельчар), у другой частцы адбываецца разбурэнне ідылічнага часу гістарычным часам народнага бедства. У рамане ж "Млечны Шлях" спецыфіка мастацкага часу вызначаецца тым, што ўступае ў правы час авантурны. Звязаны з блуканнямі ў чужым свеце, падарожжамі[7], ён набывае ў творы пачуццёва-наглядны характар, канкрэтызуе і час жыцця чалавека, і гістарычны час на пэўнай прасторы. Усе дзейныя асобы рамана праходзяць свой сумны шлях да неспадзяванай сустрэчы на хутары Сямагі, некаторым наканаваны і новыя вандроўкі ў свеце. Ідылічны ж час – бліскавічна-кароткі. Яго ўтрымліваюць успаміны персанажаў пра бесклапотнае маленства, шчаслівае юнацтва, гэта часцей за ўсё пара да вайны ці ў перапынку між войнамі. Яго далёкае ззянне не можа паглынуць нават жудасць ваеннай рэчаіснасці, бо ён заўсёды асацыятыўна звязаны ў кожнага з самай дарагой для яго істотай – маці, абагульнены вобраз якой вырастае да сімвала спакутаванай Бацькаўшчыны, што зведала безвыходнасць і бязвер'е, гвалт і здзекі прышэльцаў розных часоў.

Успамінае сваю матулю Гануся. Згадвае *"сілу матчынай душы і вялікасць яе сэрца"* Мікалай Сямага. Звяртаючыся да Ганусі, немец-дэзерцір кажа, што маці – *"гэта самае дарагое, што ёсць у чалавека"*. Усім сэрцам любіць сваю маці і Уладзімер Ярмаліцкі, вобраз якога вымалёўваецца згодна з аўтарскай канцэпцыяй нацыянальнага характару беларуса.

З хваляваннем чакаў юнак сустрэчы з дарагім сэрцу домам і шасцю вязамі, што былі для яго ўвасабленнем малой радзімы. *"Ён стаў зусім ясны вачыма і настроем. У яго калаціласа сэрца, калі ён сказаў, што дарога зараз пойдзе ўніз і там відзён будзе родны дом і шэсць старых вязаў"* (233). Аднак калі Гануся, Сямага, Новак і Ярмаліцкі наблізіліся да мэты свайго падарожжа, іх чакала жудаснае відовішча.

*"Брыдкі час"* знішчыў самае дарагое, што ёсць у чалавека, – яго роднае гняздоўе, дзе пачыналася жыццё, дзе ўсталёўваліся моцныя сувязі з вялікім светам, дзе лёгка дыхалася і вольна жылося. *"Брыдкі час"*, прыносячы кожнай асобе слёзы і гора, пакуты і смерць, пазбаўляючы права на шчасце, права на само жыццё, прымушаў чалавека помсціць і забіваць другога чалавека. Таму, убачыўшы немца-дэзерціра, які таксама цішком кіраваўся на Случчыну, Уладзімер Ярмаліцкі ў стане афекту стрэліў у яго. Немец *"упаў тварам у асмалкі і не паварушыўся"* (237). Паказальна, што тут выкарыстоўваецца прыём замоўчвання, бо фінальная сцэна асноўнага дзеяння ні адным з персанажаў-сведкаў не ацэньваецца (ні ў думках, ні ў выказваннях, ні нават у інстынктыўных рухах), не каментуецца яна і аўтарам. І хоць сцэна забойства немца, безумоўна, насычана псіхалагізмам, псіхалагічнае адлюстраванне адсутнічае. Чытачу выпадае самастойна дадумваць яе псіхалагічны змест.

Уздымаючы індывідуальныя лёсы Ганусі, Сямагі і Ярмаліцкага на абагульнена-філасофскі ўзровень, памайстэрску выкарыстоўваючы самыя разнастайныя прыёмы псіхалагічнага напаўнення вобразаў, К. Чорны здолеў паказаць шлях, пройдзены за паўвека беларускім народам, лёс і ролю народа ў Вялікай Айчыннай вайне, месца, якое пачаў займаць ён сярод народаў.

---

[1] **Чорны, К.** Выбраныя творы / К. Чорны; уклад. і прадм. М. Тычыны; камент. М. Тычыны, Я. Янушкевіча. – Мінск : Беллітфонд, 2000. – С. 184. Далей цытаты падаюцца па гэтым выданні з пазначэннем старонкі ў дужках.

[2] **Розенблюм, Л. М.** Творческие дневники Достоевского / Л. М. Розенблюм. – М. : Наука, 1981. – С. 63.

[3] **Введение в литературоведение** : Учеб. пособие / под ред. Л. Чернец. – М. : Высш. шк., 2004. – С. 292.

[4] **Бердяев, Н. А.** Духи русской революции / Н. А. Бердяев // Литературная учеба, 1990. – Кн. 2. – С. 106.

[5] **Достоевский, Ф. М.** Собрание сочинений : в 10 т. / Ф. М. Достоевский. – М. : Сов. писатель, 1958. – Т. 9. – С. 106.

[6] Гл.: **Бахтин, М.** Вопросы литературы и эстетики : Исследования разных лет / М. Бахтин. – М. : Худож. лит., 1975. – С. 159.

[7] **Тамсама.** С. 148.

*Віншуем!*



*Алесь Герасімавіч Масарэнка (нар. 12 красавіка 1938 г. у вёсцы Ходарава Слаўгарадскага раёна) вядомы як празаік, аўтар аповесці "На бабровых тонях" (1971), рамана "Баргузінскае лета" (1982), зборнікаў аповесцяў і апавяданняў "Журавіны пад снегам" (1976), "Сонца майго дня" (1988), "Пакуль не завялі кветкі" (1994), нядаўна падрыхтаваў да друку новую кнігу "Удзячны калодзеж". Сярод заслуг пісьменніка – і стварэнне часопіса маладых літаратараў "Першацвет", галоўным рэдактарам якога А. Масарэнка быў на працягу 1992 – 1998 гг. Шмат юных паэтаў збірала літаб'яднанне, што працавала пры часопісе. Ці не гэта падштурхнула Алеся Герасімавіча самога ўсё часцей звяртацца да паэтычнага радка? А радкоў тых назбіралася на ёмісты зборнік "Рэха гіпербалы" (2006), вершы з якога прапануюцца вашай увазе.*

70

Алесь МАСАРЭНКА

# "ДУША МАЯ – МОЙ АБЯРОГ"

* * *

*Боль…*
*Хаваю боль…*
*Хаваю боль свой…*
*Хаваю боль свой у сабе,*
*як у дарог бясконцасць – думкі…*
*Нам сталі скрухай пацалункі –*
*мы развіталіся ў журбе…*
*Хаваю боль свой…*
*Хаваю боль…*
*Боль…*
1999

* * *

*Скрыжалі памяці навечна –*
*сышлі ў падмуркі гарадоў.*
*Жыццёвай плыні хуткацечнай*
*не абагнаць маіх гадоў.*

*Лунае лунь, ручай булькоча,*
*гудзе чмялямі травастой…*
*Душа мая – у вырай хоча,*
*не прызнае ні ў чым застой.*

*І не забегчы мне самому*
*сабе наперад аніяк,*
*услаць каб загадзя саломай*
*свой шлях у сонме патырчак.*

*Мая душа мяне ўратуе –*
*не завядзе ў дрыгвяны лёх:*
*яна ўсё высачыць і ўчуе…*
*Душа мая – мой абярог.*
9.10.2003

**ПРОСЬБА ГУЛАГАЎЦА, 1950**

Памяці
Паўла ПРУДНІКАВА,
ахвяры сталінізму…

*О, Літасцівы!*

*Ні веры, ні светлых надзей*
*не забірай ад нас…*
*Мы церпім… А ён, ліхадзей,*
*крывёй пазначае час.*

*О, Літасцівы!*

*Насілкам гне ў дугу*
*тых, хто не з ім…*
*Сабакам на ланцугу*
*выслужваецца падхалім.*

*О, Літасцівы!*

*Няволі гадоў калаўрот*
*хавае вытокі страт…*
*Так запалохаць народ!*
*Ну ці ж гэта не кат?!.*

*О, Літасцівы!*

*Скажы мне, Магутны Божа:*
*навошта ўзвялічыў яго?*
*У вязняў цяжкая ноша…*
*Чакаць нам, скажы, чаго?!.*

*О, Літасцівы!*
*Ратуй нас, пакуль мы жывыя!*
3.07.2003

* * *

*Купаецца ў сінечы маіх сноў*
*тваё каханне, шчодрае на ласкі:*
*праз абымшэлы буралом гадоў*
*вярнулася ка мне прыгожай казкай.*

*Як поўня, жыццячасу цыферблат*
*высвечвае пачуццяў сугалоссе…*
*На жаль, каханне тое не збылося –*
*сышло іржой, як у зямлі булат.*
24.09.2003

* * *

*Ужо каторы год няўдачы не трывожаць:*
*як ёсць – так і няхай сплывае ўсё ў нябыт.*
*Пегаса вольнага нішто спыніць не можа,*
*апроч як куля ці сцяна-граніт.*

*Імклівы бег – не ўцёкі: паратунак,*
*душы бунтоўнай вырак-ускалых…*
*Я заблукаю ў лабірынце вулак,*
*дзе мовы роднай бажаволіць слых.*
26.05.2005

Пра Алеся Масарэнку і заснаваны ім часопіс у красавіцкім нумары "Роднага слова" за 1998 г. распавядалі Міхась Тычына ("Et fumus patriae est dulcis: Штрыхі творчага партрэта Алеся Масарэнкі") і Наталля Кузьміч («Цвіці, першая веснавая кветка: Часопіс "Першацвет"»). Тамсама змешчаны і партрэт пісьменніка.

Тамара ГРЫДЗЮШКА

# “ЖЫЦІЕ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ”

**УРОК ЗАСВАЕННЯ НОВЫХ ВЕДАЎ. IX клас**

**Мэты:** пазнаёміць вучняў з найбольш вядомымі творамі, якія “праз смугу стагоддзяў” дайшлі да сучаснікаў; даць паняцце жыція як жанру старажытнай літаратуры; прасачыць асноўныя этапы жыцця Еўфрасінні Полацкай; развіваць навыкі супрацоўніцтва ў парах, эстэтычны густ, цікавасць да мінулага краіны; далучаць вучняў да скарбніцы беларускай літаратуры; шанаваць памяць пра славутых продкаў.

**Форма правядзення:** урок засваення новых ведаў.

**Тып урока:** урок камбінаванай будовы.

**Абсталяванне:**

выстаўка кніг: У. Арлоў “Еўфрасіння Полацкая”, Т. Бондар “Спакуса”, А. Марціновіч “Святая Еўфрасіння”, В. Іпатава “Прадыслава”, М. Багадзяж “Праз смугу стагоддзяў”;

аўдыёзапісы: І. С. Бах “Абуджэнне”, “Таката і фуга рэ мінор”;

партрэты Еўфрасінні Полацкай і Лазара Богшы.

**Эпіграф:**

*Сілай духоўнай узвысіла Полацк высока.*
*Тым, хто імкнуўся да кнігі,*
*свяціла, бы зорка...*
*Мове, адзінай дзяржаве*
*шчэ толькі злучацца –*
*свет нас прымаў як народ*
*па адной палачанцы.*

Д. Бічэль. Еўфрасіння Полацкая.

**На дошцы з левага боку** запісаны план урока.

**На правай палове дошкі** – радавод Еўфрасінні Полацкай (*для лепшага ўспрымання матэрыялу*).




**Новыя тэрміны:** *жыціе, святы́, ра́ка, фрэска, грыўня.*

**ХОД УРОКА**

► **Пастаноўка мэтаў і актуалізацыя ведаў.**

Настаўнік паведамляе тэму і мэты ўрока, прапануе звярнуць увагу на дошку, дзе напісаны план урока.

Вучань зачытвае план.

**План урока.**

1. Літаратура XI – XV стст.
2. Нязломная духам Прадслава:

а) жыццёвы шлях;
б) пострыг у манашкі;
в) грамадская і асветніцкая дзейнасць;
г) Лазар Богша – майстар славутага крыжа;
д) шлях у Іерусалім.

3. “Жыціе Еўфрасінні Полацкай”.

► **Падрыхтоўка да ўспрымання.**

• Уступнае слова настаўніка.

– Мінулае... Што мы ведаем пра яго? Тое, што данеслі да нас помнікі пісьменства ды дапоўнілі археалагічныя звесткі. Але ці дастаткова гэтага? Якімі былі творы літаратуры, напісаныя ў далёкай мінуўшчыне? Вельмі непадобныя да сучасных. І для таго каб зразумець іх, трэба ведаць, што нашаму далёкаму продку свет уяўляўся загадкавым, поўным таямніц.

Зямное жыццё рыхтавала чалавека да “сапраўднага”, вечнага жыцця, якое чакала яго пасля смерці.

Большасць герояў старажытных твораў ідэальныя, пазбаўленыя недахопаў. Аўтары імкнуліся да максімальнай праўдзівасці, аб’ектыўнасці, амаль не дапускалі вымыслу.

Традыцыя пагадовай фіксацыі гістарычных падзей нарадзілася ў часы Старажытнага Рыма. Пазней летапісанне становіцца больш мэтанакіраваным, набывае спецыфічную форму апісання гісторыі з усімі ўласцівымі ёй жанрава-стылявымі асаблівасцямі.

Пачатак летапісання ва ўсходніх славян традыцыйна звязваецца з XI ст., хоць, верагодна, яно магло існаваць і раней, пра што сведчаць паасобныя гістарычныя паданні.

Найбольш старажытным летапісным творам усходніх славян лічыцца “Аповесць мінулых гадоў”, складзеная на пачатку XII ст. манахам Кіева-Пячэрскага манастыра Нестарам.

Летапісец прыводзіць шмат унікальных звестак з гісторыі беларускіх зямель, асабліва Полацкага княства. Менавіта тут упершыню згадваецца гісторыя пра полацкага князя Рагвалода і яго дачку Рагнеду.

З “Аповесці мінулых гадоў” пачаўся адлік часу для такіх беларускіх гарадоў, як Мінск, Пінск, Брэст, Тураў, Полацк.

Полацкая зямля шмат пабачыла на сваім вяку. Яна багатая на славутых людзей. Яркімі і непагаснымі зоркамі на небасхіле мінуўшчыны зіяюць іх імёны.

• Самаканструкцыя (праца ў сшытках).

Настаўнік прапануе вучням запісаць асацыятыўны рад да паняцця “Полацк”. (*Гучыць музыка, вучні працуюць.*)

ПОЛАЦК – Сімяон Полацкі, Францішак Скарына, Рагвалод, Рагнеда, Еўфрасіння Полацкая, Сафійскі сабор, Спаса-Еўфрасіннеўская царква і іншыя.

Вучні зачытваюць асацыятыўныя рады, выбіраюць і падкрэсліваюць самае значнае, самае важнае, на думку кожнага, слова.

– Чаму вы выбралі менавіта гэтае слова? *(Еўфрасіння Полацкая – першая святая на Беларусі, настаўніца, выдатная асветніца.)*

► **Тлумачэнне новага матэрыялу. "Нязломная духам Прадслава".**

• Вучаніца чытае верш Любові Тарасюк.

*Забыць сваё імя, дзе корань роду слаўны?*
*Няпраўда! Я твая унучка, Усяслаў!*
*Ды годнасці маёй давеку не дакажуць,*
*Што найслаўнейшы той, хто тытул мае княжы.*
*Чакаюць: бацькаў двор і мне пасадам стане,*
*І кроку не ступіць за пышнымі сватамі*
*Гандлюючы сабой з уласнай чэсцю згодна,*
*Няўжо мне быць рабой для памнажэння роду?..*
*Жаніліся дасюль, ішлі далёка замуж,*
*А справы іх – каму? А дзе сягоння самі?*
*І гіне першы той, не толькі ў полі ратным.*
*На іхняй славе – тлен, нарашчаны вякамі...*
*Імя іх не ўзнясе і надмагільны камень...*
*Я знаю, што зраблю перад судом суровым...*
*Я славу зберагу, я прынясу ім Слова.*

– Каму прысвечаны верш Любові Тарасюк? (*Верш прысвечаны Еўфрасінні Полацкай – Прадславе, унучцы слаўнага князя Усяслава Чарадзея, якая, як і дзед, засталася жыць у памяці нашчадкаў.*)

**Вучань 1-ы.**

– Еўфрасіння Полацкая...

Без гэтага імя немагчыма ўявіць не толькі духоўнае жыццё на ўсходнеславянскіх землях у XII ст., але і шматвяковую гісторыю Беларусі.

Князёўна, ігумення, настаўніца, выдатная асветніца, Еўфрасіння пакінула пра сябе добрую памяць у душы народа. (*Чытае эпіграф да ўрока.*)

**Вучань 2-і.**

– Радзіма асветніцы – Полацкае княства – магутная дзяржава, якой два з паловай стагоддзі кіравала дынастыя Рагвалодавічаў.

Полацкая ігумення паходзіла з роду князёў, які браў пачатак ад Ізяслава – сына Уладзіміра і Рагнеды, празванай у народзе Гарыславай. Усяслаў Чарадзей быў дзедам Прадславы, а яе бацька – малодшы з сямі сыноў Усяслава – Святаслаў-Георгій. Пра маці князёўны невядома нічога пэўнага. Магчыма, звалася яна Сафіяй – такі вывад можна зрабіць у выніку назірання за полацкай ***сфрагістыкай*** *(ад гр.* ***sphragis*** *– пячатка – дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае пячаткі).*

**Вучань 3-і.**

– У свядомасць юнай князёўны рана ўвайшло імя непакорлівай Рагнеды, якую Уладзімір Краснае Сонейка прымусіў стаць жонкай, але не здолеў зламаць яе волі і адправіў з малодшым сынам Ізяславам назад, на Радзіму. Прадславу вабіла і легендарная асоба дзеда Усяслава.

**Вучань 4-ы.**

– Вучылася Прадслава ў школе пры Сафійскім саборы, пры княжацкім двары. Княжацкая дачка мела шырокі доступ да кніг. Настаўнікамі яе былі духоўныя асобы, найперш манахі, падручнікамі – Святое Пісанне, жыційная літаратура. Кожны адукаваны чалавек у той час павінен быў ведаць гісторыю свайго народа. Значыць, князёўна яе вывучала.



***Тамара Канстанцінаўна Грыдзюшка*** *– настаўніца беларускай і рускай моў і літаратур Суклінскай агульнаадукацыйнай сярэдняй школы Глыбоцкага раёна. Закончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны каледж № 2 імя Максіма Танка (2001), Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка (2007). Мае другую кваліфікацыйную катэгорыю.*

**Вучань 5-ы.**

– Слава аб прыгожай і адукаванай Прадславе разнеслася "по всем градам", і да князя Святаслава-Георгія зачасцілі сваты.

**Вучань 6-ы.**

– Калі Еўфрасінні споўнілася дванаццаць гадоў (з такога ўзросту дзяўчынку ў той час пачыналі лічыць нявестай), бацькі вырашылі аддаць яе замуж за сына нейкага слаўнага багаццем і княжаннем валадара.

Наперадзе ў Прадславы быў звычайны для жанчыны лёс: нараджэнне і выхаванне дзяцей, гаспадарчыя клопаты, цярплівае чаканне свайго гаспадара-князя з паходу... Але нечакана для блізкіх яна выбірае іншую пуцявіну...

*Ружай чароўнай калісь Прадслава*
*У Полацку слаўным квітнела,*
*Вартым унучкі самога Усяслава*
*Розумам светлым звінела.*
*Сватаўся князь не адзін да яе,*
*П'яны вачэй яе сінню,*
*Іншая ж доля на гоні свае*
*Клікала ўжо Еўфрасінню.*

**Вучань 7-ы.**

– Прадслава прыходзіць у манастыр. Яна пад імем Еўфрасінні таемна ад бацькоў прымае пострыг, ахвяруючы сябе Хрысту.

Даведаўшыся пра даччын учынак, князь Святаслаў-Георгій ад гора рваў на сабе валасы, а княгіня Сафія галасіла па Прадславе, як па нябожчыцы.

**Вучань 8-ы.**

– Быў жа дадзены дар гэтай блажэннай Еўфрасінні ад Бога. Яе славілі ва ўсім горадзе: багатыя – за мужнасць, бедныя – за спагаду і дабрыню. Людзі маліліся за яе.

**Вучань 9-ы.**

– Дзень і ноч перапісвала яна кнігі, якія потым прадаваліся ў манастыры, а грошы аддавала жабракам.

*Свечкі агарак на грубым стале,*
*Келля спрадвеку сырая,*
*Здані хаваюцца ў шэрай імгле,*
*Кніжкі чарніца чытае.*
*Словаў заморскіх разблытвае вязь,*
*Думкаю іх аздабляе.*
*Мудрасць і веліч, нікчэмнасць і гразь*
*Светлай душой спасцігае.*
*Новую кнігу на мове сваёй*
*Піша і піша чарніца.*

*Кожнае слова ўжо з новай душой*
*Мусіць вось тут нарадзіцца.*
*Піша чарніца, і думка яе*
*Цэлы свет абдымае.*
*Межаў даўно для яе не стае,*
*Цемра тых дум не стрымае.*

**Вучань 10-ы.**

– Паблізу Полацка Еўфрасіння заснавала жаночы і мужчынскі манастыры, пабудавала пяць новых школ. Не толькі дзяўчат вучылі ў іх, але і хлопцаў. Вучыла іх сама Еўфрасіння.

Усё жыццё яна старалася, каб храмы і манастыры вабілі да сябе, каб сэрцы людскія знаходзілі ў іх спакой і ачышчэнне ад зямных клопатаў.

**Вучань 11-ы.**

– Еўфрасіння знаходзілася ў цэнтры духоўнага жыцця Полацкага княства. Яна нястомна збірала вакол сябе таленавітых людзей, стала першай мецэнаткай.

Мясцовы майстар Лазар Богша зрабіў для Еўфрасінні ў 1161 годзе свой славуты крыж – бясцэнны помнік прыкладнога мастацтва.

Крыж – адначасова і каштоўны помнік старажытнабеларускага пісьменства. Кароткі дробны надпіс на адваротным баку паведамляе нам імя аўтара гэтага мастацкага шэдэўра і тое, што ён створаны для храма.

"ГОСПОДИ, ПОМОЗИ РАБОУ СВОЕМОУ ЛАЗОРЮ, НАРЕЧЕНОМОУ БОГЪШИ, СЪДЕЛАВЪШЕМОУ КРЬСТЪ ЦРЬКВИ СВЯТАГО СПАСА И ОФРОСИНЬИ".

**Вучань 12-ы.**

– Еўфрасіння першая з усходнеславянскіх жанчын здзейсніла паломніцтва ў Іерусалім. У гэтым нялёгкім падарожжы асветніца мела сустрэчу з візантыйскім імператарам Мануілам, які ішоў вайною на венграў. Сваяк прыняў Еўфрасінню вельмі прыязна і "с великою честью послал в Царьград", дзе славутую палачанку блаславіў патрыярх. Наведаўшы храм Святой Сафіі і набыўшы неабходныя ў святых мясцінах дарункі, полацкія паломнікі паехалі далей і ўвесну 1173 года дасягнулі Іерусаліма.

Захварэўшы ў дарозе, 23 мая таго ж года Еўфрасіння памерла і была пахавана ў Іерусалімскім манастыры святога Феадосія.

І толькі ў 1910 г. астанкі асветніцы даставілі ў заснаваны ёю Спаскі манастыр у Полацку, дзе яны захоўваюцца і сёння.

**Настаўнік.**

– Ёсць людскія лёсы, што прамільгнуць на жыццёвым небасхіле знічкай і знікнуць назаўсёды. А ёсць, што гараць стагоддзі яснай зоркай у сусвеце жыцця, прымушаюць нас углядацца ў высокую далячынь.

► **Замацаванне новага матэрыялу.**

– Дык хто ж яна, Прадслава, прападобная Еўфрасіння Полацкая? Каб адказаць на гэтае пытанне, дастаткова прачытаць, а то і перачытаць радкі яе "Жыція". (*Работа з падручнікам.*)

Найбольш распаўсюджанымі жанрамі літаратуры гэтага часу былі ЖЫЦІІ (*"Жыціе Барыса і Глеба"*, *"Жыціе Еўфрасінні Полацкай"*).

– Што ўяўляе сабой жанр жыція?

**Вучаніца.**

– У навуцы жыціе адзначаецца тэрмінам *агіяграфія* (ад грэч. *агіос* – 'святы', *графо* – 'пішу'). ***Жыціе*** – *апісанне жыцця святога ад нараджэння да смерці.*

Кампазіцыя жыція складалася з трох частак: **уступу**, **асноўнай часткі**, **заключэння**.

**Ва ўступе**, пасля малітвы да Бога, аўтар павінен прасіць прабачэння ў чытача, што не ўмее пісаць, за сваю нягоднасць, невуцтва, але просіць выслухаць яго.

**У асноўнай частцы** гаворыцца пра нараджэнне будучага святога, яго набожных бацькоў, пра юнацтва, жыццё і дзейнасць, смерць і дзівосы да або пасля яе.

**У заключэнні** даецца кваліфікацыя пахвала святому.

Творы пісаліся сябрамі святога пасля яго смерці і афіцыйнага прызнання святога царквой. Героі жыція або станоўчыя, або адмоўныя. Станоўчыя героі заўсёды ідэалізаваны і адзначаны ўсімі хрысціянскімі дабрачыннасцямі.

**Настаўнік.**

– Узорам гэтага жанру з'яўляецца "Жыціе Еўфрасінні Полацкай" – арыгінальны помнік старабеларускай літаратуры, створаны ў Полацку на мяжы XII – XIII стст. невядомым аўтарам. Поўная назва твора "Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і Найсвяцейшай Яго Маці, што ў горадзе Полацку".

Твор дайшоў да нас у шматлікіх рукапісах (больш за 100) канца XIV – XVIII ст. Найстарэйшы з вядомых нам спісаў (XII ст.), на жаль, не захаваўся. Але найбольшую каштоўнасць мае так званы Пагодзінскі спіс, які цяпер захоўваецца ў Публічнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу. У аснову перакладу Аляксея Мельнікава (што ў падручніку) пакладзены спіс, які захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Мінску.

► **Гутарка.**

1. "Жыціе Еўфрасінні Полацкай" – твор літаратуры Сярэднявечча. Абгрунтуйце гэтую думку.

*У творы расказваецца пра жыццё асветніцы пачатку XII ст., якую царква прызнала святой. Слова* ***святы́*** *мае прамое і пераноснае значэнні.*

*(Вучань чытае тлумачэнне слова са слоўніка.)*

*Слова* ***святы́*** *– шматзначнае.*

***Святы*** *– чалавек, які ўсё жыццё служыў Богу, а пасля смерці прызнаны заступнікам веруючых.* ***Святы*** *(перан. значэнне) – чалавек высокай маралі, бездакорны ў сваім жыцці, паводзінах, высакародны. А таксама – дарагі, паважаны, любімы.*

2. Якое з пералічаных значэнняў слова мы маем на ўвазе, калі сцвярджаем, што Еўфрасіння Полацкая – святая?

(*Усе тры значэнні слова.*)

3. Дома вы прачыталі "Жыціе Еўфрасінні Полацкай". Вызначце кампазіцыйныя часткі твора. Пра што ў іх апавядаецца?

Экспазіцыя – расказ пра род Еўфрасінні Полацкай.

Завязка – жаданне бацькі аддаць Прадславу замуж.

Кульмінацыя – рашэнне Прадславы ісці ў манастыр.

Развязка – смерць Еўфрасінні Полацкай.

Эпілог – хвала святой (апошні абзац).

4. Якія мастацкія прыёмы выкарыстаў старажытны аўтар, каб паказаць ідэальнасць гераіні?

Параўнанні: *“незвядальны квет райскага саду”*, *“арол, што ... прыляцеў з захаду”;*

гіпербалы: “*з нежаночаю сілаю прайшла ўсе гарады і ўладанні”*;

метафары: “*дождж вучэння на вас праліваю”*.

5. Якія рысы характару Еўфрасінні падкрэслівае аўтар?

*Міралюбівасць, памяркоўнасць, добразычлівасць.*

(Цытата з тэксту, с. 51. *“Іх не хацела яна бачыць, каб хто варагаваў: ні князь з князем, ні баярын з баярынам, ні з простых хто са сваім сябрам, але ўсіх жадала бачыць адзінадушнымі”*.)

6. Чаму павучала юная князёўна?

(Цытата з тэксту, с. 51. *“Старых вучыла цярпенню і ўстрыманню, юных – душэўнай чысціні і цялеснаму супакаенню, гавенню чэснаму, хаджэнню рахманаму, голасу ціхмянаму, слову дабрачыннаму, ядзенню і піццю маўкліваму; пры старэйшых маўчаць, мудрых слухаць; да старэйшых – пакоры, да роўных і меншых – любові некрывадушнай; мала казаць, а больш разумець”*.)

7. Якую частку твора можна назваць “пахвалой у гонар Еўфрасінні”?

(Цытата з тэксту, с. 55. *“Была яна дапамогай пакрыўджаным, суцяшэннем смуткуючым, распранутым – адзеннем, хворым – наведаннем ці, проста кажучы, для ўсіх была ўсім”*.)

**Настаўнік.**

– Еўфрасіння заўсёды думала пра людзей і сваю краіну.

**► Сацыяканструкцыя (праца ў групах).**

– Зараз падзелімся на групы. Кожная група атрымае заданне. Праз 2-3 хвіліны правяраем працу. *(Вучні працуюць на фоне спакойнай ціхай музыкі.)*

**1-я група.** Падрыхтаваць малюнак Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы. Расказаць пра гісторыю яе стварэння. (*Еўфрасіння Полацкая разумела, як шмат могуць даць новыя храмы і манастыры для асветы народа, таму звярнулася да дойліда Іаана з просьбай пабудаваць царкву Святога Спаса. Той ахвотна адклікнуўся на гэтую прапанову. Працавалі хутка, і царква была пабудавана ўсяго за 30 тыдняў. Цяпер гэтая царква называецца Спасаўскай, ці Спаса-Праабражэнскай.*)

**Настаўнік.**

– Царква захавалася да нашых дзён. Высокая, з магутнымі сценамі і ўсяго адным купалам, мае падабенства з вежай.

**2-я група.** Разгледзець малюнкі. Знайсці помнік нябеснай заступніцы беларусаў, выкананы сучасным скульптарам. Расказаць пра помнік.

[*28 жніўня 2000 г. у Полацку быў святочна адкрыты помнік Еўфрасінні Полацкай (аўтары: скульптар – Ігар Голубеў, архітэктар – Віктар Ягадніцкі.) Гэты вобраз знакавы для Беларусі. Высокі гранітны п’едэстал складанай формы выконвае двайную функцыю: па-першае, нібы падводзіць гледача да статуі, па-другое, уздымае Еўфрасінню “над натоўпам”, спрыяе стварэнню ўражання велічнасці вобраза. Манумент цалкам адпавядае рэлігійнаму канону выявы святой, што, здаецца, і добра – для большасці Еўфрасіння ўсё ж не асветніца, а Заступніца.*]

**3-я група.** Падрыхтаваць самастойна паведамленні: а) пра гісторыю стварэння крыжа Лазара Богшы, яго каштоўнасць і лёс бясцэннага твора; б) пра гісторыю з’яўлення абраза Адзігітрыі Полацкай.

***а) “Крыж, якому няма роўных”.***

*На заказ Еўфрасінні Полацкай у 1161 годзе мясцовы майстра зрабіў крыж, які ўвайшоў у гісторыю як крыж Лазара Богшы. Гэты крыж стаў беларускай нацыянальнай святыняй. Ён з’яўляўся каўчэгам для захавання хрысціянскіх рэліквій.*

*Крыж шасціканцовы. Яго аснова з кіпарысавага дрэва. Вышыня крыжа 51,8 см, даўжыня верхняга перакрыжавання – 14, ніжняга – 21, таўшчыня – 2,5 см. Зверху і знізу дрэва пакрыта золатам. Для гэтага выкарыстана 21 пласцінка. Кожная з іх аздоблена каштоўнымі камянямі.*

*Крыж – помнік старажытнабеларускага пісьменства. У кароткім надпісе паведамляецца імя яго аўтара, кошт дарагіх металаў і камянёў, выкарыстаных для аздобы. (За золата, срэбра, каштоўныя камяні і жэмчуг заплачана 100 грыўняў, за працу – 40 грыўняў. Грыўня – грашовая адзінка ў Старажытнай Русі: сярэбраны злітак вагою з 409,5 г – дзесяцікапеечная манета.)*

*На крыжы змешчаны праклён. Доўгі час ён дзейнічаў. Аднак у канцы XII – пачатку XIII ст. крыж забралі смаленскія князі, вярнуў яго на Радзіму Іван Грозны. У 1921 г. крыж рэквізавалі савецкія ўлады. Пасля ён трапіў у Магілёўскі краязнаўчы музей, адкуль знік пры нявысветленых абставінах.*

*Аднак Беларусь сённяшняя не можа жыць без гэтай святыні. Таму вядомы брэсцкі майстар Мікалай Кузьміч вырашыў зрабіць дакладную копію крыжа. Праца заняла не адзін год. Фундатарам выступіў прадпрымальнік з Сібіры, наш зямляк Анатоль Сілівончык.*

*9 снежня 1997 г. крыж, створаны Мікалаем Кузьмічом паводле арыгінала, быў асвячоны і ўрачыста перададзены ў Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр у Полацку. Пры гэтым прысутнічаў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт.*

***б) “Абраз Божае Маці”.***

*Над унутраным убранствам сабора шчыравалі мастакі. Як і ў Спасаўскай царкве, з’явілася нямала фрэсак. Але Еўфрасіння Полацкая хацела, каб сабор Багародзіцкага манастыра быў непадобны на іншыя. Захацелася асветніцы мець у саборы абраз Багародзіцы Эфескай. Усяго іх было тры. Яшчэ пры жыцці Дзевы Марыі, паводле падання, гэтыя абразы намаляваў з яе іканапісец апостал Лука.*

*Каб прывезці абраз Багародзіцы Эфескай у Полацк, патрабаваўся дазвол візантыйскага імператара Мануіла Комніна і патрыярха канстанцінопальскага Хрысаверга. Пасланец вёз багатыя мясцовыя дары. Акрамя таго, ён меў пры сабе спецыяльную грама-*

*ту. На гэтым дакументе асветніца выказала сваю просьбу.*

*Мануіл Комнін паставіўся да просьбы сваячкі з разуменнем. З Царграда (тагачасная назва Канстанцінопаля) у Эфес, дзе захоўваўся абраз, ён паслаў сто воінаў. Яны ўрачыста даставілі абраз у Царград. У саборы Святой Сафіі абраз атрымаў патрыяршае бласлаўленне. Дарунку Еўфрасіння вельмі ўзрадавалася.*

*Сёння гэты абраз пад назвай Адзігітрыі Полацкай захоўваецца ў фондах Рускага музея ў Санкт-Пецярбургу. "Адзігітрыя" ў перакладзе з грэчаскай мовы значыць 'Пуцяводная'.*

**Настаўнік.**

– Мошчы Еўфрасінні Полацкай вярнуліся на Радзіму, хоць шлях іх быў вельмі складаны. У дзень смерці асветніцы 23 мая (па новым стылі 5 чэрвеня) 1910 г. нятленныя астанкі Еўфрасінні прывезлі ў Спасаўскі сабор. Іх паклалі ў абкладзеную срэбрам кіпарысавую ра́ку.

З таго часу 5 чэрвеня лічыцца днём памяці святой Еўфрасінні Полацкай.

***Ра́ка – куфар, у якім захоўваюцца святыя мошчы.***

***Фрэска – малюнак вадзянымі фарбамі па свежаатынкаванай сцяне ці столі.***

У царкве Святога Спаса захавалася фрэска з выявай Еўфрасінні Полацкай.

– Паглядзім на гэтую фрэску. Што можаце сказаць пра вобраз асветніцы?

*(Позірк святой скіраваны ўдалячынь, у будучыню, пра якую марыла Еўфрасіння, ствараючы падмурак нацыянальнай культуры.)*

► **Абагульненне і сістэматызацыя ведаў.**

• Літаратурны дыктант-віктарына.

1. Еўфрасіння Полацкая была ўнучкай _____.

2. Які помнік старажытнай беларускай літаратуры стаў асноўнай крыніцай біяграфічных звестак пра Еўфрасінню? _____

Хто яго аўтар? _____

Дзе і калі ён быў створаны? _____

3. Сапраўднае імя асветніцы _____.

Калі яна назвалася Еўфрасінняй? _____

4. Як звалі бацькоў асветніцы? _____

5. Назавіце месца, куды адвёў анёл Еўфрасінню ў час яе сну. _____

6. Калі Прадслава прыняла пострыг? _____

7. Хто былі памочнікамі Еўфрасінні ў асветніцкай дзейнасці? _____

8. Назавіце імя дойліда, які пры пасрэдніцтве Еўфрасінні пабудаваў царкву Спаса ў Полацку. _____ _____ За які час? _____

9. Колькі школ адкрыла Еўфрасіння? _____

10. Народны майстар Лазар Богша стварыў _____ _____. З чаго быў зроблены крыж і чым упрыгожаны? _____

11. Колькі каштаваў крыж? _____

12. Калі ра́ка з мошчамі Еўфрасінні была перавезена ў Полацк? _____

13. Калі святкуюць дзень памяці святой Еўфрасінні Полацкай? _____

14. Расказваючы пра жыццё Еўфрасінні, аўтар у канцы твора называе асветніцу _____.

15. Жыціем называецца _____.

► **Рэфлексія.** Запоўніць "Ліст самаадчування".

**Ліст самаадчування.**

Прозвішча _____

(Пастаўце балы ад 1 да 10).

Ці справіўся ты з задачамі ўрока?

Ці спадабалася табе сёння працаваць на ўроку?

Які настрой у цябе быў на ўроку?

Ацані сваю працу на ўроку.

Ацані працу настаўніка на ўроку.

► **Дамашняе заданне.**

Адказаць на пытанні падручніка.

► **Заключныя заданні (слова настаўніка, прапаганда твораў пра Еўфрасінню Полацкую).**

– Лёс Еўфрасінні Полацкай сапраўды незвычайны. Яе самаадданае служэнне роднай зямлі ўзняло знакамітую палачанку высока над сваёй эпохай. І таму невыпадкова, што яе постаць прыцягвае ўвагу не толькі вучоных-гісторыкаў, але і пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў.

Да вобраза асветніцы звярталіся Вольга Іпатава (гістарычная аповесць "Прадслава"), Уладзімір Арлоў ("Еўфрасіння Полацкая", серыя "Святыя зямлі Беларускай" і "Таямніцы полацкай зямлі") і іншыя.

Еўфрасінні і яе славутым сучаснікам прысвяцілі свае вершы, паэмы, апавяданні А. Разанаў, Г. Бураўкін, А. Мінкін, С. Тарасаў і іншыя.

► **Выстаўленне адзнак.**

► **Падвядзенне вынікаў.**

– Хай жа для вас, мае шаноўныя сябры, гарыць зорка Еўфрасінні Полацкай. Хай яе справы асветляць і ваш жыццёвы шлях! Шчыра дзякую, сябры мае, за сур'ёзную і цікавую працу. Мне хацелася б, каб гэты ўрок не прайшоў для вас бясследна.

**Спіс літаратуры**

**Арлоў, У. А.** Еўфрасіння Полацкая / У. А. Арлоў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 220 с., [13] л. іл. – (Святыя зямлі Беларускай).

**Бондар, Т. М.** Спакуса. Раман / Т. М. Бондар. – Мінск, 1989.

**Іпатава, В. М.** Прадслава. Аповесці і апавяданні / В. М. Іпатава. – Мінск, 1997.

**Коўтун, В. М.** Пакліканыя : Раман / В. М. Коўтун. – Мінск : Полымя, 2002.

**Марціновіч, А. А.** Святая Еўфрасіння : Нарыс / А. А. Марціновіч. – Мінск, 2001.

**Марціновіч, А. А.** Зерне да зерня. Гісторыя ў асобах. Эсэ, нарысы / А. А. Марціновіч. – Мінск, 1996.

**Тарасаў, С.** Фрэскі : абразкі і апавяданні / С. Тарасаў. – Мінск, 2004.

**Штыхаў, Г.** Ажываюць сівыя стагоддзі / Г. Штыхаў // Школьнікам – аб гісторыі БССР / Г. Штыхаў. – Мінск, 1982.

**Качанка, Л.** Вера нашых бацькоў / Л. Качанка // Эўрыка : Нарысы : Для мал. і сярэд. шк. узросту / укл. Н. Філіповіч. – Мінск : Юнацтва, 2000. – 112 с., : іл.

*Профільнае навучанне*

Анжаліка САДОЎСКАЯ

# ФРАЗЕАЛОГІЯ Ў КАНТЭКСЦЕ КУЛЬТУРЫ

## ЭТНАЛІНГВІСТЫЧНЫ ПАДЫХОД ДА ВЫВУЧЭННЯ

Вынікам супярэчлівага, шматвектарнага развіцця мовазнаўства ў ХХ ст. стала прызнанне прыярытэту ідэі сістэмнасці і антрапацэнтрызму ў вывучэнні мовы і пераход на антрапалагічную парадыгму даследавання, згодна з якой у цэнтры ўвагі знаходзіцца комплекс праблем, звязаных з узаемадзеяннем чалавека і мовы.

Спалучыўшы розныя падыходы (камунікатыўны, дыскурсіўны, кагнітыўны і г. д.), антрапалагічная парадыгма адкрыла шырокія магчымасці для даследавання такіх значных для чалавека і грамадства феноменаў, як моўная свядомасць, індывідуальны і калектыўны менталітэт, канцэптасфера мовы, нацыянальна-культурныя каштоўнасці і стэрэатыпы і інш. У межах дадзенай парадыгмы ў апошнія дзесяцігоддзі цэнтрам увагі даследчыкаў сталі праблемы моўнай самасвядомасці асобы і лінгвакультурнай супольнасці, шырэй – праблемы ўзаемадзеяння мовы і культуры як дзвюх анталагічна розных, але звязаных адна з другой адносінамі ўзаемнай "прысутнасці" і ўзаемаўплыву сутнасцей. Мова пры гэтым трактуецца як механізм, які дзякуючы сваёй кумулятыўнай функцыі забяспечвае пераемнасць культурнай памяці народа, а тэкст, адпаведна, як прадукт нацыянальнай культуры.

Праблема "мова і культура" цікавіць мовазнаўцаў даўно. Ужо першыя этымалагічныя вопыты антычных граматык стымуляваліся ідэяй рэканструкцыі "сапраўднага" ўяўлення пра слова, імкненнем за кожным словам убачыць "першародны" вобраз прадмета ці з'явы. Прычым гісторыя і этымалогія ўстойлівых выразаў у гэтых адносінах заўсёды здаваліся найбольш перспектыўнымі, бо спалучэнне слоў ужо ўяўляе з сябе пэўны звязны тэкст, больш ці менш выкрышталізаваны вобраз. "Тэкст напрамую звязаны з культурай, бо ён насычаны мноствам культурных кодаў, менавіта тэкст захоўвае інфармацыю пра гісторыю, этнаграфію, нацыянальную псіхалогію, нацыянальныя паводзіны, гэта значыць, пра ўсё, што складае змест культуры" [4, с. 44 – 45].

Як адзначыў В. М. Макіенка, многія збіральнікі фальклору, этнографы, гісторыкі, мовазнаўцы ўжо больш за дзвесце гадоў спрабуюць раскрыць паходжанне тых або іншых фразем, прыказак і прымавак, убачыць за імі вытокі нацыянальнай культуры ці побытавых уяўленняў, "прачытаць скрыжалі забытага мінулага" [7, с. 3]. Нямала "культуралагічных тлумачэнняў" можна знайсці, напрыклад, у зборніках рускіх даследчыкаў У. І. Даля, Ф. І. Буслаева, І. М. Снегірова, М. Я. Ермакова, М. А. Рыбнікавай, А. І. Собалева, В. П. Бірукова, М. І. Міхельсона і інш. Шмат каштоўных, унікальных звестак пра беларускую народную духоўную спадчыну змяшчаюць працы такіх айчынных фальклярыстаў, этнографаў і мовазнаўцаў, як І. І. Насовіч, Е. Р. Раманаў, М. Я. Нікіфароўскі, М. М. Нікольскі, А. К. Сержпутоўскі, Я. А. Ляцкі, Я. Ф. Карскі.

З улікам сказанага відавочна, наколькі важным і патрэбным з'яўляецца для сучаснай лінгвістыкі вывучэнне культурна значнай фразеалогіі. Так, на думку В. М. Макіенкі, "ідыяматыка, што захавала культуралагічныя рэлікты", складае ядро нацыянальнай фразеалогіі [6, с. 83]. Згодна з меркаваннем М. І. Талстога, дыялектная фразеалогія, якая "адлюстроўвае міфалагічныя ўяўленні і павер'і або з'яўляецца часткай абрадаў і рытуалаў каляндарнага, сямейнага або іншага парадку, гэта сакральная народная фразеалогія" [11, с. 375]. І. А. Падзюкоў разглядае народную фразеалогію як "вынік і адначасова спосаб культурна-нацыянальнага светабачання", "комплекс культурных субстратаў", а сам фразеалагізм жывой народнай мовы як "своеасаблівы культурны знак" [9, с. 76]. В. А. Маслава называе фразеалагізмы, што адносяцца да этнакультурнай сферы, "міфалагічнай фразеалогіяй" [4, с. 5], "фразеалагізмамі-міфалагемамі, у якіх можна ўбачыць і расшыфраваць этнакультурную інфармацыю" [4, с. 89], "транслятарамі культурнай інфармацыі" [4, с. 11], "люстэркам жыцця нацыі" [5, с. 63]. "Частку фразеалагічнага фонду, у якой адлюстравана традыцыйная народная духоўная культура, захаваная ў свядомасці носьбітаў мовы, нягледзячы на супрацьдзеянне з боку хрысціянства і актыўны ўплыў на яе навуковага светапогляду", У. І. Коваль называе этнафразеалогіяй [2, с. 6].

Сёння пытанні адлюстравання пазамоўнай рэчаіснасці ў семантыцы моўных адзінак, а таксама пошуку "этнакультурнага кампанента" як састаўной часткі значэння фразеалагізмаў сталі аб'ектам вывучэння новых, прыярытэтных напрамкаў сучаснага мовазнаўства, такіх як этналінгвістыка, лінгвакультуралогія, кагнітыўная лінгвістыка, лінгвакраіназнаўства і іншыя, у межах якіх сфарміраваліся і новыя падыходы да аналізу фразеалагічных рэсурсаў у кантэксце культуры.

*Матэрыялы тэарэтычна-практычнага курса "Нацыянальна-культурны кампанент беларускай фразеалогіі", распрацаванага Анжалікай Садоўскай, "Роднае слова" друкуе з лютаўскага нумара.*

*Пра вобразы дрэў у традыцыйнай беларускай культуры ў "Родным слове" пісала Іна Швед: "На моры камень, на зямлі дуб, на небе месяц": Дуб у традыцыйнай беларускай культуры" (2004, № 2), «"...Ты радуйся, белая бяроза...": Бяроза як паэтычны сімвал беларускага фальклору» (1998, № 7).*

*Звесткі пра аўтара змешчаны ў № 2.*

**Этналінгвістычны аспект вывучэння фразеалогіі.** З'яўленне названага падыходу да аналізу фразеалагічных рэсурсаў звязана найперш з актыўным развіццём у апошнія дзесяцігоддзі такога новага і прыярытэтнага напрамку ў мовазнаўстве, як **этналінгвістыка** (грэч. *ethnos* – народ +франц. *linguistique* – навука аб мове), якая вывучае адлюстраванне ў мове народнага светапогляду, народнай духоўнай культуры. Асабліва цікавіць гэтую навуку сувязь адзінак мовы з народнымі павер'ямі, уяўленнямі, звычаямі, абрадамі і г. д.

Актуальнасць этналінгвістычнага аналізу фразеалогіі абумоўлена тым, што гэтая сфера валодае магутным культуразнаўчым патэнцыялам: 1) фразеалагічны матэрыял дазваляе працаваць з этнакультурнай інфармацыяй, што мае сістэмна-моўны характар; 2) фразеалагічны фонд кадзіруе інфармацыю пра ўспрыманне чалавекам навакольнай прасторы, якая з'яўляецца важным складнікам мадэлі свету; 3) фразеалагічны матэрыял цесна ўзаемадзейнічае з іншымі сферамі традыцыйнай духоўнай культуры і арганічна ўпісваецца ў яе кантэкст.

Этналінгвістычнае даследаванне мае справу з двайным адлюстраваннем (фрагмента рэчаіснасці ў свядомасці носьбіта культуры і фрагмента свядомасці ў мове) і павінна, з аднаго боку, вызначыць спецыфіку нацыянальна абумоўленага ўспрымання фрагмента рэчаіснасці ў свядомасці носьбіта культуры, з другога боку, паказаць асаблівасці моўнай трансляцыі інфармацыі пра дадзены фрагмент рэчаіснасці. У адносінах да фразеалагічнага матэрыялу такая двухадзіная задача можа быць сфармулявана так: **выявіць своеасаблівасць фразеалогіі як моўнай крыніцы інфармацыі пра духоўную культуру народа**. Вырашэннем гэтай і іншых задач і займаецца **этнафразеалогія** – "новы лінгвістычны напрамак на сумежжы фразеалогіі і этналінгвістыкі, які вывучае ўстойлівыя словазлучэнні ў этнакультурным аспекце" [3, с. 3 – 5].

Такім чынам, у працах этналінгвістычнага напрамку культурна-нацыянальная інтэрпрэтацыя фразеалагічнай адзінкі (далей – ФА) пачынае даследавацца ў прасторы народнай мудрасці. Пры гэтым улічваецца сістэма эталонаў і стэрэатыпаў культурна-нацыянальнай самасвядомасці лінгвакультурнай супольнасці і яе каштоўнасныя арыенціры, у сувязі з народнымі абрадамі, звычаямі, павер'ямі і традыцыйнымі ўяўленнямі пра з'явы навакольнага свету. ФА разглядаюцца як транслятары культурнай інфармацыі, як своеасаблівыя культурныя знакі, як пэўныя пазнавальныя канструкты, якія "па сваёй прыродзе прызначаны не столькі для намінацыі свету, колькі для яго культурнай інтэрпрэтацыі ў знакава-сімвалічнай форме, а падчас і своеасаблівага мадэліравання, бо, як і іншыя факты культурнай творчасці, яны перадаюць не столькі асабісты, індывідуальны, колькі уніфікаваны погляд на свет" [9, с. 76], калектыўны духоўны вопыт пэўнага народа.

Што датычыць метадалогіі этнафразеалагічных даследаванняў, то зыходным для іх стала асноўнае метадалагічнае палажэнне этналінгвістыкі пра сустрэчнае, парытэтнае апісанне народнай культуры праз факты яе адлюстравання ў нацыянальнай мове і інтэрпрэтацыі саміх моўных фактаў (у дадзеным выпадку – ФА) праз "глыбінны пазамоўны культурны кампанент" (так званы вертыкальны кантэкст; О. С. Ахманава, І. С. Гюбенет). Гэтае палажэнне з'яўляецца ў сучаснай этналінгвістыцы найбольш канструктыўным і аб'ектыўным у плане вырашэння праблемы "мова і культура". Такі комплексны падыход цалкам адпавядае сучаснай антрапалагічнай парадыгме даследавання мовы ў яе непарыўнай сувязі з чалавекам і культурай народа і прадугледжвае сінтэз уласна лінгвістычных метадаў з метадамі і дасягненнямі сумежных навук: этналінгвістыкі, лінгвакультуралогіі, лінгвакраіназнаўства, арэальнай і кагнітыўнай лінгвістыкі, этналогіі, міфалогіі, фальклярыстыкі і інш. Асноўнымі метадамі даследавання і апрацоўкі фразеалагічнага матэрыялу становяцца, напрыклад, метады семантычнага, кампанентнага, кантэкстуальнага і параўнальнага аналізу, метад канцэптуальнага аналізу для ключавога кампанента ў складзе ФА, апісальна-аналітычны метад, прыёмы статыстыкі, сістэмнай класіфікацыі і інш. Этнафразеалагічныя даследаванні вядуцца пераважна ў індуктыўным кірунку ад фактычнага матэрыялу да яго сістэматызацыі. Пры гэтым аналіз устойлівых выразаў праводзіцца на шырокім этнаграфічным, міфапаэтычным і фальклорным фоне, што дае магчымасць паглядзець на даследаваныя моўныя адзінкі праз прызму народнага светабачання.

Так, напрыклад, не кожнаму сучаснаму носьбіту беларускай мовы без спецыяльнага каментарыя будзе зразумелым значэнне і сутнасць беларускай прымаўкі *Начная зязюлька дзённую перакукуе.* Але, калі ўзяць пад увагу той факт, што ў традыцыйнай культуры беларусаў *зязюля* ўстойліва лічылася ўвасабленнем жаночага пачатку, а фразема *начная зязюля* ўжывалася для наймення жонкі, другой палавіны, то ўжо можна выказаць меркаванне, што прыведзены выраз датычыцца інтымных адносін паміж мужам і жонкай. Паводле ж звестак ураджэнкі Магілёўскай вобласці, у іх мясцовасці пад *дзённай зязюляй* разумеецца свякроў. І ў такім выпадку сэнс прыведзенага вышэй выразу заключаецца ў тым, што жонка для мужчыны важней за маці. Цікава, што ў польскай народнай культуры *начной зязюлькай* называюць жанчыну лёгкіх паводзін, каханку. Таму, натуральна, польскі варыянт прымаўкі – *Nocna gżegżółka zawsze dzienną przekuka* – гаворыць, што каханка для мужчыны важней, чым жонка.

Або толькі ў сувязі з этнакультурнай сімволікай вобраза *вераб'я* становіцца зразумелым змест беларускага вясельнага тоста *За вераб'я! Пілі, елі аж да дня.* Справа ў тым, што ў беларускіх казачных і лірычна-песенных сюжэтах, святочных карагодах і гульнях вобразу вераб'я надаецца сімволіка плоднасці, а таксама шлюбная, любоўна-эратычная сімволіка. Ён выступае ў якасці мужчынскага сімвала, малайца, які выбірае сабе дзяўчыну, а таксама ўдалога гулякі, каханка і нават спакусніка чужой жонкі [16, с. 167 – 173], напрыклад: *Чаму, верабейка, ды не жэнішся? / <…> – Во там у бары перапёлачка – / Для верабейкі была б жоначка; Ёсць у мяне качан капусты* (капуста – жаночы сімвал) *на градзе, / Ёсць у мяне верабеечка ў страсе. / Качан капусты – добрая патрава, / А верабеечка – тлустая заправа* і г. д. Паказальным у гэтым сэнсе з'яўляецца і народнае тлумачэнне сноў: *Вераб'я бачыць, злавіць – зацяжарыш, а калі ўжо няволька (замужам), дык радзіны скора* [1, с. 104].

Варта адзначыць таксама, што згадванне менавіта *капусты* ў прыведзеных прыкладах не выпадковае, а міфалагічна значымае, калі ўлічыць, што капусце ўласціва ярка выражаная жаночая сімволіка. Успом-

ніць хоць бы адно з нашых традыцыйных тлумачэнняў дзецям абставін іх нараджэння: *у капусце знайшлі*. Прычым цікава, што ў якасці зніжанага функцыянальнага замяшчальніка *капусты* ў беларускай культуры і фразеалогіі нярэдка выступае *крапіва*. Таму пра пазашлюбныя адносіны паміж мужчынам і жанчынай казалі: *у крапіве шлюб бралі*, а пазашлюбных дзяцей называлі *крапіўнікамі*.

У плане згаданых уяўленняў і моўных адзінак да месца будзе прывесці і яшчэ адну цікавую моўную "формулу" з'яўлення дзяцей: *заяц прынёс*, існаванне якой таксама варта звязаць з уяўленнямі пра *зайца* ў сферы народнай духоўнай культуры. З аднаго боку, добра вядомая прадуцыруючая і эратычная сімволіка зайца: параўнаем зварот *зайцаў хлеб* – рэшткі ежы, прывезенай дадому з лесу, лугу, якую прапануюць з'есці дзецям. На вяселлі выкананне песень "пра зайца" звычайна звязваецца з абрадам шлюбнай ночы і вызначэннем "чысціні" (цнатлівасці) нявесты. Ідэя "дзетароднасці" зайца адлюстравана ў выкарыстанні заечай крыві як сродку ад бясплоддзя. Сон пра злоўленага зайца прадказвае жанчыне цяжарнасць і нараджэнне сына. Вядома таксама павер'е , згодна з якім у апошніх каласах на хлебным полі знаходзіцца дух поля – *хлебны заяц*, ён увасабляе ўрадлівасць зямлі [3, с. 9].

Цікавы і этнакультурны каментарый такой беларускай прыказкі, як *Тады баба перастане, як (калі) (уся) сарока белай стане*. Думаецца, у аснову пакладзена беларускае павер'е, што з часам чорныя плямы ў сарокі знікнуць і яна зноў стане цалкам белай, але адбудзецца гэта тады, калі жанчыны перастануць нараджаць дзяцей, а рабіць гэта будуць толькі мужчыны [8, с. 192]. Аднак даследчык А. В. Гура не выключае і адваротнай сувязі: у павер'е магла трансфармавацца ў выніку літаральнай інтэрпрэтацыі, якая належыць, магчыма, нават не носьбітам традыцыі, а самому збіральніку, моўная формула з ідэяй немагчымасці сітуацыі тыпу *Тады сарока стане белай, калі мужчыны пачнуць нараджаць дзяцей* са значэннем 'ніколі сарока не перастане быць плямістай'.

Арыгінальная этналінгвістычная інтэрпрэтацыя знакаў мовы (у тым ліку і ФА) праводзіцца пераважна на матэрыяле ўсходнеславянскіх моў і мае ў славістыцы даўнюю і трывалую традыцыю [10]. Так, неаднаразова звярталася ўвага на генетычную сувязь прыказак, прымавак і ўласна фразеалагізмаў з народнымі звычаямі, абрадамі і рознымі павер'ямі ў вядомых слоўніках, зборніках прыказак, фальклорных і этнаграфічных працах І. М. Снегірова, С. В. Максімава, У. І. Даля, І. Франко, І. І. Насовіча, Я. Ф. Карскага, М. Федароўскага і іншых аўтараў XIX – пачатку XX ст. У пачатку 70-х г. фразеалогія (разам з адпаведнай лексікай) стала прадметам вывучэння маскоўскай этналінгвістычнай школы.

Пытанні нацыянальна-культурнага кампанента ў семантыцы ФА, а таксама паходжання і характарыстыкі асобных фразеалагізмаў народнай духоўнай культуры разглядаюцца ў працах такіх рускіх даследчыкаў, як І. А. Падзюкоў, В. М. Макіенка, Т. А. Агапкіна і А. Л. Тапаркоў, С. Х. Бітокава, А. І. Багуцкая, А. В. Буробін, Л. Быкава і Н. Сукаленка, Е. М. Верашчагін і В. Г. Кастамараў, Л. Н. Вінаградава, А. В. Гура, А. А. Дзмітрыева, Д. О. Дабравольскі, Л. А. Івашка, А. А. Кіпрыянава, С. М. Пракоп'ева, Т. Т. Варчанка, Л. І. Райзензон, О. А. Цярноўская, Ф. К. Бадаланава, Н. Т. Ходзіна, Т. З. Чарданцава і інш. Кашубская фразеалогія ў аспекце яе сувязі з традыцыйнай духоўнай культурай разглядаецца ў манаграфічным даследаванні польскага аўтара Е. Трэдэра. Украінскую фразеалогію ў арэальным і этымалагічным аспектах з актыўным выкарыстаннем этнакультурных звестак грунтоўна апісалі А. А. Іўчанка, В. Д. Ужчанка, Ф. П. Мядзведзеў.

На Беларусі найбольш поўна этнафразеалагічная праблематыка прадстаўлена ў навуковай творчасці гомельскага моваведа У. І. Коваля. Рускія і беларускія фразеалагізмы, генетычна звязаныя з народна-міфалагічнымі ўяўленнямі пра жывёл, расліны і неадушаўлёныя прадметы, аналізуюцца ў этналінгвістычным аспекце ў яго кнізе "Чым адгукаецца слова: Фразеалогія ў павер'ях, абрадах і звычаях" (1994). У манаграфіі аўтара "Восточнославянская этнофразеология: Деривация, семантика, происхождение" (1998) і яго дысертацыйнай рабоце прыводзіцца сістэмны аналіз фразеалагізмаў, якія адносяцца да сферы народнай духоўнай культуры: устанаўліваецца іх дэрывацыйная база, апісваюцца асноўныя фраземаўтваральныя мадэлі, вызначаюцца суадносіны паміж дэрывацыйнымі заканамернасцямі і характарам семантыкі фразем, што дазваляе, па словах даследчыка, найбольш аб'ектыўна ацэньваць унутраную форму ўстойлівых словазлучэнняў, якія не былі раней прадметам дыяхранічнага аналізу.

Непасрэдныя адносіны да этнафразеалогіі маюць даследаванні А. С. Аксамітава, прысвечаныя беларускай фразеалогіі фальклорнага паходжання, К. М. Гюлумянц, І. Я. Лепешава, Ф. М. Янкоўскага, М. А. Даніловіча, Т. В. Валодзінай, А. І. Халяўкі, Л. В. Чарнышовай, Г. І. Лапаціна, А. Л. Садоўскай і інш. Усходнеславянскія і польскія этнафраземы, суадносныя з канцэптам "дрэва", аналізуюцца ў працах М. Малохі.

Пытанні даследавання ФА ў этналінгвістычным аспекце абмяркоўваліся на міжнародных навуковых канферэнцыях, напрыклад: "Актуальные проблемы славянской фразеологии" (Гомель, 1999); "Славянская фразеология в ареальном, историческом и этнокультурном аспектах" (Гомель, 2001); "Актуальные проблемы исследования языка и речи": секция "Этнолингвистика и фразеология" (Мінск, 2001); "Национально-культурный компонент в тексте и языке": секция "Наивная картина мира, отражённая во фразеологии и паремиологии" (Мінск, 1999); "Язык и социум": секция "Язык и национальная культура" (Мінск, 2000; 2001) і інш.

Такім чынам, этналінгвістычны напрамак становіцца адным з прыярытэтных у сучасных фразеалагічных даследаваннях. Фразеалагізм разглядаецца як вынік і адначасова спосаб культурна-нацыянальнага светабачання, а інтэрпрэтацыя яго семантыкі немінуча прыводзіць даследчыка-этналінгвіста да праблематыкі культурнага кантэксту.

**Спіс літаратуры**

1. **Беларускі народны соннік** / Укл. і прадм. У. Васілевіча. – Мінск, 1995.

2. **Коваль, В. И.** Фразеология народной духовной культуры в деривационно-семантическом аспекте : дис. … д-ра филол. наук: 10.02.01, 10.02.02 / В. И. Коваль. – Минск, 1999.

3. **Коваль, У. І.** Славянская этнафразеалогія ў дэрывацыйна-дыяхранічным аспекце / У. І. Коваль // XII Міжнар. з'езд славістаў : даклады. – Гомель, 1998.

4. **Маслова, В. А.** Введение в лингвокультурологию : учебное пособие / В. А. Маслова. – М. : Наследие, 1997.

5. **Маслова, В. А.** Языковая картина мира и культура / В. А. Маслова // Когнитивная лингвистика конца XX века : материалы междунар. науч. конф., Минск, 7 – 9 окт. 1997 г. : в 3 ч. / Минский гос. лингв. ун-т. – Минск, 1997. – Ч. 1. – С. 59 – 64.

6. **Мокиенко, В. М.** Культурологические комментарии в историко-этимологическом словаре фразеологии / В. М. Мокиенко // Словарь и культура. К столетию с начала публикации "Словаря болгарского языка" Н. Герова : материалы междунар. науч. конф. / Рос. акад наук, Ин-т славяновед. и балканистики. – М., 1995. – С. 81 – 83.

7. **Мокиенко, В. М.** Образы русской речи : Ист.-этимолог. и этнолингвист. очерки фразеологии / В. М. Мокиенко. – Л. : ЛГУ, 1986.

8. **Никифоровский, Н. Я.** Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровский. – Витебск, 1897.

9. **Подюков, И. А.** Культурно-семиотические аспекты народной фразеологии : дис. … д-ра филол. наук : 10.02.01 / И. А, Подюков. – Пермь, 1996.

10. **Садоўская, А. Л.** Этналінгвістычны аспект у фразеалогіі / А. Л. Садоўская // Працы кафедры сучаснай беларускай мовы. Вып. 2 / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск, 2003. – С. 121 – 128.

11. **Телия, В. Н.** Русская фразеология. Семантический, прагматический и лингвокультурологический аспекты / В. Н. Телия. – М. : Языки русской культуры, 1996.

12. **Толстой, Н. И.** Язык и культура. Очерки по славянской мифологии и этнолингвистике / Н. И. Толстой. – М. : Индрик, 2-е изд., испр. – 1995.

13. **Тульцева, Л. А.** Символика воробья в обрядах и обрядовом фольклоре (в связи с вопросом о культе птиц в аграрном календаре) / Л. А. Тульцева // Обряды и обрядовый фольклор: сб. ст. / Акад. наук СССР, Ин-т этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая; отв. ред. В. К. Соколова. – М., 1982. – С. 163 – 179.

### Пытанні для самаправеркі

1. Што такое *этналінгвістыка* і *этнафразеалогія*?

2. У чым заключаюцца сутнасць і актуальнасць этналінгвістычнага падыходу да аналізу фразеалагічных рэсурсаў мовы?

3. Якім чынам разглядаецца фразеалагізм у працах этналінгвістычнага напрамку?

4. Раскажыце пра спецыфіку метадалогіі этнафразеалагічных даследаванняў.

5. Ці прадстаўлена этнафразеалагічная праблематыка ў працах беларускіх даследчыкаў? Прывядзіце прыклады.

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАДАННІ ПА ЭТНАФРАЗЕАЛОГІІ

**Заданне 1.** Знайдзіце, якія сімвалічныя і міфалагічныя ўяўленні пра *крумкача* і *варону*, пералічаныя ў другім слупку, адпавядаюць прыведзеным фразеалагічным адзінкам. Па магчымасці прывядзіце свае прыклады фразем, прымавак і прыказак, у якіх прадстаўлены абазначаныя культурныя ўяўленні.

| | |
|---|---|
| 1. Варона загуменная. | 1. Нячыстыя, д'ябальскія, праклятыя, злавесныя птушкі, звязаныя з душамі памерлых і замагільным светам. |
| 2. Як варона на дождж. | 2. Вестуны змены надвор'я, няшчасцяў, вайны і смерці. |
| 3. Як чорнаму ворану не паможа мыла, так даўленіку кадзіла. | 3. Увасабленне палахлівасці, баязлівасці і празмернай асцярожнасці. |
| 4. (Як) мокрая варона. | 4. Увасабленне драпежнасці, крыважэрнасці, разбою. |
| 5. Пужаная варона. | 5. Увасабленне прастакаватасці, няўважлівасці, нерастаропнасці. |
| 6. Які б гэта быў крук, каб выпусціў з рук. | 6. Увасабленне разгубленасці, збянтэжанасці, разяватасці. |

**Даведка.** У аснову старажытных уяўленняў пра *варону* і *крумкача* пакладзены пэўныя міфалагемы, якія і фарміруюць семантыку фразеалагізмаў з названымі арнітонімамі, а таксама абумоўліваюць іх нацыянальна-культурныя канатацыі: крумкач і варона – нячыстыя, д'ябальскія, праклятыя, злавесныя птушкі, звязаныя з душамі памерлых і замагільным светам, медыятары паміж жыццём і смерцю [*Паможа вароне мыла, як памерламу кадзіла*; *Як чорнаму ворану не паможа мыла, так даўленіку кадзіла*; *Колькі варону ні мый, белай не будзе*; *Абы падла, вароны назлятаюцца*; *Вароны крукаюць, падла чуюць*; *Куды вароне ні ляцець, а падаль кляваць*; *За варону замуж аддаць* (каго-н.) – г. зн. выкінуць за плот (здохлую ці блізкую да смерці свойскую жывёлу ці птушку); *За варону замуж збіраецца* (ужыв. пры дзейніку, абазначае свойскіх птушак, жывёл) – г. зн. зусім хілы, блізкі да смерці]. Беларуская прымаўка *Туды і маіх касцей воран не занясе* з семантыкай "вельмі далёка" мае яшчэ адно імпліцытнае значэнне "на тым свеце". *Крумкач* і *варона* – вестуны змены надвор'я, няшчасцяў, вайны і смерці: *як варона на дождж*; *Варона на калок, селянін на палок*; *На чорта адкладваюць, калі ўжо вароны каркаюць*. Варона – увасабленне палахлівасці, баязлівасці і празмернай асцярожнасці: *Напалоханая варона і вераб'я (куста) баіцца*; *пужаная варона* (разм.) – залішне асцярожны чалавек, які праз перажытыя выпрабаванні баіцца нават таго, што не пагражае яму небяспекай; *Мужык як варона, ды ўсё жонцы абарона*. Варона і крумкач – крыважэрныя драпежнікі, "разбойнікі": *Які б гэта быў крук, каб выпусціў з рук*; *Сорам не воран, вочы не выдзяўбе*; *Няхай табе крук вочы выесць!* (праклён). Варона – увасабленне прастакаватасці, няўважлівасці, нерастаропнасці, нехлямяжасці, разгубленасці, разяватасці: *(як) мокрая варона* – пра збянтэжанага, разгубленага чалавека; *варона загуменная* – нерастаропны, нехлямяжы чалавек, разявака; *лавіць варон* – 1. Рассеяна глядзець на што-н. з пустой цікавасцю. 2. Быць няспрытным, непаваротлівым, прапускаць зручны момант; *страляць варон*, *лічыць варон* – 1. Праяўляць няўважлівасць, рассеянасць. 2. Упустую траціць час, гультаяваць. 3. Марудзячы, прапускаць зручны момант; *вароняка зловіты* – не ўбачыць па няўважлівасці; *прыкідвацца варонай*; *глядзіць як варона*; *дурны як варона*; *Глядзіць, як варона, а хітры, як чорт*; *Хітрая як ліса, а дурная як варона*.

**Заданне 2.** Вызначце, увасабленнем або сімвалам чаго з'яўляюцца словы-кампаненты ў наступных беларускіх фразеалагізмах, прыказках і прымаўках:

***Салавей*** *– пець (залівацца) салаўём; засвістаў як салавей; Свішчы не свішчы, а салаўём не будзеш; Не вучы салаўя песні пець; Салавей пяе, ды хлеба не дае; на душы салаўі (спяваюць); Салавей у клетцы (у няволі) не спявае*; *Не трэба салавейку залатая (маляваная) клетка, а трэба салавейку зялёная ветка.*

***Бяроза*** *– дзяўчына як бярозка; бярозаю ліцца* (горка плакаць)*; бярэзінкаю слацца* (дагаджаць); *пайшоў у бярозкі* (памёр); *пень бярозавы, даць бярозавай кашы; прыстаў як бярозавы ліст у лазні.*

***Дуб*** *– малойчык, як дубочак; хлопец, як дуб; плесці смаленага дуба* (гаварыць небыліцы)*; даць дуба; за дубовымі дзвярамі; уцячы (пайсці) за дубовыя дзверы; дубовая галава.*

***Агонь** – агнём і мячом; гульня з агнём; ісці агнём; пускаць (з) агнём; як агнём спаліла; між двух агнёў; падкінуць агню ў хату; выклікаць агонь на сябе.*

***Зямля** – зраўняць з зямлёй; пайсці ў зямлю; парыць зямлю; за трыдзевяць зямель; пад зямлёй знайсці; вісець паміж небам і зямлёй; бачыць на тры сажні пад зямлёй.*

***Прыкладны ўзор аналізу:***

ФА з кампанентам ***салавей.*** У фразеалагізмах *пець (залівацца) салаўём; засвістаў як салавей; Свішчы не свішчы, а салаўём не будзеш; Не вучы салаўя песні пець* салавей з'яўляецца эталонам развітай маўленчай здольнасці, умення красамоўна гаварыць. У прымаўцы *Салавей пяе, ды хлеба не дае* салаўём іранічна называюць гаваруна, балабона, які прыгожа гаворыць, шмат абяцае, а мала робіць. Ва ўстойлівых моўных адзінках *Салавей у клетцы (у няволі) не спявае*; *Не трэба салавейку залатая (маляваная) клетка, а трэба салавейку зялёная ветка* праз вобраз салаўя перадаецца ідэя свабодалюбства.

ФА з кампанентам ***бяроза.*** У кампаратыве *дзяўчына як бярозка* бяроза сімвалізуе жаночы пачатак, вобраз бярозкі становіцца эстэтычнай меркай, узорам дзявоцкай прыгажосці і дасканаласці. Дзеяслоўны фразеалагізм *бярозаю ліцца* (горка плакаць) прэзентуе бярозу як увасабленне самоты і горычы, пераважна жаночай (у народнай свядомасці вобраз бярозы, якая хістаецца і нахіляецца да зямлі, традыцыйна асацыіруецца з дзяўчынай у самоце. Ніцая бяроза са схіленым веццем сімвалізуе горыч). У фразеалагізме *бярэзінкаю слацца* кампанент *бяроза* сімвалізуе гнуткасць і дагаджанне, што звязана непасрэдна з гнуткасцю бярозавага вецця. Ва ўстойлівай форме *пайшоў у бярозкі* кампанент *бяроза* сімвалізуе "той" свет, яна – медыятар паміж жыццём і смерцю – цесна звязана з душамі памерлых. Чаму менавіта бярозкі ўяўляліся ўмяшчальніцамі душ памерлых? Гэта звязана найперш з белым колерам бяросты. Белы колер – сімвал трансфармацыі, небыцця, пераходу з аднаго свету ў іншы. З'яўляючыся "сувязной" паміж "гэтым" і "тым" светам, бяроза адначасова звязвалася са смерцю, жыццём і бессмяротнасцю. З гэтай прычыны бяроза лічылася як шчаслівым, жыццядайным дрэвам, так і дрэвам, якое можа прыносіць шкоду, няшчасце і пакуты. Таму яе неабходна было ўшаноўваць. Фразеалагізм *пень бярозавы* ўжываецца са значэннем "прастакаваты, неразумны, дурны, легкадумны, няўмелы" ў дачыненні да чалавека. Фразеалагізм мае адмоўную семантыку перадусім таму, што ніз дрэва – пень – успрымаецца ў народнай культуры як штосьці дрэннае, мёртвае, не здольнае да жыцця, а таму звязваецца са хтанічным светам і нячыстай сілай. Названы вобраз узмацняецца ад'ектыўным кампанентам *бярозавы*, праз які актуалізуецца ў дадзеным выпадку менавіта "нячыстая" семантыка дрэва. Варта адзначыць, што "раслінны" кампанент часта выкарыстоўваецца ў фразеалагізмах, што асэнсоўваюць і перадаюць заганы чалавека, звязаныя з адсутнасцю або недастатковым праяўленнем розуму, напрыклад: *пусты колас; доўбня рабінавая; слуп асінавы; даўбешка асінавая; галава садовая (яловая, дубовая, малінавая, капусцяная); куст альховы; пень асінавы; пень пнём; палена дурное; галава, што качан капусты; гарбуз, а не галава; блёкату (воўчага маку) аб'есціся; з дуба звалiўся* і інш. Відавочна, што ўсе названыя моўныя адзінкі валодаюць моцнай эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбаванасцю, у іх яскрава праяўляецца ацэначны кампанент. Фразеалагізм *даць бярозавай кашы* ўжываецца са значэннем "пакараць", такім чынам, *бяроза* ў дадзеным выпадку выступае ў якасці выхаваўчага сродку. Справа ў тым, што здаўна бярозавым розгам прыпісвалася здольнасць не толькі адганяць нячыстую сілу, але і выганяць самаўпраўства са злачынцаў, прыгонных сялян і дзяцей. Да XX ст. бярозавыя розгі прымяняліся для пакарання і "выхавання" ў школе *(бяроза розум дае).* Значэнне "атрымліваць пакаранне" прадстаўлена ў беларускай мове фразеалагічнай адзінкай *з'есці бярозавай кашы.* Фразеалагізм *прыстаў як бярозавы ліст у лазні* гаворыць пра адно з функцыянальных прызначэнняў бярозы і выступае як своеасаблівы атрыбут чысціні. Пра бярозу нават спявалі ў народзе як пра дрэва, якое выконвае чатыры справы: *першая справа – сусвет асвяшчаць, другая справа – крык сунімаць, трэцяя справа – хворых лячыць, чацвёртая справа – чысціню падтрымліваць* (першае – бярозавая лучына, якая выкарыстоўвалася для асвятлення памяшканняў, другое – дзёгаць для змазкі колаў, трэцяе – бярозавы сок, бярозавыя пупышкі і лісточкі, якія і да сёння прымяняюцца ў медыцынскай практыцы, а раней былі надзейным сродкам народнай лячэбнай магіі, чацвёртае – лазня, якая награвалася бярозавымі дровамі).

ФА з кампанентам ***дуб***. У кампаратывах *малойчык, як дубочак; хлопец, як дуб* кампанент *дуб* становіцца своеасаблівай эстэтычнай мерай, узорам дасканаласці, магутнай велічы, прэзентуе мужчынскі пачатак, моц і цвёрдасць; у кампаратывах *здаровы як дуб* і *здаровы, як дуб скарбовы* лексема *дуб* сімвалізуе моцнае здароўе; іменны кампанент дзеяслоўнай фразеалагічнай адзінкі *даць дуба* традыцыйна звязваецца з лексемай *дуб* у значэнні "дубовая калода, труна" і ў значэнні "зроблены з гэтага дрэва човен". Гэты фразеалагізм дадаткова ўказвае на архаічны спосаб пахавання чалавека ў ладдзі; у фразеалагізмах *за дубовымі дзвярамі*; *уцячы (пайсці) за дубовыя дзверы* дуб сімвалізуе моц і надзейнасць; фразеалагічная адзінка *дубовая галава* ўказвае на неразумнага чалавека, на цвёрдасць "драўлянага" розуму.

***Заданне 3.*** Знайдзіце беларускія адпаведнікі да ўстойлівых выразаў рускай мовы. Па магчымасці растлумачце іх значэнне.

| | |
|---|---|
| 1. Лой скуру пад'ядае. | 1. Без работы и репу не вырастишь. |
| 2. Без сівухі і суддзі глухі. | 2. Видна птица по полету. |
| 3. Як дбаеш, так і маеш. | 3. Бабушкины сказки. |
| 4. Якое карэнне, такое і насенне. | 4. С жиру беситься. |
| 5. На ласкавым хлебе быць. | 5. Не подмажешь – не поедешь. |
| 6. Святым духам жыць. | 6. Когда рак на горе свистнет. |
| 7. Як на далоні валасы парастуць. | 7. По матери дочка пошла. |
| 8. Круп шылам наеўся. | 8. Сидеть на шее. |
| 9. Плёткі старой цёткі. | 9. Сидеть на пище святого Антония. |
| 10. Відаць пана па халявах. | 10. Несолоно хлебавши. |

*Шматграннасць слова*

# “АГОНЬ ДУШЫ І СЭРЦА ЖАР”

## СІНЕСТЭЗІЯ ЯК ПРАДУКТЫЎНАЯ МАДЭЛЬ МЕТАФАРЫЗАЦЫІ

Метафара як спосаб пазнання ляжыць у аснове чалавечага ўяўлення пра свет і дапамагае тлумачыць недаступнае непасрэднаму ўспрыманню, усталёўваць сувязь паміж з’явамі рэчаіснасці і вопытам чалавека. Найчасцей чалавек абапіраецца на свае фізічныя адчуванні, давярае ім – нездарма ў кожнай мове столькі выразаў, што падкрэсліваюць значнасць магчымасці ўбачыць, пачуць, панюхаць, дакрануцца, каб зразумець.

Багаты пласт метафар, якія заснаваны на пераносах са сферы ўспрымання ў іншыя сферы чалавечага вопыту (у тым ліку псіхалагічную сферу). Большасць вучоных называе такі тып пераносу **сінестэзіяй**. У скрыжаванні адчуванняў можна бачыць інтуітыўнае імкненне розуму ўспрымаць свет не дыскрэтна, як гэта робіць навука, але сінтэтычна, у яго адзінстве, бягучасці, у звязанасці і ўзаемазалежнасці яго элементаў, з улікам незлічоных аналогій і тоеснасцяў [1, с. 57].

Калі разгледзець метафарычныя пераносы ў рамках самой сферы ўспрымання*, то можна заўважыць агульную заканамернасць: пераходзячы ў сферу абазначэння іншага адчування, сінестэтычныя лексіка-семантычныя варыянты (далей – ЛСВ) страчваюць свае першапачатковыя семантычныя кампаненты і рэалізуюць адцягненыя колькасныя і якасныя значэнні, выражаючы адпаведна інтэнсіўнасць і ацэнку [2, с. 18]. Аднак нельга сказаць, што семантыка першасных ЛСВ цалкам замяняецца (напрыклад, нельга лічыць абсалютна адпаведнымі “слодыч”, “цяпло” і “святло пачуццяў”). Менавіта “высвечванне” адных і “зацямненне” другіх сем дапамагае ўсталёўваць сувязь паміж кагнітыўнымі структурамі мэты і крыніцы. Асаблівасцю большасці сінестэтычных полісемантаў псіхалагічнай сферы з’яўляецца тое, што яны называюць не прадметы (хаця з’яўляюцца субстантывамі), а якасці, што ўспрымаюцца органамі пачуццяў.

Апісваючы механізмы метафарычных пераносаў у сферы “чалавек”, Ю. Апрэсян прадстаўляе чалавека як унутрана арганізаваную сістэму (фізічнае ўспрыманне, фізіялагічныя станы, фізіялагічныя рэакцыі, фізічныя дзеянні, жаданні, мысленне і інтэлектуальную дзейнасць, эмоцыі і маўленне), дзе кожная наступная падструктура з’яўляецца больш складанай адносна папярэдняй, прычым крытэрыямі складанасці сістэм выступае колькасць лексічных і граматычных адзінак, якія яе абслугоўваюць, а таксама колькасць лексем адной сістэмы, што выкарыстоўваюцца для тлумачэння лексем больш складанай сістэмы (у артыкулах тлумачальных слоўнікаў) [3, с. 42 – 45].

Калі супаставіць зробленыя навукоўцамі высновы адносна падпарадкавання сістэмных адзінак у сферах “чалавек” і “фізічнае ўспрыманне”, то можна сцвярджаць, што як словы лексічных груп з семантычным ядром “дотык” і “смак” могуць выкарыстоўвацца для абазначэння слыхавых і зрокавых вобразаў, так і лексемы сістэмы “фізічнае ўспрыманне” – для абазначэння фізічных дзеянняў, рэакцый, жаданняў і эмоцый, разумовай і маўленчай дзейнасці. Менавіта такія пераносы мы называем у дадзеным артыкуле сінестэзіяй.

Такім чынам, сінестэзія як прадуктыўная мадэль утварэння новых ЛСВ для найменняў з’яў псіхічнага свету заснавана на метафарычных пераносах лексем з семантычнай падсістэмы “фізічнае ўспрыманне” на назвы псіхічных станаў, рэакцый і г. д.

У чым асаблівасць метафарычных абазначэнняў псіхічных станаў і працэсаў лексемамі сінестэтычнай сферы? У першую чаргу, у іх “адчувальнасці”: каб зрабіць інфармацыю аб пачуццях найбольш даступнай для разумення адрасатам, адрасант “апрадмечвае” адцягненыя паняцці, апелюючы да канкрэтных адчуванняў. Па-другое, сінестэтычныя ЛСВ амаль заўсёды выражаюць валентнасць (пазітыўнае або негатыўнае перажыванне) і інтэнсіўнасць псіхічных станаў.

У беларускай мове, адпаведна агульнаму закону метафарызацыі, існуе вялікая колькасць сінестэтычных абазначэнняў эмоцый, пачуццяў, паводзін чалавека. На аснове аналізу і сістэматызацыі узуальных полісемантаў намі былі вылучаны некалькі моўных метафарычных мадэляў, кожная з якіх прадстаўлена больш або менш багатым спісам полісемантаў, аб’яднаных агульнасцю крыніцы метафарызацыі і механізмам развіцця пераноснага значэння.

**1. Тактыльныя якасці прадметаў → псіхічныя якасці чалавека.** Тактыльныя вобразы (няроўнасць, падатлівасць, нацягнутасць, тонкасць, вастрыня, прытупленасць, лёгкасць, цяжкасць, скаванасць, скамяненне, цвёрдасць, чэрствасць, сухасць, мяккасць, размякласць, ліпкасць і інш.) ужываюцца для характарыстыкі знешняга праяўлення псіхічных станаў (у знешнім выглядзе, позірку, маўленні), а таксама якасці ці стану душы: *Не, брат Нязвычны, не раджу я табе быць такім, як я, рахманым і падатлівым: ні да чаго не прывядзе гэта* ***падатлівасць****. Трэба быць цвёрдым (Ц. Гартны). Даўно не адчуваў Пракоп такой* ***лёгкасці****, такога спакою на душы, як цяпер (Я. Колас). Думы, роздумы, меркаванні і здагадкі адбілі Багдану сон, ахуталі прыкрай* ***цяжкасцю*** *душу (А. Кулакоўскі). Зандлер чакаў з пагрозлівай* ***скамянеласцю*** *на твары (В. Быкаў). Але ж трэба і характар паказаць, і выявіць станоўчасць і* ***цвёрдасць*** *сваю (Я. Колас). Таня паказала зусім новы бок сваёй душы,* ***чэрствасць*** *няўдзячнага эгаізму (М. Машара). З Ігнасёвымі словамі* ***сухасць*** *сплыла з твару* [дзяўчыны] *і гуллівая весялосць заіграла на шчоках (Р. Мурашка). Пры ўсёй* ***мяккасці*** *свае натуры, панна Ядвіга была гордая дзяўчына (Я. Колас).*

**2. Тэмпературныя адчуванні → валентнасць і інтэнсіўнасць пачуццяў.** Тэмпературныя полісеманты (холад, халоднасць, лютасць, цяпло, цеплыня, гарачыня, пал, жар і інш.) звычайна заснаваны на метафарызацыі семы “холад” у значэнні “адмоўныя ці неінтэнсіўныя пачуцці”, семы “цяпло” – у значэн-

* У сучасных даследаваннях разглядаюцца шэсць пачуццяў: зрок, слых, абанянне (нюх), смак, дотык і тэмпературныя адчуванні.

ні "станоўчыя пачуцці", семы "гарачыня, напал" – у значэнні "інтэнсіўныя пачуцці": *Сымон Ракуцька бачыў гэты* ***холад*** *на маладым твары невядомага падарожнага і пачаў траціць сваю ранейшую ажыўленасць (К. Чорны). Хлопчык адчуў* ***халоднасць*** *у... словах* [Азаркевіча] *і, зажмурыўшыся, адышоўся да сваёй калясачкі (А. Якімовіч). З лесу паказалася некалькі адзінокіх аленяў. З'яўленне іх выклікала ў сямейнага аленя прыступ* ***люцасці*** *і гневу (В. Вольскі). Многа вёсен прайшло, / Я ж заўжды адчуваю / Ў сваім сэрцы* ***цяпло*** */ І любоў к свайму краю (А. Астрэйка). Нам не забыць навечна / Цудоўнай дружбы дні, / Сяброўскіх слоў сардэчных, / Сяброўскай* ***цеплыні*** *(К. Кірэенка). Пытанне, кінутае ў натоўп так проста і неспадзявана, ахаладзіла* ***пал*** *сялянскай злосці (Я. Колас).*

**3. Смакавыя адчуванні → псіхічныя рэакцыі і ацэнка.** Смакавыя вобразы (горкасць, горыч, солад, слодыч, саладжавасць, пікантнасць, прэснасць, ядавітасць і інш.) найчасцей выражаюць ацэнку чалавекам адчування або перажывання, выкліканага знешнім уздзеяннем: *Малая не магла ўседзець дома... пакуль не сплыла патроху* ***горкасць*** *з душы (К. Чорны). Апошні месяц Міця адчувае сябе роўным з сябрамі і ўдосталь п'е* ***слодыч*** *гэтага цудоўнага пачуцця (І. Навуменка). Сэрца захліпалася ад невядомае* ***саладосці****, шчымела і ныла (Р. Мурашка). Печку Алесь недалюбліваў за* ***саладжавасць*** *усмешачкі і ласканне абцасамі, хоць гэта і вельмі тут прыдалося (Я. Брыль).*

**4. Слыхавое ўспрыманне → рэфлексійныя перажыванні.** Слыхавыя вобразы (водгук, водгулле, рэха, розгалас, рэзананс і інш.) пераважна ўжываюцца для апісання рэакцыі чалавека на пэўныя падзеі, прычым "гукавая насычанасць" зыходных значэнняў вызначае інтэнсіўнасць метафарычных ЛСВ: ***Водгук*** *на чужое гора жыў у... сэрцы* [Ядвісі] *(Я. Колас). Даўно ўжо юнацтва мінулася, / А ўдзячнасць жыве у душы, /* ***Водгуллем*** *адгукнулася, / Прыстала, сказала: пішы (В. Вітка). Я веру, песень маіх кліч бунтарскі / Знаходзіць* ***водгук*** *будзе ў сэрцах братніх (Я. Купала).* Полісеманты дадзенай сферы часта ўжываюцца ў публіцыстычным стылі, крытычных артыкулах: [Песня] *сцвярджае народнасць героя, з'яўляючыся народным* ***рэхам*** *тых ідэй, якія сеяў у масах Каліноўскі (У. Калеснік).*

**5. Абаняльныя адчуванні → эмацыянальная ацэнка.** Нешматлікія полісеманты абаняльнай падгрупы (душок, смурод, тлятворнасць, удушлівасць) абазначаюць ацэнку пачуццяў, якасцей чалавека з пункту гледжання маральнасці ці ўплыву на яго самаадчуванне: *Чакаеш, пакуль* [збожжа] *высыплецца? Ведаю я твой кулацкі* ***душок****! (М. Лобан). Што прайшло, таго не вернеш, і няма тут чаго каяцца. Добра ўжо і тое, што хоць пачулі* ***смурод*** *местачковага балота... (Я. Колас).*

**6. Зрокавае ўспрыманне → якасць і інтэнсіўнасць перажыванняў.** Зрокавыя полісеманты (цемната, цень, чарната, шэрасць, адбітак, глянец, водсвет, праблісk, прасвятленне, святло, бляск, ззянне, празрыстасць і інш.) маюць найбольш шырокі спектр метафарычных значэнняў, яны выражаюць станоўчую ці адмоўную эмацыянальную ацэнку перажыванняў, а таксама інтэнсіўнасць і характар праяўлення псіхічных станаў і працэсаў: *І спектаклі – от яны куранёўскія спектаклі! Толькі ж і тут – рэлігія* ***цемнатою*** *людской пакарысталася (І. Мележ). Непрыемныя, агідныя думкі, пачуцці… Ад успамінаў у душы* [Лёні]*... ажыла з новай сілай уся тая горкая, ганебная* ***чарната****, ад якой вось і ў родную хату не хочацца… (Я. Брыль). Пан камендант цалкам разгубіўся, і ўвесь яго* ***глянец*** *знік, як з мокрай курыцы (М. Машара).* [Буткевіч] *убачыў у яе вачах* ***водсвет*** *таго захаплення, з якім яна* [Гануся] *заўсёды глядзела на яго (У. Караткевіч). Плылі думкі... І раптам прыйшло* ***азарэнне*** *і радасць (У. Карпаў). Але і праз густое сівае шчацінне відаць было, як на старым худым...* [дзедавым] *твары прабівалася* ***святло*** *радасці (А. Якімовіч). Дулеба паволі падняўся, і ў яго вачах Бярозін заўважыў сухі і рашучы* ***бляск*** *(Г. Шчарбатаў).*

Даволі часта, асабліва ў тэкстах мастацкай літаратуры, аўтары выкарыстоўваюць прыём нанізвання метафар, што спрыяе перадачы шырокай палітры пачуццяў чалавека. Такія ланцужкі – фокусы метафар – ствараюць адчувальную карціну складаных, часам супрацьлеглых, пачуццяў: *Андрэй павярнуўся да Людмілы. На яго твары былі* ***скаванасць****,* ***халоднасць****, але яны скора саступілі месца* ***вінаватасці*** *(Л. Арабей). Хоць хуткі ад'езд Марынкі і яе незразумелая* ***халоднасць*** *пры расстанні пакінулі смутак і* ***гаркоту*** *ў сэрцы... , раздумваць аб гэтым, перажываць і пакутаваць проста не было часу (Т. Хадкевіч).* ***Боль*** *і* ***горыч*** *ад незаслужанай крыўды ахапілі сэрца старога, і ён, стоячы на скрыжаванні дарог, у думках звяртаецца да сына (К. Хромчанка). Нібы глыбіннае* ***свячэнне****, / Душы маўклівае* ***агонь****. / Усё зямное азначэнне – / Твая сяброўская далонь (В. Вярба). На* ***дне*** *душы была* ***няяснасць*** *(П. Пестрак). Толькі на ростані ўявілася яму* [Ігнасю] *цалкам уся* ***шэрань*** *будзённічыны, з усімі сваімі* ***цяжкасцямі*** *і горам (Р. Мурашка). Панёс ён людзям песень дар – / Агонь душы і сэрца* ***жар****, / Панёс пяснярскай каляінай (Я. Колас).*

Такім чынам, сінестэтычныя метафары псіхалагічнага тыпу ствараюць прадуктыўную мадэль метафарызацыі, дзе малюнак працэнтных суадносін метафарычнай актыўнасці прыватных мадэляў наступны: самая шматлікая падгрупа – падгрупа зрокавых вобразаў (каля 40% ад усіх сінестэтычных субстантываў); другая па колькасці метафарычных ЛСВ – тактыльная сфера (25%); колькасць тэмпературных і смакавых полісемантаў знаходзіцца ў межах 13%, слыхавых – 10%; самая малакольсная падгрупа – абаняльныя метафары (3%). Найбольшай семантычнай рухомасцю характарызуюцца лексемы семантычных пучкоў зрокавай і тактыльнай сферы, што тлумачыцца аб'ектыўнасцю гэтых пачуццяў для чалавека ў працэсе адлюстравання і пазнання свету.

**Спіс літаратуры**

1. **Скляревская, Г. Н.** Метафора в системе языка / Г. Н. Скляревская. – 2-е изд. – СПб. : Филологический факультет СпбГУ, 2004. – 166 с. – С. 60 – 70.

2. **Гак, В. Г.** Метафора : универсальное и специфическое / В. Г. Гак // Метафора в языке и тексте / В. Г. Гак [и др.]. – М. : Наука, 1988. – С. 11 – 26.

3. **Апресян, Ю. Д.** Образ человека по данным языка : попытка системного описания / Ю. Д. Апресян // Вопросы языкознания. – 1995. – №1. – С. 37 – 67.

**Вольга ШЫМАНСКАЯ,**
аспірант кафедры сучаснай рускай мовы
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта
імя Максіма Танка.

*Артыкул рэкамендаваны да друку кафедрай сучаснай рускай мовы БДПУ імя Максіма Танка.*

Людміла ВАКУЛІЧ

# НАЗОЎНІКІ З МАДЫФІКАЦЫЙНЫМ ЗНАЧЭННЕМ СУБ'ЕКТЫЎНАЙ АЦЭНКІ Ў РУСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ МОВАХ

Нягледзячы на генеалагічную і тыпалагічную блізкасць рускай і беларускай моў, кожная з іх мае сваю унікальную сістэму моўных сродкаў. Адрозненні дзвюх моўных сістэм можна выявіць на ўсіх узроўнях.

Аб'ектам нашага даследавання сталі назоўнікі з мадыфікацыйным значэннем суб'ектыўнай ацэнкі рускай мовы і спосабы іх перакладу на беларускую мову. Мадыфікацыйнае словаўтваральнае значэнне – значэнне вытворнага слова, якое нязначна адрозніваецца ад значэння ўтваральнага, пры гэтым вытворнае слова адносіцца да той жа часціны мовы, што і слова, ад якога яно ўтворана.

Названыя лексемы не вельмі шырока прадстаўлены ў слоўніках, у прыватнасці перакладных, што абумоўлена асаблівасцямі іх функцыяніравання, а таксама асаблівасцямі іх словаўтваральнай структуры (усе яны з'яўляюцца вытворнымі). Гэтым выклікана неабходнасць правядзення нашага эксперыменту.

Сутнасць яго ў наступным. Выкарыстоўваючы матэрыялы слоўнікаў, мы выбралі лексемы з мадыфікацыйным значэннем суб'ектыўнай ацэнкі ў рускай мове, якім у беларускай адпавядаюць словы з тоесным словаўтваральным сродкам, словы з іншым словаўтваральным сродкам, у мове перакладу слову адпавядае словаўтваральная лакуна, ці прабел (маюцца на ўвазе выпадкі, калі ў беларускай мове адсутнічае аднаслоўная адпаведнасць лексеме рускай мовы). Для перакладу былі прапанаваны сказы з лексемамі, што маюць названае значэнне, увага на апошніх не акцэнтавалася.

Мэта нашага эксперыменту – выявіць, наколькі адпавядаюць варыянты перакладу, прапанаваныя ў перакладным слоўніку, таму, што мы маем у маўленні, якія іншыя варыянты трансфармацыі выкарыстоўваюць носьбіты мовы, чым абумоўлены памылкі ў перакладах рэспандэнтаў. Неабходна адзначыць, што памылковымі мы лічылі варыянты перакладу, якія не перадаюць словаўтваральнай семантыкі ў тых выпадках, калі гэта магчыма.

Нашымі рэспандэнтамі былі 50 студэнтаў аддзялення беларускай і рускай філалогіі 1-га і 2-га курсаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Эксперымент паказаў, што студэнты незалежна ад спецыяльнасці ў аднолькавай меры валодаюць мовамі.

Вынікі эксперыменту дадзены ніжэй у табліцах. Словы размеркаваны па групах у адпаведнасці з тым, якія варыянты перакладу пададзены ў "Русско-белорусском словаре" [5] і з улікам прапанаванага намі кантэксту. У адной з груп узнікла неабходнасць размеркавання лексем у залежнасці ад таго адцення значэння, якое перадаецца словаўтваральным афіксам, у сувязі з тым, што пераклад слова ў гэтым выпадку мае асаблівасці ў залежнасці ад адцення словаўтваральнага значэння.

**1. Суфіксы ў рускай і беларускай мовах семантычна і фармальна тоесныя.**

У шиншилл очень выразительные ***мордочки***, во многом благодаря крупным черным глазам.

Возле этой улицы ***реченька*** глубокая.

Ну и ***голосище*** у артистки!

Дали нам новый ***домик***. Каменный.

На ее ангельском ***личике*** появилась тень сомнения.

Эта ***минуточка*** показалась мне вечностью.

| Слова рускай мовы | Слоўнікавы пераклад | Варыянты перакладу рэспандэнтаў | Працэнтныя суадносіны перакладу |
|---|---|---|---|
| ***мордочка*** | мордачка, мыска | мордачка | 42 |
| | | мыска | 7 |
| | | тварык | 4 |
| | | рыльца | 5 |
| | | пыска | 24 |
| | | пысачка | 12 |
| | | пыса | 6 |
| ***реченька*** | рэчанька | рэчанька | 57 |
| | | рэчка | 7 |
| | | рэчачка | 2 |
| | | рачулачка | 2 |
| | | рачулка | 32 |
| ***голосище*** | галасішча, галасіна | галасішча | 42 |
| | | галасіна | 7 |
| | | моцны голас | 12 |
| | | галасочак | 2 |
| | | голас | 37 |
| ***домик*** | домік, дамок | домік | 30 |
| | | дамок | 9 |
| | | хатка | 48 |
| | | хатанька | 2 |
| | | хатачка | 2 |
| | | хата | 7 |
| | | дом | 2 |
| ***личико*** | тварык | тварык | 57 |
| | | твар | 41 |
| | | постаць | 2 |
| ***минуточка*** | хвіліначка | хвіліначка | 50 |
| | | хвілінка | 45 |
| | | хвіліна | 3 |
| | | хвіля | 2 |

Словаўтваральнымі сінонімамі з'яўляюцца прапанаваныя рэспандэнтамі варыянты перакладу лексем: *реченька – рэчанька, рэчка, рачулка, рачулачка, рэчачка; голосище – галасішча, галасіна*. Некаторыя словы ў мове перакладу (МП) знаходзяцца на 2-й ступені словаўтварэння (*рачулачка, рэчачка*), а слова зыходнай мовы (ЗМ) – на 1-й, і наадварот, словам ЗМ, якія знаходзяцца на 2-й ступені словаўтварэння, у МП адпавядаюць словы, якія знаходзяцца на 1-й ступені словаўтварэння (*минуточка – хвілінка*).

У МП рэспандэнты выкарыстоўваюць функцыянальныя дэрывацыйныя сродкі для таго, каб перадаць мадыфікацыйнае значэнне суб'ектыўнай ацэнкі (*голосище – моцны голас*), да якіх адносяцца "як сінтэтычныя,



***Людміла Аляксееўна Вакуліч*** – *аспірантка кафедры рускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Закончыла філалагічны факультэт БДУ (2004), магістратуру (2005).*

так і аналітычныя моўныя адзінкі, што выконваюць функцыю словаўтваральнага фарманта" [3, с. 20].

У перакладным слоўніку ў названых лексемах з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі ў беларускай і рускай мовах фармальна супадаюць вытворныя асновы. Аднак рэспандэнтамі ў многіх выпадках выкарыстоўваліся іншыя словы, семантычна блізкія, але неэквівалентныя лексемам ЗМ. Так, нельга лічыць міжмоўнымі карэлятамі лексемы *мордочка* ('пярэдняя частка галавы ў жывёлы' [ТСБМ, т. 3, с. 174]) і *рыла* 'выцягнутая пярэдняя частка галавы ў некаторых жывёл' [ТСБМ,т. 4, с. 736], *пыса* 'ніжняя частка галавы (з губамі і ноздрамі ў жывёл)' [ТСБМ, т. 4, с. 532], *твар* 'пярэдняя частка галавы чалавека' [ТСБМ, т. 5, кн. 1, с. 488]. Семантычна эквівалентным з'яўляецца варыянт *мыска.*

Семантычна нятоесныя лексемы *дом* і *хата*, *личико* і *постаць*.

Памылкі пры перакладзе ў некаторых выпадках абумоўлены няправільным вызначэннем адценняў мадыфікацыйнага значэння суб'ектыўнай ацэнкі. Так, нельга лічыць адэкватным пераклад слова *голосище – галасочак*, таму што ў МП перадаецца памяншальна-ласкальнае значэнне, а не значэнне павелічэння, як у ЗМ. Лексема *хвіля* – размоўны семантычны эквівалент лексемы *минута*, які не перадае значэння суб'ектыўнай ацэнкі.

У дадзенай групе 67% адказаў правільныя (58% адпавядаюць слоўнікавым перакладам), 33% – няправільныя.

**2. Суфіксы ў рускай і беларускай мовах фармальна нятоесныя.**

Протоптал я через поле ***дороженьку***.

***Холодище***! Птица на лету мерзнет!

Детство его протекало в глухом ***городишке***.

Он выпускал в Англии ***газетенку*** сплетен и сенсаций.

Плетет кружева рукодельница-***зимушка***.

Иногда промелькнет полянка да сверкнет вдалеке безымянная ***речушка***.

Вот такое ***письмецо*** ко мне пришло.

***Здоровьишко*** стало никуда.

Она широко распахнула глаза – ***огонек*** оставался.

Сама ***ведерко*** утопила, сама и доставай.

В роще пел ***соловушка***.

Она безутешно прорыдала всю ***ноченьку***.

Бедные зверюшки ждут не дождутся ***солнышка***, так им холодно и голодно.

Ну и ***ветрище***!

Вошел старик, кривой, костлявый, ***бороденка*** рыжая торчит и сапожища огромные.

В дом вошел старик в потрепанной куртке, на голове старая, поношенная ***шапчонка*** да старый ранец за плечами.

| Слова рускай мовы | Слоўнікавы пераклад | Варыянты перакладу рэспандэнтаў | Працэнтныя суадносіны перакладу |
|---|---|---|---|
| ***дороженька*** | дарожка, дарожачка | дарожачка | 7 |
| | | сцяжынка | 13 |
| | | сцяжыначка | 14 |
| | | сцежачка | 33 |
| | | дарожанька | 33 |
| ***холодище*** | халадзіна, халадзішча | халадзішча | 7 |
| | | халадзіна | 66 |
| | | вельмі халодна | 5 |
| | | халадрыга | 2 |
| | | дубарына | 2 |
| | | халадрына | 5 |
| | | студзёна | 5 |
| | | які сівер! | 2 |
| | | халодна | 2 |
| | | дубак | 2 |
| | | холад | 2 |
| ***городишко*** | гарадок | гарадок | 50 |
| | | гарадочак | 10 |
| | | горад | 21 |
| | | гарадзішак | 10 |
| | | маленькі горад | 2 |
| | | мястэчка | 7 |
| ***газетенка*** | газеціна | газетка | 53 |
| | | газецёнка | 16 |
| | | газета | 26 |
| | | газетачка | 2 |
| | | газецінка | 3 |
| ***зимушка*** | зімка, зімачка, зіміца | зімачка | 12 |
| | | зімка | 5 |
| | | зімушка | 49 |
| | | зіма | 34 |
| ***речушка*** | рачулка, рэчачка | рачулка | 73 |
| | | рэчанька | 9 |
| | | рэчка | 2 |
| | | рачушка | 14 |
| | | рака | 2 |
| ***письмецо*** | пісямко | лісток | 14 |
| | | лісточак | 5 |
| | | ліст | 31 |
| | | пісьмо | 19 |
| | | пісьмейцо | 16 |
| | | лістоўка | 5 |
| | | лістовачка | 2 |
| | | пісямцо | 2 |
| | | лісцік | 2 |
| | | пасланне | 2 |
| | | паштовачка | 2 |
| ***речонка*** | рачулка | рачулка | 56 |
| | | рэчанька | 21 |
| | | рэчачка | 2 |
| | | рачушка | 2 |
| | | рачонка | 3 |
| | | рэчка | 16 |
| ***здоровьишко*** | здаровейка | здаровейка | 10 |
| | | здаровішка | 2 |
| | | здаравёнка | 2 |
| | | здароўіца | 23 |
| | | здароўца | 2 |
| | | здароўе | 26 |
| | | здароўечка | 35 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| ***огонек*** | агеньчык | агеньчык | 86 |
| | | аганёк | 12 |
| | | іскрынка | 2 |
| ***ведерко*** | вядзерца | вядзёрца | 40 |
| | | вядзёрка | 51 |
| | | вядзерцэ | 2 |
| | | вядро | 7 |
| ***соловушка*** | салавейка | салавейка | 47 |
| | | салоўка | 14 |
| | | салавей | 26 |
| | | салавушка | 9 |
| | | саловушка | 4 |
| ***ноченька*** | ночка, ночачка | ночка | 26 |
| | | ночачка | 4 |
| | | ночанька | 65 |
| | | ноч | 5 |
| ***зверюшка*** | звярок | звяркі | 41 |
| | | звярочкі | 3 |
| | | звяры | 9 |
| | | звярушкі | 20 |
| | | жывёлы | 23 |
| | | жывёлінкі | 2 |
| | | жывёліны | 2 |
| ***солнышко*** | сонейка | сонейка | 100 |
| ***ветрище*** | вятрышча, вятруга | вятрышча | 28 |
| | | вятруга | 5 |
| | | вятрыска | 28 |
| | | ветруган | 9 |
| | | вецер | 26 |
| | | вятрына | 2 |
| | | вятрыла | 2 |
| ***бороденка*** | бародка | бародка | 54 |
| | | бародачка | 2 |
| | | барадзёнка | 16 |
| | | барада | 28 |
| ***шапчонка*** | шапчына | шапачка | 21 |
| | | капялюх | 2 |
| | | капялюшык | 17 |
| | | капялюш | 16 |
| | | шапка | 44 |

**2.1. Памяншальна-ласкальнае значэнне.** У адказах рэспандэнтаў шырока выкарыстоўваюцца словаўтваральныя сінонімы, якія не зафіксаваны ў перакладным слоўніку: *огонек – агеньчык, аганёк; соловушка – салавейка, салоўка; ноченька – ночка, ночанька, ночачка*; *зимушка – зімка, зімачка; зверюшка – звяркі, звярочкі*.

Памылкі звязаны з тым, што пераключэнне з адной мовы на іншую выклікае цяжкасці пры перакладзе лексем, вытворныя асновы якіх супадаюць у дзвюх блізкароднасных мовах, а афіксы, выкарыстаныя ў ЗМ, з'яўляюцца непрадуктыўнымі або наогул адсутнічаюць у МП: *салавушка, звярушкі, зімушка, дарожанька*. Суфікс *-ушк-* функцыяніруе ў беларускай мове, аднак з'яўляецца непрадуктыўным (*дачушка*), у рускай мове гэты суфікс актыўна ўдзельнічае ва ўтварэнні вытворных слоў, як і суфікс *-аньк-* (рус. *-еньк-/-оньк-*), які з'яўляецца малапрадуктыўным у МП.

У некаторых выпадках у МП рэспандэнты ўжываюць словы, семантыка якіх перасякаецца, аднак не супадае з семантыкай слова ЗМ. Так, памылковымі мы лічылі пераклады *іскра* і *жывёла* рускіх лексем *огонь* і *зверь* адпаведна (*агонь* – 'святло ад асвятляльных прыстасаванняў; светлая кропка' [ТСБМ, т. 1, с. 105], *іскра* – 'маленькая часцінка распаленага або палаючага рэчыва' [ТСБМ, т. 2, с. 560]; *звер* – 'дзікая, звычайна драпежная жывёла' [ТСБМ, т. 2, с. 439], *жывёла* – 'усякая жывая істота, акрамя раслін' [ТСБМ, т. 2, с. 262].

**2.2. Павелічальнае значэнне.** Пры перакладзе лексем з названым значэннем рэспандэнты выкарыстоўвалі розныя сродкі. Па-першае, суфіксы *-ін-, -ыск-, -уг-* (*вятруга, вятрыска, вятрышча, халадзіна, халадзішча*), па-другое, функцыянальныя дэрывацыйныя сродкі (*вельмі халадна*). У некаторых выпадках змяняўся сінтаксічны тып сказа (з намінатыўнага на безасабовы): *Холодище! – Студзёна!* Рэспандэнты шырока выкарыстоўвалі вытворныя словы, якія ўласцівы гутарковай мове (*халадзіна, халадрына, халадрыга, вятруга, дубак, дубарына*) і якія падкрэсліваюць узмацненне прыметы, выражанай вытворнай асновай.

Памылкі абумоўлены няведаннем семантыкі слова ў МП, што, нягледзячы на фанетычную блізкасць са словам ЗМ, мае іншае значэнне (*вятрыла – парус*), далучэннем суфікса з іншым значэннем: *ветруган* (*-ан-* – значэнне асобы), выкарыстаннем семантычна нятоесных перакладаў (*сівер* – 'халодны, паўночны, пранізлівы вецер' [ТСБМ, т. 5, кн. 1, с. 126]). Рэспандэнты ў МП выкарыстоўвалі вытворныя, якія адсутнічаюць у моўнай сістэме, нягледзячы на тое, што суфіксы адносяцца да прадуктыўных (*вятрына, вятрышча)*. У некаторых выпадках мадыфікацыйнае значэнне наогул не ўлічвалася (*холад, холадна*).

**2.3. Значэнне зневажальнасці.** У дадзеным выпадку рэспандэнты дапусцілі найбольшую колькасць памылак. Гэта звязана з тым, што ў беларускай мове сродкі выражэння названага значэння супадаюць з выражэннем памяншальна-ласкальнага значэння. Адценне значэння можна вызначыць толькі ў кантэксце. Суфіксы, якія выражаюць значэнне зневажальнасці ў рускай мове, адсутнічаюць у беларускай.

Выкарыстанне функцыянальных дэрывацыйных сродкаў (*маленькі горад*), на наш погляд, можна лічыць правільным перакладам лексемы *городишко*. Семантычна блізкія, але нятоесныя лексемы *шапка* ('галаўны ўбор, звычайна цёплы і мяккі' [ТСБМ, т. 2, с. 349]) і *капялюш* ('галаўны ўбор, мужчынскі – з палямі, жаночы – розных фасонаў' [ТСБМ, т. 2, с. 634]), *горад* і *мястэчка* ('вялікае сяло з некаторымі прыкметамі горада; пасёлак гарадскога тыпу' [ТСБМ, т. 3, с. 194]). Значэнне зневажальнасці ў беларускай мове можа перадавацца пры дапамозе суфікса *-ін-*, аднак лексемы з дадзеным словаўтваральным сродкам не могуць выкарыстоўвацца ў якасці вытворнай асновы. На гэтай падставе пераклад *газецінка* мы аднеслі да памылковых.

Рэспандэнты не ўлічвалі словаўтваральнага значэння пры перакладзе (*бороденка – барада, газетенка – газета, шапчонка – шапка*), выкарыстоўвалі словы-русізмы (*гарадзішак, газецёнка, барадзёнка*), ужывалі вытворныя, нехарактэрныя для беларускай мовы (*газетачка, газецінка*). У адзіным выпадку даецца лексема *бародачка*, якая знаходзіцца на 2-й словаўтваральнай ступені, як пераклад слова са значэннем зневажальнасці *бороденка*, але, на наш погляд, яна не перадае значэння зневажальнасці ў МП.

Сярод адказаў рэспандэнтаў 63% правільныя (36% адпавядаюць слоўніку), 37% – няправільныя.

**3. Словаўтваральная лакуна ў беларускай мове – эквівалент вытворнага слова рускай мовы.**

Это были люди пассивные, замкнувшиеся в узкий ***мирок*** своих личных переживаний.

Свои обличительные речи он обращает к ничтожным ***людишкам***, не способным понять его.

***Жарища*** невыносимая!

***Моченьки*** нет, слаб, болен.

Об этом прошел ***слушок***.

| Слова рускай мовы | Слоўнікавы пераклад | Варыянты перакладу рэспандэнтаў | Працэнтныя суадносіны перакладу |
|---|---|---|---|
| ***мирок*** | абмежаваны свет, маленькі свет | (маленькі) свет | 2 |
| | | (вузкае) кола | 2 |
| | | (вузкі) свет | 49 |
| | | (вузенькі) свет | 9 |
| | | мірок | 34 |
| | | (вузкі) мір | 2 |
| | | (вузкі) свецік | 2 |
| ***людишки*** | нікчэмныя людзі | людзі | 56 |
| | | людзішкі | 30 |
| | | чалавечкі | 12 |
| | | людцы | 2 |
| ***жарища*** | гарачыня, спёка | спёка | 27 |
| | | гарачыня | 4 |
| | | жара | 24 |
| | | пекла | 2 |
| | | вельмі горача | 3 |
| | | спякацішча | 2 |
| | | спякотка | 2 |
| | | спякота | 31 |
| | | жарышча | 5 |
| ***моченька*** | сіла | сіла | 37 |
| | | моц | 28 |
| | | сіланька | 9 |
| | | сілёнка | 8 |
| | | моцанька | 2 |
| | | моцушка | 2 |
| | | мочанька | 14 |
| ***слушок*** | чутка, шэпт | чутка | 52 |
| | | слых | 21 |
| | | плётка | 16 |
| | | слушок | 7 |
| | | чутачка | 2 |
| | | слышок | 2 |

У тых выпадках, калі згодна са слоўнікам лексеме рускай мовы ў беларускай адпавядае словаўтваральная лакуна, рэспандэнты выкарыстоўвалі вытворныя з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, нехарактэрныя для мовы перакладу (*людзішкі, свецік, жарышча, спякотка, спекацішча, чутачка, моцушка, моцанька, слышок*), словы-русізмы (*мочанька, слушок*), словы з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі, якія не перадаюць значэння зневажальнасці (*людишки – чалавечкі, людцы*), або варыянты, што адпавядаюць прапанаваным у слоўніку, але не перадаюць значэння суб'ектыўнай ацэнкі (*спёка, гарачыня, сіла, чутка*), ці іх сінонімы (*жара, моц, слых, плётка*).

У некаторых выпадках для перакладу выкарыстоўваюцца функцыянальныя дэрывацыйныя сродкі (*жарища – вельмі горача*), метафарычны перанос (*жарища – пекла*). У такіх выпадках можна гаварыць пра тое, што ўсе элементы значэння перададзены ў МП пры дапамозе сродкаў не словаўтваральнага, а іншых моўных узроўняў.

Пры перакладзе рэспандэнты далі больш памылковых варыянтаў – 51%, правільных – 49% (24% адпавядаюць слоўніку).

Праведзены эксперымент паказаў, што ў маўленні магчымасці перакладу назоўнікаў з мадыфікацыйным значэннем суб'ектыўнай ацэнкі шырэйшыя за тыя, што адлюстраваны ў перакладным слоўніку. Рэспандэнты выкарыстоўвалі словаўтваральныя сінонімы, сінтаксічныя і лексічныя сродкі, каб перадаць семантыку слоў ЗМ.

Памылкі пры перакладзе звязаны з тым, што ў некаторых выпадках рэспандэнты не ўлічвалі словаўтваральнага значэння (41% памылак), выкарыстоўвалі вытворныя словы, нехарактэрныя для МП (34% памылак), ужывалі лексемы, семантычна блізкія, але нятоесныя лексемам ЗМ (13%). Некаторыя памылкі тлумачацца няведаннем семантыкі лексем у МП (10% памылак). Не заўсёды правільна рэспандэнты называлі значэнне, якое перадаецца пры дапамозе словаўтваральнага афікса (2% памылак).

Аналіз перакладаў сведчыць, што 60% адказаў, дадзеных рэспандэнтамі, – правільныя (39% адпавядаюць слоўніку), 40% – няправільныя, што сведчыць пра неабходнасць надаваць больш увагі перакладу і ўсім элементам значэння слова ЗМ, у тым ліку і мадыфікацыйнаму значэнню суб'ектыўнай ацэнкі, якое дазваляе эканоміць моўныя сродкі, надае маўленню большую выразнасць і эмацыянальнасць. Ніжэй мы прапануем практыкаванні, якія дазволяць высветліць як веданне вышэй пазначанага пытання, так і ўзровень ведання рускай і беларускай моў наогул.

**Практычныя заданні**

I. Якое значэнне надае словаўтваральны суфікс выдзеленым словам: памяншальна-ласкальнае, значэнне павелічэння, значэнне зневажальнасці:

***1. Галасіна*** *ў артысткі сапраўды моцны.*

*2. Шкада добрае* ***слоўца*** *губляць.*

*3. Замест гэтага можна было павесіць любую* ***паперчыну****.*

*4. Няхай яго* ***душачка*** *сярод святых будзе.*

***5. Дачушка*** *яе яшчэ зусім малая.*

II. Перакладзіце на беларускую мову сказы:

*1. Это была тихая* ***улочка*** *на окраине города.*

*2. Я должен составить фиктивный* ***документишко*** *на этот случай.*

*3. На* ***единичку*** *(автобус) я опоздал.*

*4. Этот* ***штормяга*** *воду со дна поднял.*

***5. Утречком*** *я быстро собрался и отправился на встречу.*

III. Складзіце сказы з наступнымі словамі: *крамка, шапчына, лецейка, ваяка, старэча.*

**Спіс літаратуры**

1. **Беларуская граматыка** : у 2 ч. – Мінск, 1985. – Ч. 1 : Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск.

2. **Большой толковый словарь русского языка** / Гл. ред. С. А. Кузнецов. – СПб, 2006.

3. **Роўда, І. С.** Рознаўзроўневая намінатыўная адпаведнасць беларускай і рускай моў. – Мінск, 1999.

4. **Русская грамматика** : в 2 т. – Мінск, 1980. – Т. 1. : Фонетика. Словообразование. Морфология.

5. **Русско-белорусский словарь** : в 3 т. – Мінск, 2002.

6. **Тлумачальны слоўнік беларускай мовы** : у 5 т. – Мінск, 1977.

*Артыкул рэкамендаваны да друку доктарам філалагічных навук, прафесарам Іванам Сямёнавічам Роўдам.*

*Жывое слова*

# СЛОВЫ АД ЦІШКІ ГАРТНАГА

## *КРЫНІЧАННЕ, ЗАВУАЛЕНЫ, БАГАЖНЯ*

Беларускае мовазнаўства мае значныя здабыткі ў даследаванні мовы мастацкай літаратуры, пераважна вобразных сродкаў – метафар, эпітэтаў, параўнанняў, перыфраз ды інш. Выкарыстанне ў навучальным працэсе гэтых "залацінак" мовы, бясспрэчна, служыць павышэнню эфектыўнасці і выніковасці філалагічнай падрыхтоўкі студэнтаў і вучняў.

І сёння вядуць далей вывучэнне сродкаў і прыёмаў стварэння вобразнасці, мастацкасці кваліфікаваныя навукоўцы (дактары і кандыдаты навук), аспіранты, дыпломнікі… Не перамяншаючы важнасці гэтай працы, падкрэслім. У цяперашні час актуальнай задачай уяўляецца пошук – таксама на аснове літаратурных твораў – моўных адзінак для **шырокага ўжытку**. Выяўленне, аб'ектыўная ацэнка таго ці іншага слова, словаформы, канструкцыі з апорай на маўленчую практыку, з улікам яе патрэб (і публікацыя гэтых вынікаў-высноў не толькі ў навуковых, але і ў масавых выданнях) можа паспрыяць іх усталяванню ў літаратурнай мове.

Літаратурная спадчына Цішкі Гартнага, як і творчасць іншых пісьменнікаў розных пакаленняў, дае ў гэтых адносінах багаты матэрыял.

Даследчыкі беларускай мовы на працягу дзесяцігоддзяў "адкрылі" нямала аўтарскіх наватвораў, у тым ліку *крынічыць*. Слова вядомае, асабліва філолагам, але ці дастаткова ўжывальнае сёння? Пытанне, як кажуць, рытарычнае. Не спрыяе актывізацыі ўжывання дзеяслова *крынічыць* тое, што яго не падаюць слоўнікі.

У "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы" змешчаны фразеалагізм *біць крыніцай* 'бурна развівацца, квітнець'. Дык вось, дзеяслоў *крынічыць*, які ўжываецца ў мастацкіх творах з 20-х гадоў мінулага стагоддзя, якраз і перадае значэнне, выказванае фразеалагізмам *біць крыніцай*:

*Ці ж я не ведаю, ці ж я не знаю,*
*Ці я не сын сваёй сучаснасці, –*
*Жыццё* ***крынічыць*** *і музыкі граюць,*
*На лад папасці ўсё не шчасціцца.*
(У. Дубоўка. "Мой любы браце, блізкі і далёкі…")

Вядома, пры літаратурным усталяванні слова *крынічыць* развіваюцца і семантычныя адценні, як напрыклад: "*А ўнізе, у глыбінях народнага жыцця, у жыццядайнай прастаце яго* ***крынічаць*** *раны памяці, якія нічым не загоіш*" (Маладосць, 1971, № 6).

Чаму ж фразеалагізм *біць крыніцай* ужываецца часта, а сінанімічны яму дзеяслоў *крынічыць* – зрэдку? У вялікай меры таму, што ў рускай мове няма дзеяслова, адпаведнага беларускаму (яго немагчыма ўтварыць ад назоўнікаў *ключ, родник, источник*). Карыстальнікі рускай мовы мусяць ужываць у якасці выказніка фразеалагізм *бить ключом*. А беларускія лексікографы, укладаючы перакладныя слоўнікі, такім чынам, знаходзяць у рускай мове толькі згадваны фразеалагізм і перакладаюць яго таксама фразеалагізмам.

У апавяданні "Дыягназ" (1927) Цішка Гартны ўжыў слова *крынічанне*.

*«З усіх перабраных рэчаў Паруля нарэшце спынілася на красках. "Што можа быць прыгажэй за махрастыя чырвоныя ружы. Бач, краскі адзначаюць сабою жыццё, яго харство, яго вечнае квяценне. Жывая краска – сымболь жыццёвага* ***крынічання****. Так, я куплю Таццяне букет з чырвоных ружаў…"»*

Вылучаны назоўнік утвораны ад дзеяслова *крынічыць*, што сведчыць пра жыццяздольнасць апошняга, пра пэўную ступень яго ўлітаратурвання.

Бясспрэчна, словы *крынічыць, крынічанне* вартыя ўвагі як выкладчыкаў і навучэнцаў, так і аўтараў – стваральнікаў тэкстаў.

На пачатку 70-х мінулага стагоддзя, падчас рэдагавання "Руска-беларускага слоўніка" (1982), мною рабілася спроба да рускіх слоў *завуалировать, завуалированный* даць беларускія адпаведнікі *завуаліць, завуалены*, пакінуўшы як варыянты і ранейшыя *завуаліраваць, завуаліраваны*. Пры далейшай падрыхтоўцы рукапісу да друку (іншымі рэдактарамі) гэтыя прапанаваныя словы "згубіліся".

Толькі больш як праз тры дзесяцігоддзі мне надарылася ўжыць прыметнік *завуалены* ў мовазнаўчай публікацыі (Роднае слова, 2005, № 11): "**Хітрапразны**. Замаскаваны, **завуалены**". А нядаўна, чытаючы і перачытваючы раман Цішкі Гартнага "Сокі цаліны", сапраўды перажыў, паводле выразу Янкі Брыля, радасць сустрэчы з жаданым словам: *"Але першыя сутычкі на франтах расхалоджвалі* ***завуаленую*** *сапраўднасць"* [2, с. 194].

Ужытае амаль 80 гадоў таму, гэтае слова невыпадковае ў творы Цішкі Гартнага і патрэбнае беларускай літаратурнай мове. Яно адпавядае тэндэнцыі замяняць лексічныя запазычанні з суфіксам *-ирова-* вытворнымі з суфіксам *-ава- (-ява-)*, рэдка з іншымі, якая прыкметна выявілася ў творах Цішкі Гартнага: *апераваць, асацыяваць* (і *асацыіраваць), гарманаваць, дырыгаваць, дэфіляванне, забетонены, зрэпетаваць, імпанаваць, капіяваць, перафармаванне, рэпетаваць, сфармаваны, фармаванне, фармавацца, фарсаваны* (марш) ды іншыя.

Для сучаснай моўнай практыкі застаецца актуальнай тэндэнцыя ўнікаць суфікса *-ірава-*. Так, часопіс "Полымя" (1986, №4) піша: *"У найбольш шырокіх маштабах – як у адкрытых, так і ў* ***завуаляваных*** *формах – падобная тактыка праявілася, напрыклад, у адносінах да Польскай Народнай Рэспублікі"*.

Калі параўнаць варыянты *завуаліраваны, завуаляваны, завуалены*, то няцяжка пераканацца, што апошні з іх найбольш адпавядае патрабаванням, якія ставяцца да слова. У прыватнасці, ён лёгкі на вы-

маўленне, у ім выяўна чуваць (відаць) утваральная аснова *вуал'*.

Слоўнік твораў Цішкі Гартнага, багаты і разнастайны паводле сваіх вытокаў, не страціў вартасці ў плане культуры мовы, пры вырашэнні тэарэтычных і практычных праблем функцыянавання і развіцця беларускай мовы. Разгледзім прыклад узбагачэння пісьменніцкага слоўніка за кошт жывой народнай мовы.

Некалі Барыс Сачанка пачуў ад вясковай бабулькі на вакзале слова *багажня* і падаў яго шырокаму чытачу ў якасці адпаведніка рускага тэрміна *камера хранения багажа*. Факт настолькі значны, што яго палічылі патрэбным згадаць аўтары артыкула "Сачанка Барыс Іванавіч" А. Міхневіч і Я. Саламевіч у энцыклапедычным даведніку "Беларуская мова" (1994).

Але ж слова *багажня* мае і пісьмова-літаратурную фіксацыю – ужытае ў аўтарскай мове ў рамане Цішкі Гартнага "Сокі цаліны": *"…Пасярэдзіне будынка* [станцыі] *праходзіў карыдор, разрэзаўшы яго надвое; направа ад карыдора мясцілася* ***багажня****, скарбніца і невялічкі першы клас, а налева – другі і трэці класы"* [1, с. 229]. Як сінонім да слова *багажня* выкарыстоўваецца тэрміналагічнае спалучэнне *багажнае аддзяленне* [1, с. 235].

У творах Цішкі Гартнага знаходзім шэраг слоў аналагічнай марфемнай структуры: *гарбатня, кавярня, такарня, харчэўня*, якія былі арганічнаю часткаю лексічнай сістэмы беларускай мовы пачатку XX ст. І цяперашнім часам ужываюцца гэтыя (апрача *такарня*) ды іншыя падобныя словы: *малачарня* (ТСБМ), *малочня* (М. Стральцоў), *пажарня* (В. Карамазаў), *пампоўня* 'вадакачка' (У. Арлоў), *парня́* 'памяшканне, дзе гнуць вобад, робяць калёсы' (І. Навуменка), *парыльня* (ТСБМ), *прыходня* 'пярэдні пакой, вітальня' (В. Адамчык), *цэмэнцярня* 'цэментны завод' ("Наша Ніва"), *цюкарня* 'прэс-падборшчык' (В. Гардзей).

Паводле слоўнікаў літаратурнай мовы, рускаму тэрміну *камера хранения* адпавядае беларускі *камера хавання*. Аднак з такім сцверджаннем пагаджаюцца не ўсе. Журналістка Таццяна Падаляк піша: "Неаднойчы супрацоўнікі СМІ ўзнімалі пытанне адносна правамернасці ўжывання словазлучэння *камера хавання* (*камера хранения*). І ў гутарковай мове, і ў літаратурнай звычайна ўжываецца *камера захоўвання*. Словы *хаваць* і *захоўваць* маюць блізкае, але тым не менш рознае значэнне, іх нельга назваць сінонімамі. Багаж на вакзале ў адпаведнай камеры не хаваюць, а менавіта захоўваюць" (Звязда, 20.03.2004).

Тут трэба запярэчыць: у беларускай мове ў такіх кантэкстах згаданыя Т. Падаляк дзеясловы (як і ўтвораныя ад іх назоўнікі) сінанімічныя. А таму выраз *камера хавання* цалкам правамерны. Зразумела, увядзенне ў літаратурны ўжытак слова *багажня* як эквіваленту рускага *камера хранения* зняло б пытанні і сумненні накшталт выказаных журналісткай.

Ужыванне ў літаратурнай мове 1920-х гг. вялікай колькасці адметных слоў (дыялектызмаў, паланізмаў, штучных наватвораў) А. Жураўскі называе дыялектызацыяй [3, с. 12 – 13]. Хібнасць такога вызначэння ў тым, што навукоўца робіць ацэнку слоў, вырываючы іх з лексічнай сістэмы літаратурнай мовы ў перыяд яе інтэнсіўнага станаўлення, ігнаруючы спецыфіку кантэкстаў (мастацкіх), зыходзячы з сучаснага стану літаратурнай лексікі. Пры гэтым ён кіруецца "Руска-беларускім слоўнікам" (1937) пад рэдакцыяй А. Александровіча, у якім выявілася недастаткова ўвагі да спрадвечна беларускай лексікі, захапленне калькамі і запазычаннямі. А. Жураўскі несвядома ці свядома не размяжоўвае ў гэтым выпадку паняццяў *літаратурная мова* і *мова мастацкай літаратуры*, што дазволіла яму зусім заканамернае выкарыстанне дыялектызмаў у мастацкіх творах кваліфікаваць як тэндэнцыю, што ахоплівае ўсе стылі беларускай мовы. І не толькі ў 1920-я гг., але і ў нашы дні. Так, адзначыўшы ўжыванне мноства дыялектызмаў у творах І. Пташнікава, В. Адамчыка, Г. Далідовіча, ён катэгарычна заяўляе: "Працэс лексічнай дыялектызацыі беларускай літаратурнай мовы працягваецца і цяпер". Сцверджанне беспадстаўнае: у навуковым, афіцыйна-справавым дый публіцыстычным тэксце дыялектызмаў практычна мы не знаходзім, іх там, як правіла, няма.

Вернемся, аднак, да мовы Цішкі Гартнага. У "чорны спіс" прыводжаных А. Жураўскім слоў (усяго 115) трапіў прыметнік *шаломны*. У творах Цішкі Гартнага гэтае слова, як і аднакаранёвікі *шолам, шаламіць, шаламаніць, шаламанлівы, ашаломлены*, – натуральнае, сталае.

Прыметнік *шаломны* дакладна выказвае значэнне рускага *потрясающий* у выразах тыпу *потрясающий спектакль (событие)*, якія, дарэчы, вельмі актывізаваліся ў мове творчай інтэлігенцыі.

Прыводзім ілюстрацыі з рамана "Сокі цаліны". *"Пасля бліскучых гарадскіх тэатраў Рыгі, з іх* ***шаломнаю*** *ігрою, ад гэтае абвесткі* [пра спектакль наезнай трупы аматараў] *веяла нечым мізэрным, бедным і шэрым"* [2, с. 15].

*– Што ты кажаш?!*

*–* ***Шаломная*** *нечаканасць, кажу табе!..* [2, с. 428].

Літаратурнай працай Цішкі Гартнага закладаўся грунт пад сучасныя словы *ашаламляць, ашаломваць, ашаламляльны*, як, напрыклад, у сказе: *"Багацце роднай мовы, паказанае Ф. М. Янкоўскім,* ***ашаломвае*** *не толькі тых, хто пачынае цікавіцца сваёй мовай, а нават людзей, што лічаць сябе добра падкаванымі ў беларускай філалогіі"* (П. Міськo).

"Перадсловы" тыпу *шаломны* ўяўляюць навуковую цікавасць для студэнтаў-філолагаў і выкладчыкаў, не кажучы ўжо пра лінгвістаў, якія даследуюць гісторыю мовы.

**Спіс літаратуры**

1. **Гартны, Ц.** Сокі цаліны / Ц. Гартны. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1957. – Т. 1.

2. **Гартны, Ц.** Сокі цаліны / Ц. Гартны. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1958. – Т. 2.

3. **Жураўскі, А. І.** Беларускае савецкае мовазнаўства: здабыткі, праблемы, шляхі развіцця / А. І. Жураўскі // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1988. – № 2.

**Алесь КАЎРУС.**

Сяргей ВАЖНІК

# МАЛЕНЬКІЯ КЛЮЧЫКІ ДА ПАСПЯХОВАЙ КАМУНІКАЦЫІ

## СІТУАЦЫІ ПРЫЦЯГНЕННЯ ЎВАГІ, ПРОСЬБЫ / ПРАПАНОВЫ, ПАДЗЯКІ

*Сэрцы, нібы дзверы,*
*Можна адмыкаць,*
*Трэба толькі ведаць,*
*Дзе ключы шукаць.*
*"Калі ласка!", "Дзякуй!"*
*Вось яны, ключы!*
*Ты іх, калі ласка, добра завучы.*

**А. Д. Стодарт.** Маленькія ключы.

У кожнай мове ёсць ветлівыя словы, якія, вобразна кажучы, маюць чароўную здольнасць адчыняць любыя дзверы (у сувязі з гэтым у якасці эпіграфа намі ўзяты верш "Маленькія ключы"). Таму яшчэ ў дзяцінстве бацькі вучылі нас карыстацца так званымі чароўнымі словамі. *Дзякуй!, Калі ласка!, Будзьце ласкавы!, Даруйце!, Прашу прабачэння!* – вось далёка не ўвесь арсенал такіх канструкцый, выкарыстанне якіх робіць працэс камунікацыі і міжасобасных зносін паспяховым і выніковым.

Сёння мы разгледзім этыкетныя формулы маўленчых сітуацый прыцягнення ўвагі, просьбы, прапановы і падзякі, што непасрэдна звязаны паміж сабой. І сярод іх багата арыгінальных, спецыфічных, уласцівых толькі беларускай мове канструкцый. Як і ў папярэдніх матэрыялах рубрыкі "Кірунак сказаў", адметныя беларускія канструкцыі будзем апісваць пераважна ў рускамоўным дачыненні.

• ***Attention, please!***, або Этыкетная сітуацыя прыцягнення ўвагі.

Вельмі часта працэс міжасобасных зносін пачынаецца з формул тыпу *Увага!; Прашу ўвагі!; Паслухайце!; Прабачце!; Выбачайце!; Будзьце ласкавы!; Скажыце, калі ласка!.* У асноўным моўца ўжывае іх з мэтай прыцягнуць увагу патэнцыяльнага суразмоўцы да сябе на самым пачатку камунікацыі – у пытаннях пра час, напрамак руху, у самых разнастайных просьбах, прапановах і г. д. Па сваёй функцыі такія этыкемы[1] адпавядаюць польскім ветлівым зваротам тыпу *Proszę Pana / Proszę Pani!* Параўнаем: *Proszę Pana! Jak dojść do parku?* – літаральна: *Прашу Вас, падкажыце, калі ласка, як дайсці да парку?.*

**Зводная табліца 1. Спосабы прыцягнення ўвагі.**

| Руская мова | Беларуская мова |
|---|---|
| **Афіцыйныя (публічныя) формулы** | |
| *Прошу (вашего) внимания! Внимание!* | *Прашу (вашай) увагі! Увага!* |
| *Прошу вас, обратите внимание … !* | *Прашу вас, звярніце ўвагу … !* |
| *Скажите, пожалуйста!* | *Скажыце, калі ласка!* |
| *Извините!* | *Прабачце! / Выбачайце!* |
| *Извините, пожалуйста!* | *Выбачайце, калі ласка!* |
| *Будьте добры!* | *Будзьце ласкавы!* |

*Сёлета на старонках нашага часопіса з'явілася новая рубрыка – "Кірунак сказаў". У № 1 С. Важнік пачаў размову пра нацыянальную сінтаксічную ідыяматыку, у № 2 разгледзеў ветлівыя звароты, у № 3 – формулы вітання і развітання.*

| Размоўныя формулы | |
|---|---|
| *Послушайте!* | *Паслухайце!* |
| *Послушайте, молодой человек!* | *Паслухайце, малады чалавек!* |
| *Слушай сюда!* | *Слухай сюды!* (відаць, па аналогіі з *Глядзі сюды!*) |
| *Стойте!* | *Стойце!* |
| *Эй!* | *Эй! Гэй!* |
| *Эй, мужчина / женщина / девушка / парень!* | *Гэй, мужчына / жанчына / дзяўчына / хлопец!* |
| *Але!* | Алё! |

У публічных прамовах функцыю формул прыцягнення ўвагі выконваюць ветлівыя звароты тыпу *Спадарства!, Спадары і спадарыні!, Шаноўныя!* Публічная асоба мусіць памятаць пра гэта.

• ***Як рыбак рыбака!,*** або Этыкетная сітуацыя просьбы.

Прасіць любяць не ўсе. Многія любяць атрымоўваць усё і адразу. Умець прасіць, каб не адмовілі, – гэта цэлая навука. Спектр "прасільных" канструкцый дастаткова шырокі: ад мяккіх, ветлівых – да катэгарычных і нават брутальных.

Прамое выражэнне просьбы ў беларускай мове ўласціва так званым перфарматыўным і імператыўным выказванням, а іменна:

(1) канструкцыі з перфарматывам "*прасіць* + інфінітыў / форма загаднага ладу / *каб вы* / *ты* + дзеяслоў у асабовай форме": ***Прашу***, ***каб даў*** *ты мне спакою!*;

(2) канструкцыі з загадным ладам дзеяслова: ***Прынясі***, *калі ласка, кнігу!*.

Яны займаюць цэнтральнае месца ў функцыянальна-семантычным полі просьбы. Мадыфікацыі этыкетных формул перфарматыўнага тыпу ў асноўным узнікаюць за кошт выкарыстання адпаведных часавых форм (*Я цябе* ***буду прасіць****!; Я* ***прыйшоў прасіць*** *вас!*), форм ладу (*Я* ***б*** *вас* ***праcіла***…), за кошт выражэння розных мадальных значэнняў (***Хацеў*** *вас* ***прасіць***…).

Перыферыю семантычнага поля просьбы (ускоснае выражэнне пэўнай этыкетнай інфармацыі) складаюць перадусім умоўныя (выказванні з часціцай *каб*: ***Каб*** *быў / стаў…*; ***Каб*** *было мне…*) і мадальныя канструкцыі (выказванні з мадальнымі дзеясловамі *магчы, хацець, мусіць* і мадальнымі словамі тыпу *можна, павінен, трэба*), якія, у параўнанні з цэнтральнымі, прамымі сродкамі, маюць большую ступень ветлівасці, мяккасці ці катэгарычнасці. Якраз на перыферыі

ў большай ступені выяўляецца нацыянальная спецыфіка беларускай мовы ў рускамоўным дачыненні.

Так, на агульным фоне вылучаюцца беларускамоўныя ўскосныя спосабы афармлення просьбы з часціцай *ці*, якім у рускай мове адпавядаюць канструкцыі з часціцай *ли*. Параўнаем: бел. ***Ці** няможна / можна + вам / табе / мне* + інфінітыў*?*; ***Ці** не можна было б + інфінітыў?* – руск. *Нельзя **ли** / Можно **ли*** + інфінітыў*?*; бел. ***Ці** няма ў вас / у цябе… ?* – руск. *Нет **ли** у вас / у тебя… ?* Пытальнасць і негацыя пры гэтым служаць дадатковым сродкам мадальнасці і ветлівасці.

Сярод мадальных формул просьбы найбольш прадуктыўнымі з'яўляюцца дастаткова катэгарычныя канструкцыі з адценнямі:

павіннасці: *Ты **павінен** / **мусіш*** + інфінітыў*;*

неабходнасці: ***Трэба*** + інфінітыў*; **Трэба**, каб вы / ты + мне / нам* + дзеяслоў у форме прошлага часу*;*

пажаданасці: *(Я) **хачу** / **хацеў бы**, каб* + інфінітыў*; (Я) **хачу** / **хацеў бы**, каб вы / ты* + дзеяслоў у форме прошлага часу*; (Я) **хачу** / **хацеў бы**, каб быў* + назоўнік у наз. склоне.

Адзначым таксама спецыяльныя словы і выразы, якія робяць просьбу больш ветлівай, больш мяккай: *Калі ласка!; Даруйце!; Прашу Вас!; Благаславіце!; Будзьце ласкавы!* і інш.

Як беларускай, так і рускай мовам уласцівы разнастайныя спосабы выражэння просьбы. Найбольш прадуктыўныя і адметныя з іх пададзены ў зводнай табліцы 2.

**Зводная табліца 2. Этыкемы просьбы.**

| Руская мова | Беларуская мова |
|---|---|
| **1. Спецыяльныя формулы** | |
| *Пожалуйста!* | *Калі ласка!* |
| *Будьте добры! / Будь добр! Сделайте одолжение!* (кніжн.) *Окажите честь!* (кніжн.) *Сделайте милость!* (устар., кніжн.) | *Зрабіце ласку! Будзь(це) (так) ласкавы! Будзьце такія добрыя!* |
| *Будьте добры, не посчитайте за труд, подайте … !* | *Будзьце ласкавыя, калі вам не цяжка, падайце … !* |
| *Будьте любезны!* | *Можа, вы былі б такія добрыя / ласкавыя і … !* |
| *Не будете ли вы так любезны?!* | *Ці не будзеце вы / Ці не будзе спадар / спадарыня ласкавы / ласкавая?!* |
| *Ради Бога!* | *Злітуйцеся!* |
| *Благославите!* | *Благаславіце!* |
| *Помилуйте!* | *Злітуйцеся!* |
| *Не откажите в любезности! Не сочтите за труд!* | *Зрабіце ласку!* |
| *Сделайте услугу!* | *Зрабіце паслугу!* |
| *Позвольте!* | *Дазвольце!* |
| *Не откажите / не отказывайте мне в просьбе!* | *Не адмоўце / не адмаўляйце мне ў просьбе!* |
| *Извините, пожалуйста!* | *Выбачайце, будзьце ласкавы!* |
| **2. Перфарматыўныя формулы** | |
| *Прошу вас!* | *Прашу вас!* |
| *Я вас буду просить!* | *Я вас буду прасіць!* |
| *У меня (есть) к вам просьба … !* | *У мяне (ёсць) просьба да вас … ! / Маю просьбу да вас … !* |
| *Очень / убедительно прошу вас об этом!* | *Вельмі прашу вас аб гэтым!* |
| *Я могу просить вас … ?!* | *Я магу папрасіць вас … ?!* |
| *Прошу вашего разрешения … !* | *Прашу вашага дазволу … !* |
| *Я хотел бы попросить вас … !* | *Я хацеў бы папрасіць вас … !* |
| *Умоляю вас!* | *Малю вас!* |
| *Призываю вас!* | *Заклікаю вас!* |
| **3. Імператыўныя формулы** | |
| *Разрешите! Позвольте!* | *Дазвольце!* |
| *Скажите, пожалуйста … !* | *Скажыце, калі ласка … !* |
| *Разрешите спросить (сесть, войти, взять…)!* | *Дазвольце спытаць / запытацца (сесці, увайсці, узяць…)!* |
| *Помогите мне, пожалуйста!* | *Дапамажыце мне, калі ласка!* |
| *Прошу вас, проводите (обождите) меня!* | *Прашу вас, праводзьце (пачакайце) мяне!* |
| **4. Мадальныя формулы** | |
| *Нужно, чтобы вы что-то для меня сделали … !* | *Трэба, каб вы нешта для мяне зрабілі … !* |
| *(Я) хочу / хотел бы, чтобы всегда была хорошая погода!* | *(Я) хачу / хацеў бы, каб заўсёды было добрае надвор'е!* |
| *Простите, можно вас спросить?!* | *Прабачце, можна ў вас запытацца?! Магу я ў вас запытацца?!* |
| *Можно узнать … ?!* | *Можна даведацца … ?!* |
| *Не хотите ли?* | *Ці (не) хочаце?* |
| *Не могли бы вы … ?!* | *Ці (не) маглі б вы … ?!* |
| *Вы не сделали бы этого для меня?!* | *Вы не зрабілі б гэтага для мяне?!* |
| *Не могли бы вы мне помочь?!* | *Ці (не) маглі б вы мне дапамагчы?!* |
| *Не могли бы вы сделать для меня исключение?!* | *Ці (не) маглі б вы зрабіць для мяне выключэнне?!* |
| **5. Умоўныя формулы** | |
| *Если вам не тяжело … !* | *Калі вам не цяжка … !* |
| *Буду вам очень благодарен (благодарна), если … !* | *Буду вам вельмі ўдзячны(ая), калі … !* |
| **6. Просьбы "пытанне + негацыя"** | |
| *Не желаете ли ... ?!* | *Ці (не) жадаеце ... ?!* |
| *Не тяжело ли вам … ?!* | *Ці не цяжка вам … ?!* |
| **7. Размоўныя формулы** | |
| *(Ну,) Будь другом (, а)! Ты мне друг?!* | *(Ну,) Калі ласачка!* |
| *Не в службу, а в дружбу!* | – |

• ***Як рыбак рыбаку!,*** або Этыкетная сітуацыя прапановы.

Добрая прапанова вартая падтрымання! Таму трэба навучыцца рабіць прапановы і падтрымліваць іх.

Маўленчая сітуацыя прапановы істотна адрозніваецца ад сітуацыі просьбы не столькі складам удзельнікаў пэўнай этыкетнай сітуацыі, колькі характарам іх узаемадзеяння: інтэнцыя актыўнага дзеяння зыходзіць тут ад моўцы, а не ад суразмоўцы (як у выпадку сітуацыі просьбы).

Тыпалогія этыкем прапановы такая ж, што і ў папярэднім выпадку.

**Зводная табліца 3. Этыкемы прапановы.**

| Руская мова | Беларуская мова |
|---|---|
| **1. Перфарматыўныя формулы** | |
| *Предлагаю вам … !* | *Прапаную вам … !* |
| *У меня есть к вам предложение … !* | *Маю да вас прапанову … !* |
| *Приглашаем!* | *Запрашаем!* |
| *Прошу! Милости прошу!* | *Прашу! Ласкава прашу!* |
| *Попрошу сюда! Сюда, пожалуйста!* | *Папрашу сюды! Сюды, калі ласка!* |

| 2. Імператыўныя формулы | |
|---|---|
| *Проходите! / Заходите! / Входите! Пожалуйста!* | *Праходзьце! / Заходзьце! / Уваходзьце! Прашу вас! Калі ласка!* |
| *Садитесь, пожалуйста!* | *Сядайце, калі ласка!* |
| *Будьте как дома!* | *Будзьце як дома!* |
| *Пожалуйста, прошу к столу! Угощайтесь!* | *Калі ласка, прашу за стол! Частуйцеся!* |
| *Попробуйте (на вкус)!* | *Паспрабуйце / паспытайце / пакаштуйце!* |
| *Возьмите! Берите!* | *Вазьміце! Бярыце!* |
| *Примите! Примите от всего сердца этот скромный подарок!* | *Прыміце! Прыміце ад усяго сэрца гэты сціплы падарунак!* |
| **4. Мадальныя формулы** | |
| *Хочу / могу вам предложить!* | *Хачу / магу вам прапанаваць!* |
| *Может вам еще чего-нибудь?!* | *Можа вам яшчэ чаго? / Ці вам яшчэ чаго?!* |
| *Не хотите ли зайти на пару минут на чашечку кофе / чая?!* | *Можа б зайшлі на некалькі мінут на кубачак (філіжанку) кавы / гарбаты?!* |
| *Может, сыграем в шахматы?* | *Можа, згуляем у шахматы?* |
| *Можно ли вас пригласить на ужин?* | *Ці магу запрасіць вас на вячэру?* |
| *Могу ли я вам чем-нибудь помочь?!* | *Ці магу вам нечым дапамагчы?!* |
| **5. Формулы-пытанні** | |
| *Что будете пить? Сок, кофе, чай?!* | *Што будзеце піць? Сок, кава, гарбата?!* |
| *Что будете делать завтра?* | *Што будзеце рабіць заўтра? Што спадар / спадарыня рабіць заўтра?* |

• ***"Шчыры тлусты дзякуй!"*** = ***"Большое человеческое спасибо!"***: этыкетная сітуацыя падзякі.

Надзвычай важным "ключыкам" да далейшай паспяховай камунікацыі з пэўнай асобай з'яўляецца выказванне ёй падзякі за папярэднія выніковыя дзеянні ці проста за жаданне дапамагчы. Як пажартаваў прафесар А. Я. Міхневіч у сваім арталагічным даведніку "Слоўка за слоўкам", ёсць некалькі праблем ва ўжыванні слова *дзякуй*. Адна з іх – маральная: яго трэба гаварыць як мага часцей[2].

**Зводная табліца 4. Этыкемы падзякі.**

| Руская мова | Беларуская мова |
|---|---|
| **1. Спецыяльныя формулы** | |
| *Спасибо!* 'Спаси Бог' | *Дзякуй!* |
| *Большое спасибо!* | *Вялікае (вялікі) / шчырае (шчыры) дзякуй!* |
| *Спасибо вам за угощение / за внимание / приятный вечер / помощь / за все!* | *Дзякуй вам за пачастунак / за ўвагу / прыемны вечар / дапамогу / за ўсё!* |
| *Спасибо, только немножко! Спасибо, нет, хватит!* | *Дзякуй, калі крыху! Дзякуй, не, досыць!* |
| *Спасибо за приглашение, приду, как только смогу!* | *Дзякуй за запрашэнне, прыйду, як будзе выпадаць!* |
| *Сердечное спасибо (за все, что вы сделали для нас)!* | *Сардэчнае (сардэчны) дзякуй (за ўсё, што вы зрабілі для нас)!* |
| *Не знаю, как вас и благодарить!* | *Не ведаю, як вам дзякаваць!* |
| **2. Перфарматыўныя формулы** | |
| *Сердечно благодарю!* | *Шчыра (вельмі / сардэчна) дзякую вам! Шчыра вам удзячны!* |
| *Благодарю вас!* | *Я ўдзячны вам!* |
| *Вы очень внимательны, благодарю вас!* | *Вы вельмі ўважлівыя, шчыра дзякую!* |
| *Благодарю заранее!* | *Дзякую наперад! Наперад удзячны (удзячна, удзячныя)!* |
| *Искренне благодарен (вам)!* | *(Я вам) вельмі ўдзячны. Шчыра ўдзячны вам!* |
| *Я вам очень обязан / обязана!* | *Я вам надзвычай / вельмі абавязаны / абавязана!* |
| *(Я вам) крайне признателен!* | *(Я вам) бязмерна ўдзячны!* |
| **3. Імператыўныя формулы** | |
| *Примите, пожалуйста, благодарность за … !* | *Прыміце, калі ласка, падзяку за … !* |
| *Разрешите высказать вам свою благодарность ... !* | *Дазвольце выказаць вам маю ўдзячнасць ... !* |
| **4. Эмацыянальна-ацэначныя формулы** | |
| *О, это очень мило с вашей стороны!* | *О, гэта вельмі міла з вашага боку!* |
| *Очень любезно!* | *Вельмі прыязна / ласкава!* |
| **5. Размоўныя формулы** | |
| *Благодарю покорно! (часта – іранічн.)* | *Дзякую табе за ласку!* |
| *Большое человеческое спасибо!* | *Шчыры тлусты дзякуй!* |
| *Спасибо на добром слове!* | *Дзякуй на добрым слове!* |
| **Адказы на падзяку** | |
| *Пожалуйста!* | *Калі ласка!* |
| *И вам также!* | *І вам таксама!* |
| *Не за что! Не стоит благодарности! Не стоит!* | *Няма за што (дзякаваць)! Не варта ўдзячнасці! Не варта!* |
| *Это мелочь! Мелочи! Какие пустяки! / Ну что вы!* | *Гэта дробязь / драбяза!* |
| *Обращайтесь еще!* | *Звяртайцеся яшчэ!* |

• ***Вялікі*** ці ***вялікае***? Або яшчэ раз аб родавай прыналежнасці беларускага ***дзякуй.***

Слова *дзякуй* трапіла ў беларускую мову з нямецкай мовы праз пасрэдніцтва польскай. Параўнаем: нямецк. *Danken* → польск. *dziękuję / dzięki* → бел. *дзякую / дзякуй.* Сёння ўжываецца як часціца і як назоўнік.

У слоўніках і іншых нарматыўных крыніцах[3] замацаваны ніякі род назоўніка *дзякуй.* Але ў сучаснай моўнай практыцы адпаведны назоўнік актыўна выкарыстоўваецца ў форме мужчынскага роду (*вялікі / шчыры / сардэчны дзякуй*), відаць, як адштурхоўванне ад рускага *большое спасибо*[4], што стала ўжо сучаснай нормай.

• ***Калі ласка!*** як галоўны "ключык" камунікацыі па-беларуску.

Лінгвісты вельмі часта гавораць пра мнагазначнасць і аманімічнасць этыкемы *Калі ласка!.* Гэта па сваёй сутнасці універсальны "ключ", якім адчыняюцца "дзверы" розных этыкетных сітуацый. Таму адпаведны выраз разумеецца:

1) як формула, што ўжываецца для надання просьбе, пабуджэнню да якога-небудзь дзеяння або прапанове мяккага, ветлівага характару; адпавядае па значэнні этыкеме *Вельмі прашу!* Параўнаем: *Калі ласка, дапамажыце мне!; Сядайце, калі ласка!;*

2) як формула, што ўжываецца для ветлівага выражэння дазволу, згоды ці гатоўнасці што-небудзь зрабіць. Параўнаем: *Ці не маглі б вы мне дапамагчы? – Калі ласка!;*

3) як формула, што ўжываецца ў адказ на падзяку з боку суразмоўцы і азначае, што моўца пачуў і прыняў падзяку. Параўнаем: *Дзякуй за пачастунак! – Калі ласка!;*

4) як формула, што ўжываецца ў адказ на прабачэнне і азначае, што моўца пачуў і прыняў прабачэнне. Параўнаем: *Даруйце за турботы! – Калі ласка, заходзьце яшчэ!.*

Такім чынам, як паказвае пададзены ў зводных табліцах беларускамоўны і рускамоўны матэрыял, у кожнай групе апісаных этыкем ёсць як эквівалентныя (тоесныя і падобныя), так і неэквівалентныя (адрозныя, адметныя, спецыфічныя) адзінкі. Пры гэтым развіта моцная варыятыўнасць этыкетных формул у кожным функцыянальна-семантычным класе. Менавіта з улікам гэтага прынцыпу і пабудаваны зводныя табліцы да кожнай этыкетнай сітуацыі.

Ну, дзякуй Вам за ўвагу! Заходзьце да нас яшчэ! Чытайце ў наступным нумары, як навучыцца ветліва пагаджацца і адмаўляць. Заўсёды Ваш С. В. ☺

---

[1] Тэрмін *этыкема* ўжываецца ў значэнні ‘этыкетная формула’.

[2] **Міхневіч, А. Я.** Слоўка за слоўкам: алфавітны даведнік па культуры беларускай мовы для ўсіх / А. Я. Міхневіч, Л. П. Кунцэвіч, Ю. В. Назаранка. – Мінск, 2006. – С. 47.

[3] Гл., напрыклад: **Арашонкава, Г. У.** Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы / Г. У. Арашонкава, В. П. Лемцюгова – Мінск, 1987. – С. 80 – 81.

[4] Некаторыя даследчыкі (гл. працы Ю. Бушлякова, Н. Старавойтавай) лічаць, што нельга казаць *вялікае дзякуй,* бо гэта калька з рускай мовы.

*Свет моў і святло мовы*

# СТРАКАТАЯ ЛІНГВІСТЫЧНАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

**Найстаражытнейшая “мова” зямлі.** Самым першым насельнікам сусветнага акіяна, што некалі пакрываў Зямлю, трэба было весці барацьбу за існаванне. Для гэтага ім была патрэбна інфармацыя пра навакольнае асяроддзе. А дзе інфармацыя, там і сродкі яе перадачы. Вучоныя лічаць: каб атрымаць звесткі пра хімічны стан вады, найпрасцейшыя жывыя істоты абзавяліся нюхам. І сёння нюхальная сістэма застаецца універсальнай для бактэрый, водарасцяў, грыбоў, вышэйшых раслін, жывёл і чалавека. Яна паклала пачатак фарміравання інтэлекту. Праўда, асаблівых вышынь у майстэрстве карыстацца гэтым дарам чалавек не дасягнуў, хоць і стварыў “мову парфуму”. Вастрыня нюху жывёл у дзесяткі і сотні разоў перавышае магчымасці чалавека. Сістэма камунікацыі чалавека пабудавана на сігналах рознай прыроды: акустычных, механічных, хімічных (да якіх адносяцца і пахі). Але дамінуюць сігналы аптычныя – лепей, як кажуць, адзін раз пабачыць... Для большасці жывёл найбольш дзейсным інфармацыйным сігналам застаюцца пахі. Гэта дае падставы лічыць іх своеасаблівай мовай, найстаражытнейшай на Зямлі. Даследаваўшы гэтую мову і авалодаўшы яе відамі, чалавек навучыцца кіраваць фізіялогіяй і эмоцыямі жывёл. Напрыклад, водарныя заслоны дазволяць абысціся без ядахімікатаў пры ахове раслін. Зразумець жывую мову прыроды – самая высакародная задача чалавека.

**Унутраная форма слова.** Гэтым лінгвістычным тэрмінам пазначаецца тое першаснае значэнне, якое ў зыходнай мове, г. зн. у мове, дзе нарадзілася назва, было пакладзена ў яе аснову. Напрыклад, дзеяслоў *страляць* утвораны ад *страла* і першапачаткова значыў ‘пускаць стрэлы’. Гэта і ёсць яго ўнутраная форма. *Страляць* – слова славянскае. Сама ж *страла* – слова праіндаеўрапейскае, і яго ўнутраная форма – ‘прамень’, параўнаем нямецкае *Strahl* – прамень, латышскае *(zibens) strēle* – паласа / палоса (маланкі).

Вось унутраная форма некаторых адзінак дзвюх лексічных груп. Экзатычныя жывёлы: *жыраф* (арабскае) – ‘мілы, дзівосны’; *слон* (цюркскае) – ‘леў’; *кракадзіл* (грэчаскае) – ‘галькавы чарвяк’; *арангутанг* (малайскае) – ‘лясны чалавек’; *мамант* (тунгускае) – ‘мядзведзь’. Воінскія званні: *маршал* (германскае) – ‘стайневы, канюшневы слуга’; *генерал* (лацінскае) – ‘агульны’; *маёр* (лацінскае) – ‘вялікі, старшы’; *капітан* (італьянскае) – ‘галоўны’; *лейтэнант* (французскае) – ‘намеснік’; *сяржант* (французскае) – ‘служачы’; *яфрэйтар* (нямецкае) – ‘вызвалены’; *есаул* (татарскае) – ‘начальнік’; *салдат* (італьянскае) – ‘той, хто служыць за плату – сольдзі’.

Іншая назва ўнутранай формы слова – этымон, адсюль навука, што вывучае паходжанне назваў, – этымалогія, адна з самых цікавых і займальных (але і складаных) лінгвістычных дысцыплін.

**Кемлівы сабака-мовавед.** У Германіі знойдзены сабака, што разумее мноства чалавечых слоў. Менавіта разумее, а не рэагуе на інтанацыю, што ўласціва вышэйшым жывёлам. Спецыялісты Інстытута эвалюцыйнай антрапалогіі імя Макса Планка абследавалі гэтага сабаку і выявілі, што яго здольнасць разумення і навучання новым словам адпавядае аналагічным здольнасцям трохгадовага дзіцяці, а запас слоў перавышае дзве сотні. Вось такі унікум жыве сярод братоў нашых меншых!

**Арнольд МІХНЕВІЧ,**
доктар філалагічных навук.

*“Стракатая лінгвістычная энцыклапедыя” друкуецца з 2006 г. Пра цікавыя факты з гісторыі беларускай ды іншых моў можна прачытаць у № 11 за 2006 г., у №№ 1, 3, 5, 7, 10 за 2007 г., №№ 1, 3 за 2008 г.*

*Ганарар за публікацыю аўтар ахвяруе на развіццё часопіса.*

Уладзімір КОШЧАНКА

# МОВЫ СЛАВЕНІІ

**ПЕРАДГІСТОРЫЯ СУЧАСНАЙ МОЎНАЙ, ЭТНІЧНАЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ СІТУАЦЫІ**

Тэрыторыя сучаснай Славеніі ў старажытныя часы была населена італійскімі і ілірыйскімі плямёнамі. Прыкладна ў III ст. да н. э. сюды прыйшлі кельты, якія пакінулі шмат тапонімаў (возера Бохінь, назвы рэк Сава, Драва і інш.). У I ст. да н. э. пачалася экспансія Рыма і пасля 200-гадовага змагання ў I ст. н. э. гэтая тэрыторыя ўвайшла ў склад Рымскай імперыі, тады ж пачалі з'яўляцца першыя гарады: Цэлея (Цэле), Эмона (Любляна), Наўпортус (Врхніка), Паэтовіо (Птуй).

Улада Рыма ў IV ст. аслабла ў выніку ўварвання гунаў і германцаў (лангабардаў і іншых), якія захапілі практычна ўвесь Апенінскі паўвостраў. Тэрыторыя Славеніі была заселена германскім племенем лангабардаў. А ў сярэдзіне V ст. на паўвостраве было ўсталявана панаванне астраготаў, у склад каралеўства якіх увайшлі і землі цяперашняй Славеніі.

З сярэдзіны VI ст. на тэрыторыі краіны пачалі з'яўляцца першыя славяне, якія перасяляліся з Маравіі (рэгіён сучаснай Чэхіі), але першая хваля славян была не вельмі вялікай.

У 568 г. лангабарды пакінулі тэрыторыю Славеніі і Панноніі (заходняя частка сучаснай Венгрыі) і перасяліліся ў Італію.

Блізу 585 – 595 гг. мела месца другая хваля міграцыі славян, якія засялілі абшары, што намнога перавышалі тэрыторыю сучаснай Славеніі [Сярэдні Дунай, Панонскую нізіну, усходнія Альпы (Карантанію), Прымор'е]. Славяне на гэтых землях не мелі самастойных палітычных утварэнняў, а падпарадкоўваліся Аварскаму каганату. У VII ст. у выніку паўстання славян пад кіраўніцтвам Сáма супраць аваараў быў створаны саюз славянскіх плямёнаў. Пасля смерці Сама ў 658 г. саюз разваліўся, але невялікая яго частка захавала самастойнасць – утварылася княства *Карантанія* (Харутанія) з цэнтрам у *Гаспасвецкім полі* [на поўнач ад Клагенфурта (Аўстрыя)], якое займала тэрыторыі сучасных аўстрыйскай і славенскай Карынтыі.

Карантанія ў 745 г. страціла самастойнасць і трапіла ў залежнасць ад Баварыі, а ў 788 – ад Франкскага каралеўства. З моманту распаду Франкскай дзяржавы Карантанія перайшла да Усходне-Франкскага каралеўства. Частка панонскіх харутанскіх земляў увайшла ў склад Вялікамараўскага каралеўства. У 840 г. панонскія харутаны здолелі стварыць балатонскае княства, якое праіснавала да 876 г. У 896 г. у Панонію прыйшлі венгры пад кіраўніцтвам Арпада, якія паступова сталі асіміляваць і выцясняць славян з Панноніі.

У X – XIII стст. на тэрыторыі, населенай славенцамі, утварыўся шэраг феадальных княстваў, якія ўваходзілі ў склад Свяшчэннай Рымскай імперыі: Карынтыя (Карантанія), Штырыя, Крайна (асноўная частка сучаснай Славеніі), Гарыца і Істрыя.

Пад 1144 г. у летапісах упершыню згадваецца сучасная назва сталіцы Славеніі Любляны ў яе нямецкім варыянце – *Laibach* (пазней сустракаецца пад імем *Luwigana*).

Карынтыйская дынастыя знікла ў 1269 г., і землі герцагства былі далучаны да каралеўства Багеміі каралём Атакарам II, але ў 1278 г. у бітве пры Дзюрнкруце войскі нямецкага караля Рудольфа I і венгерскага Ладыслава IV перамаглі Атакара, а сам ён быў забіты. Славенскія землі былі далучаны да ўладанняў Габсбургаў.

Герцагства Карантанія ў 1335 г. было перададзена аўстрыйскім герцагам з Габсбургскай дынастыі і пазней страціла адносную самастойнасць. Славенцы, што жылі ў Карынтыі, Карніёле і Штырыі, заставаліся пад уладай аўстрыйскіх Габсбургаў да 1918 г. за выключэннем кароткага чатырохгадовага перыяду з 1809 да 1813 г., калі славенскія землі ўвайшлі ў склад так званых "Ілірыйскіх правінцый".

У 1849 г. было створана герцагства Карынтыя. Паступова нарастаў рух за самастойнасць славенскіх земляў. У 1848 г. узнікла першая палітычная праграма "Аб'яднаная Славенія" (Zedinjena Slovenija), якая ставіла за мэту аб'яднанне славенскіх земляў пад адзіным палітычным кіраўніцтвам. У 1869 г. адбыўся сход у Віжмар'і каля Любляны, у якім удзельнічала каля 30 000 чалавек, што падтрымалі праграму "Аб'яднанай Славеніі". Паступова пачала развівацца ідэя "югаславізму" – аб'яднання ўсіх паўднёвых славян у адну дзяржаву.

Сербскія, харвацкія і славенскія прадстаўнікі ў аўстрыйскім парламенце 30 мая 1917 г. падпісалі Дэкларацыю аб стварэнні агульнай дзяржавы сербаў, харватаў і славенцаў.

6 кастрычніка 1918 г. была створана Нацыянальная рада трох славянскіх народаў, якая неўзабаве зрабілася палітычнай сілай, што прадстаўляла паўднёвых славян у Аўстра-Венгрыі, а 29 кастрычніка Рада абвясціла пра разрыў адносінаў з Аўстра-Венгрыяй і стварэнне Дзяржавы славенцаў, харватаў і сербаў, якую, аднак, ніхто не прызнаў.

1 снежня 1918 г. дзяржава славенцаў, харватаў і сербаў аб'ядналася з Каралеўствам Сербіяй і Кара-

*Артыкул Уладзіміра Кошчанкі працягвае цыкл публікацый "Роднага слова", якія змяшчаюцца ў рубрыках "Моўнае аблічча планеты", "Мовы свету", "Цікава ведаць" з 2004 г. Асвятленню названых тэм прысвечаны таксама публікацыі* ***Наталлі Перавалавай*** *(2004, №№ 1 – 4, № 6) і* ***Эрыкі Ялоўскай*** *(2004, №№ 9, 11, 12; 2005, № 10; 2007, № 2).* ***Уладзімірам Кошчанкам*** *былі падрыхтаваны матэрыялы пра валійскую мову (2004, № 4), шматмоўе ў Еўропе (2004, № 8), мовы Іберыйскага (Пірэнейскага) паўвострава (2005, № 8), мовы Францыі і Манака (2006, № 10), мовы Брытанскіх астравоў (2007, № 4).*

леўствам Чарнагорыяй у Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 г. – Югаславія).

Частка славенскіх земляў вакол Трыеста ў выніку вайны паміж Італіяй і Аўстрыяй адышла ў 1920 г. па Рапальскай дамове да Італіі.

У 1941 г. арміі Германіі, Італіі і Венгрыі акупіравалі краіну і падзялілі яе на тры часткі. Гэта быў ці не самы цёмны перыяд у гісторыі славенцаў.

Пасля Другой сусветнай вайны Славенія стала адной з рэспублік Югаславіі*. Згодна з рашэннем Парыжскай мірнай канферэнцыі 1946 г. большая частка тэрыторыі, населенай славенцамі, але якая ўваходзіла ў склад Італіі з 1918 г., была далучана да Югаславіі. Да 1954 г. тэрыторыя вакол Трыеста лічылася вольнай зонай, а ў 1954 г. яна была падзелена паміж Італіяй і Югаславіяй – Італія атрымала Трыест, а югаслаўская рэспубліка Славенія – паўночную частку паўвострава Істрыя. У выніку палітычных падзей XX ст. па-за межамі Славеніі апынулася каля трэці этнічнага славенскага насельніцтва: большай часткай у Карынтыі (Аўстрыя) – прыкладна 100 тыс., і Італіі (вакол Трыеста) – каля 500 тыс.

25 чэрвеня 1991 г. Славенія абвясціла незалежнасць ад Югаславіі.

### СУЧАСНАЯ МОЎНАЯ І ЭТНІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ


Паводле перапісу 2002 г., насельніцтва Славеніі складала 1 964 036 чалавек (83,1% – славенцы). Італьянцы (0,11%) і венгры (0,32%) маюць статус аўтахтонных нацыянальных меншасцяў і таксама маюць сваіх прадстаўнікоў у вышэйшым заканадаўчым органе краіны – Нацыянальнай Асамблеі. У этнічна неаднародных рэгіёнах італьянская і венгерская мовы маюць афіцыйны статус нароўні са славенскай. Сярод іншых меншасцяў можна назваць сербаў, харватаў, баснійцаў, албанцаў, македонцаў, чарнагорцаў (каля 6% агулам). Асобны статус і правы маюць цыганы (0,17%).

Сёння ў межах Славеніі можна вылучыць наступныя моўныя ідыёмы: *венгерская*, *італьянская*, *славенская*, а таксама мовы эмігрантаў: *албанская*, *баснійская*, *македонская*, *сербская*, *харвацкая*, *цыганская*.

### АЎТАХТОННЫЯ МОВЫ

***Венгерская (вугорская) мова***, *Magyar nyelv* (венг.). Фіна-угорская мова. Агульная колькасць носьбітаў венгерскай мовы ў Славеніі каля 7713 чалавек (звесткі на 2002 г.). Распаўсюджана ў Прэкмур'і (тэрыторыя, што мяжуе з Венгрыяй), дзе мае афіцыйны статус разам са славенскай. Існуе пачатковая і сярэдняя адукацыя, праграмы на радыё і тэлебачанні на венгерскай мове. Прадстаўнікі венгерскай меншасці маюць права звяртацца ў афіцыйныя структуры на роднай мове.

***Італьянская мова***, *Italiano, Vènetо, Veneto* (італ.). Раманская мова. Прадстаўлена ў Славеніі венецыянскім дыялектам (славенская Істрыя). Агульная колькасць носьбітаў у Славеніі каля 3762. Распаўсюджана галоўным чынам у славенскай Істрыі (узбярэжжа Адрыятыкі), дзе яна мае статус афіцыйнай разам са славенскай. У школах можна атрымаць пачатковую і сярэднюю адукацыю на італьянскай. Ёсць нацыянальныя радыё- і тэлеперадачы. Прадстаўнікі італьянскай меншасці маюць права звяртацца ў афіцыйныя структуры на роднай мове.



**Уладзімір Аляксандравіч Кошчанка** – *мовазнаўца. Закончыў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт (1998) і аспірантуру Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі (2002). Малодшы навуковы супрацоўнік аддзела славянскага і тэарэтычнага мовазнаўства Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі.*

***Славенская мова***, *Slovenski jezik* (славен.). Паўднёваславянская мова. Родная для прыкладна 1 723 434 славенцаў у Рэспубліцы Славенія, дзе яна з'яўляецца афіцыйнай мовай. Пашырана таксама сярод славенскай меншасці ў Аўстрыі (каля 60 тыс. у Карынтыі і Штырыі), Італіі (55 – 100 тыс. у венецыянскай Італіі, Рэзіі, Трыесце і Гарыцыі), Харватыі (каля 12 тыс., паўвостраў Істрыя) і Венгрыі (ад 3 да 6 тыс.). Па-за межамі этнічнай тэрыторыі ў эміграцыі жыве каля 400 тыс. славенцаў.

Цікавай асаблівасцю славенскай мовы з'яўляецца наяўнасць вялікай колькасці дыялектаў (паводле розных ацэнак, да 49).

Першымі пісьмовымі помнікамі славенскай мовы, у якіх назіраюцца тыповыя славенскія рысы, з'яўляюцца Фрэйзінгенскія фрагменты (Brižinski spomeniki), напісаныя каля XI ст. Але пра літаратурную славенскую мову можна казаць пачынаючы толькі з сярэдзіны XVI ст. – часу Рэфармацыі. Ля вытокаў стварэння новай славенскай мовы быў Прымаж Трубар, які ў 1550 г. у германскім Цюбінгене надрукаваў першую кнігу на славенскай мове Abecedarium, а таксама Катэхізіс, а пазней (1557 – 1560) пераклаў Новы Запавет. Ёсць звесткі, што ў сваёй працы ён выкарыстоўваў таксама Біблію Францішка Скарыны. Поўны пераклад Біблії ажыццявіў Юры Далмацін у 1584 г. Тадысама Адам Бохарыч напісаў першую славенскую граматыку, што стала важнай падзеяй у развіцці славенскай мовы.

Контррэфармацыя прыпыніла працэс развіцця літаратурнай славенскай мовы, і новыя спробы ўпарадкавання мовы пачалі рабіцца ў XVIII ст. Так, у 1768 г. з'явілася "Grammatik der Slavischen Sprache in Krain, Kärnten und Steyermark" ("Граматыка сла- ►

* З 1945 г. назва краіны – Федэратыўная Народная Рэспубліка Югаславія (ФНРЮ), з 1963 – Сацыялістычная Федэратыўная Рэспубліка Югаславія (СФРЮ). – *Заўвага рэд.*

* Аўтарам першай славенскай граматыкі на роднай мове (1811) быў паэт Валянцін Воднік. Важную ролю ў станаўленні славенскай літаратурнай мовы ў XIX ст. адыгралі таксама драматург А.Т. Лінхарт, празаікі Ф. Леўсцік і І. Юрчыч, паэты І. Стрытар, С. Грэгарчыч, А. Ашкерц і інш. – *Заўвага рэд.*

# ГАННА БАЗЫЛЕНКА



100

Нарадзілася Ганна Мартынаўна Базыленка 4 красавіка 1908 г. у вёсцы Арахі Аршанскага павета (цяпер г. п. Арэхаўск Аршанскага раёна). У 1920-я гг. у зборніках Віцебскай маладнякоўскай філіі "Пачатак" і "Світанне", а таксама ў перыядычным друку змяшчала вершы, апавяданні, аднаактовыя п'есы пад сваім прозвішчам і пад псеўданімам *Ганна Арахоўская*. Закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт (1931). Працавала ў Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН Беларусі (1933 – 1938), у БДУ (1944 – 1970; старшы выкладчык, дацэнт, у 1949 – 1955 гг. намеснік дэкана філалагічнага факультэта). Прымала ўдзел у стварэнні "Руска-беларускага слоўніка" (1937) і "Практычнага беларуска-рускага слоўніка" (рукапіс загінуў падчас Вялікай Айчыннай вайны). Абараніла кандыдацкую дысертацыю "Устойлівыя словазлучэнні ў мове твораў Якуба Коласа" (1952). Манаграфія даследчыцы "Пабочныя і ўстаўныя словы, словазлучэнні і сказы ў беларускай літаратурнай мове" (1964) да сёння не страціла навуковага значэння. Г. Базыленка – аўтар шэрагу навуковых артыкулаў па праблемах сучаснай беларускай мовы, у тым ліку па пытаннях моўнага майстэрства Якуба Коласа, сааўтар падручніка "Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Марфалогія" (1957), першага тома акадэмічнай "Граматыкі беларускай мовы" (1962). Памерла Ганна Базыленка 19 студзеня 1980 г.

Да 90-годдзя з дня нараджэння Г. М. Базыленкі на старонках нашага часопіса (1998, № 4) змешчаны нарыс Івана Германовіча, прысвечаны жыццю і дзейнасці мовазнаўцы.

---

► вянскай мовы ў Краіне, Карынтыі і Штырыі") Ярнэя Капітара. XIX ст. было часам выпрацоўкі новай літаратурнай нормы, у чым важную ролю адыгралі паэт Францэ Прэшэрэн (Прашэрн) і празаік Іван Цанкар*. Важным этапам у нармалізацыі мовы было выданне славенска-нямецкага слоўніка Макса Плетэршніка ў 1894 – 1895 гг. і правапісу Франа Леўца ў 1899 г. Апошнія змены ў правапіс унесены ў 1990 г.

Доўгае знаходжанне Славеніі пад уладай Аўстра-Венгрыі прывяло да таго, што эліты карысталіся толькі нямецкай мовай, а славенская была ў асноўным мовай сялянства. Нямецкая моцна паўплывала таксама на лексіку і граматыку славенскай. Толькі пасля ўваходжання ў склад Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў у 1918 г. славенская мова пачала развівацца паўнавартасна. Сёння яна мае даволі ўстойлівыя пазіцыі, але нават у такой, здавалася б, спрыяльнай сітуацыі, у славенскім грамадстве існуе засцярога, што мова ў любы момант можа апынуцца пад пагрозай у сувязі з адкрытасцю межаў і глабалізацыяй.

### МОВЫ ЭМІГРАНТАЎ

Згодна з перапісам 2002 г. эмігранты (сербы, харваты, албанцы і іншыя) складалі 6,72% ад агульнай колькасці насельніцтва, але ніводная з моваў гэтых народаў не мае якога-небудзь афіцыйнага статусу.

Цыганы ў Славеніі маюць асобны статус і правы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, але яшчэ ў 2005 г. (больш актуальнай інфармацыі атрымаць не ўдалося) адсутнічаў закон, які рэгуляваў бы гэтыя правы. На тэрыторыі Славеніі жыве тры групы цыганоў: *венгерскія*, *бургенляндскія* (Прэкмур'е і прылеглыя раёны Аўстрыі і Венгрыі) і *даленьскія* (Даленьска, або Ніжняя Карніёла, вакол горада Нова-Места). Даленьскія цыганы – перасяленцы з Харватыі, прадстаўнікі гэтай групы цыганоў у Італіі называюць сябе *храваты* / *хаваты*.

### Спіс літаратуры

**Большая советская энциклопедия**, электронная версия издания 1970 – 1977 гг. – Москва : Большая Рос. Энцикл., 2002.

**Калыгин, В.** Введение в кельтскую филологию / В. Калыгин, А. Королев. – Москва : Наука, 1989.

**Лингвистический энциклопедический словарь**. – Москва : Сов. Энцикл., 1990.

**Языки мира. Романские языки :** Сборник / И. Челышева [и др.] – Москва : Academia, 2001.

Ethnologue, 14-th ed. – Dallas, Texas : SIL International, 2000. Vol. 1, 2.

http://en.wikipedia.org/wiki/Languages_of_Slovenia (07.09.2007)

http://www.stat.si/popis2002/si/default.htm (07.09.2007)

http://www.uradni-list.si/1/objava.jsp?urlid=200486&stevilka=3841 (07.09.2007)

http://romani.uni-graz.at/romlex/dialects.xml (07.09.2007)

http://www.errc.org/cikk.php?cikk=1109 (07.09.2007)

*ВНУ – школе*

Алена САЛАМЕВІЧ

# КАНТАМІНАЦЫЯ І СУМЕЖНЫЯ З ЁЮ З'ЯВЫ ЯК ПРЫЧЫНЫ ПАРУШЭННЯ СІНТАКСІЧНЫХ СУВЯЗЯЎ У МАЎЛЕННІ

**Кантамінацыя** (лац. *contaminatio* – змешванне) – узаемадзеянне асацыятыўна блізкіх моўных адзінак шляхам перакрыжаванага аб'яднання двух слоў ці выразаў, якое вядзе да ўтварэння новай моўнай адзінкі, часам нават няправільнай: *рацыя – радыёстанцыя; іграць значэнне – іграць ролю + мець значэнне* [6, с. 68]. Кантамінацыя сінтаксічных канструкцый узнікае ў працэсе стварэння тэксту, калі выказванне будуецца на аснове дзвюх розных сінтаксічных мадэляў, дакладней, на аснове якой-небудзь адной, але падчас гаворкі, калі думка ўжо стала агучвацца, прамоўца "на хаду" замяняе выбраную структурную мадэль іншай, блізкай па семантыцы, але са сваімі сінтаксічнымі асаблівасцямі [5, с. 111 – 112]. У выніку гэтага ўзаемадзеяння «адбываецца "абмен" кампанентамі такіх адзінак» [1, с. 238], узаемная замена элементаў: *звяртаць увагу на што-небудзь, удзяляць увагу чаму-небудзь* – ***звяртаць увагу чаму-небудзь, удзяляць увагу на што-небудзь.***

Паколькі кантамінацыя – працэс утварэння маўленчай адзінкі, то яна часцей і фіксуецца ў вольнай гаворцы, калі чалавек не вельмі сочыць за выбарам сінтаксічных мадэляў: у размове з сябрамі, сваякамі. Ужываюцца кантамінаваныя канструкцыі ў вусным і пісьмовым маўленні вучняў, абітурыентаў – тых, хто яшчэ вывучае мову і не мае багатага моўнага досведу: ***я цвёрда вызначыла сабе*** *спрабаваць паступаць у БДПУ* (з канструкцый *цвёрда вырашыла* і *дакладна вызначыла, што буду*); ***павышана вывучала матэматыку і беларускую мову*** (са словазлучэнняў *паглыблена вывучала, на павышаным узроўні вывучала),* ***спалучае ў сябе*** (са словазлучэнняў *уключае ў сябе, спалучае ў сабе*).

Ужыванне ж такіх адзінак у публіцыстыцы, у мастацкім творы апраўдана тады, калі яны выкарыстоўваюцца ў дыялогу і з'яўляюцца сродкам характарыстыкі гаворкі персанажа:

– *Менавіта* ***пра гэта****, паважаны Расціслаў, я і* ***тлумачыў*** *вам ці не цэлую гадзіну* (з газет).

З элементаў розных словазлучэнняў *тлумачыць гэта* і *гаварыць пра гэта* ўтварылася трэцяе словазлучэнне *тлумачыць пра гэта*. Ці ў аповесці А. Васілевіч "Новы свет" чытаем:

– *А цяпер толькі* ***пра яго*** *і* ***плача****.*

Са словазлучэнняў *думае пра яго* і *плача па ім* утварылася трэцяе *плача пра яго*.

У сказе:

– *Ты* ***выглядаеш на сапраўдную высакародную даму*** (В. Іпатава. "Залатая жрыца Ашвінаў") словазлучэнне *выглядаеш на сапраўдную высакародную даму* ўтворана з элементаў наступных словазлучэнняў: *падобна на сапраўдную высакародную даму, выглядаеш як сапраўдная высакародная дама.*

Кантамінацыя словазлучэнняў з'яўляецца адной з найбольш частых прычын парушэння сінтаксічных сувязяў. Вылучаюць наступныя выпадкі кантамінацыі [3, с. 56 – 57].

**А.** Парушэнне граматычных заканамернасцяў кіравання на падставе сінанімічнасці (лексічнай або кантэкставай) галоўных членаў двух словазлучэнняў: *Менавіта так і павінна быць, каб кожны чалавек* ***адчуваў*** *найвялікшую* ***падзяку*** *сваёй краіне...* (з творчых прац абітурыентаў) (параўнаем: *выказаў падзяку, адчуваў удзячнасць*); ***мне цвёрда захацелася*** *стаць настаўніцай* (са спалучэнняў *цвёрда вырашыла, мне вельмі захацелася*).

**Б.** Парушэнне сінтаксічных сувязяў можа быць вынікам кантамінацыі двух і болей сітуацыйна-сінтаксічных сінонімаў: *Ён* ***памёр****, калі ўжо нас у Адэсе не было,* ***на тое самае****, што і маці* (Я. Брыль. "Муштук і папка"). Параўнаем: *хварэў на тое самае; памёр ад хваробы на тое самае; ён памёр, бо хварэў на тое самае, што і маці*. У сказе *Ніколі ў жыцці ён так прыгожа* ***не паміраў па жанчыне*** (В. Казько. "Да сустрэчы") выдзеленае словазлучэнне ўтварылася з дзвюх (ці нават трох) канструкцый: *сумаваў па жанчыне, ледзь не паміраў ад кахання да жанчыны.* Кантамінацыю фразеалагізмаў назіраем у наступным выпадку: *Таварышы* ***згаралі ад зайздрасці*** *да яго поспехаў* (В. Быкаў. "Жураўліны крык"). Гэта адбылося ў выніку змяшання двух фразеалагізмаў: *згараць ад сораму* і *лопнуць ад зайздрасці.*

**В.** Парушэнне сінтаксічных сувязяў на падставе неспалучальнасці асобных граматычных катэгорый і пэўных лексічных сродкаў: *Алёша* ***сядзеў на рог*** *стала* (І. Пташнікаў. "Найдорф"). Параўнаем: *сядзеў на рагу стала*, *сеў на рог стала*. У апошнім сказе дзеяслоў незакончанага трывання *сядзець* патрабуе толькі меснага склону (*на чым?* ці *дзе?*), а дзеяслоў закончанага трывання *сесці* – вінавальнага склону (*на што?* ці *куды?*) і меснага (*на чым?* ці *дзе?*). Яшчэ прыклады. *Кароль мінуў доўгі плот і* ***спыніўся на другі бок вуліцы****, каля белага дома з высокімі цэментовымі ўсходамі* (В. Адамчык. "Кароль Нябожа"). Параўнаем: *спыніўся на другім баку вуліцы, пераехаў на другі бок вуліцы. Свой скарб* ***схаваў*** *не тут –* ***у бібліятэку*** (С. Давідовіч. "Пан Лявіцкі"). Параўнаем: *схаваў не тут, у бібліятэцы; схаваў не сюды, у бібліятэку. Цяпер падумала, што дарэмна* ***не раз крычыць*** *на сына, хоча зрабіць яго "сталым", забываецца, што ён дзіця яшчэ горкае…* (Г. Далідовіч. "Юля"). Параўнаем: *часта крычыць*, *не раз крычала*, *не першы раз крычыць*.

Такія словазлучэнні сустракаюцца і ў сачыненнях школьнікаў і абітурыентаў: *Гэта* ***характэрна*** *галоўнаму* ***герою*** (з двух словазлучэнняў *характэрна для героя* і *ўласціва герою* ўтворана трэцяе ***характэрна герою***). *Дакладных* ***звестак*** *аб даце яго нараджэння* ***невядома*** (з сачыненняў абітурыентаў). Параўнаем: *звестак няма, звесткі невядомы, звесткі адсутнічаюць. Гэтая перадача* ***расказвае*** *вельмі цікавыя* ***падзеі***. Параўнаем: *расказвае пра падзеі*, *паказвае падзеі*.

**Г.** Парушэнне сінтаксічных сувязяў у выніку змешвання граматычных формаў або словаўтваральна



***Алена Уладзіміраўна Саламевіч*** *– даследчык мовы. Закончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1984), аспірантуру пры Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка (1998). Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў СШ № 138 г. Мінска. З 1991 г. – у БДПУ на факультэце дауніверсітэцкай падрыхтоўкі, цяпер – старшы выкладчык кафедры методыкі выкладання інтэграваных школьных курсаў. Даследуе пытанні сінтаксісу беларускай мовы. Аўтар больш як 30 публікацый па праблемах сінтаксісу, па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратуры ў сістэме дауніверсітэцкай падрыхтоўкі.*

звязаных адзінак, якія маюць розныя спалучальнасныя магчымасці: словазлучэнне ***здзіўлены з гэтага*** ўтворана з элементаў двух іншых – *здзіўлены гэтым* і *дзівіцца з гэтага*; ***загадчык кафедрай*** – са словазлучэнняў *загадчык кафедры* і *загадваць кафедрай* (хаця тут магчымы і ўплыў рускамоўнай канструкцыі – *заведующий кафедрой*). *Бо* ***чым*** *цяпер жонка* ***будзе памятаць*** *яго? Тым грубым, злым штурхалём, ад якога паляцела ў кут?* (В. Быкаў. “На Чорных лядах”). Выдзеленае словазлучэнне ўтворана з канструкцый *жонка будзе памятаць за што* і *ён запомніцца жонцы чым.*

**Д.** Парушэнне сінтаксічных сувязяў можа ўзнікнуць пад уплывам інтэрферэнцыі: ***дзякаваць сябра*** (бел. *дзякаваць сябру,* рус. *благодарить друга),* ***хварэць грыпам*** (бел. *хварэць на грып*, рус. *болеть гриппом*), ***ажаніцца на ёй*** (бел. *ажаніцца з ёй,* рус. *жениться на ней*), ***два шчырых словы*** (бел. *два шчырыя словы,* рус. *два откровенных слова).* Ва ўмовах білінгвізму такія ненарматыўныя канструкцыі пранікаюць нават у мову пісьменніка, і апраўданае іх ужыванне можа быць толькі ў вершаваных радках: *Настаўнікі, усхваляваныя нечаканай сустрэчай і падтрымкай,* ***падзякавалі*** *сваю добраахвотную* ***варту*** *і рушылі далей* (Я. Колас. “На ростанях”). *Там ён* ***ажаніўся на*** *Грышкавай маці* ***Адэлі*** *і прывёз яе ў сваю Зялёную Дуброву* (А. Васілевіч. “Пачакай, затрымайся...”). *Як песня родная ці казка, /* ***Два шчырых словы*** *“калі ласка”* (А. Лойка. “Два шчырых словы”).

Некаторыя мовазнаўцы аднабаковае ўздзеянне (калі адбываецца не ўзаемаабмен, а толькі ўплыў адной канструкцыі на другую) лічаць не кантамінацыяй, а асіміляцыяй: *артысты* ***шчаслівыя прыезду*** *ў Маскву* [2, с. 91]**.**

Калі лексічны склад новай маўленчай адзінкі большы, чым склад кожнай з кантамінаваных, то такія з’явы называюць накладаннем ці складаннем. Пры **накладанні**, ці аплікацыі, адна канструкцыя прадстаўлена поўнасцю, а другая толькі адным сваім кампанентам: *Не толькі* ***жыць****, але і* ***бачыць цябе не хачу*** (Г. Далідовіч. “Юля”) (*жыць з табой не хачу, бачыць цябе не хачу*). Разнавіднасцю накладання лічаць і выпадкі кантамінацыі фразеалагізмаў, якія маюць аднолькавую структуру, а адрозніваюцца толькі адным кампанентам: *з усіх сіл*, *з апошніх сіл –* ***з усіх апошніх сіл*** [2, с. 95]. Пры **складанні** абедзве кантамінаваныя адзінкі прысутнічаюць у трэцяй поўнасцю, як, напрыклад, у рускай мове фразеалагізм: *ад кромешный на душе* [2, с. 95].

Некаторыя словазлучэнні, на нашу думку, узніклі некалі як кантамінаваныя, аднак сёння ўжо ўспрымаюцца як нарматыўныя, бо за кампанентам такой канструкцыі замацавалася яшчэ адно значэнне. Напрыклад, *гаварыць пра гэта + маўчаць =* ***маўчаць пра гэта.*** (Слова *маўчаць* мае значэнні: 1) нічога не гаварыць, не падаваць голасу; 2) захоўваць што-небудзь у таямніцы, не расказваць аб чым-небудзь; 3) не даваць знаць пра сябе, не праяўляцца; 4) не выказваць адкрыта сваіх думак, намераў: *Нельга маўчаць аб недахопах* [7, с. 124 – 125]. *“А чаму пра Злотнікаву маўчыш?”* (В. Быкаў. “Жураўліны крык”).

*Ён* ***спадзяваўся*** *большай* ***урачыстасці і паважнасці*** *ў гэтай справе* (Я. Колас. “На ростанях”). Словазлучэнне *спадзявацца большай урачыстасці і паважнасці* ўтворана, на нашу думку, пад уплывам наступных словазлучэнняў: *спадзявацца на большую ўрачыстасць і паважнасць* і *чакаць большай урачыстасці і паважнасці*.

З’ява кантамінацыі ўласціва спантаннаму вуснаму маўленню, і таму прамоўца яе часта не заўважае. Аднак кантамінаванае словазлучэнне можа выкарыстоўвацца ў дыялогу наўмысна, з мэтай лаканічна перадаць, падкрэсліць “сумеснае ўзаемадзеянне” розных бакоў для дасягнення адзінай мэты: ***яго пайшлі*** ўтворана з *яго звольнілі + ён пайшоў* (у рускай мове: *его ушли = его уволили + он ушел);* ***яго паступілі*** ўтворана з *яго ўладкавалі + ён паступіў* (у рускай мове: *его поступили = его устроили + он поступил*).

Калі перад намі маўленне не вуснае, а пісьмовае, кантамінаваныя канструкцыі ў ім заўважаюцца лягчэй, пры рэдагаванні тэксту яны выпраўляюцца (хаця мы бачылі, што яны “праскочылі” і туды), бо правілы літаратурнай мовы падаюць кантамінацыю як адхіленне ад узаконеных шляхоў утварэння маўлення і таму яе забараняюць [4, с. 187].

**Спіс літаратуры**

1. **Бельчиков, Ю. А.** Контаминация / Ю. А. Бельчиков // Лингвистический энциклопедический словарь. – М., 1990.

2. **Ицкович, В. А.** О контаминации и смежных с нею явлениях / В. А. Ицкович, Б. С. Шварцкопф // В сб. : Памяти академика В. В. Виноградова. – М., 1971.

3. **Міхневіч, А. Я.** Сінтаксічная перабудова падпарадкавальных словазлучэнняў у сказе (тэксце) / А. Я. Міхневіч // Беларуская лінгвістыка. – 1978. – (13).

4. **Норман, Б. Ю.** Грамматика говорящего / Б. Ю. Норман. – СПб., 1994.

5. **Норман, Б. Ю.** Синтаксис речевой деятельности / Б. Ю. Норман. – Минск, 1978.

6. **Сцяцко, П. У.** Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко і інш. – Мінск, 1990.

7. **Тлумачальны слоўнік беларускай мовы :** у 5 т. – Мінск, 1979. – Т. 3.

8. **Шведова, Н. Ю.** Активные процессы в современном русском синтаксисе (Словосочетание) / Н. Ю. Шведова. – М., 1966.

Таццяна СТАРАСЦЕНКА

# НАВУКОВЫ СТЫЛЬ

**ТЭМА 2**

Навуковы стыль – сістэма моўных сродкаў, прызначаных для перадачы і захавання навуковых ведаў. Гэта стыль спецыяльнай навуковай літаратуры, які падзяляецца на тры падстылі: ***уласна навуковы*** (жанры: *манаграфія, дысертацыя, аўтарэферат* і інш.); ***навукова-вучэбны*** (жанры: *падручнік, лекцыя, семінарскі даклад* і інш.); ***навукова-папулярны*** (жанры: *выступленне, дапаможнік, артыкул* і інш.). У сучаснай лінгвістычнай літаратуры вылучаюць яшчэ і такі падстыль, як ***навукова-справавы*** з жанрамі *анатацыя і рэферат* [4, с. 104]. *Анатацыя* – слова лацінскага паходжання, абазначае ‘кароткую характарыстыку кнігі, артыкула, якая ў асноўным перадае іх змест і дае ацэнку’ [ТСБМ, т. 1, с. 232]. *Рэферат* – слова таксама лацінскага паходжання і мае два значэнні: 1. Кароткае паведамленне зместу навуковай працы, артыкула, кнігі; 2. Даклад, заснаваны на крытычным аглядзе кніг [ТСБМ, т. 4, с. 763].

Спецыфіка інфармацыйнай функцыі навуковага стылю вызначае сукупнасць такіх камунікатыўных якасцей, як л а г і ч н а с ц ь, я с н а с ц ь, д а к л а д н а с ц ь маўлення. Адметнасць тэксту навуковага стылю асабліва выразна праяўляецца пры яго супастаўленні з тэкстам мастацкага стылю. Прыклад навуковага тэксту:

*Белавежскі зубр. Развядзенне. Да 1924 г. у заапарках розных краін Еўропы захавалася 45 зуброў, сярод якіх былі чыстакроўныя белавежскія, самец каўказскага падвіду і гібрыды. У 1929 г. у Польшчы быў створаны першы гадавальнік па развядзенні чыстакроўных абарыгенных зуброў. У 1946 г. і пазней з Польшчы было атрымана племяннное пагалоўе зуброў для развядзення на Беларусі. Да 1964 г. зуброў у Белавежскай пушчы трымалі ў загарадзі, пазней – на волі. На 1.04.1997 г. у Белавежскай пушчы было 280 зуброў, у Бярэзінскім біясферным запаведніку – 34, у Прыпяцкім запаведніку – 29, у іншых раёнах Беларусі – 43 асобіны.* (Паводле “Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь” і “Беларускай Энцыклапедыі”)

Звернемся да мастацкага тэксту:

*Шкада, аднак, зуброў тых і зубрых,*
*Што ў блізкім заняволены кардоне,*
*Што, здраставаўшы верас у загоне,*
*Ідуць панура між ялін старых.*

*У час перадвячэрні цішыня*
*Туманам разліваецца бялёсым.*
*Каля бацькоў, здаволенае лёсам,*
*Вясёлае сваволіць зубраня.*

*Стары важак, зірнуўшы спадылба,*
*Напярэдзе ступае асцярожна.*
*Адбіліся ў яго вачах трывожна*
*Любоў і боль, пяшчота і журба...*

(В. Гардзей. “Пушча”)

Для першага тэксту характэрна дакладнасць словаўжывання, якая дасягаецца выкарыстаннем лічэбнікаў для абазначэння даты і колькасці. У мастацкім творы – вершы “Пушча” В. Гардзея – эстэтычная функцыя рэалізуецца праз ацэначныя словы і вобразныя сродкі мовы.

Функцыя перадачы лагічна аргументаванай інфармацыі найбольш поўна выяўляецца ва ўласна навуковым маўленні:

*Н – пятнаццатая літара беларускага алфавіта. Паходзіць з кірыліцкай N (“наш”), што ўзнікла на аснове грэка-візантыйскай устаўнай N (“ні”). У старабеларускую графіку перайшла са старажытнарускага пісьменства. Абазначала зычныя гукі* ***н, н’*** *(“назвати”, “небо”). Мела таксама лічбавае значэнне “пяцьдзесят”.* (Беларуская мова: Энцыклапедыя)

Для тэкстаў навукова-папулярнага падстылю характэрна ўжыванне вобразных сродкаў мовы, гутарковых моўных адзінак, што дазваляе перадаць навуковую інфармацыю цікава і даступна. Такая інфармацыя папулярна каменціруецца:

*Вобраз рабой жывёлы (каня, каровы) звязваўся са зменлівым, няўстойлівым надвор’ем. Напрыклад, у беларускіх гаворках сустракаецца выраз “Восень на рабым кані ездзіць” – так гавораць пра пахмурнае, зменлівае асенняе надвор’е, калі следам за цёплымі днямі прыходзяць дні з дажджамі і вятрамі.* (Паводле У. Коваля. “Чым адгукаецца слова”)

Яшчэ прыклад тэксту навукова-папулярнага падстылю:

*Кажуць, што лінгвістыка – рыдлёўка археолага. І сапраўды, яна дапамагае ўзнавіць, дзе, калі, як жыў пэўны народ, хто былі яго суседзі, з кім вёўся гандаль...*

*Найбольшую цікавасць, як правіла, выклікаюць пытанні паходжання асобных слоў і выразаў. І гэта зразумела, таму што чалавек часам ужывае іх, не ведаючы дакладнага сэнсу, унутраных сувязей з іншымі словамі...*

*Каб дакладна выказаць любы змест з яго шматбаковымі эмацыянальна-вобразнымі асаблівасцямі, трэба адшукаць найбольш прыдатныя словы. Набыць гэтае ўменне прасцей, калі ўсведамляецца паходжанне слова, вызначаюцца ў ім напластаванні розных часоў, калі аналізуецца, чаму аўтар абраў менавіта гэтае слова.* (Л. Выгонная. “Пуржыць, паўзе мяцеліца...”: Гутарка пра вытокі “зімовых” слоў)

• Якія моўныя сродкі гэтых тэкстаў дазваляюць цікава і даступна перадаць інфармацыю?

*У студзеньскім нумары Т. Старасценка разгледзела тэму 1 “Афіцыйна-справавы стыль”. Адказы да практычных заданняў па гэтай тэме надрукаваны ў № 2.*

У навукова-вучэбных тэкстах могуць спалучацца моўныя сродкі ўласна навуковага і навукова-папулярнага падстыляў з перавагай аднаго ці другога ў залежнасці ад узросту і кантынгенту навучэнцаў. Звернемся да прыкладу:

*Лексікаграфія – раздзел мовазнаўства, які распрацоўвае пытанні тэорыі і практыкі складання слоўнікаў. У задачы лексікаграфіі ўваходзіць збіранне, сістэматызацыя і апісанне лексікі пэўнай мовы з мэтай складання слоўнікаў, вызначэнне іх тыпаў, структуры слоўнікавых артыкулаў, распрацоўка сістэмы памет, тлумачэнне семантыкі слова.* (“Сучасная беларуская літаратурная мова”)

У гэтым навукова-вучэбным тэксце пераважаюць моўныя сродкі ўласна навуковага падстылю, што выяўляецца ва ўжыванні лінгвістычных тэрмінаў *лексікаграфія, лексіка, семантыка*, формаў роднага склону назоўнікаў, у дакладнай перадачы інфармацыі без вобразных сродкаў мовы і элементаў гутарковага стылю. Наступны тэкст таксама навукова-вучэбнага падстылю, але з моўнымі асаблівасцямі навукова-папулярнага маўлення:

*Значным, разнастайным і своеасаблівым моўным багаццем вызначаецца размоўны стыль. Менавіта пісьменнікі дбаюць, каб захавалася, не перарывалася сувязь, каб літаратурная мова не асобным дрэўцам развівалася, а вырасла з адзіных каранёў мовы народнай. Гэта адносіцца не да тых ці іншых дыялектных лексем, а, у першую чаргу, да адзінства заканамернасцей унутранага развіцця ўсіх моўных узроўняў – фанетычнага, лексічнага, граматычнага.* (“Асновы культуры маўлення і стылістыкі”)

Як бачым, апрача лінгвістычных тэрмінаў, у тэксце выкарыстоўваюцца вобразныя сродкі мовы: *адзіныя карані мовы народнай, асобнае дрэўца.*

Найбольш спецыфічнай часткай лексічнага складу навуковых тэкстаў з’яўляецца *тэрміналогія* – сістэма тэрмінаў пэўнай галіны навукі, тэхнікі, культуры. Існуе, напрыклад, лінгвістычная, фізічная, тэхнічная, медыцынская тэрміналогія. Поруч з тэрмінамі ў кожнай галіне ведаў ёсць таксама тэрміны-назвы. Сукупнасць спецыяльных тэрмінаў-назваў называецца *наменклатурай*. Напрыклад, у межах сучаснага беларускага мовазнаўства да ўласна тэрмінаў можна аднесці назвы часцін мовы *(дзеяслоў, займеннік, лічэбнік, прыназоўнік, злучнік)*, рознаўзроўневых моўных адзінак *(лексема, фанема, марфема)*, раздзелаў мовазнаўства *(словаўтварэнне, лексікалогія, марфалогія, сінтаксіс)*. У мовазнаўчую наменклатуру ўключаюцца, напрыклад, назвы канкрэтных падпарадкавальных злучнікаў *(калі, пакуль, як, з прычыны таго што, дзеля таго каб, быццам, нягледзячы на тое што)*, словаўтваральных суфіксаў *(-асць, -ав-, -іст-, -нік, -ак, -аў)*, няпэўна-колькасных слоў *(многа, мала, трохі, шмат, некалькі)*.

Самы значны пласт лексікі навуковага стылю складае агульнанавуковая лексіка: *канцэнтраваць, атаясамліваць, вынікаць, прадугледжваць, прадвызначаць, высвятляць, тлумачыць, даказваць*. Актыўна выкарыстоўваюцца інтэрнацыянальныя словы лацінскага і грэчаскага паходжання: *альтэрнатыва, аргумент, апрабацыя, аналіз, гіпотэза, дыялектыка*.

На марфалагічным узроўні для навуковага стылю характэрна ўжыванне формаў займеннікаў 1-й асобы множнага ліку, напрыклад: *мы лічым, мы мяркуем*. У навуковых тэкстах актыўна ўжываюцца назоўнікі, што тлумачыцца іх намінатыўнай функцыяй: яны абазначаюць, апісваюць з’яву. Выкарыстоўваюцца абстрактныя назоўнікі: *умова, колькасць, уласцівасць, велічыня, з’ява* і інш. У навуковым стылі некаторыя абстрактныя і рэчыўныя назоўнікі маюць форму множнага ліку: *тэмпературы, частоты, маслы, гліны, солі.* Навуковаму маўленню ўласцівы формы роднага склону назоўнікаў: *вынікі даследавання, дасягненні лінгвістыкі, правядзенне эксперыментаў.* Прыметнікі выкарыстоўваюцца пераважна ў тэрмінах: *звонкі зычны, якасны прыметнік, складаны сказ*. Для навуковага стылю характэрна ўжыванне ў ролі прыназоўнікаў поўназнамянальных слоў: *у сувязі з, шляхам, па меры, на працягу*.

Адметнасць навуковага стылю выяўляецца і ў сінтаксісе. Пераважаюць простыя сказы, ускладненыя аднароднымі членамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі:

*Словы з прамым і пераносным значэннем лёгка збліжаюцца, сінанімізуюцца ў кантэксце, ствараюць індывідуальнасць, непаўторнасць Коласавага стылю.* (А. Юрэвіч. “Вобразнасць Коласавага слова”)

У гэтым сказе з навуковага тэксту ўжыты аднародныя члены: *прамым і пераносным; збліжаюцца, сінанімізуюцца, ствараюць; індывідуальнасць, непаўторнасць*.

Сярод простых сказаў навуковых тэкстаў актыўна выкарыстоўваюцца няпэўна-асабовыя *(Вылучаюць некалькі разнавіднасцей марфалагічнага словаўтварэння)*, безасабовыя *(Нельга ўтварыць простую форму вышэйшай ступені параўнання)*.

У тэкстах навуковага стылю часта ўжываюцца складаназалежныя сказы, якія пераважаюць над складаназлучанымі. Складаназалежныя сказы выражаюць прычынныя, азначальныя, умоўныя, выніковыя, часавыя адносіны, што асабліва важна для навуковага маўлення. У лінгвістычных даследаваннях актыўна выкарыстоўваюцца складаназалежныя сказы з даданымі азначальнымі:

*Метафара макракантэксту можа знаходзіцца ў розных пазіцыях адносна слова ці тэксту, якія яе тлумачаць, падтрымліваюць або падрыхтоўваюць.* (М. Кавалёва. “Метафара і кантэкст”)

*Пераклад сказа з адной мовы на другую, як вядома, немагчымы без пэўных змен, або трансфармацый, з якіх найчасцей выкарыстоўваюцца замены.* (М. Ржавуцкая. “Культура мовы і некаторыя аспекты мастацкага перакладу”)

*Мова адлюстроўвае канцэптуальную карціну свету ў моўных формах, да якіх адносяцца і формулы маўленчага этыкету.* (Н. Старжынская. “Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін старэйшых дашкольнікаў”)

Сэнсавыя сувязі паміж сказамі ў тэксце рэалізуюцца пэўнымі спосабамі, адзін з якіх – паўтор. У на-

вуковым стылі найчасцей выкарыстоўваецца *лексічны паўтор*. Неабходна памятаць, што нематываваны паўтор пэўнага слова ў вузкім кантэксце звычайна разглядаецца як стылістычная памылка – таўталогія. Аднак у тэкстах навуковага стылю лексічны паўтор стылістычна апраўданы. Звернемся да прыкладу:

***Займеннікі** ў мове паказваюць на прадметы, якасці, на іх адносіны і сувязь. Таму ад правільнага ўжывання **займеннікаў** у многім залежыць дакладнасць, даступнасць выкладу ў тэкстах любога стылю. Вучыць ужыванню **займеннікаў** у пісьмовай і вуснай мове – задача і граматыкі, і стылістыкі.* (А. Каўрус. "Стылістыка беларускай мовы")

У гэтым тэксце навуковага стылю сказы звязаны паміж сабой паслядоўнай сувяззю, якая выражаецца паўторам слова *займеннікі*. Паўтор можа выражацца заменай часткі папярэдняга сказа займеннікамі:

*Дзеяслоў адыгрывае вялікую ролю ў арганізацыі сказа, у стварэнні тэксту любога стылю. Гэта абумоўлена і яго лексічным значэннем, і шматлікімі граматычнымі катэгорыямі: ладу, часу, стану, асобы і іншымі.* (А. Каўрус. "Стылістыка беларускай мовы")

У прыведзеным прыкладзе частка першага сказа *вялікая роля ў арганізацыі сказа, у стварэнні тэксту любога стылю* замяняецца ў другім сказе словам *гэта*. Такім чынам ажыццяўляецца сувязь паміж сказамі. У тэкстах навуковага стылю можа выкарыстоўвацца сінанімічны паўтор:

*Злітныя эпітэты могуць быць выражаныя і спалучэннямі некалькіх – двух, а то і трох – прыслоўяў з прыметнікам. У такім выпадку вобразныя азначэнні не толькі характарызуюць прымету прадмета, а і паглыбляюць, пашыраюць яго сэнс...* (Н. Гаўрош. "Злітныя эпітэты ў мастацкіх тэкстах")

Слова *эпітэты* ў наступным сказе замяняецца сінанімічным адпаведнікам *вобразныя азначэнні*.

Як бачым, для навуковага стылю характэрна спецыфічнае ўжыванне лексічных, марфалагічных і сінтаксічных сродкаў. Такое ўжыванне дазваляе поўна рэалізаваць асноўную функцыю навуковага стылю – функцыю перадачы лагічна аргументаванай інфармацыі.

**Спіс тэарэтычнай літаратуры**

1. **Асновы культуры маўлення і стылістыкі** / пад рэд. У. В. Анічэнкі. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – С. 40 – 47.

2. **Каўрус, А. А.** Стылістыка беларускай мовы / А. А. Каўрус. – Мінск : Нар. асвета, 1987. – С. 35 – 38.

3. **Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы** / пад рэд. А. Я. Баханькова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – С. 324 – 328; 407 – 427.

4. **Стилистика и литературное редактирование** / под ред. проф. В. И. Максимова. – М. : Гардарики, 2004. – С. 98 – 114.

5. **Стилистический энциклопедический словарь русского языка** / под ред. М. Н. Кожиной. – М. : Флинта : Наука, 2003. – С. 242 – 248.

6. **Цікоцкі, М. Я.** Стылістыка беларускай мовы / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – С. 258 – 265.

7. **Цікоцкі, М. Я.** Стылістыка тэксту / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Бел. навука, 2002. – С. 170 – 178.

8. **Юрэвіч, А. К.** Стылістыка беларускай мовы / А. К. Юрэвіч. – Мінск : Выш. шк., 1992. – С. 104 – 108.

**ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАДАННІ**

1. Выпішыце лінгвістычныя і літаратуразнаўчыя тэрміны, растлумачце іх значэнні.

Гукааператар, эмпірызм, варварызм, базальт, антытэза, ген, інфінітыў, гідрометр, мерыдыян, акорд, дзейнік, лагарыфм, полісіндэтон, барый, плеаназм, сімвалізм, дэдукцыя, страфа, трылогія, вектар, градацыя, генератар, эпітэт, выпраменьванне, рэтардацыя, нацюрморт, трыялет, аорта, літота, готыка.

2. Вызначце стыль тэкстаў на тэму "Белавежская пушча" і прааналізуйце іх моўныя асаблівасці.

Сімвалам нашай Беларусі з'яўляецца Белавежская пушча – бадай, самы вялікі і стары лясны абшар у Цэнтральнай Еўропе, дзе збераглiся і высокія, аж да аблокаў, бары, і магутныя векавыя дубровы, і светлыя бярозавыя гаі, і змрочныя нават у сонечныя дні яловыя нетры.

Восем стагоддзяў таму ў глухіх навакольных мясцінах гаспадарыла ваяўнічае непакорнае племя яцвягаў. Яцвягі былі спрактыкаваныя паляўнічыя, збіралі з борцяў пчаліны мёд. Але яны не выстаялі перад націскам галіцка-валынскіх, кіеўскіх ды полацкіх князёў, рассеяліся сярод іншых народаў. І Белавежу пачалі называць Зубрынай Краінаю, надзвычай багатаю на птушак і звяроў.

...Не, недарэмна хуткаплынны час у Белавежскай пушчы спыніўся, каб сівая мінуўшчына сустрэлася з днём сённяшнім і заўтрашнім. Тут наяве трапляеш у казку, легенду, паданне. Тут святлееш душою, дабрэеш сэрцам, зноў пачынаеш верыць у неспакойны чалавечы розум. Нам пад сілу зберагчы гэты цудоўны разнастайны свет для будучых пакаленняў людзей. *(У. Ягоўдзік. Нацыянальны парк "Белавежская пушча")*

Белавежская пушча – дзяржаўны нацыянальны парк у Беларусі. Размешчаны на тэрыторыі буйнога ляснога масіву Белавежская пушча (Камянецкі і Пружанскі р-ны Брэсцкай і Свіслацкі р-н Гродзенскай вобл.). Створаны ў мэтах захавання эталонных і унікальных прыродных комплексаў і аб'ектаў прыроды, правядзення навуковых даследаванняў, распрацоўкі і ўкаранення навуковых метадаў аховы прыроды і прыродакарыстання, арганізацыі экалагічнай асветы і рэкрэацыйнай дзейнасці, вядзення комплекснай гаспадаркі на аснове традыцыйных метадаў і дасягненняў прыродакарыстання. Пушча – былая паляўнічая гаспадарка польскіх каралёў (з XV ст.) і рус. цароў (XVIII – пач. XX ст.). У 1939 г. абвешчана дзяржаўным запаведнікам, у 1957 – 1991 гг. – дзяржаўная запаведна-паляўнічая гаспадарка, з 1991 г. – дзяржаў-

ны нацыянальны парк. У 1992 г. уключана ЮНЕСКА ў спіс аб'ектаў сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, з 1993 г. – біясферны запаведнік. Плошча каля 51 тыс. га (1994), у т. л. абсалютна запаведнай часткі 15,7 тыс. га. Адміністрацыйна-гаспадарчы і навуковы цэнтр у в. Камянюкі Камянецкага р-на. *(Беларуская Энцыклапедыя)*

3. Вызначце падстыль тэкстаў Міхася Лібінтава. Ахарактарызуйце моўныя сродкі гэтых урыўкаў.

Цікава, а ці можна змерыць тэмпературу за адно імгненне?.. А ці можна змерыць яе, не дакранаючыся да цела, – бескантактна, на адлегласці?.. А ці можна... убачыць тэмпературу?

Пачаліся творчыя даследаванні нашых вучоных. А за аснову ўзялі факт, даўно вядомы навуцы і кожнаму школьніку: любое цела з тэмпературай, вышэйшай за тэмпературу наваколля, выпраменьвае цеплыню ў гэтае наваколле. Цеплыня перадаецца на адлегласць у выглядзе цеплавых хваль – так званых інфрачырвоных промняў. Даўжыня гэтых хваль большая за даўжыню хваль бачнага спектра і меншая за даўжыню радыёхваль. Дыстанцыйнае ўлоўліванне такіх інфрачырвоных промняў і ляжыць у аснове цеплабачання.

Дык што гэта такое – марожанае? Гаворачы навуковымі тэрмінамі, гэта замарожаная салодкая і вадкая сумесь малочных і яечных прадуктаў, цукрозы і стабілізатараў, спецыяльных рэчываў для водару і смаку. Прычым сумесь тая ўзбітая – гэта значыць, насычаная бурбалкамі паветра...

Акрамя таго, што марожанае незвычайна прыемнае на смак, яно яшчэ і вельмі карыснае. Марожанае лёгка засвойваецца нашым арганізмам. Яно мае высокую пажыўнасць: утрымлівае малочны тлушч (самы каштоўны з харчовых тлушчаў), бялкі, вугляводы, цукар, мінеральныя рэчывы і цэлае сузор'е розных вітамінаў.

Лазеры. Перш за ўсё давайце высветлім, што гэта такое. Лазеры – гэта квантавыя генератары аптычнага дыяпазону, ці прасцей – генератары святла. У аснову іх работы пакладзена з'ява ўзмацнення электрамагнітных ваганняў пры дапамозе вымушанага выпраменьвання атамаў і малекул. Само слова "лазер" азначае ўзмацненне святла. Гэтую навуковую ідэю прадказаў яшчэ ў 1917 годзе выдатны фізік і філосаф Альберт Эйнштэйн. З таго часу, бадай, і пачынаецца гісторыя стварэння лазераў.

4. Прачытайце слоўнікавы артыкул са "Слоўніка цяжкасцей беларускай мовы" Г. Арашонкавай, В. Лемцюговай (Мінск, 2005, с. 171). Вызначце стыль артыкула і абгрунтуйце сваю думку.

ЗАРА́НКА, ДМ -нцы – ЗАРНІ́ЦА, Р мн. -ніц – (паэт.)

ЗАРАНІ́ЦА, Р мн. -ніц. Супадаюць у знач.: 1. Ранішняя або вячэрняя зорка; зорка наогул. *Згас касцёр перад світанкам, І табе глядзіць у вочы Пільна першая заранка* (А. Зарыцкі). *Вячэрнія гаснуць зарніцы* (В. Каваленка). *У тваіх вачах... Я чытаю шлях... У прастор, дзе гараць зараніцы* (Я. Колас). *А там надыдзе касавіца – уставай, чуць гляне зараніца...* (Я. Колас). 2. Водбліск агнёў; сполахі. *Спіць стомлена ўрочышча ў водсветах заводскіх зараніц* (Х. Чэрня). *Далёка наперадзе над дарогай успыхвалі густыя, чырвоныя заранкі* (І. Пташнікаў). *Тамаш нібы бачыў перад вачыма чырвоную, бы кроў, зарніцу пажару* (З. Бядуля).

Зараніца, заранка ўжыв. яшчэ ў знач. 'зара'. *На ўсходзе займалася зараніца* (А. Якімовіч). *На ранку, на заранцы, Гучыць наш звонка горн* (К. Кірэенка).

Зарніца ўжыв. яшчэ ў знач. 'водбліск далёкай навальніцы'. *Следам за першым гукам бліснула зарніца* (Я. Колас).

5. Складзіце два тэксты – навукова-папулярнага і мастацкага стыляў – на тэму "Зараніца".

6. Прааналізуйце лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці навуковага тэксту.

Даволі эфектыўным і распаўсюджаным сродкам пры стварэнні грамадска-палітычных тэрміналагічных адзінак з'яўляецца звужэнне значэння слова. Сутнасць гэтага тыпу тэрмінаўтварэння заключаецца ў тым, што слова з даволі шырокай семантычнай структурай у сферы спецыяльнай камунікацыі абмяжоўвае сваю семантыку і пачынае выкарыстоўвацца для абазначэння вузкага навуковага паняцця. Напрыклад, слова *асіміляцыя* ў агульналітаратурнай мове мае значэнне 'прыпадобніць сабе'; 'ператварыць адно ў другое, падобнае да яго'. Пры выкарыстанні гэтага слова ў якасці тэрміна яго семантыка абмяжоўваецца, канкрэтызуецца пад уздзеяннем той тэорыі, у межах якой яно пачынае функцыянаваць. Так, у метасістэме мовазнаўства тэрмін *асіміляцыя* стаў абазначаць 'фанетычны працэс прыпадабнення аднаго гука да другога ў артыкуляцыйных і акустычных адносінах'; у метасістэме біялогіі – 'утварэнне ў арганізме складаных рэчываў з больш простых'; у грамадска-палітычнай метасістэме – 'зліццё аднаго народа (або яго часткі) з другім шляхам засваення яго мовы, культуры і нацыянальнай самасвядомасці'; у медыцынскай метасістэме – 'ператварэнне рэчываў наваколля ў рэчыва самога жывога арганізма'. (А. Дзячэня. "Звужэнне значэння слова як сродак тэрмінаўтварэння")

**АДКАЗЫ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАДАННЯЎ**

**1.** Лінгвістычныя і літаратуразнаўчыя тэрміны:

*варварызм* – 'іншамоўнае слова (або выраз), якое не стала агульнаўжывальным, поўнасцю не засвоена мовай'; *антытэза* – 'стылістычная фігура супастаўлення кантрастных паняццяў і вобразаў'; *інфінітыў* – 'неазначальная форма дзеяслова', *дзейнік* – 'галоўны член сказа, граматычна не залежны ад іншых членаў, характарыстыка якога (дзеянне, стан, уласцівасць, якасць) даецца ў выказніку'; *полісіндэтон, або шматзлучнікавасць*, – 'стылістычны прыём, сутнасць якога – у выкарыстанні адных і тых жа злучнікаў паміж аднароднымі членамі сказа'; *плеа-*

*назм* – ‘стылістычная памылка, звязаная з ужываннем лішніх моўных сродкаў’; *сімвалізм* – ‘плынь у літаратуры і мастацтве канца XIX – пачатку XX ст., якая абвяшчала сваім мастацкім прыёмам сімвал як выразнік сутнасці рэчаў і з’яў’; *страфа* – ‘адносна закончаная частка вершаванага твора’; *трылогія* – ‘тры літаратурныя творы аднаго аўтара, аб’яднаныя агульнай ідэяй і пераемнасцю зместу’; *градацыя* – ‘стылістычная фігура, якая заключаецца ў такім размяшчэнні частак выказвання, калі кожная наступная частка мае большае сэнсавае або эмацыянальна-экспрэсіўнае значэнне’; *эпітэт* – ‘паэтычнае азначэнне, якое выражае эмацыянальную ацэнку або дае вобразную характарыстыку прадмету, з’яве’; *рэтардацыя* – ‘стылістычны прыём запаволення якіх-небудзь падзей ці з’яў’; *трыялет* – ‘від васьмірадковага верша, у якім два першыя і два апошнія, а таксама першы і чацвёрты радкі аднолькавыя’; *літота* – ‘вобразны выраз, які змяншае ўласцівасці ці прыметы з’явы або прадмета’.

**2.** Тэкст У. Ягоўдзіка публіцыстычнага стылю. Выкарыстаны ацэначныя словы і выразы *самы вялікі, магутныя, непакорнае, спрактыкаваныя, надзвычай багатая, хуткаплынны, неспакойны, цудоўны, разнастайны*. Эпітэты *светлыя* (гаі), *змрочныя* (нетры), *сівая* (мінуўшчына) узмацняюць вобраз Белавежы – Зубрынай Краіны. У тэксце ўжыты простыя і складаныя сказы. Простыя сказы ўскладнены аднароднымі членамі і адасобленым азначэннем. Па мэце выказвання сказы апавядальныя. Функцыя ўздзеяння гэтага тэксту рэалізуецца праз ацэначнасць слоў і выразаў, лексічную анафару (аднолькавы пачатак сказаў) і паралелізм канструкцый *(Тут наяве трапляеш у казку, легенду, паданне. Тут святлееш душою, дабрэеш сэрцам, зноў пачынаеш верыць у неспакойны чалавечы розум)*.

Тэкст з “Беларускай Энцыклапедыі” навуковага стылю (уласна навуковага падстылю). Для тэксту характэрна дакладнасць словаўжывання, якая дасягаецца выкарыстаннем слоў з прамым значэннем і лічэбнікаў. Ужываюцца назоўнікі, што тлумачыцца іх намінатыўнай накіраванасцю. Прыметнікі гэтага тэксту ўдакладняюць навуковыя паняцці і выконваюць тэрміналагічную функцыю: *прыродны* комплекс, *рэкрэацыйная* дзейнасць, *комплексная* гаспадарка, *біясферны* запаведнік і інш. Ужыты сказы з аднароднымі членамі для выражэння складанай сістэмы навуковых паняццяў.

**3.** Падстыль тэкстаў М. Лібінтава навукова-папулярны. Такія тэксты разлічаны на шырокае кола чытачоў, таму яны адметныя даступнасцю ў перадачы навуковай інфармацыі і эмацыянальнасцю выкладу. Выкарыстоўваюцца пытальныя сказы, якія ствараюць кантакт з чытачом. Метафара *сузор’е вітамінаў* дазваляе вобразна ўспрыняць разнастайнасць рэчываў, неабходных для жыццёвай дзейнасці.

**4.** Стыль артыкула навуковы (уласна навуковы). Пададзены канкрэтныя звесткі пра граматычныя, лексічныя і стылістычныя асаблівасці слоў. Прыклады з мастацкіх твораў пацвярджаюць значэнні лексем.

**5.** Прыкладныя тэксты на тэму “Зараніца” (у значэнні ‘зорка’).

Навукова-папулярны тэкст:

*Многім з нас даводзілася назіраць за начным небам з мноствам зорак. Зорка – гэта нябеснае цела, якое падобна на Сонца і ўяўляецца на небе яркай кропачкай. Для падрабязнага вывучэння зорак спатрэбіцца цэлая серыя тэлескопаў і касмічных апаратаў. А ці ведаеце вы, што ў Германіі размешчаны найбуйнейшы ў свеце радыётэлескоп са стометровай парабалічнай антэнай? Такія гіганцкія тэлескапічныя “вушы” дазваляюць вучоным спазнаваць таямніцы Сусвету.*

Мастацкі тэкст:

*На летнім небе, нібыта маленькі зыркі агеньчык, з’явілася зараніца. Яна зацікаўлена пазірала на зямлю. Як прыгожа там! Бязмежная веліч лясоў і шырыня прастораў, блакітныя рачулкі і чароўныя кветкі... Можа, спусціцца ўніз? Можа, правесці там хаця б некалькі гадзін гэтага цудоўнага жнівеньскага вечара? Не, нельга! Трэба заставацца на небе, каб дарыць людзям святло і надзею, каб чалавечыя позіркі, як і думкі, мары, ляцелі ў зорную вышыню.*

**6.** Лагічнасць і дакладнасць гэтага навуковага тэксту рэалізуюцца праз адпаведныя моўныя сродкі. Сярод лексічных – тэрміны *семантыка, асіміляцыя, метасістэма, прыпадабненне* і інш. Для абазначэння абстрактных паняццяў выкарыстоўваюцца назоўнікі *сродак, стварэнне, камунікацыя, выкарыстанне, уздзеянне, самасвядомасць* і інш. Са склонавых формаў назоўнікаў вылучаюцца формы роднага склону: звужэнне *значэння слова*, тып *тэрмінаўтварэння*, сфера *камунікацыі*, метасістэма *мовазнаўства*, працэс *прыпадабнення*, сфера *камунікацыі*. Пашыранасць прыметнікаў звязана з іх выкарыстаннем у тэрміналагічных словазлучэннях: *семантычная* структура, *агульналітаратурная* мова, *фанетычны* працэс і інш. У тэксце ўжыты простыя сказы, ускладненыя аднароднымі членамі, і складаныя (складаназалежныя). Ускладненыя і складаныя сінтаксічныя канструкцыі выражаюць сістэму навуковых паняццяў, наладжваюць узаемаадносіны паміж імі. Так, родавае паняцце *асіміляцыя* раскрываецца з дапамогай відавых паняццяў. У метасістэмах розных навук семантыка слова *асіміляцыя* канкрэтызуецца, што адлюстроўваюць аднародныя члены. Сэнсавая сувязь паміж сказамі гэтага навуковага тэксту ажыццяўляецца праз лексічны паўтор і сінанімічны адпаведнік.

Святлана МАРОЗ,
Марына РЖАВУЦКАЯ

# НАТАТКА-РАЗВАЖАННЕ Ў ГАЗЕТУ ПРА ЎДЗЕЛ ВУЧНЯЎ У АЗЕЛЯНЕННІ ШКОЛЬНАЙ ТЭРЫТОРЫІ, ВУЛІЦЫ, ДВАРА

## УРОК РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ

**Мэты:** навучыць пісаць нататку-разважанне ў газету пра ўдзел у азеляненні школьнай тэрыторыі, вуліцы, двара, абапіраючыся на кампазіцыйную схему (тэзіс, доказы, вывад);

узнавіць і паглыбіць веды вучняў пра разважанне як тып маўлення, пра яго стылістычную разнастайнасць;

навучыць адбіраць моўныя сродкі ў адпаведнасці з тыпам тэксту, сістэматызаваць уласныя назіранні, складаць план сачынення;

развіваць вуснае і пісьмовае маўленне;

выпрацоўваць уменне пісаць нататку-разважанне, захоўваючы стыль, жанр, моўныя асаблівасці, кампазіцыйную структуру гэтага тыпу маўлення;

выхоўваць любоў да Радзімы і беражлівыя адносіны да ўсяго навакольнага.

**Абсталяванне:**

1. Тэкст нататкі-разважання з перыядычнага друку.

2. Запіс магчымых варыянтаў тэмаў сачынення на дошцы:

"І вабіць зрок дзіцячы школа" (Анатоль Астрэйка);

"На вуліцы, на якой я жыву…" (Максім Танк);

"Шануйце зямлю нашу…" (Янка Сіпакоў);

"Наш праспект, нібыта Млечны Шлях…" (Пімен Панчанка);

"Мне тут усё для сэрца міла …" (Канстанцыя Буйло);

"Гляджу з захапленнем на нашу зямлю…" (Васіль Жуковіч);

"Нас не раз'яднаць нічым з прыродай…" (Казімір Камейша);

"Я не ведаю, не ведаю прыгажэйшае зямлі" (Кастусь Жук);

эпіграфаў:

"Дарма пра песню пытацца ў глухога, дарма пра сонца пытацца ў сляпога, пра слодыч жыцця на зямлі – ў нежывога і праўды шукаць у таго, хто нічога – ані сцяблінкі, ні дрэўца малога – не пасадзіў за свой век" (Максім Танк);

"Радзіма ў кожнага адна… Атулім ласкай яе плечы" (Мікола Мішчанчук);

"Пакорныя людскому злу, навек знікаюць дрэвы, моры, жывёлы, птушкі, нават горы… Баюся за зямлю!" (Соф'я Шах);

"Шчаслівы я тым, што маёй стала доляю Радзімы святло, харство адчуваць" (Алег Лойка);

"Чалавек жыве ў хаце, дрэва жыве на сваім водрубе, але іхнія лёсы пароднены і паяднаны жы́цці" (Алесь Разанаў);

"Быць чалавекам на зямлі зямля бацькоў дала мне права" (Рыгор Барадулін);

"Народная мудрасць гаворыць, што чалавек, які дзе-небудзь пасадзіў дрэўца, ніколі не пакіне думкамі той мясціны, дзе пасадзіў яго. Ён як бы пакідае там часцінку свайго сэрца, сваёй любові" (Кастусь Кірэенка);

"Дай Божа, каб здаровай была Зямля. Амін" (Леанід Дранько-Майсюк);

"Нясмелым жаўранкам праклюнецца світанне, зашэпчуць ліўні радасна здаля… Вось толькі б зберагчы тваё дыханне, цябе, мая зялёная Зямля" (Эдуард Зубрыцкі).

**Тып урока:** урок развіцця маўлення.

*Пра падрыхтоўку да напісання нататкі-разважання С. Мароз і М. Ржавуцкая распавялі ў сакавіцкім нумары.*

### ХОД УРОКА

**І. Арганізацыйны момант.**

**ІІ. Паведамленне тэмы і мэтаў урока.**

• Слова настаўніка.

Сёння на ўроку мы будзем вучыцца пісаць нататку-разважанне пра ваш удзел у азеляненні школьнай тэрыторыі (вуліцы, двара). Як сцвярджаюць аўтары энцыклапедыі "Літаратура і мастацтва", нататка – 'газетны жанр, кароткае паведамленне, дзе апісваецца які-небудзь факт ці ставіцца канкрэтнае пытанне. Нататкай таксама называюць жанр публіцыстычнага ці навуковага твора, які, нягледзячы на адрывачнасць, дае ўяўленне аб прадмеце'. Асноўныя рысы нататкі – гэта аператыўнасць матэрыялу, дакументальная праўдзівасць, лаканічнасць выкладу і значнасць фактаў.

Такім чынам, нататка – гэта найперш інфармацыйны жанр, асноўная мэта якога – даць кароткія і разам з тым вычарпальныя, а таксама дастаткова дакладныя звесткі пра нейкі жыццёвы факт ці падзею. Мы будзем вучыцца пісаць не проста нататку, а нататку-разважанне.

Успомніце, калі ласка, які тып маўлення называецца разважаннем?

• Вучні адказваюць, настаўнік абагульняе.

Разважанне – гэта такі тып маўлення, якому ўласціва своеасаблівая будова, што ўключае тэзіс (асноўную думку), аргументы (доказы на карысць асноўнай думкі) і вывад.

• Слова настаўніка.

Значыць, наша нататка павінна мець тры асноўныя часткі. Акрамя таго, разважанне ў розных выпадках вядзецца з рознымі мэтамі: даць ацэнку прадмету маўлення, абгрунтаваць пэўныя дзеянні, аргументавана штосьці сцвярджаць ці адмаўляць і г. д. А паколькі нататка – найперш інфармацыйны жанр, то разважанне будзе арганічна спалучацца тут з элементамі апавядання і апісання, бо нам трэба не толькі абгрунтаваць нашы дзеянні, але і расказаць пра падзею, указаўшы дакладныя лічбы, а таксама ахарактарызаваць і ацаніць прыведзеныя факты. Кожная нататка абавязкова павінна мець подпіс і назву. Прыкладныя варыян-

ты назвы нататкі пазначаны на дошцы, прачытайце іх, выберыце і запішыце тую, якая, на вашу думку, найбольш дакладна адлюструе яе інфармацыйны змест, а можаце прапанаваць і запісаць сваю.

**III. Фармулёўка асноўнай думкі нататкі, падбор эпіграфа.**

• Слова настаўніка.

Перад напісаннем нататкі вельмі важна сфармуляваць асноўную думку, на карысць якой вы будзеце прыводзіць аргументы. Звярніце ўвагу на запісаныя на дошцы вершаваныя радкі вядомых беларускіх пісьменнікаў, якія можна выкарыстаць у якасці эпіграфаў, хоць эпіграф і неабавязковы для гэтага газетнага жанру. Уважліва прачытайце іх, падумайце і патлумачце іх змест.

• Вучні адказваюць, настаўнік абагульняе.

Беларускія паэты і празаікі ў сваіх радках выражаюць адносіны да таго месца, дзе яны нарадзіліся. Кожны чалавек любіць сваю Радзіму. Паняцце Радзімы вялікай неад'емнае ад паняцця радзімы малой. Малая радзіма – гэта той горад, дзе вы нарадзіліся, тая вёска, дзе вы жывяце, той дом і двор, дзе вы праводзіце большую частку свайго жыцця, вуліца, на якой вы кожны вечар гуляеце. А што значыць любіць сваю Радзіму? Любіць – гэта значыць быць адданым ёй, гатовым выконваць доўг грамадзяніна (працаваць для яе, абараняць, берагчы яе). У межах праграмы Усебеларускай турысцка-краязнаўчай экспедыцыі "Наш край" вучні многіх школ удзельнічаюць у правядзенні аперацый "Азеляненне і добраўпарадкаванне", "Зялёная аптэка", "Лес – наш сябар" і інш. Школьнікі прыбіраюць тэрыторыю школы (вуліцы, двара), высаджваюць дрэвы і кусты, афармляюць газоны і кветкавыя клумбы. Кожны год у краіне, а таксама ў раёнах, гарадах праводзяцца конкурсы на самую добраўпарадкаваную і прыгожую тэрыторыю.

Давайце падумаем, з якой мэтай гэта робіцца?

• Вучні адказваюць, настаўнік абагульняе.

Чысціня і парадак вакол дома ствараюць добры настрой. Зялёныя пасадкі паляпшаюць экалогію, ачышчаюць паветра ад шкодных выкідаў. Там, дзе расце многа дрэў, лягчэй дыхаецца, менш хварэюць і дарослыя, і дзеці. Акрамя таго, мы павінны клапаціцца не толькі пра сябе, але і пра зямлю, якая таксама можа захварэць, калі яе бесперапынна забруджваць. Зямля – наш агульны дом, а свой дом трэба трымаць у чысціні і парадку, каб потым моцна не пашкадаваць пра свае неабачлівыя адносіны да яе.

**IV. Складанне плана нататкі.**

• Слова настаўніка.

Мы ўжо вызначылі, што нататка будзе мець тры часткі, якія адпавядаюць кампазіцыйнай схеме разважання. Цяпер давайце падумаем, пра што мы скажам у самым пачатку нататкі. А каб вам было прасцей, паслухайце, калі ласка, некалькі ўступаў да нататак (настаўнік чытае).

I. *Сёлетні красавік у нашай краіне праходзіць пад знакам навядзення парадку ў буйных і малых гарадах і вёсках. 16 красавіка пройдзе "тэматычная" працоўная акцыя, прысвечаная 60-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.*

*У абласных цэнтрах, а таксама ва ўсіх раёнах і гарадах Беларусі школьнікі, студэнты прыйдуць самі і паклічуць іншых на рэспубліканскі маладзёжны суботнік.*

"Чырвоная змена".

II. *Гады тры таму давялося пабываць па нейкіх справах у Валожыне. Шчыра кажучы, горад тады не ўразіў – не вельмі прыгожыя вуліцы, старая фарба на дамах, непрыбраныя двары. На мінулым тыдні завітаў на валожынскую зямлю другі раз. І вельмі здзівіўся.*

*Такое ўражанне, што горад стаў іншым.*

"Мясцовае самакіраванне".

III. *Люблю бываць у Жлобіне, люблю хадзіць па яго ўтульных жылых мікрараёнах, светлых прасторных вуліцах, размаўляць з яго гасціннымі жыхарамі, якія ганарацца сваім горадам. Так, апошнім часам тут на кожным кроку бачыш клопат людзей аб добраўпарадкаванні…*

"Звязда".

IV. *Гэтую экалагічную сцяжынку мы праклалі год назад. У яе стварэнні бралі ўдзел і настаўнікі, і вучні, і супрацоўнікі бібліятэкі. Цікава тое, што сцяжынка праходзіць праз усе тры паверхі школьнага будынка.*

"Лесавік. Часопіс сяброў прыроды".

V. *Усім вядомы пісьменнік і драматург А. П. Чэхаў яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя сказаў: "Усё ў чалавеку павінна быць прыгожае: і душа, і твар, і адзенне". Згадзіцеся, калі б усе людзі жылі, кіруючыся менавіта гэтым мудрым выказваннем, у нас было б ідэальнае грамадства!*

*Аднак толькі добра выглядаць ці толькі добра гаварыць, вядома ж, вельмі мала для сучаснага маладога паспяховага чалавека. А што ж яшчэ патрэбна? Патрэбны веды этыкету, патрэбны неканфліктны характар, патрэбна, каб дома было цёпла і ўтульна… А вось Аляўціна Грыцышына, 19-гадовая мадэль, і яе брат Саша, вучань 7 класа СШ № 95 г. Мінска, лічаць неабходнай яшчэ адну рэч – інтэр'ер пад'езда і двара. Чаму?*

"Бярозка".

• Вучні адказваюць, настаўнік абагульняе.

Праслуханыя ўступы нам падказваюць, што на пачатку нататкі абавязкова трэба падкрэсліць важнасць і патрэбнасць мерапрыемства, а таксама ўказаць, калі і дзе праводзілася акцыя і хто прыняў у ёй удзел, выказаць агульнае ўражанне.

• Слова настаўніка.

А цяпер давайце прачытаем поўнасцю яшчэ адну нататку па нашай тэме і папрацуем з ёю (раздаецца тэкст, настаўнік або вучань чытае).

**Як ажывілі фантазію**

*Цяжка паверыць, але яшчэ чатыры гады таму на месцы нашых цяперашніх шыкоўных кветнікаў была пустэча. Не было ні гульнёвай, ні спартыўнай пляцовак, ні клумб – толькі дзве самотныя пясочніцы… Таму задача перад калектывам была пастаўлена такая: стварыць утульнасць не толькі ў памяшканні дзіцячага сада, а і вакол яго, абсталяваць гульнёвую і спартыўную пляцоўкі, развіццёвае асяроддзе. Выснова зразумелая: дзеці павінны бачыць вакол сябе прыгажосць з самага маленства.*

*І мы ўзяліся за працу… Летам дзіцячы сад патанае ў кветках, іх у нас больш за 30 відаў. Па ўсёй тэрыторыі разбіты кветнікі, зроблены і ўпрыгожаны малыя архітэктурныя формы. Ля ўваходу прыцягваюць позірк сплеценыя з лазы кошыкі, у якіх пасаджаны петуніі, настуркі і іншыя кветкі. Калі мы працавалі над кампазіцыяй "Гаспадыня каля калодзежа", то доўга вырашалі, якія кветкі пасадзіць у драўляны калодзеж, каб яны нагадвалі водны струмень і цвілі да позняй восені. Спыніліся на сіняй лабеліі. Арыгінальным дадаткам да кампазіцыі стаў драўляны бусел у гняздзе з лазы. "Друж-*

*ная сямейка" – гэта чародка апенек (звязаных з нітак кручком) на пяньку, вакол якога цвітуць кветкі.*

*За тэрыторыяй дзіцячага сада мы пасадзілі больш за 200 хвоек, так што праз некаторы час нашы дзеці змогуць гуляць у бары і дыхаць яго гаючым паветрам.*

*Нашы 34 выхаванцы з задавальненнем даглядаюць свае ўласныя кветнікі – паліваюць, полюць, збіраюць насенне. Дзякуючы такому развіццёваму асяроддзю іх гульні сталі больш насычанымі, цікавымі, бо ёсць на тэрыторыі дашкольнай установы ўтульная хатка, паравозік, лодка і інш.*

*На нашым гародзе растуць фасоля, буракі, морква, агуркі, капуста, цыбуля. Усё гэта выкарыстоўваецца для харчавання выхаванцаў. Дзеці з задавальненнем далучаюцца да працы на градках.*

*Мы не збіраемся спыняцца на тым, што ўжо паспелі зрабіць, плануем стварыць новыя кампазіцыі, каб нашы дзеці выхоўваліся ў сапраўды цудоўным месцы, такім як наш садок.*

Паводле часопіса "Пралеска".

**Праца з тэкстам.**

• Слова настаўніка.

На якія кампазіцыйныя часткі падзяляецца тэкст? Зачытайце іх.

• Вучні адказваюць, настаўнік абагульняе.

Нататка падзяляецца на тры кампазіцыйныя часткі: уступ – гэта першы абзац нататкі, асноўная частка – ад слоў *"І мы ўзяліся за працу…"* і да слоў *"На нашым гародзе…"*, канцоўка – апошні абзац, які пачынаецца словамі *"Мы не збіраемся спыняцца…"*.

• Слова настаўніка.

Сфармулюйце асноўную думку нататкі або прачытайце радкі, у якіх яна заключана.

• Вучні адказваюць, настаўнік абагульняе.

Асноўная думка, размешчаная ва ўступе, – *"дзеці павінны бачыць вакол сябе прыгажосць"* – можа быць вамі ўдакладнена і разгорнута. Мы павінны зрабіць чыстай і прывабнай нашу зямлю не толькі для таго, каб бачыць вакол сябе прыгожае. Існуе навука, якая вывучае найскладанейшыя сувязі паміж чалавекам і прыродай (жывой і нежывой). Навука гэтая называецца *экалогія* (літаральна "навука аб доме" – грэч. *oikos* 'дом, радзіма', *logos* – 'вучэнне, навука'). Зняважлівыя адносіны да экалагічных законаў неаднаразова прыводзілі да сумных вынікаў. Таму найпершы чалавечы абавязак перад нашчадкамі: абараніць і захаваць навакольнае асяроддзе, абараніць прыгажосць.

• Слова настаўніка.

Яшчэ раз прагледзьце асноўную частку, знайдзіце і зачытайце тыя сказы, у якіх змешчаны аргументы на карысць асноўнай думкі.

• Вучні адказваюць, настаўнік абагульняе.

На карысць асноўнай думкі ў нататцы прыводзяцца наступныя доказы: па-першае, паляпшаецца экалогія вакол садка (дзеці дыхаюць чыстым паветрам), па-другое, навакольнае харство станоўча ўплывае на інтэлектуальнае развіццё дзяцей (іх гульні робяцца больш змястоўнымі), па-трэцяе, работа на зямлі прывівае пэўныя працоўныя ўменні і навыкі, якія потым спатрэбяцца ў жыцці (дзеці вучацца садзіць расліны, палоць клумбы і градкі, даглядаць іх).

• Слова настаўніка.

Зачытайце сказ, у якім змешчаны вывад нататкі.

• Вучні адказваюць, настаўнік абагульняе.

Вывад нататкі – *"Мы не збіраемся спыняцца на тым, што ўжо паспелі зрабіць…"* – натуральна вынікае з усяго зместу тэксту. Аднаразовая акцыя па азеляненні і добраўпарадкаванні тэрыторыі дасць не вельмі вялікі эфект. Для таго каб ваша школа, двор, вуліца заўсёды радавалі вас харствам кветак і птушынымі спевамі, праца па навядзенні чысціні і парадку, па захаванні зямлі павінна быць планавай і сістэматычнай.

• Слова настаўніка.

Карыстаючыся зместам нататкі, запішам ключавыя словы і выразы.

Настаўнік запісвае на дошцы: *любіць – значыць аберагаць і захоўваць, экалогія – навука пра сувязь чалавека і прыроды, па-першае, па-другое, па-трэцяе, такім чынам, свежае паветра, любавацца кветкамі, птушыныя спевы, развіваць здольнасці, удасканальваць працоўныя навыкі, не спыняцца на дасягнутым* і пад.

• Слова настаўніка.

А цяпер, абапіраючыся на змест прачытаных і праслуханых тэкстаў, а таксама на нашу размову, давайце складзем і запішам план нататкі.

***План***

| | |
|---|---|
| Тэзіс | *1. Любоў да Радзімы – гэта і любоў да свайго двара (школы, вуліцы).* |
| | *2. Любіць – значыць берагчы і клапаціцца.* |
| | *3. Азеляненне – гэта паляпшэнне экалогіі навакольля.* |
| Аргументы | 4. Добраўпарадкаванне – гэта развіццё неабходных працоўных уменняў і навыкаў. |
| | *5. Прыгожая школа (вуліца, двор) – прыгожыя і яе жыхары.* |
| Вывад | *6. Не спыняйцеся на дасягнутым!* |

• Слова настаўніка.

Нам трэба вызначыць тыя моўныя сродкі, якія адрозніваюць нататку ад іншых тыпаў і жанраў маўлення.

• Вучні адказваюць, настаўнік абагульняе.

Спецыфічны характар нататкі найперш патрабуе наяўнасці загалоўка і аўтарскага подпісу. Тып разважання вымагае ўжывання пабочных і ўстаўных канструкцый, пытальных (пытальна-рытарычных), клічных сказаў і г. д.

Уступам да нататкі-разважання можа быць неразгорнутае апавяданне, дзе вы ўкажаце дакладную колькасць удзельнікаў акцыі, дату і месца правядзення, колькасць высаджаных дрэў і кустоў, а таксама сфармулюеце асноўную думку.

Паслухайце найлепшую мінулагоднюю нататку-разважанне (настаўнік называе загаловак, аўтара і чытае нататку).

**V. Падагульненне.**

• Слова настаўніка.

Назавіце, калі ласка, асноўныя асаблівасці нататкі-разважання.

• Вучні адказваюць, настаўнік абагульняе.

Для нататкі-разважання характэрна дакументальная праўдзівасць, абгрунтаванне мэтазгоднасці і важнасці правядзення мерапрыемства, лаканічнасць.

**VI. Напісанне першага (чарнавога) варыянта нататкі.**

Рэдагаванне і аналіз першага варыянта: 2-3 вучні чытаюць напісанае, настаўнік і астатнія вучні выпраўляюць, рэцэнзуюць.

**VII. Напісанне апошняга (чыставога) варыянта нататкі.**

Алена РАМАШКА

# БЕЛАРУСКАЯ ЛЕКСІКА ПАВОДЛЕ ПАХОДЖАННЯ. СТЫЛІСТЫЧНЫ ПАДЗЕЛ ЛЕКСІКІ

**УРОК У X класе**

**Мэты:** пазнаёміць вучняў з паходжаннем і стылістычным падзелам лексікі; выпрацоўваць уменні і навыкі адрозніваць словы розных стылістычных пластоў, навучыць выкарыстоўваць іх у розных маўленчых сітуацыях і стылях; развіваць звязную мову і творчае мысленне вучняў; выхоўваць у вучняў акуратнасць, працавітасць.

**Абсталяванне:** памятка "Паходжанне беларускай лексікі", кластэр-схема "Стылістычны падзел лексікі", карткі з рознаўзроўневымі заданнямі, карта "Рассяленне славянскіх народаў", "Этимологический словарь русского языка" пад рэдакцыяй М. М. Шанскага, "Слоўнік іншамоўных слоў" пад рэдакцыяй А. А. Булыкі, "Белорусско-русский словарь школьника".

**Эпіграф:**

Слова! Яно неабсяжнае, як сусвет, невычэрпнае, як акіян. Слова ўсюды прысутнае, усемагутнае і скрозь дасягальнае...

Уладзімір Юрэвіч.

**ХОД УРОКА**

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Вывучэнне новага матэрыялу.**

► "Беларуская лексіка паводле паходжання".

• ***Слова настаўніка.***

– Перш чым пачаць урок, я хачу, каб вы шчыра ўсміхнуліся адзін аднаму, паціснулі рукі, набраліся станоўчай энергіі, пажадалі поспехаў у працы на ўроку.

На сённяшнім уроку мы будзем гаварыць пра паходжанне беларускай лексікі, даведаемся, адкуль да нас прыйшло беларускае слова. А потым разгледзім асноўныя стылістычныя пласты беларускай лексікі. Будзем выпрацоўваць уменні і навыкі адрозніваць словы розных стылістычных разрадаў, вучыцца выкарыстоўваць іх у розных маўленчых стылях.

А працаваць мы будзем у творчых рознаўзроўневых групах. У нас іх тры. Група А (5-ы ўзровень) – навукоўцы, яны сёння будуць дапамагаць мне на ўроку, група Б (4-ы ўзровень), група В (3-і ўзровень).

– Звярніце ўвагу яшчэ раз на тэму нашага ўрока. Якое слова паўтараецца ў ёй? *(Лексіка.)* А што такое лексіка? *(Сукупнасць слоў мовы, яе слоўнікавы запас.)*А якое месца сярод розных адзінак мовы – гукаў, марфем, слоў, словазлучэнняў, сказаў – займае слова? *(Слова з'яўляецца асноўнай, цэнтральнай адзінкай: з дапамогай слоў мы абазначаем прадметы і з'явы рэчаіснасці, выражаем адносіны паміж імі, фармулюем і выказваем свае думкі, успрымаем думкі іншых людзей.)*

• ***Праца з эпіграфам.***

– Пра ролю слова ў мове свае думкі выказвалі не толькі мовазнаўцы, але і паэты, пісьменнікі. Вельмі прыгожа пра цудадзейную сілу слова сказаў аўтар кнігі "Слова і вобраз" Уладзімір Юрэвіч. *(Вучань чытае эпіграф.)* З дапамогай якіх мастацкіх сродкаў аўтар гаворыць пра сілу слова? *(Эпітэты і параўнанні.)* Аўтар паказвае цудадзейную сілу слова, здольную закрануць тонкія струны чалавечай душы, суцешыць гора, выклікаць весялосць, натхніць на подзвіг, спыніць злы намер, абудзіць да дзеяння цэлыя народы.

Дзякуючы слову мы з вамі гаворым, чытаем, слухаем, але мы не задумваемся, які шлях прайшло слова. На працягу шматвяковай гісторыі беларуская мова няспынна развівалася. Пры гэтым найбольш значныя змены адбываліся заўсёды ў лексічным складзе мовы, які, з аднаго боку, пастаянна папаўняўся новымі словамі, а з другога – страчваў асобныя лексічныя адзінкі. Чым жа тлумачацца змены, якія адбываюцца ў лексіцы? *(Сама рэчаіснасць увесь час змяняецца: на змену адным гістарычным эпохам прыходзяць другія, удасканальваюцца і развіваюцца эканоміка і культура, навука і вытворчасць.)*

– Звернемся да гісторыі пытання. Я даю слова навукоўцу. Ён прааналізуе гістарычны шлях развіцця мовы і народа, а мы з вамі будзем адначасова складаць схему-кластэр. *(Настаўнік на дошцы, а вучні ў сшытках складаюць кластэр.)*

• ***Гістарычны экскурс.***

*(Вучань расказвае пра шлях мовы і народа і адначасова паказвае на карце рассяленне славянскіх народаў.)*

Задоўга да нашай эры на поўнач і захад ад Чорнага мора існавала адзіная індаеўрапейская мова, на якой гаварылі амаль усе продкі сучасных еўрапейскіх і некаторых азіяцкіх народаў. У III тысячагоддзі да н. э. у асобную групу выдзеліліся славянскія плямёны, што насялялі тэрыторыю паміж Дняпром і Віслай, і пачала фарміравацца агульнаславянская мова, якая праіснавала больш за тры тысячы гадоў. У V – VI стст. н. э. адасобіліся тры групы славянскіх плямёнаў – усходняя, заходняя і паўднёвая. Заходнюю групу прадстаўляюць польская, кашубская, чэшская, славацкая, лужыцкая, паўднёвую – балгарская, сербская і харвацкая, македонская, славенская мовы. На шырокіх прасторах Усходняй Еўропы з VI – VII стст. пачынае складвацца ўсходнеславянская народнасць і асобная ўсходнеславянская мова, якой карысталіся

продкі трох сучасных усходнеславянскіх народаў – рускага, беларускага і ўкраінскага.

У XII – XIII стст. феадальная раздробленасць прывяла да таго, што Кіеўская Русь распалася на асобныя княствы. Спынілася далейшае фарміраванне ўсходнеславянскай народнасці і ўсходнеславянскай мовы. На рубяжы XIII – XIV стст. у працэсе аб'яднання асобных плямёнаў на адпаведных этнічных тэрыторыях пачалі складвацца беларуская, руская і ўкраінская народнасці, а на аснове жывых народных гаворак – асобныя ўсходнеславянскія мовы: беларуская, руская і ўкраінская.

**Кластэр-схема**




– Як вы бачыце, беларуская мова ўключае ў сябе пласт агульнаславянскай, усходнеславянскай лексікі і ўласнабеларускія словы, якія ўзнікалі і ўтвараліся ў перыяд самастойнага існавання народа і мовы.

А цяпер давайце знойдзем практычнае прымяненне нашаму кластэру. Разгледзім табліцу "Паходжанне беларускай лексікі" і дакажам, якія словы маюць агульнаславянскае паходжанне, а якія ўсходнеславянскае ці ўласнабеларускае.

• **Праца па табліцы.**

**Паходжанне беларускай лексікі**

| Назвы слоў | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| На беларускай мове | На рускай мове | На ўкраінскай мове | На польскай мове | На чэшскай мове | На балгарскай мове |
| хлеб | хлеб | хліб | hleb | chleb | хляб |
| тры | три | три | trzy | ry | три |
| пляменнік | племянник | плямінник | siostrzeniec | synowec | сыноска |
| асілак | богатырь | богатирь | bohater | bohatyr | юнак |

– Высветліць паходжанне слоў – праца вельмі складаная. Гэтым займаюцца вучоныя. Паходжанне таго ці іншага слова мы можам знайсці ў этымалагічных слоўніках.

• ***Выкананне рознаўзроўневых заданняў.***

**3-і ўзровень.**

Да прыведзеных слоў падабраць адпаведныя словы рускай мовы і запісаць іх парамі. Вызначыць, якія словы і чаму можна лічыць уласнабеларускімі.

*Аглядальнік, алень, апошні, блытаць, выпадак, месяцаход, рука, зброя, працаўнік, узмацняльнік.*

**4-ы ўзровень.**

Прачытаць верш Янкі Купалы "А хто там ідзе?" на беларускай, рускай (пераклад М. Горкага) і ўкраінскай (пераклад М. Рыльскага) мовах. Выпісаць словы, агульныя для гэтых моў.

*А хто там ідзе, а хто там ідзе*
*У агромністай такой грамадзе?*
*– Беларусы.*
*А што яны нясуць на худых плячах,*
*На руках у крыві, на нагах у лапцях?*
*– Сваю крыўду.*
*А куды ж нясуць гэту крыўду ўсю,*
*А куды ж нясуць напаказ сваю?*
*– На свет цэлы.*
*А хто гэта іх, не адзін мільён,*
*Крыўду несць наўчыў, разбудзіў іх сон?*
*– Бяда, гора.*
*А чаго ж, чаго захацелась ім,*
*Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?*
*– Людзьмі звацца.*

*А кто там идёт по болотам и лесам*
*Огромной такою толпой?*
*– Белорусы.*
*А что они несут на худых плечах,*
*Что подняли они на худых руках?*
*– Свою кривду.*
*А куда они несут эту кривду всю,*
*А кому они несут напоказ свою?*
*– На свет божий.*
*А кто ж это их – не один миллион –*
*Кривду несть научил, разбудил их сон?*
*– Нужда, горе.*
*А чего ж теперь захотелось им,*
*Угнетённым века, им, слепым и глухим?*
*– Людьми зваться.*

*А хто там ідзе, а хто там ідзе,*
*Яка то грамада веліка гудзе?*
*– Білоруси.*
*А що вони несуть на худих плечах,*
*На руках у крові, на ногах в постолах?*
*– Свою кривду.*
*А куди ж несуть вони кривду всю,*
*А куди ж несуть показать свою?*
*– У світ цілий.*
*А хто ж ото іх, не один мільйон,*
*Кривду вчив нести, разбудив іх сон?*
*– Біда, горе.*
*А чого ж, чого ж захотілось ім,*
*Ім, погорженим, ім, сліпим, глухим?*
*– Людьми зватись.*

**5-ы ўзровень**

Уважліва прачытаць верш класіка балгарскай літаратуры І. Вазава і перакласці яго на беларускую мову. Параўнаць словы верша з адпаведнымі словамі

беларускай і рускай моў, вызначыць сярод іх агульнаславянскія лексемы.

*Оте́чество любе́зно, как ху́баво ти!*
*Как чу́дно се сине́е небе́то ти безкрайно!*
*Как тво́ите карти́ни меняват се ома́йно!*
*При все́ки по́глед но́ви, по́-но́ви красоти́:*
*тук ве́сели доли́ни, там планини́ гига́нти,*
*земята пълна с цве́те небе́то със брилянти…*
*Оте́чество любе́зно, как ху́баво си ти!*

**Для даведак:** *хубаво* – прыгожае, добрае; *си* – ёсць; *омайно* – чароўна; *планина* – гара.

***Алена Мікалаеўна Рамашка*** *– настаўніца беларускай мовы і літаратуры Морацкай агульнаадукацыйнай сярэдняй школы Клецкага раёна. Закончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1994). Мае першую кваліфікацыйную катэгорыю.*



– Аснову лексікі складаюць уласнабеларускія словы, гэта як фундамент, на якім яна няспынна развіваецца і ўдасканальваецца. На аснове гэтых слоў утвараюцца новыя за кошт уласных моўных рэсурсаў. Аднак папаўненне лексікі адбываецца і іншым шляхам. А якім, вы скажаце пасля невялікага слоўнікавага дыктанта.

• ***Слоўнікавы дыктант.***

Сяржант, кансіліум, імпрэсарыо, сауна, шніцэль, галерэя, фіялка, кліент, ва універсітэт, фуфайка.

Заданне да слоўнікавага дыктанта:

а) *па ланцужку растлумачыць напісанне слоў*;

б) *праца па ўзроўнях*:

**3-і ўзровень.**

У “Слоўніку іншамоўных слоў” знайсці значэнне слоў *кансіліум, імпрэсарыо*.

**4-ы ўзровень.**

Назваць у словах дыктанта прыметы запазычаных слоў (можна выкарыстаць матэрыял падручніка – § 24).

**5-ы ўзровень.**

Замяніць наступныя выразы аднаслоўнымі адпаведнікамі.

Афіцыйны прыём у высокапастаўленай асобы – _____ .

Становішча ў спартыўных гульнях, калі мяч (шайба) аказваюцца за межамі бакавых ліній гульнёвага поля, пляцоўкі – _____ .

Бліскучы поспех, выдатная перамога – _____ .

Выдатны твор літаратуры, мастацтва – _____ .

Перакладзіна для адкрывання і закрывання шляху на чыгуначных пераездах – _____ .

Службовая асоба, якая засведчвае і афармляе розныя юрыдычныя дакументы, акты – _____ .

Буйная афрыканская птушка, якая хутка бегае – _____ .

► **Стылістычны падзел лексікі.**

– Зараз мы пазнаёмімся са стылістычным падзелам лексікі, высветлім, як пэўнае слова рэалізуецца ў стылі ў залежнасці ад характару, мэтаў і зместу выказвання.

• ***Самастойная праца над новым матэрыялам.***

Самастойна разгледзець табліцу на с. 99 падручніка і памятку “Стылістычныя разрады лексікі”. (Гл. табліцу на с. 68.)

– Што такое нейтральныя словы? Прааналізуем іх.

На дошцы запісаныя сказы для аналізу.

*Мова – сродак чалавечых зносін і выказвання думкі.*

*Мова! Як сонца маё беларускае, ты свецішся словам кожным.*

*Раптам яму і мову заняло.*

*(Слова “мова” выкарыстоўваецца ў розных стылях у залежнасці ад мэты і зместу выказвання.)*

• ***Выкананне рознаўзроўневых заданняў.***

*(Праца ў групах, адначасова ля дошкі вучань выконвае заданне 4-га ўзроўню.)*

**3-і ўзровень.**

Падабраць гутарковыя словы, што называюць чалавека з пэўнымі рысамі характару. Запісаць парамі антонімы.

Чалавек, “які не захоўвае чысціні, парадку”; “які занадта ахайны, акуратны, вызначаецца празмерным імкненнем да чысціні і парадку”; “які любіць смяяцца, рагатаць”; “які многа, без дастатковай прычыны плача”.

*Словы для даведак.*

Мурза, мазіла, мурзіла, неахайнік;
чысцёха, чыстаплюй, акуратыст;
рагатун, усмешлівы, перасмешнік, пустасмех;
плакса, плаксун, плаксуха, румза.

**4-ы ўзровень.**

Спісаць сказ, расстаўляючы знакі прыпынку і графічна растлумачыць іх. Вызначыць стылістычны разрад выдзеленых слоў.


Арэометр прылада для вымярэння шчыльнасці вадкасцей прынцып дзеяння якой заснаваны на законе Архімеда.

**5-ы ўзровень.**

Скласці і запісаць невялікае апавяданне, якое можна назваць “Гультай”. Выкарыстаць у ім, па магчымасці, гутарковыя найменні лянівага чалавека, лодара, прымаўкі пра гультаёў.

*Словы для даведак.*

Лодар, абібок, байбак, лежабок, лежань, нядбайнік, нядбалец.




Адна звычка гультаёў усіх: рабіць чужымі бакамі, а ляжаць на сваіх.

Гультайства горш за хваробу.

Белыя рукі працы баяцца.

**III. Замацаванне.**

**• Выкананне тэставых заданняў.**

**1.** Закончыце сказ. Лексіка – гэта …

а) раздзел навукі, які вывучае слова;

б) сукупнасць слоў мовы;

в) найменшая структурная частка слова, якая мае пэўнае значэнне;

г) слоўнікавы запас пэўнай мовы.

**2.** Якія мовы адносяцца да ўсходнеславянскіх?

а) польская;

б) славацкая;

в) украінская;

г) беларуская.

**3.** Выберыце ўласнабеларускае слова:

а) зямля;

б) бацька;

в) сям'я;

г) сабака.

**4.** Адзначце словы, у якіх назіраюцца прыкметы запазычанасці:

а) таксі;

б) фактар;

в) геаграфія;

г) эра.

**5.** Адзначце радок, у якім ёсць лішняе слова:

а) бераг, гара, луг, сцежка;

б) восень, мароз, раса, снег;

в) воўк, дуб, вапна, любоў.

**6.** Да афіцыйна-справавой лексікі адносяцца словы:

а) хата;

б) зануда;

в) дэпутат;

г) заява.

**7.** Прастамоўнымі з'яўляюцца словы:

а) інтэрв'ю;

б) абармот;

в) балабол.

**8.** Да кніжнай лексікі адносяцца словы:

а) гутарковага стылю;

б) навуковага стылю;

в) публіцыстычнага стылю.

**9.** Ці правільнае сцверджанне: *"Да мастацка-паэтычнай лексікі адносяцца словы з народна-паэтычных твораў"?*

а) так;

б) не.

**10.** Вызначце стыль тэксту і запішыце толькі тое слова, якое не характэрна для дадзенага стылю.

*Мясцовасць скрозь была няроўная. Часам траплялiся высакаватыя ўзгоркі, невялікія ўзвышшы, і сялянскія загоны на іх то падымаліся ды апускаліся, то перарываліся пералескамі. Здавалася, нейкая казачная ткачыха зрабіла гэты маляўнічы дэкор.*

**IV. Падвядзенне вынікаў, выстаўленне адзнак.**

**V. Рэфлексія.**

Дапоўніце сказ: *"Сёння на ўроку беларускай мовы я …".*

**VI. Дамашняе заданне.**

*Да Свята пісьменства і друку*

# БАРЫСАЎ

## ДЫДАКТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ

*Працяг. Пачатак у №№ 1 – 3.*

### XVIII

Прачытайце. У чым выявілася адметнасць сімволікі горада Барысава (сцяга, герба, гімна)? Раскажыце пра геральдычныя асаблівасці іншых беларускіх гарадоў.

Вядомы сёння гістарычны герб горада Барысава (у сярэбраным полі барочнага шчыта на зялёнай зямлі сярэбраная брама паміж дзвюма вежамі пад чырвоным дахам, над якімі на сярэбраным воблаку стаіць святы Пётр з ключамі ў руцэ) быў дараваны гораду 14 чэрвеня 1792 года каралём Станіславам Аўгустам Панятоўскім. Сучасны герб зацверджаны 29 студзеня 1999 года на сесіі Барысаўскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Сцяг горада Барысава ўяўляе сабой прамавугольнае палотнішча, якое складаецца з трох гарызантальных палосаў: чырвонай, белай (серабрыстай) і зялёнай. Пасярэдзіне вонкавага боку – выява святога Пятра з ключамі ў руцэ. Зацверджаны сцяг Барысава 15 студзеня 2001 года на сесіі Барысаўскага гарадскога Савета дэпутатаў.

У 2002 годзе быў зацверджаны і гімн Барысава. Музыку і словы напісаў Сяргей Мажароўскі. Упершыню гімн прагучаў у дзень святкавання 900-годдзя горада.

Расцвітае, нібы ў казцы,
Над спакойнаю ракой
Горад славы, горад працы,
Дарагі Барысаў мой.

Прыпеў:
Многа соцень год бачыш ты ўсход
Над сваёй ракою, любімы горад мой.
Ліха хай міне, радасць абаўе
Над ракой Бярэзінай цябе, Барысаў мой.

З цягам часу помні вечна
Сваіх дочак і сыноў,
Тых, хто з мужнасцю адвечнай
За цябе на смерць ішоў.

Прыпеў.

Дык квітней у добрай згодзе,
Старажытны горад мой,
Слаўся доўгія стагоддзі
Над ракой Бярэзінай.

Прыпеў.

Паводле барысаўскіх газет "Адзінства", "Гоман Барысаўшчыны".

### XIX

1. Прачытайце тэкст. Дайце яму назву.
2. Растлумачце ўжыванне вялікай літары.

*Дыдактычны матэрыял падрыхтавалі барысаўскія педагогі Л. Лапянок, С. Макарава, Н. Галушка, Н. Асіпенка, В. Мікулік, Н. Гаўрусева, А. Буланда.*

3. Раскажыце пра жыццё і дзейнасць каго-небудзь з выдатных асобаў, згаданых у тэксце.



**Герб г. Барысава.**

Барысаўшчына падарыла краіне шмат знакамітых таленавітых людзей. Гэта заслужаныя артысты Беларусі Марыя Адамейка і Ілля Курган, мастакі Мікалай Ісаёнак, Валерый Шкаруба, Мікалай Кісялёў, скульптар Анатоль Анікейчык, урач-афтальмолаг Таццяна Бірыч, пісьменнікі Васіль Гігевіч, Міхась Клімковіч, алімпійскі чэмпіён 1980 года па веласпорце Алег Логвін і многія іншыя.

Любіў Барысаўшчыну і Янка Маўр. Янка Купала ў 1934 годзе напісаў паэму, якую назваў "Барысаў".

Паводле кнігі "Барысаўскі раён". Мінск, 2004.

### XX

1. Прачытайце тэкст.
2. Растлумачце правапіс вялікай літары, сфармулюйце правілы ўжывання вялікай літары.
3. Выпішыце з тэксту па 3 невытворныя і вытворныя словы. Чым яны адрозніваюцца?
4. Выпішыце словы з нулявым канчаткам. Якой часцінай мовы яны з'яўляюцца?
5. Выпішыце з тэксту словы з зацвярдзелымі зычнымі, затранскрыбіруйце іх.
6. Выпішыце з тэксту па 2-3 словы, у якіх назіраецца аглушэнне (варыянт 1) і прыпадабненне (варыянт 2) зычных.
7. Выпішыце з тэксту прыметнікі, вызначце іх разрад па значэнні. Якія з іх утвараюць ступені параўнання? Праілюструйце прыкладамі.
8. У тэксце падкрэсліце дзеясловы прошлага часу, адзначце іх граматычныя паказчыкі.
9. Выпішыце сказы з аднароднымі членамі, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.
10. Выпішыце складаныя сказы, дайце ім характарыстыку, намалюйце графічныя схемы.

**Крыніца натхнення**

Біяграфіі і творчыя лёсы многіх беларускіх пісьменнікаў, дзеячаў культуры і мастацтва звязаны з Барысаўшчынай. Гэтая зямля натхняла іх на лірычныя вобразы, дапамагала знайсці нейкія адметныя, непараўнальныя з творчасцю іншых рыфмы і строфы. Са сталіцы прыязджалі сюды сталыя майстры слова. Як маладыя парасткі, узыходзілі і хутка набіралі моц новыя творцы.

Надоўга застаўся ў памяці барысаўчан цёплы восеньскі вечар 1934 года, калі яны сустрэліся з дэлегатам 1-га Усенароднага з'езда пісьменнікаў СССР народным паэтам Беларусі Янкам Купалам. Цесныя сувязі злучылі песняра з гэтай зямлёй. Ён часта прыязджаў сюды, адно лета адпачываў у калгасе "Камінтэрн", тут напісаў некалькі твораў. Не мінаў паэт і рэдакцыю газеты "Бальшавік Барысаўшчыны", на яе старонках упершыню друкавалася паэма "Барысаў". Першая сярэдняя школа насіла імя народнага паэта, ён не раз бываў тут. У школьнай бібліятэцы, як дарагая рэліквія, захоўваўся купалаўскі зборнік "Жалейка" з аўтографам.

З Барысаўшчынай звязана творчая біяграфія народных паэтаў Беларусі Петруся Броўкі і Пятра Глебкі. Старажылы вёскі Кішчына Слабада добра памятаюць іх прыезд сюды летам 1935 года, дзе пісьменнікі правялі цэлы месяц. Хутка на старонках газеты "Звязда" з'явіліся іх цікавыя нарысы і вершаваныя творы пра калгас "Чырвоная зорка" і шчырых працаўнікоў барысаўскай зямлі. Паэму "Над Бярозай-ракой" П. Глебка прысвяціў С. Арджанікідзе, жыццёвыя шляхі якога ў грамадзянскую вайну прайшлі праз Барысаўшчыну.

У даваенныя гады на нашай зямлі праводзіліся сустрэчы з пісьменнікамі, дзе выступалі Платон Галавач, Васіль Каваль, Барыс Мікуліч, Сцяпан Ліхадзіеўскі, Юлі Таўбін, Мікола Аляхновіч і інш. У пасляваенныя часы беларуская літаратура папоўнілася новымі імёнамі, сярод іх – імёны тых паэтаў і празаікаў, якія ў розны час звязалі свой лёс з Барысаўшчынай.

Паводле хронікі "Памяць".

**XXI**

1. Да якога стылю адносіцца тэкст? Дакажыце.

2. Дайце тлумачэнне слову *вальер*.

3. Знайдзіце і падкрэсліце ўласныя назоўнікі. Зрабіце марфалагічны разбор аднаго з іх.

4. Зрабіце сінтаксічны разбор сказа:

*Шматлікія жыхары запаведніка жывуць у спецыяльных прасторных вальерах.*

5. Выпішыце з тэксту 2-3 словазлучэнні тыпу "назоўнік + прыметнік".

**Краявіды Барысаўшчыны**

Барысаў прыгожы ў любую пару года. Зімою ён нібыта ўвесь з крышталю: звонкі ад марозу, пульхны ў снегавым уборы. Летам нельга не залюбавацца пышным зялёным убраннем і цудоўнай, шумнай Бярэзінай.

Прыгажосць Барысаўшчыны словамі не апісаць. Каб адчуць яе і зразумець, трэба пастаяць на высокім беразе над срэбнай стужкай Бярэзіны; наведаць маляўнічыя куточкі ўрочышча Стара-Барысава; выправіцца ў падарожжа да возера Палік – знакамітага партызанскага краю.

Горад Барысаў знаходзіцца на важнай турыстычнай магістралі. Маляўнічыя ваколіцы вёскі Дудзінка, гераічная прыгажосць Брылёўскага поля, сівая даўніна татарскіх могілак у вёсцы Крычына, таямнічасць жаночага манастыра ў вёсцы Барань…

Прыгожы басейн Бярэзіны, прыгожы і сам Барысаў. У горадзе прыгажосць вызначаецца ў першую чаргу майстэрствам архітэктараў і будаўнікоў. На працягу многіх стагоддзяў Барысаў уяўляў сабою паселішча з драўляных хацін. Сёння Барысаў – буйны прамысловы горад, слава якога распаўсюдзілася далёка за межы краіны.

Паводле кнігі "Дзевяць стагоддзяў Барысава".

**XXII**

Запішыце тэксты, устаўце прапушчаныя літары (I) і знакі прыпынку (II).

**I.** Мой родны горад, калыска майго дзя...інства! І ў ліпен...скую спёку, і ў восен...скую слату, і ў снежан...скую замець, і ў вясе...яе разво...е ты горача вітаеш спагадлівых, руплівых гаспадароў-барысаўчан, гас...цей.

Ты сустракаеш іх багатай л...гендарнай гісторыяй. Пра гэта све...чаць манум...нтальныя помнікі і с...ціплыя аб...ліскі, што стаяць на гара...кіх вуліцах і скрыжава...ях бойкіх даро..., у цяністым парку і скверах.

Ціхаплы...ая, задуме...ая Б…рэзіна-рака – све...ка сівой мінуў...ыны.

**II.** На рацэ Бярэзіне стаіць прыгожы горад акаймаваны з усіх бакоў лясамі і лугамі. Аблокі плывуць па блакітным небе з якога льюцца на зямлю жывыя сонечныя промні асвятляючы горад і пасылаючы сваё цяпло яго жыхарам.

Стаіць горад ва ўсёй сваёй красе. Вышынныя рознага колеру жылыя дамы перамешваюцца з дзіўнымі паркамі і скверамі шырокімі зялёнымі вуліцамі і алеямі дзе прагульваюцца барысаўчане. А побач імчацца камфартабельныя аўтамабілі аўтобусы.

Барысаў горад падобны на вялікую майстэрню дзе працуюць таленавітыя людзі. Вось мастак піша карціну залатога лістападу скульптар заняты лепкай гістарычнай панарамы горада швачка шые цудоўныя карнавальныя касцюмы архітэктар стварае новыя праекты рабочы кіруе станком батанік вырошчвае экзатычную садавіну. І кожны на сваім рабочым месцы займаецца сваёй любімай справай адчувае сябе майстрам таму ў горадзе пануе атмасфера прыгажосці цеплыні і шчырасці.

З вучнёўскіх сачыненняў.

**XXIII**

1. Прачытайце тэкст. Вызначце стыль і тып маўлення. Назавіце асноўныя прыметы стылю. Знайдзіце сказ, які выражае галоўную думку тэксту.

2. Спішыце тэкст, замяняючы лічбы словамі.

**Возера Палік**

Возера Палік – адзін з найпрыгажэйшых і найбольш цікавых куткоў Барысаўшчыны. Яго бязлюднасць, бязмежныя навакольныя лясы і балоты робяць гэтую амаль некранутую частку нашага краю унікальнай.

Палік з'яўляецца самым вялікім возерам у нашым краі. Яго плошча 7,68 квадратнага кіламетра, даўжыня берагавой лініі – 18,5 кіламетра. Даўжыня возера 6,2 кіламетра, найбольшая шырыня – 3 кіламетры. Сярэдняя глыбіня возера 1,1 метра, максімальная глыбіня – 3,1 метра.

Берагі возера нізкія, забалочаныя, тарфяныя, месцамі пясчаныя.

Праз Палік цячэ рака Бярэзіна. Шырыня паласы расліннасці да 500 метраў. Водзяцца шчупак, акунь, плотка, лешч, лінь, карась, язь, гусцяра.

Галоўная наша задача – захаваць возера Палік чыстым і празрыстым для будучага пакалення.

Паводле матэрыялаў
турыстычнага агенцтва "Барысаў Рэгіён Тур".

**XXIV**

1. Спішыце сказы з аднароднымі членамі.
2. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.
3. Пабудуйце схемы выпісаных сказаў.

На Барысаўшчыне ёсць шмат помнікаў археалогіі: гарадзішчы каля вёсак Аздзяцічы, Барань, Вялікая Ухалода, Кімія, Ляшчыны; курганы каля вёсак Іканы, Брылі, Каршавіца, Малы Стахаў, Обча, Хаўхоліца. У народзе гарадзішчы называюць Замак, Замкавая Гара, Гарадок, Польская Гара, а курганы – Валатоўкі, Волатава Поле, Французскія Магілы і інш. Вядома, што курганы ніякага дачынення да французаў ці шведаў не маюць. Гэта пахаванні нашых продкаў VI – VII стагоддзяў. Але паданні адлюстроўваюць народнае ўяўленне пра мінулыя гістарычныя падзеі.

Нямала на Барысаўшчыне вельмі цікавых, але яшчэ мала вывучаных помнікаў гісторыі – так званых культавых камянёў. Шырокавядомыя Князь-камень каля вёскі Бярозаўшчына ва ўрочышчы Тур'і Горы і камень Быкі каля вёскі Мсціж. У навакольлі Мсціжа захаваліся паданні, што камяні – гэта акамянелыя людзі і жывёлы. У народзе гавораць: «…На першы дзень Вялікадня паехаў чалавек араць поле. Жонка панесла яму абед. Падышла да аратага і сказала: "Дапамагай, Бог". У гэты самы момант чалавек, яго жонка, быкі і сабака акамянелі. Потым чалавек, баба і сабака разбіліся, напалавіну ўвайшлі ў зямлю быкі». Каля вёсак Пупелічы (Крынічка) і Зачысце вядомы камень з адбіткам конскага капыта.

Паводле хронікі "Памяць".

*Заканчэнне будзе.*

*Ганарары аўтары ахвяруюць на развіццё часопіса.*

*Крытыка і бібліяграфія*

# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ – КУЛЬТУРА СЛОВА

**Лепешаў І.** Культура маўлення. – Гродна : ГрДУ, 2007. – 203 с. Тыраж 300 экз.

У апошнія 2-3 дзесяцігоддзі ўзмацнілася ўвага да праблемаў культуры беларускай мовы і маўлення. Зрэшты, працяглы час у нашай лінгвістыцы фактычна не размяжоўваліся паняцці "мова" і "маўленне", ва ўжытку быў тэрмін "мова" з двума значэннямі. Спалучэнне яго са словам *культура* не заўсёды адлюстроўвала сутнасць рэчаў. Цяпер ужо даказана, што *культура маўлення* – гэта "сукупнасць і сістэма яго камунікацыйных якасцяў", а *культура мовы* вызначаецца "ступенню развіцця і багацця яе лексікі і сінтаксісу, вытанчанасцю яе семантыкі, разнастайнасцю і гнуткасцю яе інтанацыі і інш." (Головин Б. Основы культуры речи. Москва, 1988, с. 14). Менавіта такая навуковая пазіцыя пакладзена ў аснову новага дапаможніка Івана Лепешава "Культура маўлення", які ў значнай ступені дапаўняе наяўныя дапаможнікі з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (гл.: Лепешаў І. Асновы культуры мовы і стылістыкі. Практыкум. Мінск, 1989; Асновы культуры маўлення і стылістыкі / Пад рэд. У. Анічэнкі. Мінск, 1992) па дысцыпліне, якая цяпер мае назву "Стылістыка і культура беларускага маўлення" (паводле аднайменнай праграмы, выдадзенай у Беларускім дзяржаўным універсітэце ў 2006 г.).

Рэцэнзаваны дапаможнік І. Лепешава выкарыстаюць і настаўнікі сярэдняй школы, бо, па-першае, у X класе вывучаецца раздзел "Маўленне" і ўсе камунікацыйныя якасці, па-другое, гэтая кніга прафесійна-педагагічна зарыентавана на школу і мае непасрэдны выхад у школьную практыку. Аўтар заўважае: "Веданне слабых участкаў марфалагічных нормаў дае настаўніку магчымасць праводзіць папераджальную работу пры вывучэнні тых ці іншых праграмных тэм па марфалогіі" (с. 38). Хоць у працы не разглядаюцца пытанні стылістыкі, але пры апісанні кожнай камунікацыйнай якасці маўлення паслядоўна ўлічваецца іх праяўленне ў розных стылях. Характэрна, што ва ўсіх 7 раздзелах дапаможніка правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце і выразнасць маўлення разгледжаны на ўжыванне не толькі слоў, але і фразеалагізмаў і прыказак.

Палова старонак кнігі адводзіцца правільнасці маўлення – галоўнай камунікацыйнай якасці. Падрабязна разглядаюцца арфаэпічныя, акцэнталагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, лексічныя, фразеалагічныя і прыказкавыя нормы. Істотная ўвага звернута на лексічныя нормы, бо ў некаторых працах іх існаванне адмаўляецца. Пад гэтымі нормамі разумеюцца правілы словаўжывання, заканамернасць існавання асобных слоў у сучаснай літаратурнай мове. У межах лексічных нормаў асобна вылучаны лексіка-семантычныя нормы, некаторыя з іх разглядаюцца ў раздзеле пра дакладнасць маўлення.

У працы ўпершыню даецца абгрунтаванне шматлікіх словаўтваральных, марфалагічных, лексічных і іншых нормаў. Пры чытанні кнігі вельмі часта заўважаеш дзесяткі сапраўдных навуковых адкрыццяў у галіне культуры маўлення: упершыню ўсебакова аналізуецца багацце маўлення. Аўтар слушна заўважае: "У стварэнні маўленчага багацця ўдзельнічаюць розныя структурныя элементы мовы. Таму можна гаварыць пра лексічнае, семантычнае, фразеалагічнае, прыказкавае і сінтаксічнае багацце (разнастайнасць) маўлення" (с. 165). Кожная з гэтых складовых частак маўленчага багацця аргументавана характарызуецца, канкрэтызуецца неаспрэчнымі, пераканальнымі прыкладамі.

Кніга, несумненна, спатрэбіцца і студэнтам філалагічных факультэтаў, і настаўнікам беларускай мовы ў сярэдняй школе. На жаль, наклад з 300 экземпляраў – вельмі малы для забеспячэння такіх патрэбаў. Пажадана было б выдаць гэты дапаможнік у цэнтральным рэспубліканскім выдавецтве.

**Тамаш ТАМАШЭВІЧ,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры беларускай мовы ГрДУ імя Янкі Купалы.

*Рыхтуемся да тэсціравання*

# КУЛЬТУРА МОВЫ

## ТЭСТ № 1

### ЧАСТКА А

**1.** Адзначыць словы, у якіх гук [**і**] вымаўляецца як [**й**]:
1. снег ідзе
2. да інстытута
3. на ігрышчы
4. бачыў Ірыну
5. прыехаў з Італіі

**2.** Адзначыць словы, у якіх вымаўляецца падоўжаны гук [**с'**]:
1. чэшскі
2. нясвіжскі
3. хвалюешся
4. імкнешся
5. суквецце

**3.** Адзначыць словы, у якіх вымаўляецца падоўжаны гук [**ч**]:
1. адчыніць
2. адпачыць
3. лётчык
4. мамчын
5. цётчын

**4.** Адзначыць словы, у якіх гукі [**з**] і [**с**] вымаўляюцца мякка:
1. з'ява
2. схіліць
3. згіб
4. скінуць
5. несмяротны

**5.** Адзначыць словы, у якіх вымаўляецца выбухны гук [**г**]:
1. агарод
2. ганак
3. мазгі
4. гарбуз
5. агрэст

**6.** Адзначыць словы з першым націскным складам:
1. бліснуць
2. вэлюм
3. слата
4. прынята
5. рупіцца

**7.** Адзначыць словы з другім націскным складам:
1. выпадак
2. чатырнаццаць
3. сакавік
4. упрысядкі
5. дачыста

**8.** Адзначыць словы з апошнім націскным складам:
1. пасланец
2. паслугач
3. катаваць
4. крапіва
5. вусы

**9.** Адзначыць словы, якія могуць мець варыянты націск:
1. адзінаццаць
2. хабар
3. літасцівы
4. лётаць
5. красавік

**10.** Адзначыць мовы, якія маюць фіксаваны на першым складзе націск:
1. польская
2. чэшская
3. фінская
4. французская
5. турэцкая

**11.** Адзначыць выпадкі, калі пры ўтварэнні патрэбнай формы адбываецца чаргаванне зычных гукаў:
1. працаваць у (бібліятэка)
2. сядзець на (дах)
3. вярнуцца з (практыка)
4. ісці па (луг)
5. гаварыць з (цётка)

**12.** Адзначыць выпадкі, калі пры ўтварэнні патрэбнай формы адбываецца чаргаванне галоснага з нулём гука:
1. слухаць (вучань)
2. махаць (дубец)
3. ехаць па (поле)
4. жартаваць з (хлопец)
5. плысці да (бераг)

**13.** Адзначыць назоўнікі, якія ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-а(-я)***:
1. сінус
2. рэнесанс
3. авёс
4. пясок
5. Віцебск

**14.** Адзначыць назоўнікі, якія ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-у(-ю)***:
1. грам
2. сок
3. дом
4. гай
5. поўдзень

**15.** Адзначыць назоўнікі, якія ў месным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-у(-ю)***:
1. цукар
2. Гомель
3. Васіль
4. кірмаш
5. каваль

**16.** Адзначыць назоўнікі, якія ў месным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-ы***:
1. друкар
2. трактар
3. нож
4. змагар
5. Багдановіч

**17.** Адзначыць назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку:
1. крупы
2. веснічкі
3. мётлы
4. кубкі
5. дзверы

**18.** Адзначыць назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку:
1. магній
2. чарніла
3. кола
4. насенне
5. вока

**19.** Адзначыць назоўнікі, якія маюць форму мужчынскага роду:
1. Тбілісі
2. Антарыо
3. кенгуру
4. міс
5. бра

**20.** Адзначыць назоўнікі, якія маюць форму ніякага роду:
1. Місісіпі
2. ранцье
3. аташэ
4. фае
5. алібі

**21.** Адзначыць назоўнікі, якія маюць форму жаночага роду:

1. крэда 4. Гобі
2. вета 5. Ай-Петры
3. інжэню

**22.** Адзначыць абрэвіятуры, якія маюць форму жаночага роду:
1. СНД 4. АТН
2. ЛіМ 5. ДАІ
3. БелТА

**23.** Адзначыць словазлучэнні з формамі дзеепрыметнікаў, якія не адпавядаюць літаратурным нормам:
1. расплюшчаныя вочы
2. грукочучы экскаватар
3. пасіveўшыя валасы
4. разбітая шыба
5. збялеўшы твар

**24.** Адзначыць сказы з няправільным ужываннем дзеепрыслоўяў:
1. Мы зразумелі, што, адпачыўшы, дарога не будзе такой цяжкай.
2. Стараючыся не разбудзіць бацькоў, мы апрануліся і выйшлі з хаты.
3. Браўшы на сябе такую адказнасць, трэба быць добра падрыхтаваным.
4. Красуе ля дарогі бярозка, цешачы вока мінакоў.
5. Слухаючы гэту песню, успамінаюцца канікулы ў летніку.

**25.** Адзначыць сказы з сінтаксічнымі памылкамі:
1. Падзякаваўшы настаўніка, дзеці выйшлі з класа.
2. Я папрасіў сябра дараваць мне за гэту недарэчнасць.
3. Прабачыць суседа можна заўсёды.
4. "Дзякую цябе за ўсё", – з усмешкай сказала сястра.
5. "Прабачце мне, калі ласка", – вінавата прамовіў вучань.

**26.** Адзначыць сказы з сінтаксічнымі памылкамі:
1. Мяне выправілі за ўрачом.
2. Зранку паехалі ў лес за дровамі.
3. Маці папрасіла мяне схадзіць па хлеб.
4. Старэйшы брат накіраваўся ў горад за пашпартам.
5. "Я прыйшоў за табой", – з парога сказаў дзядзька.

**27.** Адзначыць сказы з сінтаксічнымі памылкамі:
1. Ніколі не трэба смяяцца з хворых.
2. Досыць кпіць з няправільных адказаў.
3. Здзекавацца над ім ніхто не будзе.
4. Маці заўсёды цешыцца са свайго дзіцяці.
5. Дзівіцца тут не было над чым.

**28.** Адзначыць сказы з няправільным ужываннем колькасна-іменных спалучэнняў:
1. Уздоўж дарогі раслі чатыры старых хвоі.
2. Тры вясёлых хлопцы зайшлі ў хату.
3. Прыпынак знаходзіцца ў двух кроках ад дома.
4. Два новыя катэджы з'явіліся на нашай вуліцы.
5. Наша лецішча знаходзіцца за дваццаць кіламетраў ад горада.

**29.** Адзначыць сказы з няправільным ужываннем прыназоўнікаў:
1. Сын вельмі падобны на бацьку.
2. Аб адной вадзе сыты не будзеш.
3. Я ўсім паведаміў пра сваю знаходку.
4. Мы працуем у сваю карысць.
5. У Глыбоччыне заўсёды чуеш чыстую беларускую мову.

**30.** Адзначыць сказы з парушэннем лагічнасці маўлення:
1. Ужо ў верасні месяцы мы будзем студэнтамі.
2. Я напісаў аўтабіяграфію і паставіў подпіс.
3. Спачатку праехалі вайскоўцы, а потым пайшлі людзі.
4. Дзядуля падарыў унуку новенькі веласіпед.
5. Вывучэнне фальклору – неабходны элемент у засваенні вуснай народнай творчасці.

**31.** Адзначыць сказы з парушэннем чысціні маўлення:
1. Дваццаць два чалавекі з групы атрымалі станоўчыя адзнакі, але чатыры студэнты яшчэ маюць хвасты.
2. Выхавальнік зайшоў у пакой і строга папярэдзіў: "Перастаньце калбасіцца – ужо другая гадзіна ночы".
3. Мы два дні сур'ёзна рыхтаваліся да практычных заняткаў.
4. Я зняў з рук ісподкі, потым адчыніў дзверы ў істопку.
5. Студэнт з радасцю казаў бацькам, што яму ў горадзе ўсяго выстарчае.

**32.** Адзначыць сказы з парушэннем дакладнасці маўлення:
1. Майстар вырэзваў на сцяне залатыя фрэскі.
2. Хлопец адчыніў кнігу і стаў уважліва чытаць.
3. Я люблю даглядаць свойскіх жывёл.
4. На дварэ вельмі халодна, таму трэба апрануць валёнкі.
5. Вучань захапляўся фантастыкай і часта прасіў бацькоў купіць яму новых аўтараў.

### ЧАСТКА В

**1.** Запісаць у пачатковай форме апорнае (ключавое) слова абрэвіятуры ***МВФ***.

**2.** Запісаць у форме творнага склону лічэбнік ***128***.

**3.** Запісаць назоўнік ***дно*** ў форме роднага склону множнага ліку.

**4.** Знайсці сказ з парушэннем лексічнай спалучальнасці і выпісаць з кантэксту лішняе слова:
1. Расказаць пра ўсё было амаль немагчыма.
2. На лузе пасвіцца табун коней.
3. Малады чалавек зайшоў у пакой і прывітаўся.
4. Я сёння прачытаў вельмі цудоўны верш.

**5.** Знайсці сказ з граматычнай памылкай і запісаць адпаведнае слова правільна разам з прыназоўнікам:
1. Міхась вельмі любіць хваліцца, і з задавакам ніхто не сябруе.
2. Зараз шмат аўтамабіляў не толькі ў горадзе, але і ў сяле.
3. Мне падабаецца ездзіць ранняй вясною па вёскам.
4. У спісе было не толькі маё прозвішча.

**6.** Знайсці памылку ў колькасна-іменным спалучэнні і запісаць яго правільна:
1. пяцёра вучняў 3. абодва студэнты
2. двое дзяўчат 4. трое парасят

**7.** Запісаць у форме назоўнага склону множнага ліку слова, якое абазначае жыхароў Рэспублікі Конга.

**8.** Выпісаць з прыведзенага раду лішняе слова: ***вадзяны, вадзяністы, вадзіць, водны, вадзіца***.

### АДКАЗЫ

**Частка А**

**1.** – 2, 3; **2.** – 3, 4; **3.** – 1, 3, 5; **4.** – 1, 5; **5.** – 2, 3, 5; **6.** – 1, 2, 5; **7.** – 4, 5; **8.** – 1, 2, 3, 4; **9.** – 3, 4; **10.** – 2, 3; **11.** – 1, 4; **12.** – 1, 2, 4; **13.** – 1, 3, 5; **14.** – 2, 4; **15.** – 3, 5; **16.** – 2, 3; **17.** – 1, 2, 5; **18.** – 1, 2, 4; **19.** – 1, 3; **20.** – 4, 5;

**21.** – 3, 4, 5; **22.** – 1, 5; **23.** – 2, 3, 5; **24.** – 1, 3, 5; **25.** – 1, 3, 4; **26.** – 1, 2, 4, 5; **27.** – 3, 5; **28.** – 1, 2, 3; **29.** – 1, 4, 5; **30.** – 1, 3, 5; **31.** – 1, 2, 4, 5; **32.** – 1, 2, 4, 5.

**Частка В**

**1.** Фонд; **2.** ста дваццаццю васьмю; **3.** дноў; **4.** вельмі; **5.** па вёсках; **6.** дзве дзяўчыны; **7.** кангалезцы; **8.** вадзіць.

## ТЭСТ № 2

### ЧАСТКА А

**1.** Адзначыць словы, у якіх гук **і** вымаўляецца як [**ы**]:
1. стол і крэсла
2. гарох і фасоля
3. снег і дождж
4. вялікі і разумны
5. лес і поле

**2.** Адзначыць словы, у якіх вымаўляецца адзіночны гук [**с**]:
1. мыешся
2. белавежскі
3. парыжскі
4. радуешся
5. суражскі

**3.** Адзначыць словы, у якіх вымаўляецца падоўжаны гук [**ц**]:
1. адцадзіць
2. адстаць
3. на кладцы
4. падстава
5. (дзякаваць) цётцы

**4.** Адзначыць словы, у якіх гукі [**з**] і [**с**] вымаўляюцца мякка:
1. пасля
2. з'есці
3. схема
4. раскідаць
5. смешны

**5.** Адзначыць словы, у якіх вымаўляецца выбухны гук [**г**]:
1. вакзал
2. экзамен
3. абцугі
4. мікстура
5. швагер

**6.** Адзначыць словы з першым націскным складам:
1. прыяцель
2. загадзя
3. блукаць
4. хлусіць
5. мармур

**7.** Адзначыць словы з другім націскным складам:
1. бульбяны
2. дакумент
3. араты
4. Скарына
5. індустрыя

**8.** Адзначыць словы з апошнім націскным складам:
1. каштарыс
2. жалюзі
3. аркуш
4. навіна
5. знахар

**9.** Адзначыць словы, якія могуць мець варыянты націск:
1. муляр
2. Нясвіж
3. навокал
4. супраць
5. нанава

**10.** Адзначыць мовы, якія маюць фіксаваны (пастаянны) націск:
1. беларуская
2. украінская
3. венгерская
4. латышская
5. нямецкая

**11.** Адзначыць выпадкі, калі пры ўтварэнні патрэбнай формы адбываецца чаргаванне зычных гукаў:
1. быў на (практыка)
2. быць не ў (дух)
3. вярнуцца з (бібліятэка)
4. ісці па (мост)
5. кнігі на (палічка)

**12.** Адзначыць выпадкі, калі пры ўтварэнні патрэбнай формы адбываецца чаргаванне галоснага з нулём гука:
1. спектакль у (тэатр)
2. трава на (сцяжынка)
3. ад (аўторак) да (аўторак)
4. думаць пра (сябар)
5. удаўжыню каля (метр)

**13.** Адзначыць назоўнікі, якія ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-а(-я)***:
1. сеанс
2. мухамор
3. хакей
4. спорт
5. каледж

**14.** Адзначыць назоўнікі, якія ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-у(-ю)***:
1. боль
2. прафсаюз
3. паркаль
4. сухавей
5. балет

**15.** Адзначыць назоўнікі, якія ў месным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-у(-ю)***:
1. Мележ
2. Алег
3. спіс
4. млын
5. герой

**16.** Адзначыць назоўнікі, якія ў месным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-ы***:
1. рэвізор
2. матор
3. хвошч
4. Караткевіч
5. корч

**17.** Адзначыць назоўнікі, якія ў давальным і месным склонах адзіночнага ліку маюць канчатак ***-э***:
1. траўка
2. рука
3. ракá
4. скрынка
5. шчака

**18.** Адзначыць назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку:
1. прысады
2. арэлі
3. альтанкі
4. каноплі
5. звычаі

**19.** Адзначыць назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку:
1. воцат
2. крыга
3. дарвінізм
4. галлё
5. жарабя

**20.** Адзначыць назоўнікі, якія маюць форму мужчынскага роду:
1. марабу
2. Алатау
3. авеню
4. маэстра
5. журы

**21.** Адзначыць назоўнікі, якія маюць форму ніякага роду:
1. Дэлі
2. поні
3. кашнэ
4. сальта
5. Перу

**22.** Адзначыць абрэвіятуры, якія маюць форму мужчынскага роду:
1. ЭЛіМБел
2. БАТЭ
3. НАН РБ
4. МТЗ
5. КНР

**23.** Адзначыць назоўнікі, якія змяняюцца па склонах:
1. Жодзіна
2. паліто
3. Сянно
4. радыё
5. жарало

**24.** Адзначыць словазлучэнні з формамі дзеепрыметнікаў, якія не адпавядаюць літаратурным нормам:

1. падсмажанае мяса
2. плачучы вучань
3. прадстаячая работа
4. хвалюючыйся студэнт
5. прыбітая дошка

**25.** Адзначыць сказы з няправільным ужываннем дзеепрыслоўяў:

1. Гуляя ў футбол, я забываюся пра ўсё на свеце.
2. Ідучы дадому, я трапіў у непрыемную гісторыю.
3. Машына рухалася па абледзянелай дарозе, раскідвая па баках пясок.
4. Хвалюючыся і плачучы, сын расказваў маці пра атрыманыя адзнакі.
5. Я вельмі люблю назіраць за птушкамі, катаясь на веласіпедзе па лясной дарозе.

**26.** Адзначыць сказы з сінтаксічнымі памылкамі:

1. Наша знаёмая – загадчыца бібліятэкай.
2. Мой сябар часта жартуе з мяне.
3. Яго старэйшы брат у мінулым годзе ажаніўся на сваёй аднакласніцы.
4. "Дзякую вас за дапамогу", – ветліва сказаў дзядуля.
5. "Схадзі, унучак, па доктара", – папрасіла мяне бабуля.

**27.** Адзначыць сказы з сінтаксічнымі памылкамі:

1. Мінулай зімою я тыдзень хварэў грыпам.
2. Усё гэта мы бачылі сваімі вачамі.
3. Наш дом знаходзіцца літаральна ў двух кроках ад прыпынку.
4. Разам з сябрамі мы паехалі па новыя ўражанні.
5. Два малыя хлопчыкі нясмела зайшлі ў клас.

**28.** Адзначыць сказы з няправільна ўтворанымі формамі ступеняў параўнання:

1. Я крыху вышэйшы за брата.
2. Самыя смачнейшыя яблыкі былі некалі ў бацькоўскім садзе.
3. Тэмпература паветра – два градусы вышэй нуля.
4. Бразільскія футбалісты – мацнейшыя ў свеце.
5. Найбольш лепшыя працы будуць дасланыя на конкурс.

**29.** Адзначыць сказы з няправільным ужываннем колькасна-іменных спалучэнняў:

1. У нашай вёсцы ўсяго трое кароў.
2. У дзвюхтысячным годзе я пайшоў у школу.
3. Да бацькі прыехалі абодва дарослыя сыны.
4. У пасёлку зараз каля пяціста жыхароў.
5. Я сёння купіў чатыры новыя кнігі.

**30.** Адзначыць сказы з няправільным ужываннем асобных кампанентаў фразеалагізмаў:

1. Снег за два дні як сабака языком злізаў.
2. Я моцна спалохаўся, бо ён выскачыў як Піліп з канапель.
3. Мне здаецца, што ты зусім збіўся з панталыку.
4. Па фізіцы Васіль кульгаў на абедзве рукі.
5. Да вёскі было зусім блізка, можна сказаць, рукою кінуць.

**31.** Адзначыць сказы з парушэннем лагічнасці маўлення:

1. Турысты спыніліся на беразе ракі і адразу разбілі палатку.
2. Зранку мы зайшлі ў краму па хлеб і малако.
3. На сходзе прысутнічалі чатыры чалавекі і тры вайскоўцы.
4. У суседняй гаспадарцы гадуюцца розныя жывёлы: каровы, авечкі, качкі, куры.
5. Увосень розныя птушкі адлятаюць у вырай.

**32.** Адзначыць сказы з парушэннем дакладнасці маўлення:

1. Маці ўчора сказала, што я ад радасці згубіў розум.
2. На дварэ люты, а сапраўднай зімы яшчэ не было.
3. Працавітасць адыгрывае вялікае значэнне ў станаўленні асобы.
4. Сяброўства мае істотную ролю ў жыцці кожнага чалавека.
5. Перш чым зрабіць такі важны крок, трэба ўсё добра ўзважыць.

### ЧАСТКА В

**1.** Запісаць у пачатковай форме апорнае (ключавое) слова абрэвіятуры ***ПАР***.

**2.** Запісаць у форме творнага склону лічэбнік ***359***.

**3.** Запісаць у форме роднага склону множнага ліку назоўнік ***сцябло***.

**4.** Знайсці сказ з парушэннем лексічнай спалучальнасці і выпісаць з кантэксту лішняе слова:

1. На полі здалёк відаць статак кароў.
2. Нейкі малады юнак дапамог бабулі перайсці праз дарогу.
3. Ужо каторы дзень стаіць сапраўдная летняя спёка.
4. Настаўніца папрасіла дзяцей хуценька зайсці ў клас.

**5.** Знайсці сказ з граматычнай памылкай і запісаць адпаведны кампанент фразеалагізма правільна:

1. Тое, што ты мне паказаў, – гэта фількіна грамата.
2. Ноч была светлая – хоць іголкі збірай.
3. Не варта, працуючы разам, трымаць камень за пазухай.
4. Грошай у нас было як кот наплакаў.

**6.** Знайсці памылку ў колькасна-іменным спалучэнні і запісаць яго правільна:

1. двое жарабят
2. трое дзвярэй
3. чацвёра дзяцей
4. пяцёра клёнаў

**7.** Запісаць у форме назоўнага склону множнага ліку слова, якое абазначае жыхароў Рэспублікі Кот-д'Івуар.

**8.** Выпісаць з прыведзенага раду лішняе слова: ***канстытуцыя, камінар, электарат, рэферэндум, выбаркам***.

### АДКАЗЫ

#### Частка А

**1.** – 1, 5; **2.** – 2, 3, 5; **3.** – 1, 3, 5; **4.** – 1, 2, 5; **5.** – 1, 2, 5; **6.** – 1, 2, 5; **7.** – 3, 4, 5; **8.** – 1, 2, 4, 5; **9.** – 3, 4, 5; **10.** – 3, 4; **11.** – 1, 4, 5; **12.** – 3, 4; **13.** – 1, 2, 3, 5; **14.** – 1, 3, 4; **15.** – 1, 2, 5; **16.** – 2, 3, 5; **17.** – 2, 3, 5; **18.** – 1, 2, 4; **19.** – 1, 3, 4; **20.** – 1, 2, 4; **21.** – 3, 4; **22.** – 2, 4; **23.** – 1, 3, 5; **24.** – 2, 3, 4; **25.** – 1, 3, 5; **26.** – 1, 3, 4; **27.** – 1, 2, 3; **28.** – 2, 3, 4, 5; **29.** – 1, 2, 4; **30.** – 1, 4, 5; **31.** – 1, 3, 4; **32.** – 1, 3, 4.

#### Частка В

**1.** – Рэспубліка; **2.** – трымастамі пяццюдзесяццю дзевяццю; **3.** – сцёблаў; **4.** – малады; **5.** – фількава; **6.** – пяць клёнаў; **7.** – івуарыйцы; **8.** – камінар.

Падрыхтаваў **Юрый БАБІЧ**.

# КАНТРОЛЬНЫЯ ТЭСТЫ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ Ў 2007/2008 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

**МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА**

**Частка А**

**№ 1.** Адзначце словы з нулявым канчаткам:
1) найлепш 4) насіў
2) метро 5) станцый
3) Толеў

**№ 2**. Адзначце словы з матэрыяльна выражаным канчаткам:
1) сёння 4) дзвярэй
2) пехатой 5) сто
3) кенгуру

**№ 3.** Адзначце словы, якія не маюць канчаткаў:
1) паліто 4) змалку
2) геній 5) соцень
3) малако

**№ 4.** Адзначце словы з асновай на зычны гук:
1) пайшоў 4) лёгка
2) двое 5) аварыя
3) таксі

**№ 5.** Адзначце словы з асновай на галосны гук:
1) даўно 4) знізу
2) чытаў 5) радыё
3) маэстра

**№ 6.** Адзначце словы з перарванай асновай:
1) двоеўладдзе 4) купацца
2) якісьці 5) добразычліва
3) сустрэліся

**№ 7**. Адзначце словы з двума канчаткамі (з дзвюма асновамі):
1) жоўта-зялёны 4) дзевяноста
2) восемсот 5) пяцідзесяці
3) каго-небудзь

**№ 8.** Адзначце словы, аснова якіх дзеліцца на марфемы:
1) скрыпка 4) шапка
2) галка 5) тачка
3) качка

**№ 9.** Адзначце словы з непадзельнай асновай:
1) важны 4) лепшы
2) першы 5) дзейны
3) кожны

**№ 10.** Адзначце словы, аснова якіх складаецца толькі з кораня:
1) промах 4) какаду
2) гігант 5) зямля
3) замок

**№11**. Адзначце словы, аснова якіх складаецца з трох марфем:
1) ранішнік 4) узмор'е
2) юнацкі 5) па-руску
3) зімоўка

**№ 12.** Адзначце словы з фанетычным падаўжэннем гукаў:
1) разводдзе 4) надзённы
2) бяссонніца 5) жыццё
3) насенне

**№ 13.** Адзначце словы з марфалагічным падаўжэннем гукаў:
1) адчуванне 4) паданне
2) гуллівы 5) развіццё
3) аддзякаваць

**№ 14.** Адзначце словы з нулявым суфіксам:
1) выбары 4) давер'е
2) высь 5) воўчы
3) двукроп'е

**№ 15.** Адзначце словы, якія маюць нулявы суфікс і нулявы канчатак:
1) параход 4) збярог
2) выступіў 5) накрыж
3) просінь

**№ 16.** Адзначце словы, якія маюць прыстаўку і суфікс:
1) прывычка 4) прыватны
2) выдатна 5) надоўга
3) зарніца

**№ 17.** Адзначце словы з марфемнай будовай "корань + суфікс":
1) холадна 4) іначай
2) дубец 5) учора
3) застаць

**№ 18.** Адзначце словы з марфемнай будовай "корань + суфікс + суфікс":
1) далёка 4) весела
2) сасоннік 5) бясспрэчна
3) цішком

**№ 19**. Адзначце словы з марфемнай будовай "прыстаўка + корань + суфікс":
1) запаведзь 4) зранку
2) сцерагчы 5) спераду
3) аддаць

**№ 20.** Адзначце словы з марфемнай будовай "корань + канчатак":
1) сталіца 4) позна
2) зерне 5) рубель
3) лодка

**№ 21.** Адзначце словы з марфемнай будовай "корань + суфікс + канчатак":
1) драўляны 4) дубняк
2) вогнішча 5) водгук
3) біцца

**№ 22.** Адзначце словы з марфемнай будовай "прыстаўка + корань + суфікс + канчатак":
1) дажынкі 4) абясшкодзіць
2) вывучэнне 5) па-добраму
3) паслабленне

**№ 23.** Адзначце словы з марфемнай будовай "корань + суфікс + суфікс + канчатак":
1) каштоўнасць 4) грамадзянін
2) скульптурны 5) студэнцтва
3) будоўля

**№ 24.** Адзначце словы з формаўтваральным суфіксам:
1) берагчы 4) з'елі
2) ціха 5) тысячны
3) цяжэй

**№ 25.** Адзначце словы, у якіх постфікс знаходзіцца пасля формаўтваральнага суфікса:
1) нарэжце 4) дзесьці
2) закаціўся 5) найгрviцца
3) хвалюючыся

**№ 26.** Адзначце словы з дзвюма прыстаўкамі:
1) недавыканаць 4) знясілець
2) запатрабаваць 5) падзарабіць
3) адазвацца

**№ 27.** Адзначце словы, якія складаюцца з пяці марфем:
1) нагаварыцца 4) раздвоены
2) абагравальнік 5) затуханне
3) абясцэньваць

**№ 28.** Адзначце пары слоў з аманімічнымі каранямі:
1) выразнасць – выразанне
2) лужок – лужына
3) водны – адводны
4) скараціць – карацейшы
5) душавая – душэўны

**№ 29.** Адзначце пары слоў з аманімічнымі суфіксамі:
1) адмычка – сінічка
2) звычай – трамвай
3) сінець – чарнець
4) студэнтка – падрыхтоўка
5) бульбянішча – дамішча

**№ 30.** Адзначце пары слоў з аманімічнымі прыстаўкамі:
1) праход – правобраз
2) даехаць – даплыць
3) адораны – амаральны
4) заспяваць – засмяяцца
5) выток – вышыня

**№ 31.** Адзначце словы з аднолькавай марфемнай будовай:
1) бяліць 4) азёрны
2) здароўе 5) раней
3) мыў

**№ 32.** Адзначце словы, правільна падзеленыя на марфемы:
1) пера-гляд-ва-цца
2) драў-л-ян-ы
3) арэш-н-ік-□
4) па-на-вы-думл-я-ць
5) на-ўз-да-гон

**Частка Б**

**№ 33.** Запішыце назву найменшай граматычнай моўнай адзінкі, якая выражае пэўнае значэнне.

**№ 34.** Запішыце назву марфемы – агульнай часткі роднасных слоў.

**№ 35.** Запішыце назву часткі слова, якая выражае яго індывідуальнае лексічнае значэнне.

**№ 36.** Дапоўніце азначэнне, запісаўшы адказ у форме назоўнага склону:

*Марфема, якая звычайна знаходзіцца ў слове пасля канчатка ці формаўтваральнага суфікса, называецца ... .*

**№ 37.** Дапоўніце азначэнне, запісаўшы адказ у форме назоўнага склону:

*Марфема, якая ніколі не сустракаецца ў нязменных словах, называецца ... .*

**№ 38.** Дапоўніце азначэнне, запісаўшы адказ у форме назоўнага склону:

*Злучальны элемент, які звычайна размешчаны паміж каранямі ў складаных словах, называецца ... .*

**№ 39.** Устаўце патрэбнае:

*Не мае ў слове гукавога выражэння ... канчатак.*

**№ 40.** Устаўце патрэбнае:

*Звесткі пра падзел слоў на структурныя часткі, якія маюць пэўнае значэнне, змяшчае ... слоўнік.*

## СЛОВАЎТВАРЭННЕ

**Частка А**

**№ 1.** Адзначце невытворныя словы:
1) высокі 4) глыбока
2) плаціць 5) чысціць
3) чырвань

**№ 2.** Адзначце вытворныя (утвораныя) словы:
1) гаварыць 4) бег
2) пер'е 5) другі
3) студэнт

**№ 3.** Адзначце словы, утвораныя ад назоўнікаў:
1) узлесак 4) цаніць
2) далечыня 5) вучаніца
3) палёт

**№ 4.** Адзначце словы, утвораныя ад прыметнікаў:
1) жыццё 4) багацце
2) вечнасць 5) грыбнік
3) нецярплівы

**№ 5.** Адзначце словы, утвораныя ад лічэбнікаў:
1) раздвоенасць 4) найперш
2) траякі 5) сотня
3) упяцярых

**№ 6.** Адзначце словы, утвораныя ад займеннікаў:
1) нідзе 4) як-небудзь
2) па-нашаму 5) засвоіць
3) чыйсьці

**№ 7.** Адзначце словы, утвораныя ад дзеясловаў:
1) пераход 4) наклеены
2) насмешніца 5) настойліва
3) лоўля

**№ 8.** Адзначце словы, утвораныя ад прыслоўяў:
1) штосьці 4) заўтрашні
2) лёгкасць 5) беспакарана
3) наваколле

**№ 9.** Адзначце словы, утвораныя прыставачным спосабам:
1) дабяла 4) прагаласаваць
2) пазаўчора 5) апярэдзіць
3) падкормка

**№ 10**. Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам:
1) байкапісец 4) добрасумленнасць
2) прачытанне 5) чалавецтва
3) бесклапотны

**№ 11.** Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:
1) падпісчык 4) бязрыб'е
2) раздзяўбаць 5) загартоўка
3) па-летняму

**№ 12.** Адзначце словы, утвораныя постфіксальным спосабам:
1) развітацца 4) раскінуцца
2) напіцца 5) шаптацца
3) зачапіцца

**№ 13.** Адзначце словы, утвораныя нульсуфіксальным спосабам:
1) просінь 4) карэнне
2) заезд 5) падзяка
3) чалавечы

**№ 14.** Адзначце словы, утвораныя прыставачна-нульсуфіксальным спосабам:
1) непагадзь 4) пераход
2) вастрадзюбы 5) прыбудова
3) бясконцы

**№ 15.** Адзначце словы, утвораныя прыставачна-постфіксальным спосабам:
1) раз'ехацца 4) пацалавацца
2) прыцярпецца 5) прымацавацца
3) узрадавацца

**№ 16.** Адзначце словы, утвораныя суфіксальна-постфіксальным спосабам:
1) слязіцца 4) каласіцца
2) купацца 5) сустракацца
3) сталавацца

**№ 17.** Адзначце словы, утвораныя спосабам асноваскладання:
1) светапогляд 4) жалезабетонны
2) маладаступнасць 5) хлебазавод
3) плашч-палатка

**№ 18.** Адзначце словы, утвораныя спосабам словаскладання:
1) чарнавокі 4) кінарэжысёр
2) жывапіснасць 5) вагон-рэстаран
3) радыёэлектроніка

**№ 19.** Адзначце словы, утвораныя складана-суфіксальным спосабам:
1) добраахвотны 4) даўгавечнасць
2) вадакачка 5) торфабрыкетны
3) стогадовы

**№ 20.** Адзначце словы, утвораныя складана-нульсуфіксальным спосабам:
1) звералоў 4) сенакос
2) суквецце 5) законапраект
3) драбналісты

**№ 21.** Адзначце словы, утвораныя спосабам абрэвіяцыі:
1) дрывасек 4) педсавет
2) універмаг 5) філфак
3) бездараж

**№ 22.** Адзначце літарныя абрэвіятуры:
1) ГЭС 4) РБ
2) БДУ 5) КНР
3) ЦУМ

**№ 23.** Адзначце пары, у якіх першае слова з'яўляецца ўтваральным:
1) фізіка – фізік
2) украінец – украінка
3) хутка – хуткі
4) намёк – намякаць
5) белы – бель

**№ 24.** Адзначце пары, у якіх першае слова з'яўляецца вытворным:
1) атакаваць – атака
2) смеласць – смелы
3) гоман – гаманіць
4) скакаць – скокнуць
5) золата – залаты

**№ 25.** Адзначце слова, ад якога ўтворан назоўнік *прадвызначанасць:*
1) прадвызначыць
2) прадвызначаны
3) вызначанасць
4) прадвызначэнне
5) вызначаны

**№ 26.** Адзначце слова, ад якога ўтворан прыметнік *недаверлівы:*
1) даверыцца 4) даверлівы
2) недаверліва 5) давер
3) даверыць

**№ 27.** Адзначце слова, ад якога ўтворан дзеяслоў *распрацоўваць:*
1) праца 4) распрацоўшчык
2) працаваць 5) распрацаваць
3) распрацоўка

**№ 28.** Адзначце слова, ад якога ўтворана прыслоўе *ажыўлена:*
1) ажыўляць 4) ажывіць
2) ажыўленне 5) жывы
3) ажыўлены

**№ 29**. Адзначце правільна пабудаваныя слова-ўтваральныя ланцужкі:
1) век → вечны → вечнасць
2) тры → тройка → патроіць
3) век → векавы → векаваць
4) тры → трое → патроіць
5) век → вечны → вечна

**№ 30.** Адзначце няправільна пабудаваныя слова-ўтваральныя ланцужкі:
1) снег → снежны → падснежнік
2) шчасце → шчаслівы → шчаслівец
3) школа → школьнік → школьніца
4) тры → трайны → трое
5) шчасце → шчасціць → шчасліва

**№ 31.** Адзначце правільныя сцверджанні:
1) Усе складаныя словы маюць не менш як два корані.
2) Слова можа быць утворана пры дапамозе двух суфіксаў.
3) Усе зваротныя дзеясловы маюць постфікс.
4) Да кожнага вытворнага слова можна падабраць утваральнае.

5) Колькасць марфем у вытворным слове заўсёды большая, чым у адпаведным утваральным.

**№ 32**. Адзначце памылковыя сцверджанні:

1) У слове могуць быць дзве прыстаўкі.

2) Усе словы без канчаткаў з'яўляюцца невытворнымі.

3) Слова можа быць утворана пры дапамозе дзвюх прыставак.

4) Усе словы без суфіксаў з'яўляюцца невытворнымі.

5) Корань – абавязковая частка кожнага слова.

**Частка Б**

**№ 33.** Устанавіце адпаведнасць паміж словамі і спосабамі іх утварэння:

| | |
|---|---|
| А. бяскрайні | 1. суфіксальны |
| Б. дапамога | 2. прыставачны |
| В. нарэзка | 3. прыставачна-суфіксальны |
| Г. непагода | 4. складана-суфіксальны |
| | 5. нульсуфіксальны |

**№ 34.** Устанавіце адпаведнасць паміж словамі і спосабамі іх утварэння:

| | |
|---|---|
| А. снегапад | 1. складана-суфіксальны |
| Б. цяжкадаступны | 2. асноваскладанне |
| В. кароткатэрміновы | 3. словаскладанне |
| Г. бульбаўборачны | 4. складана-нульсуфіксальны |
| | 5. суфіксальны |

**№ 35.** Запішыце назву раздзела мовазнаўства, які вывучае шляхі і спосабы ўтварэння новых слоў.

**№ 36.** Запішыце, як называецца слова, утворанае на базе іншага, роднаснага слова.

**№ 37.** Запішыце, як называецца слова, што паслужыла базай для ўтварэння аднакарэннага слова.

**№ 38.** Дапоўніце азначэнне, запісаўшы адказ у форме назоўнага склону:

*Спосаб словаўтварэння, які заключаецца ў складанні скарочаных асноў слоў, называецца ....*

**№ 39.** Устаўце патрэбнае:

*... спосабы словаўтварэння – гэта тыя, з дапамогай якіх актыўна ўтвараюцца новыя словы.*

**№ 40.** Устаўце патрэбнае:

*... спосабы словаўтварэння – гэта тыя, з дапамогай якіх новыя словы на сучасным этапе развіцця мовы не ўтвараюцца.*

**ДАВЕДКІ**

**Марфемная будова слова**

**Частка А: № 1. –** 3, 4, 5; **№ 2. –** 4, 5; **№ 3.** – 1, 4; **№ 4.** – 1, 2, 5; **№ 5.** – 1, 3, 4, 5; **№ 6.** – 2, 3; **№ 7.** – 2, 5; **№ 8.** – 1, 3; **№ 9.** – 1, 2, 3; **№ 10.** – 2, 4, 5; **№ 11.** – 2, 3, 4; **№ 12.** – 1, 3; **№ 13.** – 1, 2, 3; **№ 14.** – 1, 2, 5; **№ 15.** – 1, 3, 4; **№ 16.** – 1, 5; **№ 17.** – 3, 4; **№ 18.** – 1, 3; **№ 19.** – 3, 5; **№ 20.** – 1, 2, 3, 5; **№ 21.** – 1, 2, 4; **№ 22.** – 1, 2, 3; **№ 23.** – 2, 4; **№ 24.** – 1, 3, 4; **№ 25.** – 3, 5; **№ 26.** – 2, 4, 5; **№ 27.** – 1, 4, 5; **№ 28.** – 2, 3, 5; **№ 29.** – 1, 4, 5; **№ 30. –** 1, 3; **№ 31.** – 2, 3, 4; **№ 32.** – 4, 5.

**Частка Б: № 33.** – марфема; **№ 34.** – корань; **№ 35.** – аснова; **№ 36.** – постфікс; **№ 37.** – канчатак; **№ 38.** – інтэрфікс; **№ 39.** – нулявы; **№ 40.** – марфемны.

**Словаўтварэнне**

**Частка А: № 1.** – 1, 2; **№ 2.** – 2, 4; **№ 3.** – 1, 4, 5; **№ 4.** – 2, 3, 4; **№ 5.** – 2, 3, 5; **№ 6.** – 2, 3, 5; **№ 7.** – 1, 3, 4; **№ 8.** – 3, 4; **№ 9.** – 2, 4; **№ 10.** – 2, 4, 5; **№ 11.** – 3, 4; **№ 12.** – 3, 4, 5; **№ 13.** – 2, 3, 5; **№ 14.** – 1, 3; **№ 15.** – 1, 2; **№ 16.** – 1, 3, 4; **№ 17.** – 1, 5; **№ 18.** – 3, 4, 5; **№ 19. –** 1, 2, 3; **№ 20.–** 1, 3, 4; **№ 21.** – 2, 4, 5; **№ 22.** – 2, 4, 5; **№ 23.–** 1, 2, 5; **№ 24.** – 1, 2, 3; **№ 25.** – 2; **№ 26.** – 4; **№ 27.** – 5; **№ 28.** – 3; **№ 29.–**1, 4, 5; **№ 30.** – 1, 4, 5; **№ 31.** – 1, 3, 4; **№ 32.** – 2, 3, 4.

**Частка Б: № 33.** – А3Б5В1Г2; **№ 34.** – А4Б3В1Г5; **№ 35.** – словаўтварэнне; **№ 36.** – вытворнае; **№ 37.** – утваральнае; **№ 38.** – абрэвіяцыя; **№ 39.** – прадуктыўныя; **№ 40.** – непрадуктыўныя.

Падрыхтаваў **Генадзь АРЦЯМЁНАК.**


## АЎТАРАМ І ПАДПІСЧЫКАМ!

### Патрабаванні да афармлення матэрыялаў

Рэдакцыя прымае на разгляд матэрыялы на беларускай мове аб'ёмам да 20 старонак (пажадана ў электронным выглядзе).

Тэкставая інфармацыя мусіць быць запісаная ў фармаце doc або rtf, дапускаецца мінімальнае фарматаванне (шрыфт Times New Roman, вылучэнні або курсівам, або паўтлустым, або паўтлустым курсівам).

Калі дасылаецца рукапіс, то ён павінен лёгка чытацца і не ўтрымліваць выпраўленняў. Малюнкі варта выконваць выразна, ярка (у чорна-белай гаме).

Уся нятэкставая інфармацыя на электронных носьбітах (фота, графікі і да т. п.) павінна быць запісана ў любым графічным фармаце (jpg, tiff; ≥ 300 dpi), але не павінна знаходзіцца ў тэксце ў фармаце Word.

Фотаздымкі аўтараў прымаюцца партрэтнага кшталту (неабавязкова пашпартныя), добрай якасці (ні ў якім выпадку не ксеракопіі!).

Неабходна пазначаць прозвішча, імя і імя па бацьку аўтара, месца яго працы, пасаду, вучоную ступень, званне, хатні адрас, тэлефоны, пашпартныя звесткі (серыя, нумар, калі і кім выдадзены, асабісты нумар, адрас прапіскі). Без гэтых звестак матэрыялы прымацца не будуць.

На распрацоўках урокаў і сцэнарыяў трэба пазначаць клас 12-годкі, чвэрць і месяц, калі тэма вывучаецца ў школе.

Паколькі наш часопіс не паступае ў рознічны гандаль, атрымаць яго можна па падпісцы. Абмежаваная колькасць асобнікаў прадаецца ў краме "Акадэмкніга" і ў кніжным кіёску галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка ў Мінску.

# ТЭСТ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ № 1

**Частка А**

**А1.** Адзначце словы, у якіх літара ***я*** абазначае два гукі:
1) памяць; 4) Прыпяць;
2) мільярд; 5) аб'ява.
3) падзяка;

**А2.** Адзначце словы, у якіх спалучэнне ***дж*** абазначае адзін гук:
1) ураджай; 4) паджылкі;
2) паджаць; 5) пасяджэнне.
3) выезджаны;

**А3.** Адзначце радкі слоў, у якіх выдзеленыя літары абазначаюць націскныя галосныя:
1) стат**у**я, в**ы**падак; 4) садавін**а**, крапів**а**;
2) з**а**гадзя, знах**а**р; 5) н**е**куды, некат**о**ры.
3) ст**а**ры, адз**і**наццаць;

**А4.** Адзначце выпадкі, у якіх пры ўтварэнні патрэбнай формы адбываецца чаргаванне зычных гукаў:
1) ішоў па (дарога); 4) прысутнічаў на (з'езд);
2) паклаў у (бочка); 5) бінт у (кроў).
3) гуляў па (парк);

**А5.** Адзначце словы, у якіх пішацца літара ***а***:
1) лат..рэя; 4) кр..млёўскі;
2) кр..пасны; 5) ц..нтральны.
3) р..лігія;

**А6.** Адзначце словы, у якіх пішацца літара ***э***:
1) ц..мент; 4) р..корд;
2) р..сора; 5) Ч..чня.
3) інж..нер;

**А7.** Адзначце прыклады, у якіх пішацца ***ў*** (нескладовае):
1) за..ралам; 4) ла..рэат;
2) фа..на; 5) рыба-..юн.
3) рады..с;

**А8.** Адзначце словы, у якіх пішацца злучальная галосная ***я*** (інтэрфікс):
1) зме..лоў; 4) ален..водства;
2) зме..падобны; 5) жыцц..радасны.
3) бран..носец;

**А9.** Адзначце словы, у якіх пішацца ***ь*** (мяккі знак):
1) вішан..ка; 4) соцен..;
2) пен..сіянер; 5) дзес..ці.
3) абедз..вюма;

**А10.** Адзначце словы, у якіх пішацца апостраф:
1) сем..янін; 4) вераб..і;
2) салаў..і; 5) двукроп..е.
3) разал..ецца;

**А11.** Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:
1) (М, м)іхасёвы прыгоды;
2) (Г, г)родзеншчына;
3) (А, а)хілесава пята;
4) (Дз, дз)ень настаўніка;
5) (К, к)упалаўскія мясціны.

**А12.** Адзначце прыклады, у якіх слова пішацца разам (злітна):
1) сямі (гадовы) сын;
2) светла (зялёны) фон;
3) ультра (фіялетавыя) прамяні;
4) беларуска (польскі) слоўнік;
5) (грамадска) карысная праца.

**А13.** Адзначце прыклады, у якіх словы пішуцца праз дэфіс (злучок):
1) (паў) Мінска; 4) (дзе) нідзе;
2) (анты) гуманны; 5) (абы) якавы.
3) (паў) аркуша;

**А14.** Адзначце радкі, дзе ўсе словы з'яўляюцца сінонімамі:
1) дарога, гасцінец, шаша, бальшак;
2) кантроль, праверка, рэвізія, экзамен;
3) гаварыць, гаманіць, выступаць, галасіць;
4) лёгкі, даступны, свежы, бязважкі;
5) старанна, руплівa, дбайна, акуратна.

**А15.** Адзначце словазлучэнні, у якіх прыметнік ужываецца ў пераносным значэнні:
1) залатыя рукі; 4) людская плынь;
2) матуліны рукі; 5) светлая галава.
3) глыбокая плынь;

**А16.** Адзначце словы, у якіх на месцы кропак трэба ўставіць патрэбную літару:
1) міласэр..ны; 4) праяз..ны;
2) двухмес..ны; 5) балас..ны.
3) кантрас..ны;

**А17.** Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:
1) загор'е; 4) бясхлебіца;
2) змоладу; 5) назаўсёды.
3) узлесак;

**А18.** Адзначце назоўнікі, у якіх пішацца канчатак ***а(я)***:
1) луста (хлеб); 4) у глыб (акіян);
2) кілаграм (ячмень); 5) расшчапленне (атам).
3) бутэлька (квас);

**А19.** Адзначце сказы, у якіх дапушчаны граматычныя памылкі:
1) У парку маленькая смешная поні катала дзетак.
2) Сваю рукапісь малады аўтар даслаў у часопіс "Маладосць".
3) Міхась доўга спрачаўся з адвакатам Патапчыкавай.
4) Легкавое таксі хутка дамчала нас да вакзала.
5) Ля ўваходу вісела таблічка: "Асцярожна! У двары злая сабака".

**А20.** Адзначце радкі прыкладаў, у якіх правільна напісаны канчаткі назоўнікаў у творным склоне адзіночнага ліку:

1) Янкам Купалам, Змітраком Бядулем, Зосяй Савіч;

2) Сярожай Плаксай, Янкам Журбою, сіратой Алесяй;

3) Міхасём Тычынам, Пятром Глебкам, Кандратам Крапівой;

4) Мікітам Сарокам, Жэнем Хватам, старшынёй калгаса;

5) Петрусём Броўкай, Язэпам Пушчам, Вольгай Зязюляй.

**А21.** Адзначце прыметнікі, ад якіх нельга ўтварыць ступені параўнання:

1) строгі; 4) босы;

2) дрэнны; 5) лёгкі.

3) туманны;

**А22.** Адзначце лічэбнікі, у якіх на месцы кропак трэба пісаць ***ь*** (мяккі знак):

1) вас..мёра; 4) шэсц..дзесят;

2) сем..сот; 5) вас..мідзесяты.

3) дз..весце;

**А23.** Адзначце дзеясловы, якія ў 2-й асобе множнага ліку маюць канчаткі ***-аце, -яце***:

1) адрэзаць; 4) зайсці;

2) абвіць; 5) браць.

3) кінуць;

**А24.** Адзначце прыслоўі, якія пішуцца разам:

1) (у) далечыні; 4) (на) прадвесні;

2) (да) заўтра; 5) (на) памяць.

3) (а) поўначы;

**А25.** Адзначце сказы, у якіх ужываецца часціца ***ні***:

1) Вакол, куды (не, ні) кінь вокам, – збажына.

2) У начной цішыні (не, ні) чуваць было галасоў.

3) Ад перажытага хвалявання яна не магла (не, ні) рухацца, (не, ні) гаварыць, (не, ні) нават думаць.

4) То (не, ні) гул завірухі мяцежнай і (не, ні) рокаты ўпартага мора.

5) У гэты бок не даляталі (не, ні) смех, (не, ні) песні, (не, ні) гаворка.

**А26.** Адзначце словазлучэнні, у якіх сувязь паміж словамі – прымыканне:

1) чытаў лежачы; 4) наеўшыся кашы;

2) дзесьці збоку; 5) зроблены па-майстэрску.

3) пайшоў касіць;

**А27.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць працяжнік:

1) Звіняць пілы, гудуць тапарышчы, стогне дрэва___будуецца дом.

2) Запяеш па душы, дасі ўцехі гасцям___поўны гуслі насыплю дукатаў.

3) Раніца першага верасня выдалася хмурная і халодная___уначы ішоў дождж.

4) Разведка данесла___у вёсцы непрыяцеля няма.

5) Не паспеў аддыхацца, прыйсці ў нармальны стан___самалёт знік за гарызонтам.

**А28.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) У сенцах грукнулі дзверы___і пачуліся нечыя крокі.

2) Ужо даўно звечарэла___і ў хатах свяціліся вокны.

3) Угары ззяе месяц___ды мне не відаць яго твару.

4) Ляцяць на ветры косы ранняй восені___і кліча лісцяў жоўты сум зіму.

5) Вечарэла___і пахла кветкамі.

**А29.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы аддзяляюцца коскамі:

1) Паклон табе нізкі, што вяла мяне ***маці*** дарогай зямною.

2) Вы шуміце, шуміце нада мною ***бярозы*** калышыце, люляйце свой напеў векавы.

3) Не плач ***каханая*** і не журыся, а я прыеду ўвесну, як зацвітуць сады.

4) Мне ***Беларусь*** мая родная снілася часта на чужыне.

5) Што вам сніцца ***дні мае маладыя***.

**А30.** Выберыце правільны варыянт пастаноўкі знакаў прыпынку на месцы пропускаў:

Трафім уважліва ўглядзеўся ў пабялелы твар Марыны___і ў яго сэрцы разлілося цяпло замілаванасці да гэтай маладзіцы___не пабаялася___прайшла праз некалькі пастоў___каб прынесці звесткі пра варожы гарнізон___колькі кулямётных гнёздаў___дзе схаваны бранявік___у якіх будынках месцяцца салдаты.

1) коска, коска, коска, коска, коска, коска, коска.

2) коска, двукроп'е, коска, коска, коска, коска, коска.

3) коска, коска, коска, коска, двукроп'е, коска, коска.

4) коска, двукроп'е, коска, коска, двукроп'е, коска, коска.

**А31.** Адзначце правільны варыянт схемы афармлення і пастаноўкі знакаў прыпынку:

У цябе вялікія здольнасці да навукі сказаў настаўнік, звяртаючыся да Сцёпкі, і дадаў табе абавязкова трэба вучыцца далей.

1) "П – а, – П". 4) "П", – а. – П".

2) "П, – а, – п". 5) "П, – а: – п".

3) "П, – а: – П".

**А32.** Падумайце, у якім парадку трэба размясціць сказы, каб атрымаўся тэкст.

**Навагрудак**

1. Узнікненне горада адносіцца да XI стагоддзя і звязана з іменем кіеўскага князя Яраслава Мудрага. 2. Сёння Навагрудак – цэнтр раёна ў Гродзенскай вобласці. 3. А на самай высокай кропцы яе месціўся велічны замак, ад якога засталіся дзве напаўразбураныя вежы. 4. Навагрудак – першая сталіца старажытнай беларускай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага. 5. Таму, з якога боку ні пад'язджаеш да Навагрудка, дарога ідзе ўгару. 6. Размешчаны горад на вышынях Навагрудскай горнай грады. 7. За сваю амаль тысячагадовую гісторыю ён называўся і Ноўгародак, і Новагарадок, і Наваградак.

**Частка В**

**В1.** Знайдзіце памылковае напісанне слова і запішыце яго правільна:

1) акардэон; 4) цэрыманіял;
2) лінолеум; 5) інтэлігенцыя.
3) вінегрэт;

**В2.** Знайдзіце памылку ў лексічнай спалучальнасці слоў. Падбярыце да няправільна ўжытага слова паронім і запішыце яго ў пачатковай форме.

Мы ўключылі рубільнік, і стужка транспарціра аж пачала прагінацца, несучы ў вагон бясконцую плынь пшанічных зярнят.

**В3.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх лексічным значэннем. Запішыце правільныя адказы.

| | |
|---|---|
| А. Блёкату аб'есціся. | 1. Заблытаць, давесці да замяшання, заблытацца. |
| Б. Браць на цугундар. | 2. Драмаць седзячы ці стоячы, кляваць носам. |
| В. Збіцца з панталыку. | 3. Перастаць разумець, кеміць; здурнець. |
| Г. Табáку важыць. | 4. Спазніцца, прыйсці позна. |
| Д. У свіныя галасы. | 5. Прыцягнуць да адказнасці, пакараць, расправіцца. |

**В4.** Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі словамі і іх характарыстыкай:

| | |
|---|---|
| А. Плывец – плывун. | 1. Сінонімы. |
| Б. Жалезная каска – цікавая казка. | 2. Паронімы. |
| В. Згадзіцца – адмовіцца. | 3. Антонімы. |
| Г. Барацьба – змаганне. | 4. Амографы. |
| Д. Дзявочая каса – адшчадная каса. | 5. Амафоны. |

**В5.** Ад дзеяслова, што пададзены ў дужках, утварыце дзеепрыметнік і запішыце яго ў пачатковай форме.

Апознены месячык загарэўся залатым пажарам за тым панурым лесам, што стаяў з боку чыгункі, і павольна ўзнімаўся над (заспакоіць) зямлёю.

**В6.** Ад дзеяслова, што падаецца ў дужках, утварыце дзеепрыслоўе і запішыце асобна.

Дзверы загрукалі, пасля зарыпелі і, (разыходзіцца) насцеж, прапускалі ў начную цемру косы аранжавага святла.

**В7.** Устанавіце адпаведнасць паміж аднасастаўнымі сказамі і іх тыпамі. Адказы запішыце.

| | |
|---|---|
| А. Не сядзіцца ў хаце хлопчыку малому. | 1. Пэўна-асабовы. |
| Б. Сапраўднага сябра пазнаеш у бядзе. | 2. Няпэўна-асабовы. |
| В. Міхала нечакана выклікалі ў кантору. | 3. Абагульнена-асабовы. |
| Г. Люблю наш край – старонку гэту. | 4. Інфінітыўны. |
| Д. Не злічыць у небе зорачак. | 5. Безасабовы. |

**В8.** Вызначце тып маўлення і стыль тэксту.

**Музей песняра**

Музей Янкі Купалы быў адкрыты для наведвальнікаў 20 жніўня 1945 года. Спачатку месціўся ён некалькі гадоў у часовых будынках, пакуль у 1959 годзе было закончана будаўніцтва спецыяльнага музейнага дома на беразе Свіслачы, па вуліцы Янкі Купалы, дзе ў даваенныя гады ў доміку, падараваным урадам рэспублікі, жыў паэт. На жаль, домік згарэў у першыя дні вайны. У агні загінулі рукапісы, архіў, бібліятэка, асабістыя рэчы.

Але дзякуючы старанням жонкі Купалы – Уладзіславы Францаўны, была праведзена вялікая работа па зборы ацалелых і раскіданых па гарадах Савецкага Саюза матэрыялаў. І музей быў створаны, а жонка стала першым дырэктарам. Сёння ў музеі захоўваецца ўсё, што звязана з жыццём і творчасцю вялікага песняра Беларусі.

**АДКАЗЫ**

| | |
|---|---|
| А1 – 2, 5. | А21 – 3, 4. |
| А2 – 1, 3, 5. | А22 – 1, 4, 5. |
| А3 – 2, 4, 5. | А23 – 1, 2, 5. |
| А4 – 1, 4, 5. | А24 – 1, 3, 4. |
| А5 – 1, 2, 4. | А25 – 1, 3, 5. |
| А6 – 1, 4, 5. | А26 – 1, 2, 3, 5. |
| А7 – 4, 5. | А27 – 1, 2, 5. |
| А8 – 1, 3, 4, 5. | А28 – 2, 3, 4. |
| А9 – 1, 4, 5. | А29 – 1, 2, 3, 5. |
| А10 – 1, 4, 5. | А30 – 4. |
| А11 – 1, 2, 4. | А31 – 3. |
| А12 – 1, 3. | А32 – 4, 1, 7, 6, 3, 5, 2. |
| А13 – 1, 4. | В1 – цырыманіял |
| А14 – 1, 2, 5. | В2 – транспарцёр |
| А15 – 1, 4, 5. | В3 – А3Б5В1Г2Д4 |
| А16 – 3, 5. | В4 – А2Б5В3Г1Д4 |
| А17 – 1, 2, 3, 4. | В5 – заспакоены |
| А18 – 1, 4, 5. | В6 – разыходзячыся |
| А19 – 1, 2, 5. | В7 – А5Б3В2Г1Д4 |
| А20 – 1, 3, 4. | В8 – апісанне публіцыстычны |

Падрыхтаваў **Уладзімір ДЗІСКО**.

*У дапамогу абітурыентам*

# НОВЫЯ ДАПАМОЖНІКІ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ

Значную дапамогу ў вучэбна-метадычным забеспячэнні адукацыйнага працэсу ў навучальных установах нашай краіны аказвае выдавецтва "Аверсэв". Ужо больш за дзевяць гадоў яно спецыялізуецца на выданні вучэбнай і метадычнай літаратуры амаль па ўсіх школьных прадметах, у тым ліку па беларускай мове і літаратуры. Аўтарамі гэтых выданняў з'яўляюцца вядомыя ў рэспубліцы вучоныя, метадысты, лепшыя настаўнікі. Дзякуючы іх прафесіяналізму вучэбна-метадычная літаратура выдавецтва "Аверсэв" атрымала высокую ацэнку педагагічнай грамадскасці, карыстаецца попытам у настаўнікаў, вучняў, бацькоў.

Так, у 2008 г. у серыі "Школьнікам, абітурыентам, навучэнцам" запланавана выданне пяці новых і надзвычай патрэбных дапаможнікаў для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай мове, чатыры з якіх маюць агульны падзагаловак **"Тэматычны трэнажор"**. У дапаможніках **"Беларуская мова: тэматычны трэнажор: марфемная будова слова і словаўтварэнне: марфалогія і правапіс: для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання",** аўтарамі якога з'яўляюцца А. І. Калечыц, А. К. Пекач, Т. Я. Старасценка, **"Беларуская мова: тэматычны трэнажор: лексікалогія: фразеалогія: асновы стылістыкі: для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання"** аўтараў П. А. Міхайлава і С. І. Фацеевай, **"Беларуская мова: тэматычны трэнажор: фанетыка: арфаэпія: арфаграфія"** аўтараў П. А. Міхайлава, А. К. Пекач, **"Беларуская мова: тэматычны трэнажор: сінтаксіс: пунктуацыя"** аўтараў А. І. Калечыц, П. А. Міхайлава, Т. Я. Старасценкі, С. І. Фацеевай, А. К. Пекач змешчаны заданні ў форме тэстаў па ўсіх раздзелах школьнага курса беларускай мовы, а ў абагульненым дапаможніку **"Беларуская мова: тэставы трэнажор"** аўтараў А. І. Калечыц, П. А. Міхайлава, Т. Я. Старасценкі, С. І. Фацеевай, А. К. Пекач прадугледжана паэтапная тэматычная падача матэрыялу па ўсім школьным курсе, што будзе спрыяць інтэнсіўнаму паўтарэнню і трэнінгу, асабліва напярэдадні праходжання тэсціравання.

Пры падрыхтоўцы дапаможнікаў аўтарскімі калектывамі прааналізаваны матэрыялы Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў па цэнтралізаваным тэсціраванні за 2003 – 2007 гады.

У дапаможніках прапануецца па некалькі варыянтаў тэстаў. Так, напрыклад, кожны тэст у дапаможніку "Беларуская мова: тэматычны трэнажор: марфемная будова слова і словаўтварэнне: марфалогія і правапіс: для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання" складзены ў трох варыянтах, у дапаможніку "Беларуская мова: тэматычны трэнажор: лексікалогія: фразеалогія: асновы стылістыкі: для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання" – у чатырох варыянтах.

Кожны тэст прадугледжвае заданні як закрытага тыпу (частка А), так і адкрытага тыпу (частка В), падрыхтаваныя на новым і цікавым моўным матэрыяле. Да кожнага задання часткі А прапануецца пяць варыянтаў адказаў, з якіх правільнымі могуць быць ад аднаго да чатырох.

Адказы да ўсіх тэстаў падаюцца ў канцы дапаможнікаў.

Дапаможнікі, складзеныя вядомымі ў рэспубліцы вучонымі-мовазнаўцамі, адпавядаюць патрабаванням дзеючых навучальных праграм па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў і прызначаны для паўтарэння, сістэматызацыі ведаў, самакантролю, самастойнай падрыхтоўкі выпускнікоў агульнаадукацыйных устаноў і абітурыентаў да вельмі адказнага ў іх жыцці іспыту – цэнтралізаванага тэсціравання.

Выкананне тэстаў старшакласнікамі і абітурыентамі дапаможа уніфікаваць уменні і навыкі, што ў сваю чаргу дасць магчымасць пазбегнуць памылак пры праходжанні цэнтралізаванага тэсціравання.

Акрамя гэтага, дапаможнікі могуць быць выкарыстаны настаўнікамі беларускай мовы на ўроках пры выкладанні адпаведных тэм школьнага курса беларускай мовы, студэнтамі філалагічных факультэтаў, слухачамі падрыхтоўчых аддзяленняў вышэйшых навучальных устаноў.

Шаноўныя калегі, не забудзьце паведаміць вашым вучням, іх бацькам пра выданне новых дапаможнікаў для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання і магчымасць іх набыцця ў кнігарнях нашай краіны.

Тры названыя дапаможнікі з серыі "Тэматычны трэнажор" ужо можна набыць у кнігарнях, дапаможнікі "Беларуская мова: тэматычны трэнажор: сінтаксіс: пунктуацыя" і "Тэставы трэнажор" з'явяцца ў продажы ў канцы мая гэтага года.

**Тамара САЎЧУК.**



**КАЛІ ЗАКОНЧЫЎСЯ ЎРОК**

*Да Дня Перамогі*

Вера БУЛАНДА

# “МЫ ЗАХАВАЕМ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ МІР!”

## СЦЭНАРЫЙ ВЕЧАРЫНЫ, ПРЫСВЕЧАНАЙ ДНЮ ПЕРАМОГІ

Да Дня Перамогі неабходна загадзя, магчыма, і ўвесь навучальны год сур’ёзна рыхтавацца, бо гэта не проста свята, а дзень памяці загінуўшых, дзень перамогі над фашызмам, дзень сапраўды са слязамі на вачах, слязамі радасці і горычы страт. Непасрэдных удзельнікаў ваенных паходаў з кожным годам становіцца ўсё менш і менш. Тых, хто нарадзіўся ў гады вайны, таксама менее на нашай шматпакутнай зямлі. Пайшлі ад нас і многія жанчыны-ўдовы, якія не дачакаліся з фронту сваіх мужоў. І таму да мерапрыемстваў, прысвечаных Дню Перамогі, неабходна паставіцца з вялікай увагай. На жаль, часам даводзіцца назіраць, як запрошаныя ветэраны разгублена пазіраюць вакол сябе, бачаць смяшлівыя твары вучняў, абыякавыя позіркі настаўнікаў. Нікому не патрэбна такая сустрэча, дзе пра ветэрана ніхто нічога не ведае, апрача хіба яго імя.

Вечарына, ранішнік ці агеньчык, прысвечаныя гэтай святой даце, абавязкова атрымаюцца, калі ўся падрыхтоўка пройдзе на належным узроўні: будуць працаваць следапыты, здымацца школьныя фільмы, арганізуюцца фотавыставы, конкурс на найлепшае сачыненне “Вайна ў лёсе маёй сям’і”. Можна падрыхтаваць і вусныя часопісы, і праграмы-анонсы, і літаратурныя чытанні на разнастайныя тэмы: “Не бывае ў вайны эпілога”, “Шляхі-дарогі франтавыя”, “Да перамогі ішоў салдат”, “Дзень нашай памяці трывожнай”…

Наш сцэнарый – гэта прыкладны літаратурна-музычны мантаж, які можна выкарыстаць цалкам або ўнесці ў яго свае карэктывы, дапрацаваць у залежнасці ад аўдыторыі і тых магчымасцяў, якімі валодае школа. Усё, што робіцца шчыра і ад сэрца, будзе пасеяна надзейным зярняткам у маладыя душы і абавязкова прарасце ўдзячнай памяццю будучых пакаленняў.

*З левага боку сцэны стаіць стэлаж з кнігамі на ваенную тэматыку з надпісам – своеасаблівым эпіграфам: “Не бывае ў вайны эпілога”. С. Гаўрусёў. З правага боку сцэны размешчаны вялікі “Каляндар Перамогі”. На падлозе каля календара ляжыць салдацкая каска, у якую ў час кампазіцыі ў гонар герояў будуць класціся кветкі. Дзяўчынкі ў ярка-жоўтых сукенках перагортваюць лісток календара, на першай старонцы якога мы бачым дату “21 чэрвеня 1941 года”. Пад мелодыю факстрота “Рыа-рыта” на сцэне танцуюць пары маладых людзей. Праз хвіліну перагортваецца другая старонка з датай “22 чэрвеня 1941 года”, мелодыя прыглушаецца, пары працягваюць танцаваць, прыслухоўваючыся да нязвычных гукаў далёкай кананады, стрэлаў і выбухаў. Калі гэтыя гукі нарастаюць, абрываецца мелодыя, маладыя людзі развітваюцца пад песню “Мой милый, если б не было войны…” (словы І. Шаферана, музыка М. Машкова).*

**1-я дзяўчынка-сонейка.**
На лічбу 22 світанне
Перагарнула каляндар, –
Дзень летняга сонцастаяння,
Дзень цішыні і летніх мар...
**2-я дзяўчынка-сонейка.**
Дзень васількоў, травы мурожнай
І спелай чырвані суніц,
Дзень нашай памяці трывожнай
З далёкім водбліскам зарніц…

**В. Гардзей.** “На лічбу 22…”

*Па сцэне мітусіцца ліхтарнае асвятленне, юнакі, развітаўшыся, бяруць з падлогі ў глыбіні сцэны рэчавыя мяшкі, дзяўчаты накідваюць на плечы хусткі, у рукі бяруць вузлы, выходзяць на авансцэну, рухаюцца ў пантаміме, нібы спяшаюцца, суровыя позіркі скіраваны ўдалячынь.*

**1-ы чытальнік.**
На ўсход раптоўна рынула вайна,
І заблытала бежанцаў дарогі.
Брыдуць, брыдуць, а збажына
Людзям з жальбою кланяецца ў ногі.
**1-я чытальніца.**
Сцябліны, што трымаюць каласы,
Як струны пад смычком, галосяць,
З прыфрантавой грымотнай паласы
Зацішша у вятроў гарачых просяць.

*Пантаміма рэзка абрываецца, юнакі ўзнімаюць да вачэй далоні.*

**2-і чытальнік.**
Спыніўся рух, і да вачэй далонь
Дзядзькі ўзнімаюць моўчкі на хвілінку –
Бяжыць у жыта ад сяла агонь
Спраўляць апусташальныя зажынкі.
**2-я чытальніца.**
І людзі ў шлях далей нясуць бяду,
Агорнутыя жудасцю і жахам,
І каласы зрываюць на хаду,
Не зжатыя пакуль яшчэ пажарам.
**3-і чытальнік.**
Яны, ў нязнанасць гнаныя вайной,
Жывуць надзеяй:
смерць чужынцаў скосіць,

І вернецца жыццё, і зноў ралля вясной
Зярнят у рупных сейбітаў папросіць.

**М. Калачынскі**. Бежанцы.

*Дэманструецца фрагмент з кінафільма "Звычайны фашызм".*

**Вядучы.**
Не бывае ў вайны эпілога –
Памяць чорна заносіць крыло.
Замест поля – дзічэе аблога,
Божа мой, як усё зарасло!

**С. Гаўрусёў.** "Не бывае ў вайны эпілога…"

**Вядучая.**
Нас па галовах секлі зоркі
Чэргамі –
У чэрвені,
У вечаровым чэрвені…
Смерць хадзіла
Гаспадаром.

**1-я дзяўчынка-сонейка.**
Быў крык,
Быў плач,
Быў гром.
Дол скалануўся ад груку.
Уцякаючы ад пагоні,
Стрымгалоў праскакаў па бруку
Конь без конніка,
Як агонь,
Неба,
Выючы нема,
Цэлілася здаля…

**2-я дзяўчынка-сонейка.**
Няўжо ты мне здрадзіла, неба?
Дай мне ратунак, зямля!
Неба – якое відовішча! –
Зеўрала россыпам дзір.

**Вядучы.**
Няма ад вайны сховішча...

**Вядучая.**
Адно ад вайны сховішча...

**Разам.**
Мір.

**П. Макаль.** "Нас па галовах секлі зоркамі..."

*Фонам гучыць мелодыя песні А. Аляксандрава на словы Л. Ашаніна "Свяшчэнная вайна".*

**1-ы чытальнік.**

Суровым экзаменам на мужнасць і трываласць нашага народа стала Вялікая Айчынная вайна. 1113 жахлівых дзён і начэй працягвалася вайна на тэрыторыі Беларусі. Усе вогненныя дні і ночы наша краіна аказвала небывалае ў гісторыі чалавецтва супраціўленне агрэсару.

**1-я чытальніца.**

Увесь гэты час вораг не ведаў спакою ні днём, ні ноччу. Зямля гарэла пад нагамі вылюдкаў-захопнікаў і іх хаўруснікаў, ляцелі ў паветра камунікацыі і склады, гарэлі на зямлі варожыя самалёты і танкі.

**Вядучы.**

63 гады прайшло з дня перамогі над гітлераўскім фашызмам, а жывыя ветэраны не могуць забыцца на жудаснае ліхалецце, перабіраюць у памяці кожную хвіліну, гартаюць альбомы са старымі выцвілымі ад часу фотаздымкамі.

**Унук.**

Дзядуля, ты вайну прайшоў аж да Берліна,



***Вера Аляксандраўна Буланда*** *– педагог. Закончыла Мінскі педагагічны інстытут імя А. М. Горкага (1977). Настаўнічала на Віцебшчыне і Міншчыне. Выдала кнігі паэзіі "Мне не жыць без цябе" (1977), "Цыганскія кастры" (2001).*

Не раз паранены, без памяці ляжаў,
Расказваў шмат дачцэ сваёй і сыну,
Хачу, каб ты і мне што-небудзь расказаў.

**Ветэран** *(з альбомам у руках).*

*Для большай праўдзівасці ролю ветэрана лепш сыграць настаўніку або каму-небудзь з бацькоў.*

Аб перажытым
Заўсёды лепш расказваюць
Нашчадкі.
А нам, аслеплым ад агню,
Аглухлым ад грымот
І анямелым ад пакут вайны,
Знаць, не знайсці
Патрэбных слоў,
А мо і іх няма,
Бо з усіх моў,
Існуючых на свеце,
Ніводная не здольна перадаць
Ні горычы руін і папялішчаў,
Ні цішыні магіл,
Ні гора, ні пакут мільёнаў,
Ні велічы расплаты справядлівай
І Перамогі нашай.

**М. Танк.** "Аб перажытым…"

**Унук.**
І ўсё-такі, прашу цябе, дзядуля,
Распавядзі хоць колькі пра вайну,
Пра крэпасць Брэсцкую, не раз мы чулі
Гісторыю герояў не адну.

*На працягу аповеду пра Брэсцкую крэпасць і яе герояў гучыць "Рэквіем" Дз. Кабалеўскага.*

**Ветэран.**

Гэта пачалося на досвітку 22 чэрвеня 1941 года. Гітлераўскія войскі раптоўна напалі на нашу краіну. У тую ж раніцу на Брэсцкую крэпасць і на горад абрынуўся агонь варожай артылерыі. З неба пасыпаліся бомбы. Але авалодаць крэпасцю з ходу, як меркавала нямецкае камандаванне, ворагу не ўдалося. Гітлераўскія часці, якія фарсіравалі Буг і ўварваліся ў Брэст, на кожным кроку сустракалі жорсткае супраціўленне.

Мужна абаранялася Брэсцкая крэпасць. Яе нешматлікі гарнізон змагаўся да апошняга. Гітлераўцы прымянілі тут сваё самае новае ўзбраенне. Звышмагутныя гарматныя ўстаноўкі пасылалі адзін за адным бетанабойныя і фугасныя снарады.

У абаронцаў крэпасці не хапала боепрыпасаў, не было ежы і вады. Але савецкія воіны не раз кідаліся ў контратаку, каб у рукапашнай бойцы адкінуць фашысцкія войскі назад.

**Унук.**

*Бярэ з паліцы кнігу "Брэсцкая крэпасць" С. Смірнова. На экран адначасова праецыруюцца выявы Холмскіх і Цярэспальскіх варотаў напярэдадні вайны, казематы ў разбураных казармах, карціна П. Крываногава "Абаронцы Брэсцкай крэпасці", фотаздымкі герояў цытадэлі. "Рэквіем" узмацняецца.*

Трэці дзень не ўдавалася дастаць вады. Зусім побач, за вокнамі казармаў, блішчэў Мухавец. На тым беразе нямецкія кулямётчыкі насцярожана сачылі за нашай абаронай. Варта было каму-небудзь толькі выглянуць у амбразуру – адразу некалькі кулямётаў пачыналі ўзахлёб біць па гэтым месцы. Ноччу на валах за ракой запальваліся пражэктары, наведзеныя на казармы, і кожныя трычатыры хвіліны ў паветра ўзлятала ракета – было светла як днём.

**Вядучая.**

Ужо дзесятка паўтара смельчакоў заплацілі жыццём за спробу спусціцца па крутым схіле да вады. Смага станавілася невыноснай. Але калі тыя, хто заставаўся ў страі, яшчэ цярпелі, то параненыя страшна мучыліся. Цяжка было чуць іх хрыплыя стогны: "Братцы! Вады! Вадзічкі! Хоць кропельку!"

*"Рэквіем" прыглушаецца, на экран праецыруюцца фотавыявы Вячаслава Меера, ракі Мухавец, развалін царквы ў двары цытадэлі.*

**Вядучы.**

Вячаслаў Меер быў цярплівым чалавекам і гераічна пераносіў усе нягоды, але спакойна бачыць пакуты раненых ён не мог. Гэта было днём, у хвіліну зацішша. Паранены лейтэнант 84-га палка ў трызненні прасіў піць, і Меер не вытрымаў, схапіў кацялок, імгненна збег па схіле да вады і, асцярожна трымаючы яго ў дзвюх руках, падняўся зноў уверх. Ці немцы на гэты раз не заўважылі, ці іх здзівіла дзёрзкасць раптоўнай вылазкі, але Меер паспеў дабегчы да акна і працягнуў кацялок таварышам.

**Ветэран.**

І ў гэты самы момант з таго берага раздалася чарга. Рукі Меера быццам падламіліся. Таварышы ўцягнулі яго ў памяшканне. Куля трапіла ў патыліцу, але ён быў яшчэ ў прытомнасці. "Ваду… раненым…" – паспеў сказаць, і блакітныя вясёлыя вочы старшыны сталі мутна-шклянымі. Ён памёр.

**Унук.**

Кніга "Брэсцкая крэпасць" Сяргея Смірнова падае нам шмат імёнаў і подзвігаў.

*На экран праецыруюцца фотаздымкі абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Называючы імёны герояў, удзельнікі кампазіцыі кладуць па кветцы ў каску.*

**1-ы чытальнік.**

Гэта маёр Гаўрылаў.

**2-і чытальнік.**

Лейтэнант Ягораў.

**1-я чытальніца.**

Камісар Фамін.

**2-я чытальніца.**

Капітан Зубачоў.

**3-і чытальнік.**

Чырвонаармеец Бяссонаў.

**3-я чытальніца.**

Начальнік пагранзаставы лейтэнант Кіжаватаў.

**Ветэран.**

Часцей, часцей прыпамінай
Імёны паўшых смерцю храбрых
За родны край, наш мілы край, –
Каб над зямлёй, што млела ў ранах,
Плыў гэты сіні-сіні ранак,
Цвіў гэты белы-белы май,–
Часцей, мой друг, прыпамінай!

**Н. Гілевіч.** "Часцей, часцей прыпамінай…"

*У выкананні хору гучыць "Песня аб Брэсцкай крэпасці"* на словы А. Лазнявога, музыку У. Алоўнікава, або саліст, які адначасова з'яўляецца ўдзельнікам кампазіцыі, выконвае песню "Героям Брэста"** на словы В. Левіна, музыку Л. Захлеўнага.*

**Вядучая.**

Што ведаем увогуле пра вайну, якая была тут, побач? Толькі з часам мы даведаліся аб мастах-пераправах цераз Днепр, што будаваліся з жывых людзей. Аб тым, што перажылі людзі ў канцлагерах. Дзякуй аўтарам кніг "Мы з вогненнай вёскі", "Доўгія вёрсты вайны", "Ніколі не забудзем", з якіх мы даведаліся, што і на роднай зямлі, і ў канцлагерах смерці нямецкія каты жудасна і жорстка здзекаваліся з дарослых і дзяцей. Вось што распавядаюць самі дзеці.

*На сцэну выходзяць дзяўчынкі 10-12 гадоў у просценькіх сукенках. На экран праецыруюцца ў адпаведнасці з аповедам карціны з бежанцамі на дарогах, спаленыя вёскі, спалоханыя твары дзяцей, устрывожаныя – жанчын, цягнікі з палоннымі, канцлагеры смерці з нарамі, запоўненымі знямоганымі вязнямі, печы крэматорыяў. Можна таксама выкарыстаць рэпрадукцыі з цыкла "Лічбы на сэрцы" М. Савіцкага.*

**Каця.**

Калі фронт стаў набліжацца да Бягомля, сакратар райкама партыі сказаў маме...

**Вядучы.**

Муж ваюе, а ты выязджай. Няма чаго табе тут рабіць з чацвярыма дзецьмі.

**Вядучая.**

А на чым я паеду?

**Вядучы.**

Я дапамагу дастаць каня.

**Каця.**

Каля запаведніка немцы перарэзалі нам шлях і забралі каня. Далей не было на чым ехаць, і мы пешшу вярнуліся ў Бягомль. Але там жыць доўга не прыйшлося... Пайсці да партызан мы таксама не паспелі: апоўдні наляцелі немцы і акружылі вёску. У вёсцы былі партызаны. Між імі і немцамі завязаўся бой. Мая мама была паранена ў руку і нагу.

**1-я чытальніца.**

Людзей сабралі ў адно месца, пералічылі, пад канвоем прыгналі ў Талачын і пасадзілі ў турму.

**1-ы чытальнік.**

У невялікім памяшканні змяшчалася каля трохсот чалавек. Людзі задыхаліся. Есці давалі адзін раз у суткі, і то нейкага пойла. Каля дзвярэй стаяла бочка з вадой.

**Міля.**

Тыдзень, праведзены ў талачынскай турме, здаўся годам. Потым нас перавялі ў мінскі канцлагер. У

---

*Беларусь у песні. – Мінск, 1988. – С. 83.

**Тамсама. – С. 116.

ім было яшчэ горш. Людзей зусім марылі голадам. Пачаліся хваробы. Хворых вывозілі за горад у лес і расстрэльвалі.

**Каця.**

Так загінулі мая бабуля, цётка Саша і іншыя знаёмыя з нашага мястэчка. Пасля ўсіх пагналі на станцыю.

**Алеся.**

Нас пасадзілі ў таварны вагон, дзверы зацягнулі дротам і строга загадалі сядзець і не варушыцца. Пры гэтым было аб'яўлена, што калі ўцячэ хоць адзін чалавек, то ўвесь састаў паляціць пад адхон.

**Ярынка.**

На шостыя суткі цягнік спыніўся. Куды мы прыехалі, ніхто не ведаў. Некалькі гадзін нас не выпускалі з вагонаў. Потым загадалі выходзіць. Нас пастроілі ў калону па пяць чалавек і пагналі. Ноч была цёмная, ішоў дождж з градам. Мы курчыліся ад холаду, бо нашу вопратку адабралі яшчэ ў Мінску.

**Міля.**

Спачатку мы ішлі полем, потым увайшлі ў лес. Пасярод яго, недалёка ад дарогі, мы ўбачылі вогнішча, на якім нямецкія каты спальвалі дзяцей, як дровы, кідалі ў агонь. Дзеці страшэнна крычалі: "Мамачка, ратуй нас! Я жыць хачу! Не трэба паміраць!"

**Алеся.**

Некаторыя маці не вытрымлівалі і тут жа падалі без прытомнасці, іх немцы забівалі таксама. Астатнія крычалі так, што рабілася страшна, і мы дрыжалі, нібы на марозе.

**Ярынка.**

На ўскраіне лесу мы ўбачылі крэматорыі, вялікія, падобныя на фабрыку, будынкі з высокімі круглымі комінамі. З комінаў вырываліся клубы сівога дыму і часам шугала полымя. На зямлі стаяў страшэнны смурод. Пахла гарам. Тут мы здагадаліся, што трапілі ў лагер, дзе спальваюць людзей.

**Каця.**

Убачыўшы першы раз гэтае полымя, я крыкнула: "Мамачка, пажар!" Але полымя хутка згасла. Мая сяброўка Міля Янушэўская, якая ішла побач, сказала...

**Міля.**

Каця, нас адлучаць ад дарослых і спаляць на тым самым вогнішчы, на якім спальвалі дзяцей.

**Каця.**

Няўжо нас вядуць на смерць? Мне страшна, Міля, я жыць хачу.

**Міля.**

За што, скажы, за што нас вядуць на смерць, мы ж нічога дрэннага не зрабілі…

**Міля.**

Будынак крэматорыя быў агароджаны калючым дротам. Нам загадалі спыніцца. Гадзіны тры мы стаялі без руху. Калі ўспыхвала полымя, мы здагадваліся, што гэта кідалі ў агонь людзей.

**Каця.**

Праз некалькі хвілін падышоў тоўсты пажылы немец-эсэсавец і загадаў усім распранацца... З крыкам і плачам жанчыны і дзеці пачалі скідаць вопратку. Тых, хто не хацеў распранацца, немец біў палкай. Многія, усё яшчэ не верачы, што іх гоняць на верную смерць, звязвалі сваю вопратку ў клуначкі і клалі збоку, у сушэйшае месца.

**Міля.**

Мы ўвайшлі ў сырое і цёмнае, без вокнаў, памяшканне. Сцены і падлога ў ім былі цэментавыя. Холад хапаў за ногі, зрабілася яшчэ страшней. Я з жахам падумала: "Вось-вось настане мой канец, і больш я нічога не ўбачу".

**Ярынка.**

Мінуўшы адзін пакой, увайшлі ў другі. Тут жанчынам пачалі абстрыгаць валасы і кідаць у кучу. Такіх куч было некалькі.

**Алеся.**

У трэцім пакоі дзве немкі ў чорных халатах змазвалі нам галовы нейкай смярдзючай вадкасцю. Потым па адной сталі мы заходзіць у памяшканне, з якога ўжо траплялі ў печ крэматорыя. Перад уваходам стаяла вялікае карыта з якойсьці густой сліззю. Кожны з нас вымушаны быў памазаць ногі да каленяў.

**Каця.**

Калі памяшканне аказалася бітком набітым людзьмі, дзверы за намі зачыніліся. Падняўся страшэнны плач, енк.

**Алеся.**

Раптам я адчула, як падлога пад намі зварухнулася і пачала нахіляцца. Унізе, збоку, мы ўбачылі агонь – гэта і была печ крэматорыя, у якой спальвалі людзей. Тыя, што стаялі з таго краю, з крыкам звaліліся ўніз. Мы таксама не маглі ўтрымацца на слізкіх нагах і пачалі пасоўвацца.

**Ярынка.**

Але ў гэты час здарылася тое, чаго ніхто не чакаў. Падлога пачала ўзнімацца. Калі яна выраўнялася, расчыніліся дзверы і ў памяшканне ўвайшлі камендант і той самы немец, які прымушаў нас распранацца. Камендант па-нямецку нешта сказаў тоўстаму.

**Каця.**

Нас аблілі халоднай вадой, якая лілася аднекуль зверху. Некаторыя жанчыны так сасмяглі, што разяўлялі раты і з прагнасцю пілі гэтую брудную халодную ваду. У асобнай зале ўсіх нас аглядалі і ставілі кляймо. У мяне на левай руцэ, ніжэй ад локця, быў зроблены нумар 79645, у мамы – 79646, а ў Мілі – 79644.

**Алеся.**

Недалёка ад лагера была сажалка. Немцы прымушалі зняволеных залазіць у сцюдзёную ваду і вядзерцамі пераліваць яе ў канаву, а потым з канавы – назад у сажалку. За найменшае непаслушэнства жорстка збівалі.

**Ярынка.**

Аднойчы ў адзінаццаць гадзін дня навічкоў павялі ў "рывір" – бальніцу. Сярод нас было некалькі зусім маленькіх дзетак – па два-тры гады, не больш. Іх павялі ў асобную палату. Потым запрасілі мяне. Там распранулі і павялі да стала, я ўпіралася, плакала. Немка і перакладчыца сілком паклалі мяне на стол. Рукі, ногі, галаву прывязалі гумавымі жгутамі.

**Каця.**

Крыві бралі шмат, і многія дзеці паміралі. У канцы 1944 года да нас дайшлі весткі, што Чырвоная Армія падыходзіць да Асвенціма. У лагеры паднялася паніка. Немцы пачалі паліць дакументы, баракі, узрывалі крэматорыі, выводзілі людзей. Тых, хто не мог ісці, расстрэльвалі.

**Вядучы.**

"Нас тут было чатыры міліёны!" –

Крычыць жахлівы надпіс са сцяны.
“Усім, усім падпальшчыкам вайны
На ўсе вякі мы шлём свае праклёны!”
**Ярынка.**
“Нас з’еў агонь – чатыры міліёны
Мужчын, жанчын, дарослых і дзяцей”.
**Алеся.**
“Скажыце: дымам з вогнішча касцей
Сягоння свет ужо не заімглёны?”
**Каця.**
“Скажыце – мёртвыя, мы хочам знаць:
З жаночых кос, як таннай сыравіны,
Ужо не ткуць сягоння мешкавіны...”
**Міля.**
“І дываноў, каб ногі выціраць?
А каб мільёнамі не памірaць –
Вы знаеце, што вы рабіць павінны?”

**Н. Гілевіч.** Асвенцім.

*Дзеці нясуць у каску некалькі кветак, аб’яўляецца ХВІЛІНА МАЎЧАННЯ.*

**Вядучая.**
Дык вось што з табою хацелі зрабіць,
Любоў мая, гордасць і вера!..
Аб гэтым патомкаў прашу не забыць
На сто пакаленняў уперад.
**Міля.**
Які нечуваны чакаў прыгавор!
Прымусіўшы гвалту скарыцца,
Тры чвэрці адправіць на голад і мор,
А рэшту – хрысціць у арыйцаў.
**Каця.**
Тры чвэрці адправіць за тысячу вёрст
Ад гоняў, дзе й вецер быў родны,
Каб нават памерці да дзедаўскіх гнёзд
Вярнуцца не мог аніводны.
**Алеся.**
А рэшту пакінуць, каб неслі крыжы,
Каб самі магілу капалі
Для скарбаў тваёй неўміручай душы,
Для сонечных песень Купалы...
**Вядучы.**
Каб сёння, праз некалькі год усяго,
Нявольнік і раб на Радзіме,
Не мог я маленькага сына свайго
Па продку назваць нашым імем.

**Н. Гілевіч.** Любоў мая, гордасць і вера.

**Унук.**
Прыпамінай часцей, мой друг,
Імёны тых, што ўсё зрабілі –
Вышэй усіх тваіх заслуг,
Што, як і ты, да слёз любілі
Маністы ўвосень на рабіне
І ў ліпкіх смолках майскі луг, –
Не забывай пра іх, мой друг!

**Н. Гілевіч.** “Часцей, часцей прыпамінай...”

**Вядучы.**
Сёння ў нас у зале прысутнічаюць людзі розных пакаленняў. Тут і ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, і людзі, чыё дзяцінства выпала на гады ваеннага ліхалецця, і тыя, хто нарадзіўся пасля вайны, і маладыя, для каго вайна – ужо даўно гісторыя…

*Зачытваецца найлепшае конкурснае сачыненне на тэму “Вайна ў лёсе маёй сям’і”, даецца слова ветэранам, або ідзе кароткі аповед пра іх ваеннае жыццё і подзвігі.*

**2-і чытальнік.**
Суровы прыпомніцца шлях
І тыя пякельныя мукі…
Гараць медалі на грудзях,
І вас абдымаюць унукі.
**3-я чытальніца.**
За подзвіг вам шчыра яны
Гавораць удзячныя словы...
**3-і чытальнік.**
І праўнуку – рэхам вайны
Гром першы ў нябёсах вясновых.

**А. Нафрановіч.** Ветэранам мінулай вайны.

*Дзеці падносяць кветкі ветэранам.*

*Харэаграфічная група выконвае кампазіцыю пад музыку песні “Майскі вальс” (словы М. Ясеня, музыка І. Лучанка)*.*

**Унук.**
Я сёння даведаўся многа,
Скажы, дзядуля, якой
Была тады Перамога,
Калі закончыўся бой?

*Дзяўчынкі-сонейкі перагортваюць каляндар, на старонцы якога мы чытаем “9 мая – Дзень Перамогі”.*

**Ветэран.**
Яна была ў лінялай гімнасцёрцы,
І ногі да крыві ў яе нацёрты,
Яна прыйшла, пастукалася ў хату,
Сустрэла маці госцю ля парога.

*Праз залу ідзе жанчына ў салдацкай гімнасцёрцы, з мікрафонам у руках, падымаецца на сцэну.*

**Перамога.**
Служыў твой сын са мной – сягоння свята,
І я прыйшла, завуся Перамога.
**1-я дзяўчынка-сонейка.**
Быў чорны хлеб святлей ад светлых дзён,
І слёзы больш салёныя за соль.
**2-я дзяўчынка-сонейка.**
І сто сталіц крычалі, білі ў звон,
Ў далоні пляскалі і танцавалі...
**Міля.**
І дзве кабеты праз пакутны боль
Сядзелі ў хаце ціха і маўчалі.
**Каця.**
Якія цяжкія за спінаю дарогі...
**Алеся.**
І лёсу невыносна-страшны вір.
**Ярынка.**
Шчаслівы самы дзень – Дзень Перамогі...
**Разам.**
Мы захаваем для нашчадкаў мір!

*Усе ўдзельнікі кампазіцыі выходзяць на сцэну, жанчына-спявачка, што ў ролі Перамогі, выконвае песню Д. Тухманава “Дзень Перамогі”, прыпеў якой падхопліваюць усе прысутныя: і госці, і артысты.*

*Вядучыя запрашаюць ветэранаў у “Гасцёўню”, дзе ў цёплай, нязмушанай атмасферы прагучаць іх любімыя мелодыі, магчыма, адбудзецца частаванне за салодкім сталом.*

---

* Гэтая песня змешчана на старонках “Роднага слова” ў сакавіцкім нумары за 2005 г. – *Заўвага рэд.*

Жанна ДРАГУН

# У НАШЫХ СЭРЦАХ – ПАМЯЦЬ АБ КОЖНЫМ ЧАЦВЁРТЫМ

**УРОК МУЖНАСЦІ**

**ХОД МЕРАПРЫЕМСТВА**

*Гучыць вакальна-сімфанічная паэма "Вечна жывыя" Г. Вагнера.*

*На сцэну выходзяць вядучыя.*

**1-ы вядучы**. Усім, хто не вярнуўся з крывавых палёў вайны, прысвячаецца.

**2-і вядучы**. Слаўным ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, якія выстаялі, перамаглі, далі свету жыццё і шчасце, прысвячаецца.

**3-і вядучы.** Пакаленню, якое ўступае ў жыццё, прысвячаецца.

*Гучыць песня "Свяшчэнная вайна". Паступова мелодыя заціхае.*

**1-ы чытальнік.**

Я чую голас несціханы.
Зямля мая мяне заве
І кроіць сэрца мне на раны,
Звініць, як звон касы ў траве.

**2-і чытальнік.**

Слоў няма, каб цяпер гаварыць,
Яны анямелі.
Слёз няма, каб наўзрыд праліць,
Яны скамянелі.
А навокал – вайна.

**3-і чытальнік.**

Не, не будзе мой край любімы
Пад фашысцкай пятою стагнаць.
Беларуса дастойнае імя
Я нікому не дам зганьбаваць.

*На сцэну выходзяць тры пары. Першая пара – дзве сястры, другая – муж і жонка, трэцяя – юнак і дзяўчына.*

– Люда, радзімая. Што я скажу маці?
– Я сама ёй напішу з дарогі.

– Не плач, я хутка вярнуся.
– Так, хутка ўсё скончыцца, пра нас не клапаціся.
– Дзяцей беражы, дзяцей.

– А як жа я?
– Я не магу інакш.
– Там людзі гінуць.

**1-ы вядучы**. На досвітку 22 чэрвеня 1941 года гітлераўскія войскі вераломна напалі на Савецкі Саюз.

Геаічна змагаліся абаронцы Брэсцкай крэпасці. За тыдзень баёў байцы пагранічнай заставы лейтэнанта А. М. Кіжаватава знішчылі каля батальёна гітлераўцаў. Гарнізон крэпасці пратрымаўся каля месяца, хоць нямецкія генералы планавалі на яе захоп толькі 3 гадзіны. Апошнія дні абароны крэпасці авеяны легендамі. На сценах крэпасці былі зроблены надпісы, якія ведае ўвесь свет: "Паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма".

**2-і вядучы.** Адважна змагаліся лётчыкі ў небе Беларусі. Вядомы подзвіг А. Данілава, які ўступіў у адзінаборства з дзевяццю "месершмітамі", збіў два з іх і тараніў трэцяга. Каля Радашковіч здзейснілі геаічны подзвіг камандзір эскадрыллі, ураджэнец Беларусі капітан Мікалай Гастэла і члены яго экіпажа – Анатоль Бурдзянюк, Рыгор Скарабагатаў і Аляксей Калінін. Ахоплены полымем самалёт экіпаж накіраваў на групу нямецкіх танкаў і аўтамашын. Толькі за адзін дзень байцы стралковага палка пад камандаваннем палкоўніка Куцепава знішчылі 39 танкаў.

Пра гэтыя падзеі расказаў у рамане "Жывыя і мёртвыя" пісьменнік Канстанцін Сіманаў.

**3-і вядучы**. Ужо на пяты дзень вайны ў Пінскім раёне быў сфарміраваны партызанскі атрад, які ўступіў у бой з захопнікамі… У ліпені 1941 года рабочыя кардоннай фабрыкі ў пасёлку Пудаць Суражскага раёна стварылі партызанскі атрад пад кіраўніцтвам свайго дырэктара М. Шмырова. Бацька Мінай – так называлі яго партызаны. За кіраўніка партызанскага атрада фашысты давалі 30 тысяч марак, але здраднікаў сярод партызан не знайшлося. Тады акупанты схапілі чацвярых дзяцей Міная ў якасці заложнікаў і расстралялі. Беларускую зямлю справядліва называюць краем былінай партызанскай славы і воінскай доблесці.

**4-ы вядучы**. Побач са сваімі бацькамі, дзядамі ваявалі хлопчыкі і дзяўчынкі.

Так, подзвіг братоў Цубаў паўтарыў 12-гадовы хлопчык Ціхан Баран. А хто не ведае подзвіг Марата Казея – юнага разведчыка партызанскай брыгады?

Валянцін Дончык у 12 гадоў стаў партызанам атрада імя С. М. Кірава, у 13 – пайшоў на фронт. Малодшаму сяржанту Валянціну Дончыку было 14 гадоў, калі ён распісаўся на рэйхстагу.

Зінаіда Корж усю вайну была санінструктарам. З эскадронам разведкі здзяйсняла яна дзёрзкія рэйды ў тыл праціўніка.

Юныя абаронцы Брэсцкай крэпасці Пётр Клыпа, Пётр Васільеў, Мікалай Новікаў, Уладзімір Козьмін, Сцяпан Аксёнаў у час асады даглядалі цяжкапараненых, набівалі патронамі стужкі станкавых і ручных кулямётаў, выносілі байцоў, якія сцякалі крывёю, замянялі тых, хто не мог трымаць зброю.

**5-ы вядучы**. На акупіраванай тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкія захопнікі ўводзілі "новы парадак". Адносіны да беларусаў былі вызначаны ў плане



***Жанна Аркадзьеўна Драгун*** *– настаўніца беларускай мовы і літаратуры Шчэпіцкай агульнаадукацыйнай сярэдняй школы Клецкага раёна. Закончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка (1998). Мае першую кваліфікацыйную катэгорыю.*

"Ост", згодна з якім прадугледжвалася 75% рускіх, беларусаў, украінцаў фізічна знішчыць, а астатніх ператварыць у рабоў.

На Беларусі было створана больш як 260 лагераў смерці. У кожным раёне дзейнічалі канцлагеры, турмы, гета. У Мінску і яго ваколіцах знаходзілася пяць такіх лагераў. Адзін з іх – Трасцянец. Трэці пасля Асвенціма і Майданака па колькасці знішчаных людзей – 206 500. Людзей палілі, цкавалі сабакамі, закопвалі жывымі ў зямлю, атручвалі газам.

**1-ы чытальнік**.

Суайчыннік, стань!
Тут знішчалі людзей!
Суайчыннік!
Запомні навек:
Тры гады па сто трыццаць сем у дзень,
І ў гадзіну – па шэсць чалавек.
Гэта значыць, што кожныя дзесяць хвілін
Тут навекі чарнеў небакрай.
Попел сэрцаў нашых ракоча ў зямлі:
Памятай…
Памятай…
Памятай…

**1-ы вядучы**. За час акупацыі гітлераўцы правялі ў Беларусі больш як 140 карных экспедыцый, у час якіх цэлыя раёны ператварыліся ў "зоны пустыні".

*Словы чытаюцца на фоне мелодыі песні "Хатынь".*

Беразнякі, Бор, Боркава, Бярозка… Усяго 619 вёсак. Тужлівая цішыня… Яна ўвабрала ў сябе гул шалёнага агню, надрыўны плач дзяцей і страшэнны крык маці, віскатлівы захлёп аўтаматаў і стогны паміраючых ад куль. І сярод іх – Хатынь.

22 сакавіка 1943 года фашысты спалілі жывымі ўсіх жыхароў гэтай вёскі. У агні загінулі 149 чалавек, у тым ліку 76 дзяцей. Назва Хатынь стала сімвалам трагедыі беларускага народа ў гады вайны.

**1-ы чытальнік**.

Вы чулі, як у Хатыні
Звоняць каміны?
Кроў у жылах стыне,
Як слухаеш тыя званы.
Кроў у жылах стыне,
Слухаеш і маўчыш,
А наўкола – пустыня,
А наўкола – ціш.
Толькі адны каміны...
Толькі адны званы...
Толькі адны яны...

**2-і вядучы.**

Званіце званы ў Хатыні,
Зганяйце санлівую стынь!
Хай голас народнай святыні
Кране ўсіх краін далячынь!
Званіце балюча, няспынна,
Званіце ад веку ў век,
Каб з попелу сэрцы нявінных
Пачуў, зразумеў чалавек.

**2-і вядучы**. Звоняць, звоняць званы Хатыні, горам адгукаюцца ў душах людзей, якія перажылі жудасныя гады акупацыі, і тых, хто нарадзіўся пасля вайны.

**3-і вядучы**. Дарогі вайны… Колькі іх пройдзена савецкімі воінамі па стэпах і балотах, камяністых перавалах і ўзгорках, лясных масівах і чыстых палях. Удзячнае чалавецтва заўсёды будзе помніць пра стойкасць, мужнасць, самаадданасць савецкіх салдат.

**Інсцэніроўка ўрыўка з рамана "Зеніт" Івана Шамякіна.**

Дзеючыя асобы:

Павел Шыянок – малодшы лейтэнант.

Ліда Асташка – малодшы сяржант.

*Гучыць мелодыя песні "Два полі" (словы Анатоля Вярцінскага, музыка Эдуарда Ханка).*

Павел *(разважае ўслых).* Мы плывём вельмі павольна. За кармой шыпіць і пеніцца вада. А там на носе баржы – зорка. Дзіўная гэта зорка. Яна не плыве, а нібы пераскоквае праз хвалі. Я заснуў, бо нейкае імгненне нічога не бачыў. Але пачуў толькі, што побач са мной хтосьці стаіць. Прачнуўся, але здавалася мне, што сплю і сню сон: побач – Ліда. Я нядаўна думаў пра яе, так хацелася, каб яна прыйшла ў мой сон.

Ліда (*падыходзіць*). Спі!

Павел. Ліда?

Ліда. Цішэй.

Павел. Табе не спіцца?

Ліда. Давай пастаім і памаўчым. Паглядзі, бачыш тую зорку ў вадзе?

Павел. Бачу. Мы плывём за гэтай зоркай, нібы імкнёмся дагнаць яе...

Ліда. А яна ўцякае ад нас…

Павел. Памятаеш, падышла: "Вы ў Гомелі вучыліся? Шыянок – ваша прозвішча?"

Ліда. А потым яшчэ аказалася, што мы вучыліся ў адным тэхнікуме.

Павел. Індустрыяльна-педагагічным, я на апошнім курсе, а ты – на першым.

Ліда. Вы, выпускнікі, на нас, першакурсніц, ніякай увагі не звярталі.

Павел. Але ж я адразу пазнаў цябе, Ліда.

Ліда. Ты не баішся, Павел?

Павел. Чаго?

Ліда. Мін.

Павел. Навошта іх ставіць тут, міны?

Ліда. І я не баюся, Паўлік! Ніколі не баялася ні самалётаў, ні бомбаў. А сёння баюся… Загінуць у такі час!.. Ідзе вызваленне родных мясцін, дарагой Бела-

русі. А можа, ужо мая вёска Грыбавец вызвалена… І мама жывая… І ёй напішуць, калі патонем.

Павел *(з папрокам)*. Ліда!

Ліда. Не буду. Гэта я так… Не думай, я не баязліўка. Проста памяць не хочацца. Давай памаўчым.

*(Ліда выходзіць.)*

Павел. А потым… Калі ўжо былі ў Мядзведжагорску, нечакана з'явілася Ліда. Бачу – бяжыць ад батарэі, расчырванелася.

Ліда. Таварыш малодшы лейтэнант! Старшы сяржант Лідзія Асташка прыбыла ў ваша распараджэнне.

Павел. І не паспела яна гэта сказаць, як раптам грымнула… Мяне ўдарыла па галаве. Я, напэўна, страціў прытомнасць. Я ляжаў каля дзвярэй. Пакой быў поўны дыму і пылу. Сцяміў, што здарылася: міна. У дзень пахавання нахмурыла, пачаў ісці дробны дождж. Плакала неба. Плакалі дзяўчаты – і тыя, што знаходзіліся ўвесь час каля труны, і тыя, што праходзілі строем. Кідалі кветкі. А праз колькі дзён прыйшоў ліст ад маці Ліды.

*(Голас за сцэнай.)*

"Лідачка! Дзіцятка ты маё роднае! Крывіначка ты мая! Ета ж такая радасць у нас, што пісьмо ад цябе прыйшло, Лідачка! Я ж усе тыя тры гады верыла, што ты жывая… І ў сне гаварыла з табой".

**3-і чытальнік**.

Успомнім усіх пайменна,
Горам успомнім сваім.
Гэта трэба не мёртвым –
Гэта трэба жывым!

*Чуцен стук метранома, на сцэну выходзяць 7 вучаніц з запаленымі свечкамі і ўспамінаюць загінуўшых.*

**Вучаніца 1-я.** ***Драгун Пётр Максімавіч,*** нарадзіўся ў 1925 годзе, прапаў без вестак.

**Вучаніца 2-я.** ***Кісель Васіль Адамавіч,*** радавы, прапаў без вестак 29.04.1945 года.

**Вучаніца 3-я.** ***Шаўлінскі Баляслаў Антонавіч,*** радавы, загінуў 12.02.1945 года ва Усходняй Прусіі.

**Вучаніца 4-я.** ***Гардзейчык Васіль Максімавіч,*** нарадзіўся ў 1904 годзе, радавы, загінуў 24.04.1945 года ў Берліне.

**Вучаніца 5-я.** ***Сакалоўскі Іван Мацвеевіч,*** нарадзіўся ў 1919 годзе, радавы, памёр ад ран 24.01.1945 года ў горадзе Кёнігсбергу.

**Вучаніца 6-я.** ***Таўкач Уладзімір Пятровіч,*** нарадзіўся ў 1909 годзе, загінуў 22.10.1944 года ва Усходняй Прусіі.

**Вучаніца 7-я.** ***Ярмолік Іван Ігнатавіч,*** нарадзіўся ў 1918 годзе, радавы, памёр ад ран 05.06.1945 года ў Германіі.

*(Мінута маўчання.)*

**4-ы вядучы.** Жудасная памяць вайны, не сціхае гора, не затуманьваецца слава подзвігу народнага. Жыве сёння і ад пакалення ў пакаленне ідзе ў заўтра эстафета гэтай памяці.

*Гучыць вальс. На сцэну выбягае школьніца з рознакаляровымі шарамі ў руках і пачынае кружыцца. За ёй выходзіць ветэран. Ён нейкі час слухае, глядзіць на яе, потым пачынае чытаць.*

Грымяць, грымяць святочныя салюты…
І феерверкі зырка рассыпаюцца,
І дзетвара да батарэй збягаецца,
І смех, і крык на кожнай плошчы людней.
А мне заўсёды страшнавата робіцца,
Як неба засцілае дымам шызым,
І жаласна звіняць у вокнах шыбы,
І нечыя матулі сумна горбяцца.

*Дзяўчынка спыняецца, пачынае слухаць, а тады падыходзіць да дзеда з намерам супакоіць яго. Ветэран гладзіць яе па галаве.*

І прывіды мінулага ўстаюць.
І б'юць гарматы ў маладосць маю.
Сябры мае, прашу цішэй паліць.
Зямлі яшчэ баліць і мне баліць…

*Выступленне ветэрана Вялікай Айчыннай вайны.*

*Гучыць песня "Журавлі".*

**1-ы чытальнік.**

Адгулі, адгрымелі гарматы,
Хмары чорныя адплылі,
Прынясіце кветкі салдатам,
Што палеглі на нашай зямлі.
Пакланіцеся нізка-нізка
Тым, хто зведаў агонь і дым,
Чорным помнікам і абеліскам,
Слаўным зорачкам баявым.
Ля салдацкіх магіл памаўчыце.
Кожны з мужных салдат збярог
Цішыню і сонца ў блакіце
І сцяжынку на школьны парог.
Многа год пад сцягам крылатым
Крочыць мір па роднай зямлі.
Прынясіце кветкі салдатам,
Што свабоду для нас здабылі!

**2-я чытальніца.**

Я не глытала па акопах дыму
І франтавых не ведаю дарог.
Калі я нарадзілася, Радзіма,
Ты святкавала свята перамог.
І не выццё варожых самалётаў,
І не агонь, што пёк тваю зямлю, –
Чаромху помню, як цвіла ля плота,
Як падалі зярняты на раллю.
Цябе, вясняная, я помню ў цвеце,
Люблю з маленства, родная, люблю.
І за таго, каго няма на свеце,
Хто ўсё аддаў за гэтую зямлю.
Мае сябры ў жыцця да скону бралі
Усё, чым навучаем даражыць.
Мы за цябе яшчэ не паміралі,
Мы для цябе, Радзіма, будзем жыць!

**3-і чытальнік.**

Святіся кропкай весела і звонка,
Нясі ў прастор свой непамерны груз,
Жыць будзе Беларусь – мая старонка,
Сярод зямлян жыць будзе беларус!

*Гучыць мелодыя песні "Радзіма мая дарагая"(словы Алеся Бачылы, музыка Уладзіміра Алоўнікава).*

*Педагагічная майстэрня*

Алег ЛОЙКА

# У ПОШУКАХ МАЙСТЭРСТВА ВЫКЛАДАННЯ

Лектарам, па сутнасці, я пачаў станавіцца ў школе. Рэдкімі тады, у першыя пасляваенныя гады, былі прыезды ў мой раённы горад сталічных – мінскіх ці маскоўскіх – пасланцоў таварыства "Веды", але калі дзе хто аб'яўляўся, у іх аўдыторыях я абавязкова прысутнічаў, ледзь не кожнага з іх маючы за апостала. Асабліва калі дакладчык гаварыў не па пісанаму, не па канспекце. У Слоніме былі такія лектары: дырэктар музея Іосіф Іосіфавіч Стаброўскі (са сваімі выступленнямі пра паходжанне Зямлі і чалавека) і дырэктар школы Звераў, здаецца, былы банкаўскі работнік (шкадую, самога яго памятаю, але яго імя і імя па бацьку на слыху не засталося).

Мне шанцавала на настаўнікаў: у большасці яны на ўроках у падручнік не зазіралі, былі валадарамі свайго прадмета, вуснага слова, выкладалі вольна, доказна, з жэстыкуляцыяй, з улюбёнасцю. Былі таксама тварам прыгожыя, маладыя, паставай, ці, як жанчыны, станам, фігурай зграбныя ці ўвогуле як грэчаскія і рымскія багі і багіні.

Выключэнні былі адзінкавыя: у 8-м класе рускую літаратуру стала выкладаць у нас нехта Людвігаўна – о, якая брыдота з твару, якая каравенцыя на лёдзе ў рухах! Яе, вывучаючы "Недоросля" Фанвізіна, мы, дзеці, проста з ходу ахрысцілі Прастаковай. Таму я і імя яе не памятаю, але ўжо са школы зразумеў: настаўнік павінен быць прыгожым. І, працуючы ўжо дзесяць гадоў выкладчыкам, упершыню ў 1966 г. наведаўшы Прагу, я менавіта пасля гэтага на адным з вучоных саветаў філфака БДУ пры абмеркаванні чарговага набору абітурыентаў сказаў, салідарызуючыся з чэшскімі калегамі ў тым, што адбор абітурыентаў на філфак перш за ўсё павінен быць па іх красе, прыгажосці, сімпатычнасці, а не толькі па балах. Памятаю, крытыкі ў мой адрас, пярэчанняў, нават крыўдаў на мяне было нямала, але я ўсё ж не змог забыць сваю Прастакову, якая ўжо самой знешнасцю адбівала ахвоту да літаратуры.

Вядома, я, вылучаючы свой крытэрый па красе, не пазбягаў і выключэнняў з правіла: прымаць квазімодаў з папярэджаннем (аб забароне выкладання ў сярэдняй школе з выбарам шырокага профілю працы ў выдавецтвах, на радыё ці тэлебачанні, у рэкламе, у школе сляпых). Так ці інакш, а мой першы метадычны падыход да вобліку асобы настаўніка, звязаны з адборам яго па красе, так і застанецца маім назаўсёды.

Але вернемся да асобы лектара – да асобы настаўніка як лектара і лектара як лектара ўвогуле. Крытэрыі мае да іх у школе былі, несумненна, наіўныя, хоць не было б іх, такім лектарам, якім стаў я, я не стаў бы. І было, што калі я аказаўся студэнтам, я ніяк не мог належна ацаніць выкладчыкаў, якія чыталі лекцыі, унурыўшыся ў канспект. У школе я меў за правіла, за знак вучонасці гаварэнне з кафедры, са сцэны менавіта ад сябе, з галавы, са сваёй памяці.

Даклады па фізіцы, астраноміі, не помню як, але ў 9-м, 10-м класах я вызубрываў на памяць, тым больш чытаў на памяць даклады па рускай літаратуры. Па Бялінскаму, напрыклад, заплюшчваючы вочы, аглушваў аўдыторыю абзацамі, пабраўшы іх з кніжкі Бродскага пра Бялінскага. Прыйшлося ж потым даваць урок – першы мой урок у СШ № 9 г. Мінска, калі быў студэнтам-практыкантам 4-га курса філфака і, як усе, канспект урока напісаў. Урок быў па паэме Паўлюка Труса "Дзесяты падмурак", але ж у канспект на ўроку ні на хвілю не зазірнуў. Нездарма ж аж чатыры дні завучваў яго тэкст, ідучы па вуліцы. Таму зусім і не збіўся ў сваім эмацыянальным нібы экспромце, тлумачачы вучням працэс пераўтварэння паэтычнай задумы ў паэму (запіс яе знайшоў у акадэмічным выданні твораў П. Труса). І было, што мой шаноўнейшы кіраўнік практыкі К. І. Шапялевіч, як цяпер разумею, поўнасцю справядліва ацаніў мой урок на чацвёрку, але тое, як выказвалі сваё захапленне аднакурсніцы, увянчала ўсё ж мае старанні пяцёркай. Тая пяцёрка, па сутнасці, і пачынала мяне як выступоўца, як выкладчыка універсітэта.

Увогуле, лічу, што выкладчыкаў нараджалі настаўнікі-выкладчыкі. Тыя мажлівасці для росту, якія даў, у прыватнасці, мне Міхась Рыгоравіч Ларчанка, былі такімі, што больш спрыяльных і не прыдумаеш: раз у тыдзень я чытаў гадавы курс лекцыяў па беларускай літаратуры (90 гадзін) на 4-м курсе рускага аддзялення філфака: чытаў ад князя Алега да чатырох Максімаў – Багдановіча, Гарэцкага, Танка, Лужаніна. Тыдзень на падрыхтоўку да лекцыі – гэтага хапала. Па старажытнай пісаў канспект, але намагаўся зазіраць у яго чым найменш.

І, мусіць, канчаткова лектарам мяне зрабіла электрыка. У першым семестры лекцыі мае былі вечарамі. І вось аднойчы ў аўдыторыі прапала электрычнасць. Суцішваю ажыўленне ў зале. І гавару: "Лекцыя прадаўжаецца. Кароткі змест, як загарыцца святло, для запісу перадыктую…" Ціша ў аўдыторыі была неймаверная, і тое была надта прыемная ціша студэнцкага прызнання мяне лектарам!..

А далей пачалася практыка, якую называлі тады асновай тэорыі. Але, па маіх перакананнях, яе вялікасці маці тэорыі ў методыцы выкладання, у станаўленні лектара няма, бо гэта справа надта інды-



***Алег Антонавіч Лойка*** *– літаратуразнаўца, паэт, празаік, перакладчык. Доктар філалагічных навук, прафесар. Закончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1953), быў выкладчыкам, загадчыкам кафедры, дэканам філфака БДУ.*

*Аўтар многіх артыкулаў, манаграфій, кніг, сярод якіх "Гісторыя беларускай літаратуры дакастрычніцкага перыяду" (1977, 2-е выд. 1980), раманы-эсэ "Як агонь, як вада" (1984; пра Янку Купалу) і "Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае" (1990, Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я. Коласа), паэтычныя зборнікі "На юначым шляху" (1959), "Блакітнае азерца" (1965), "Дзівасіл" (1969), "Шчырасць" (1973), "Скрыжалі" (1981), "Грайна" (1986), "Талая вясна" (1990), аповесці "Скарына на Градчанах" (1990), "Кельты не ўміраюць..." (1997). Адзін са складальнікаў хрэстаматыі "Беларуская літаратура XIX ст." (1971, 2-е выд. 1988). Аўтар кніг для дзяцей "Як Тоня рэха шукала" (1962), "Каля млына" (1972), "Дзе хто начуе?" (1977), "Кніжка Надзейкі" (1987) і інш. Пераклаў на беларускую мову творы П. Верлена ("У месяцавым ззянні"; 1974), Ё. В. Гётэ ("Спатканне і растань"; 1981), Ф. Шылера ("Улада песняспеву"; 1997), літоўскіх, польскіх, рускіх, украінскіх паэтаў. Член-карэспандэнт НАН Беларусі (1989), сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1960 г.*

відуальная, творчая, і як нельга навучыць чалавека стаць паэтам, празаікам, драматургам, так нельга навучыць стаць педагогам – імі становяцца людзі праз сябе, дзякуючы Божай іскры, як кажуць, прыроднаму дару. Рамантыкамі нараджаюцца. Нараджаюцца Моцартамі, становяцца Сальеры. Паводле Пушкіна, і першы геній, і другі сталі геніяльнымі праз сваю працу, трэніроўку, вопыт. Дык без працы ўперад не пойдзеш, але і да тэорыі як упарадкаваных правілаў, законаў, пастулатаў у лектарскай справе не вельмі дойдзеш. І, можа, найперш таму, што ёсць лектар як асоба і маса, аўдыторыя як успрымальніца голасу, думак, пачуццяў лектара. Заікастасць, картавасць не вельмі зачаруюць публіку, як і акадэмічная сухасць – не вельмі, хоць змястоўнасці лектару і будзе хапаць. Так што справа лектара – справа не аднаго лектара, але і аўдыторыі. Якая аўдыторыя, які яе цэнз, якога яна культурнага ўзроўню, сацыяльнага профілю, узросту – усё гэта павінен ведаць і ўлічваць лектар. А перад усім, якая яна ні ёсць, аўдыторыя, каб трымаць яе ўвагу, трэба ўлічваць псіхалогію, асаблівасці ўспрыняцця чалавекам маўленчага слова, тэксту.

Я, можна сказаць, вынаходзіў веласіпед. Улічваючы цяжкасць матэрыялу для ўспрыняцця, я папярадзе ставіў матэрыял цяжэйшы, а затым – лягчэйшы. Ад Івана Якаўлевіча Навуменкі пераняў перабіўку выкладання сур'ёзнага матэрыялу лёгкім, смешным тэкстам – урыўкам, адступленнем, анекдотам, цытатай. Вытрымкі з тэкстаў – па тэме, цытаты з крытыкаў – па тэме, лірычныя адступленні, анекдоты – абавязкова. Але пры гэтым я разлічваў месца перабівак (якую, дзе ўжыць – дзеля разрадкі, дзеля трымання студэнта ў сваёй абладзе, каб той баяўся прапусціць пушчанага мной казла дзеля гігікання, збіцця яго санлівай абыякавасці, дзеля абуджэння, ажыўлення аўдыторыі. Часам загатовак на перабіўку хапала, а часам не хапала, але тады адчуваў, што не трэба перабіраць меры. Перабіўка дзеля разрадкі – так, але твая задача – не зводзіць лекцыю да аднаго "гі-гі!..".

Але чаму я сказаў, што быў вынаходцам веласіпеда? А зразумеў я гэта, калі прэзідэнтам у ЗША стаў Клінтан, калі сталі ў нас пісаць і гаварыць, што свае прамовы ён абавязкова ўкладвае ў 15 хвілін, і што 15 хвілін – мерка плённага ўспрымання прамоўцы слухачом. Закон псіхалогіі чалавека! Іван Якаўлевіч да мяне, я – пасля яго, мы абодва ўлічвалі гэты закон прытуплення актыўнага, плённага ўспрымання слухачом жывога слова за 15 хвілін, сцірання гэтага прытуплення перабіўкай, смехатлівай перш за ўсё, сцірання, як запісанай формуламі дошкі мокрай шматай – і вось пасля сцірання запісанай дошкі мозг-дошка зноў tabula rasa – чыстая дошка ў тваім распараджэнні: гавары, дыктуй, фіксуй на ёй новую інфармацыю, як зноў на новай, чыстай плошчы.

На перабіўку заўсёды добра ішоў факт, які будзіў у зале смех, які-небудзь сюжэцік, нават проста жаргоннае слоўца. Але куды большае ўражанне заўсёды робіць сюжэт драматычны, трагічны. Чалавек заўжды асабліва ўражлівы на пакуты, на трагізм. Пры ўскалыхванні імі ягонага сэрца перажыванні заўжды становяцца больш глыбокімі, больш трывалымі. Катарсіс! Аднак трэба і ўмець выводзіць аўдыторыю з катарсіснага стану, не ўпадаць адразу ў пафаснасць, патэтыку, а даць сэрцу, як гаворыцца, адысці, уціхамірыцца. Tabula rasa пры гэтым удвайне гарантаваная.

Я яшчэ нічога не сказаў пра дапаможную ролю жэстыкуляцыі лектара. Яна вельмі ўспаможная, калі ў меру, але бывае вымоўнай і празмернай, як і адсутнасць жэстыкуляцыі ўвогуле. Што, як, каму – ад характару, ад тэмпераменту. Можна сказаць, што прамаўляюць і рукі – падкрэсліваюць самае важнае, закругляюць вывады, як і дапамагаюць голасу нешта чым вышэй узносіць ці, наадварот, нешта чым ніжэй апусціць.

Рукам сястрою міміка. Міміка жывая, міміка мёртвая. Вядома, ажыўляе прамову жывая, натхнёная, эмацыянальная міміка.

Мімікі настаўніку няма чаго баяцца. Жывая міміка – зброя акцёра, цуд яго пераўтварэнняў у розныя вобразы. Настаўнік, лектар – таксама акцёры, артысты. Настаўнік каля дошкі, прафесар на трыбуне, чым большыя яны артысты, тым больш іх слова ўражвае, запамінаецца. Без прыроджанага артыстызму, як і без прыгажосці, сімпатычнасці ў настаўнікі, у лектары я таксама не ўсіх прагных пускаў бы. Хоць, відаць, і ў гэтым выпадку быць катэгарычным нельга, бо ёсць жа тое, што называецца нажыўным. Вопытам яно нажываецца, з гадамі прыходзіць, са стратай сарамяжнасці. Я, напрыклад, так і не дайшоў да таго, чым улюбляў у сябе прафесар Саўсун: за выдатныя адказы даваў студэнтам шакаладныя цукеркі. Я, праўда, адкінуў сарамлівасць, калі пасля сваіх шасцідзесяці пачаў на лекцыі… спяваць. "Здзяцінеў", – можна было падумаць, але калі я абрысоўваў перадваенную атмасферу часу, фарміраванне светаўспрымання таго часу, яго ідэйную скіраванасць, дык мне гэта асабліва ўдалося пры супастаўленні песень, якія напярэдадні вайны спявалі ў СССР і Заходняй Беларусі, у Польшчы.

У СССР ішло проста татальнае выхаванне грамадства на ваенных матывах, адкрытых непасрэдна ў песнях пра трох танкістаў, “Если завтра война”, пра Кахоўку (“Иного нет у нас пути: в руках у нас винтовка”), пра штурм Спаска (“И останутся, как сказка, как манящие огни, штурмовые ночи Спасска, волочаевские дни!”). “Сказка”, “манящие огни”!.. Звабнай, казачнай стыхіяй паэтызавалася вайна з прароцтвамі: “И на вражьей земле мы врага разобьем малой кровью, могучим ударом”. Нават у самай шлягернай тады “Кацюшы” ішла паэтызацыя воінскага, калі ўсплывала ў канцоўцы фігурка пагранічніка (“Пусть он землю бережет родную, а любовь Катюша сбережет!..”).

А што было ў польскай песні таго часу? Была “Та остатня недзеля” з вельмі драматычным падтэкстам, з адчуваннем трагізму блізкай будучыні, але больш было пра шчырае каханне, шчаснае ладкаванне дамашняй утульнасці, пра сентыментальныя ўздыханні каханай і каханага…

Спакуса дапамагчы студэнтам зразумець атмасферу таго часу праз песні, праз іх мелодыі абяцала выйгрыш, і, мне здаецца, я меў яго. Я, па сутнасці, быў за кафедрай спеваком, артыстам. Я ішоў на сінтэз слова і песні, і я ўпэўнены ў неабходнасці таго, што лектару трэба выхоўваць у сабе артыста, мець у сабе артыста, быць і драматычным артыстам, і комікам, толькі ўдаючы сябе імі, чытаць тэксты, дыялогі, ролі ў п’есах. Лектар – артыст, настаўнік – артыст. О, гэта настаўнік у ідэале, лектар у ідэале!..

Па-свойму ажыўляе лекцыю і мастацкі жывапіс. Я, напрыклад, аналізуючы “Новую зямлю” Якуба Коласа, калі пачынаў гаворку пра Антося, заўсёды браў з сабой рэпрадукцыю карціны Рэпіна “Беларус” 1892 г. І заўсёды шкадаваў, што маю яе толькі чорна-белы адбітак, бо калі я ўбачыў арыгінал – радасную вясновую зеляніну карціны як фону, на якім паўстае постаць беларуса Антося, то толькі вясновыя асацыяцыі апанавалі мяне: у вясне гэты беларус, яго зялёная зямля, тая новая зямля, да якое ён імкнецца – родная, яго вяснова-зялёная зямля!..

Прагляд кінафільмаў пасля лекцыі таксама дае карысць для пазнання, але ўсё ж гэта пасіўная форма і часам сваёй рэальнай праўдзівасцю можа збіць пафас захаплення, якім поўніўся твой аналіз творчасці паэта, твая характарыстыка яго. Так было менавіта ў мяне, калі пасля раскрыцця рамантычнай сутнасці лірыкі Янкі Купалы я завёў студэнтаў у залу паказаць ім фільм пра Купалу. Завёў аднойчы, каб назаўсёды адмовіцца даваць студэнтам чуць глухі, картавы, рэчытатыўны голас вялікага паэта. “Які рамантык, што вы сачыняеце, плецяце?!” – упаўне пасля ўспрыняцця такіх дэталяў фільма мог думаць студэнт. І я пасля таго фільма спецыяльна гаварыў студэнтам, што Купала не любіў свой голас, і сам ведаў, што не ўмее, не можа чытаць свае вершы, што ён іх правяраў на чужым добрым голасе, якім, напрыклад, лічыў голас Часлава – брата Паўліны Мядзёлкі, які пэўны час жыў на кватэры Купалы, што была на Кастрычніцкай (былой Паліцэйскай) вуліцы.

І асобна з вялікім задавальненнем я цяпер успамінаю, як я часам свае лекцыі тэатралізаваў. Найлягчэй было з “Пінскай шляхтай” Вінцука Дуніна-Марцінкевіча. Спачатку на дэмакратычных прынцыпах з ліку студэнтаў я выбіраў выканаўцаў роляў вадэвіля.

Чаму на дэмакратычных прынцыпах? А таму, што на выкананне той ці іншай ролі прасіў у аўдыторыі вылучыць кандыдатуры, імёны якіх запісваў на дошцы – тры, чатыры, пяць прозвішчаў, колькі аўдыторыя прапаноўвала. Прапаноўвала, праўда, пасля маіх характарыстык персанажа: “Марыся – маладая, прыгожая і каб умела цалавацца. Грыша – малады, прыгожы і каб умеў даць начальству хабар – грыбамі. Кручкоў – каб меў вусы – адзін задзёрты ўгару, другі – уніз – і каб умеў добра блытаць гістарычныя даты і ўсчыняць інтрыгі”. Найцяжэй было з выбарам Куторгі, але дэмакратыя ў зале перамагала: выбіралі з пяцёх адну Марыську, з чатырох – аднаго Грышку, на Куторгу звычайна бракавала кандыдатаў. Але ніколі не бракавала ў зале смеху – і пры выбары кандыдатаў, і пры чытанні імі тэксту (патрэбную колькасць экземпляраў п’есы я прыносіў з сабой).

Тэатралізаваць спрабаваў я і лекцыі па “Слову пра паход Ігаравы”. На дэмакратычных асновах таксама папярэдне выбіраў Яраслаўну, князя Ігара, Ганчака, даваў ім дамашняе заданне: “Што рабіла да выхаду на Пуціўлеўскую сцяну Яраслаўна?” (Няньчыла чацвёртага сына!) Якім было імя Яраслаўны? (Невядома, Яраслаўна – дачка Яраслава.) Кім прыходзіўся Ігар Гзаку, Гзак – Ігару? (Яны былі сватамі.) Словам, такімі пытаннямі аўдыторыя разварушвалася, яна павінна была шукаць адказы, думаць, дамалёўваць побыт княжацкіх церамаў, дэталі адзежы дружыны, князя, князёўны, увогуле кіеўскіх модніцаў, якія ў люстэркі не глядзеліся, каб не цешыць беса, а ўсё-такі цешылі яго, бачачы свой адбітак ў застылай гладзі поўнага вадою вядзерца. Такім чынам, філолаг зрастаўся з гісторыкам, краязнаўцам і глыбеў менавіта сам як філолаг.


У заключэнне падкрэслю, што сваю справу ў ажыўленні лекцый з поспехам рабіў прынос у аўдыторыю дзеля паказу кніг-рарытэтаў (прыносіў выданне 1855 г. “Гапона” В. Дуніна-Марцінкевіча, першыя выданні “Жалейкі”, “Песняў-жальбаў”, “Вянка”, “Руні”). Вельмі падабалася тварэнне з аўдыторыяй “бібліятэкі”, калі на стол кожнаму клаўся нумар-два газеты “Наша ніва” – за розныя гады, кірыліцай і лацінкай. Нагляднасць тут праяўляла сябе ў найлепшай яве.

Дык гэта не інакш, як значыць тое, што і выдатнымі настаўнікамі, лектарамі не толькі нараджаюцца, але і становяцца. Не важна, ці ты нарадзіўся, ці выхаваў у сабе настаўніка, лектара, бо важна адно: каб выдатнае ў поўні было перад намі! Генезіс таго хай будзе любы – важны эфект. Бо ўвогуле як вышэйшая, так і ўсіх ступеняў школы маюць два тыпы выкладчыкаў: творцаў, наватараў, эксперыментатараў і працаўнікоў, што зор з неба не хапаюць, але заложныя, цягавітыя, законныя настаўнікі. Навучанне трымаецца на плячах і першых, і другіх, адначасова патрэбныя і першыя, і другія, адначасова важныя і першыя, і другія, і ні тых, ні другіх даваць у крыўду нельга. Адно другое павінна дапаўняць. Хоць пошуку ўсё ж лягчэй заняць першае месца. Без пошуку – застой і практыкі, і тэорыі.

Індывідуальныя пошукі, аднак, вельмі цяжка абагульняць, але іх спосабы, метады можна пераймаць, лёгка пераймаць і будзем жа пераймаць!

*Вясёлы перапынак*

Рубрыку вядзе
Мікола ШАБОВІЧ



Быкаў Аляксандр Генадзевіч нарадзіўся ў 1954 годзе ў Барысаве. З 1985 года пражывае ў Мядзеле і працуе ў рэдакцыі райгазеты "Нарачанская зара". Аўтар паэтычных кніг "Кветка папараць" (2005), "Пад небам бусліным" (2007) і інш. Апошнім часам паэт плённа працуе і ў парадыйным жанры, пра што сведчаць яго публікацыі ў "ЛіМе" і ў абласной газеце "Мінская праўда". Рыхтуе Аляксандр і асобную кнігу пародый, некаторыя з якіх хочацца прапанаваць вашай увазе. Спадзяемся, што вы не расчаруецеся ні ў досціпе аўтара, ні ў мастацкіх вартасцях яго твораў.

Аляксандр БЫКАЎ

# ПАРОДЫІ

### МАЛАДЗІЛЬНЫ ВЯНОК

Ты мне здаешся
школьніцай-дзяўчынкай,
У тым вянку рамонкавым сваім...

А можа, й мне узяць памаладзець....

**Мікола Шабовіч**

*Гады ляцяць. Даводзіцца пацець,*
*Калі куды па лесвіцы намецішся,*
*А ты ў вянку рамонкавым аж свецішся.*
*Дык, можа, й мне узяць памаладзець?*

*І вось аднойчы, лета як гуло,*
*Натрапіў на паляну я з рамонкамі,*
*І, прыгадаўшы твае вусны тонкія,*
*Вянок і я ўздзябурыў на чало.*

*Не ведаю, ці шмат памаладзеў,*
*Ды як вяртаўся вуліцай вясковаю,*
*Дзяды ківалі здзіўлена галовамі,*
*А дзеўкі пахаваліся за хлеў!*

### ЗМІТРАКОЎСКІ ЗЕМЛЯТРУС

Каркне вечарам воран былінны –
Смачна чмякнецца яблык на дол.

Быццам звон, скаланецца планета...

**Змітрок Марозаў**

*Не пазбавіцца вечнай руціны.*
*А цудоўна як – гляньце наўкол!*
*Каркне вечарам воран былінны*
*Так, што чмякнецца яблык на дол.*

*І прамовіць суседскі Пятровіч,*
*Хоць даўно ён ужо як ралля:*
*"Я былінны Алёша Паповіч!*
*Булаву мне хутчэй і каня!"*

*Хто пасмее паправіць Паэта?*
*Смела крэмзае аркуш рука.*
*І калоціцца наша планета*
*Ад былінных радкоў Змітрака!*

### КАСМІЧНЫ ЛОЙКА

Не лётчык, не касманаўт,
Не альпініст, не мічман,
Ды паміж зораў нат
Я – самы касмічны.

**Алег Лойка**

*Хоць не лётчык, не артыст,*
*Не круты я рокер –*
*Касмадрома гул і свіст*
*Чую я здалёку.*

*І, на жаль, не касманаўт,*
*Заяўляю зычна:*
*Зорак даўні я фанат,*
*Я паэт – касмічны!*

*Адарвацца толькі каб*
*Ад зямелькі ворнай,*
*І спасцігну я маштаб*
*Па-за небам зорным.*

*Ад прасторы незямной*
*Ў захапленні войкну...*
*Ключ на старт. Ах, божа мой, –*
*Вы забылі Лойку!*

### ВЯСКОВАЯ ІДЫЛІЯ

Ідылія вясковага двара.
Сабака. Кот. Карова.
І ў штабялёчку дровы.

**Анатоль Зэкаў**

*Даю пейзаж вясковага двара:*
*Сабака, кот і курка-недарэка,*
*Дроў пашчапаных цэлая гара,*
*І грэецца на лаўцы Толя Зэкаў.*

*Ідылія. Ды трошкі не гатова,*
*Бо з поля не прыйшла яшчэ*
*карова!*

Мікола НОВІК

# “НЕ ОБЧЫМ ЯКИМ ЯЗЫКОМ, АЛЕ СВОИМ ВЛАСНЫМ ПРАВА СПИСАНЫЕ МАЕМ”

## ДА 420-ГОДДЗЯ ТРЭЦЯГА СТАТУТА ВКЛ

28 студзеня 1588 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт III Ваза зацвердзіў Статут для Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (*далей* – ВКЛ), які адразу ж надрукавалі кірылічным шрыфтам у Вільні ў друкарні братоў Лукаша і Кузьмы Мамонічаў. Для ВКЛ гэта была ўжо трэцяя кадыфікацыя сістэмы права ў XVI ст., што з’яўлялася бясспрэчным сведчаннем палітычнай актыўнасці шляхты.

XVI ст. – час імклівых і асноватворных зменаў у грамадскай і палітычнай структуры ВКЛ. Сваё адлюстраванне гэтыя пераўтварэнні знаходзілі ў фарміраванні шляхецкага парламентарызму, у тэрытарыяльна-адміністрацыйнай рэформе, адметнай судовай сістэме на чале з Трыбуналам (1581). Названыя змены адбываліся разам з уключэннем грамадскіх эліт ВКЛ у сферу заходнееўрапейскай культуры, і выключнае месца ў гэтым належала менавіта юрыдычнай культуры. Статут ВКЛ (1588) стаў важным крокам на шляху развіцця прававой думкі. Ён адлюстраваў рэформы, праведзеныя ў эканамічным і палітычным жыцці краіны. Крыніцамі для распрацоўкі гэтага найважнейшага юрыдычнага помніка былі Статуты 1529 і 1566 гг., соймавыя пастановы 1573, 1578, 1580 і 1584 гг., прывілеі, пастановы павятовых соймікаў. Ён быў падрыхтаваны на высокім тэарэтычным узроўні кваліфікаванымі правазнаўцамі пад кіраўніцтвам канцлера ВКЛ Астафея (Яўстафія) Валовіча і падканцлера Льва Сапегі. Менавіта Л. Сапега ўзначальваў соймавую камісію па падрыхтоўцы Статута (1588), адрэдагаваў тэкст і прафінансаваў яго выданне.

Прадмова да Статута (1588), прысвечаная Жыгімонту III і ўсім станам ВКЛ, у якой Л. Сапега падкрэсліў асноўную мэту новага заканадаўчага кодэкса – стварэнне сапраўды прававой дзяржавы, – напісана ў Берасці (Брэсце): *“Писан у Берестью лета от нароженья Сына Божего 1588 месяца декабра, 1 дня”*.

Пасля смерці 12 снежня 1586 г. караля і вялікага князя Стэфана Баторыя кандыдатамі на трон у Рэчы Паспалітай былі рускі цар Фёдар Іванавіч (яго падтрымлівала праваслаўная шляхта Беларусі і Украіны), шведскі каралевіч Жыгімонт Ваза, за якога стаялі каталіцкае духавенства і значная частка феадалаў-католікаў, аўстрыйскі эрцгерцаг Максімільян. Але рускі цар хутка адмовіўся ад вылучэння сваёй кандыдатуры на трон, і галоўная барацьба разгарнулася паміж прыхільнікамі Жыгімонта Вазы і Максімільяна.

Прадстаўнікі ВКЛ, выкарыстаўшы гэтую барацьбу і першымі даведаўшыся пра перамогу прыхільнікаў Жыгімонта, прапанавалі яму сваю падтрымку, пры ўмове, што ён зацвердзіць Статут (1588). 28 студзеня 1588 г. Жыгімонт III Ваза сваёй граматай зацвердзіў Статут (1588) і абавязаўся *“права вольности и свободы их не только цело и непорушно держати, але што бы наболей примножати, справедливость и оборону чинити …привельем нашим ствержаем и всим станом Великого князьства Литовского ку уживанью на вси потомные часы выдаем. Водле которого вже якосмы сами, господар, так и вси иные станы, обыватели Великого князьства Литовского, заховатисе маем”*. Гэтай жа граматай Статут (1588) уводзіўся ў дзеянне з 6 студзеня 1589 г. А дзеля таго, каб найхутчэй можна было ім карыстацца, загадалі яго *“письмом польским и руским* (г. зн. беларускім. – ***М. Н.***) *друковати”* з прыкладаннем агульнадзяржаўных прывілеяў (граматаў). Аднак Статут (1588) быў выдадзены без граматаў, бо, на думку Л. Сапегі, не ўсе яны былі на карысць ВКЛ.

З пункту гледжання прававой тэорыі і практыкі Статут (1588) меў значныя перавагі перад сваімі папярэднікамі 1529 і 1566 гг. У яго ўвайшлі нормы дзяржаўнага права, чаго на той час не было ў заканадаўчай практыцы іншых еўрапейскіх краін, а таксама ў ім атрымалі больш выразнае адлюстраванне дзяржаўна-прававыя ідэі таго часу, асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу. Трэці Статут санкцыянаваў рэлігійную талерантнасць, а ў галіне крымінальнага права практычна меў надстанавы характар.

Статут (1588) заканадаўча аформіў захаванне ВКЛ як самастойнай дзяржавы насуперак акту Люблінскай уніі. І ў гэтым галоўнае значэнне яго дзяржаўна-прававых нормаў. Складальнікі не ўнеслі ў дакумент ніводнай нормы, якую можна было б скарыстаць на шкоду дзяржаўнай незалежнасці ВКЛ. Адметна і тое, што ў першым артыкуле чацвёртага раздзела юрыдычна зацвярджалася дзяржаўнасць беларускай мовы: *“Писар земский маеть по руску литерами и словы рускими* (г. зн. па-беларуску. – ***М. Н.***) *вси листы, выписы и позвы писати, а не иншим езыком и словы”*.

Сістэма Статута (1588) складзена надзвычай разумна. Ён мае 14 раздзелаў і 488 артыкулаў, у якія ўключаны нормы дзяржаўнага (канстытуцыйнага) права: адміністрацыйнага, ваеннага, судова-працэсуальнага, шлюбна-сямейнага і апякунскага, грамадзянскага, спадчыннага, зямельнага, ляснога і па-

***Мікола Аляксандравіч Новік*** *– мовазнаўца. Кандыдат філалагічных навук (2003). Закончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, аспірантуру пры Інстытуце мовазнаўства імя Я. Коласа НАН Беларусі (1997). Выкладаў беларускую мову ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце, Будапешцкім універсітэце імя Лоранда Этвеша (Венгрыя). Зараз – настаўнік беларускай мовы і літаратуры Малазводскай базавай школы Брэсцкага р-на Брэсцкай вобл. Супрацоўнічае з Віленскім педагагічным універсітэтам (Літва). Даследуе пытанні гісторыі і культуры беларускай літаратурнай мовы.*



ляўнічага, крымінальнага. У гэтым заканадаўчым акце юрыдычна замацаваны дзяржаўна-прававыя ідэі эпохі, выявілася багатая прававая культура беларускага народа. Складзены ён на беларускай мове. У аснове беларуская прававая лексіка. Вось чаму Статут (1588) быў зразумелы большасці народа, у адрозненне ад Заходняй Еўропы, дзе на той час карысталіся рымскім правам, выкладзеным на латыні. Мовай Статута (1588) ганарыліся яго сучаснікі. У дадатку Л. Сапега запісаў: *"Так кождый обыватель годен наганенья, который вольностью се фалить и прав своих умети и разумети не хочеть, которым правом усю вольность свою обваровану маеть. А если которому народу встыд прав своих не умети, поготовю нам, которые не обчим яким языком, але своим власным права списаные маем и кождого часу, чого нам потреба ку отпору всякое крывды, ведати можем"*.

Сістэматызацыя права, на аснове якой стварыўся Статут (1588), рабілася паводле новых прынцыпаў: намячалася раздзяленне ўладаў, з-за чаго заканадаўчая ўлада замацоўвалася за соймам, выканаўчая – за вялікім князем і радай, судовая – за вялікакняжацкім, галоўным, а таксама за мясцовымі судамі; абвяшчалася неабходнасць прытрымлівацца дзяржаўнага суверэнітэту; гарантавалася адзінства права для ўсёй дзяржавы і ўсіх паўнапраўных людзей; вызнаваўся прыярытэт пісанага права. Побач з тыпова феадальнымі прававымі нормамі ў Статут (1588) таксама былі ўключаны нормы, народжаныя распаўсюджаннем ідэяў Рэфармацыі і гуманізму. Праз увесь Статут (1588) праводзіцца тэза ўмацавання прававога парадку, пры якім усе дзяржаўныя органы і службовыя асобы абавязаны былі дзейнічаць толькі ў адпаведнасці з законам. Ідэя прававога парадку была накіравана найперш супраць дэспатызму гаспадара, буйных феадалаў і сярэднявечнай тэакратычнай тэорыі паходжання і сутнасці дзяржавы. Гэта адлюстравалася ў многіх артыкулах Статута (1588), а таксама было выкладзена Л. Сапегам у яго прысвячэнні Жыгімонту III і ўсім станам ВКЛ: *"Для того права суть поставлены, абы можнаму и потужному не все было вольно чинити. Яко цыцеро поведил, иж естесьмо невольниками прав для того, абысьмы вольности уживати могли"*.

Статут (1588) стаў помнікам юрыдычнай думкі, раўназначнага якому не ведала тагачасная Еўропа. Яго выданне мела выключнае значэнне для ўсёй наступнай гісторыі Беларусі, на тэрыторыі якой трэці Статут быў абавязковы два з паловай стагоддзі. Сведчаннем таго, што інтэлектуальнай і палітычнай элітамі Статут (1588) лічыўся актуальным зводам юрыдычных законаў, з'яўляецца яго юрыдычна-прававая вартасць амаль да сярэдзіны XIX ст. У ВКЛ Статут (1588) дзейнічаў да канца існавання Рэчы Паспалітай, а пасля далучэння Беларусі да Расіі ў Віцебскай і Магілёўскай губернях – да 1831 г., у Кіеўскай, Валынскай, Падольскай, Менскай, Віленскай і Гарадзенскай губернях – да 1840 г. Толькі ў 1840 г. Мікалай I замест Статута (1588) увёў на тэрыторыі Беларусі расійскае заканадаўства.

Для суседніх краінаў Статут (1588) стаў узорам прававой думкі. У 1614 г. ён быў надрукаваны ў перакладзе на польскую мову і потым перавыдаваўся яшчэ шэсць разоў, а ў 1881 г. выдадзены на рускай мове, прычым пераклад быў зроблены з польскай. Статут (1588) выкарыстоўваўся на тэрыторыі Кароны ў практыцы шляхецкіх судоў у XVII – XVIII стст. У XVII ст. для Прыбалтыкі Статут (1588) быў перакладзены з польскай мовы на нямецкую. Ён ужываўся ў Маскоўскай дзяржаве, стаў адной з асноўных крыніцаў рускага права, вядомага як *"Соборное уложение"* 1649 г. Статутам (1588) карысталіся і ва Украіне: на яго аснове быў складзены ўкраінскі збор законаў пад назвай *"Права, по которым судится малороссийский народ"*. Калі на парадку дня стала пытанне кадыфікацыі права Рэчы Паспалітай, асновай яе стаў Статут (1588). Канстытуцыя 1768 г. прадугледжвала падрыхтоўку праекта карэктуры права таксама найперш са Статута (1588), а потым з цывільнага рымскага права ці з іншых законаў, але Польшча ў той час так і не прапанавала сваёй уласнай прававой кадыфікацыі.

Праз восем гадоў кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст, выступаючы 11 верасня 1776 г. у сойме з троннай прамовай, гаварыў, што Статут (1588) заслугоўвае самай справядлівай павагі, бо ім шчасліва і разумна карыстаюцца да гэтага часу грамадзяне ВКЛ, таму многія ваяводствы Польшчы жадаюць, каб для іх ён таксама стаў правам, і пажадаў, *"каб у Кароне дайшлі да такога шчасця, якім ганарыцца Літва* (г. зн. Беларусь. – ***М. Н.***)*"*.

Такім чынам, Статут (1588) увасобіў найвышэйшае дасягненне сярэднявечнай прававой культуры Беларусі. Ён значна паўплываў на развіццё права Польшчы, Расіі, Украіны, Латвіі, Эстоніі. Нормы дзяржаўнага права, змешчаныя ў Статуце (1588), былі разумнымі і дасканалымі для свайго часу. Яны замацоўвалі дзяржаўны лад ВКЛ, абмяжоўвалі ўладу вялікага князя, гарантавалі шырокія палітычныя, асабістыя і грамадзянскія правы шляхты. Выданне Статута (1588) мела выключна важнае значэнне для ўсяго ВКЛ, бо гэта быў галоўны юрыдычны акт, які заканадаўча вызначаў дзяржаўнасць беларускай мовы, абараняў самастойнасць і незалежнасць дзяржавы.

**Спіс літаратуры**

1. **Саверчанка, І. В.** Канцлер Вялікага княства / І. Саверчанка. – Мінск, 1992.

2. **Статут Вялікага княства Літоўскага 1588** : Тэксты. Даведнік. Каментарыі. – Мінск, 1982.

3. **Статут Вялікага княства Літоўскага 1588** / Пераклад на сучасную беларускую мову А. С. Шагун. – Мінск, 2005.

4. **Юхо, І.** Крыніцы беларуска-літоўскага права / І. Юхо. – Мінск, 1991.

*З гісторыі беларускага дойлідства*

# ШЛЯХ СВЯТЫХ АПОСТАЛАЎ З ІТАЛІІ НА БЕЛАРУСЬ

## СКУЛЬПТУРНА-ДЭКАРАТЫЎНЫ АНСАМБЛЬ КАСЦЁЛА АРХАНГЕЛА МІХАІЛА Ў МІХАЛІШКАХ

Вывучэнне нацыянальнага барока як аднаго з самых плённых перыядаў у развіцці нашай культуры і мастацтва і сёння застаецца актуальным у беларускім мастацтвазнаўстве і прыцягвае ўвагу даследчыкаў.

Цікавасць да гэтага перыяду невыпадковая, бо "беларускае мастацтва існуе ва ўзаемаўплыве і ўзаемаўзбагачэнні, што не мае прамых аналогій у мастацтве Заходняй і Усходняй Еўропы і караніцца ў гістарычных асаблівасцях развіцця Беларусі, якая знаходзіцца на стыку лацінскага захаду і праваслаўнага ўсходу, што, у сваю чаргу, спрыяла ўзнікненню цесных сувязяў мастацтва як са старажытнарускай, так і з заходнееўрапейскай культурай" [2].

Значны ўклад у вывучэнне барока на Беларусі зрабілі як айчынныя, так і замежныя вучоныя. На працягу XX і ў пачатку XXI ст. у шматлікіх публікацыях і манаграфіях польскіх (А. Мілабэндзскі, М. Карповіч, С. Лоранц, М. Каламайская-Саед, Ю. Клос, Е. Пашэнда, М. Маралоўскі, Е. Орда, Е. Кавальчык і інш.), літоўскіх (С. Самалавічус, У. Дрэма, С. Самуолене) і беларускіх вучоных (М. М. Шчакаціхін, Н. Ф. Высоцкая, Т. В. Габрусь, А. Д. Квітніцкая, А. К. Лявонава, А. Б. Лазука, А. А. Ярашэвіч, А. А. Кулагін і інш.) праблема стылю барока на землях Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) разглядаецца ўсебакова і грунтоўна. У працах гэтых і іншых навукоўцаў даецца вельмі сур'ёзны і шырокі агляд беларускіх помнікаў XVI – XVIII стст., уводзяцца для навуковага выкарыстання новыя гістарычныя крыніцы, даследуюцца помнікі культавай і свецкай архітэктуры, творы жывапісу, скульптуры і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Беларускае барока – гэта унікальны сінтэз багатых традыцый і культурных уплываў і, у той жа час, самабытная з'ява, станаўленне якой зрабілася магчымым дзякуючы ўздзеянню высокамастацкіх твораў італьянскіх майстроў. Да цяперашняга часу маладаследаванай у кантэксце стылю барока застаецца інтэр'ерная пластыка культавых пабудоў на Беларусі XVII – XVIII стст.

Паколькі барока – гэта стыль, якому ўласцівы пышнасць, урачыстасць, эмацыянальная ўзнёсласць і шматлікія дэкаратыўныя эфекты, трэба адзначыць, што глыбокае разуменне архітэктуры гэтага перыяду магчыма толькі пры дэталёвым аналізе мастацтва аздаблення інтэр'ера. Менавіта ён з'яўляецца найважнейшым кампанентам мастацкай выразнасці сакральнай архітэктуры барока. Як правіла, унутраная частка архітэктурнай пабудовы найбольш чуйна адгукаецца на любыя змены ў стылі і дазваляе ўбачыць праяўленне яго асаблівасцей і мастацкіх інавацый.

У сакральнай скульптуры XVII – XVIII стст. мясцовымі і замежнымі майстрамі, што працавалі на Беларусі, часта выкарыстоўваўся **стук***, – матэрыял, які дазваляў дасягаць шматлікіх пластычных эфектаў і вырашаць складаныя мастацкія задачы, немагчымыя для іншага матэрыялу.

Папулярнасць стукавай скульптуры абумоўлена яшчэ і тым, што на Беларусі, у адрозненне ад Італіі, няма сваіх прыродных запасаў мармуру. У дакументах XVII – XVIII стст. майстры, якія працавалі ў гэтай тэхніцы, звычайна называліся "штука́тары", "гіпсатуршчыкі" ці "фальшмармурнікі" [10].

Стукавая пластыка інтэнсіўна выкарыстоўвалася ў беларускім культавым дойлідстве для стварэння галоўных і бакавых алтароў, круглай скульптуры, рэльефаў, раслінных матываў дэкору храма. На яе развіццё ў ВКЛ у другой палове XVII ст. найбольшы ўплыў аказала ламбардыйская школа пластыкі, што ўвабрала ў сябе багатыя традыцыі рымскай школы. Менавіта Ламбардыя (Паўночная Італія) у XVI – XVII стст. з'яўлялася тым месцам, дзе існавалі цэлыя дынастыі прафесійных майстроў-стукатараў. Невялікая тэрыторыя паміж ламбардыйскімі азёрамі Кома, Ізэа, Гарда, Варэзэ і іншымі стала месцам найбольшай канцэнтрацыі ў Еўропе майстроў мастацкай пластыкі. Стукатары з Паўночнай Італіі былі вядомы як "ticinesi", "intelvesi", "lombardi", "luganesi", але часцей за ўсё іх называюць "кама́скі", нягледзячы на тое, што гэта дастаткова агульны тэрмін для майстроў, якія нарадзіліся ў горадзе Кома і яго наваколлі. Менавіта яны ў XVII ст. распаўсюдзілі ламбардыйскі стыль не толькі ў Італіі, але і па ўсёй Еўропе, працуючы над стварэннем інтэр'ераў шматлікіх архітэктурных ансамбляў. Гэта тлумачыцца тым, што ў Італіі ў канцы XVII ст. пачынаецца эканамічны спад, у выніку якога памяншаюцца маштабы будаўніцтва. Таму высокакваліфікаваныя майстры стукавай пластыкі накіроўваліся ў Аўстрыю, Чэхію, Германію, Францыю і Рэч Паспалітую, дзе былі запатрабаваны іх талент і майстэрства, дзе мецэнатамі выступалі манархі і прадстаўнікі арыстакратычных фамілій.

Сярод магнатаў ВКЛ лічылася прэстыжным мець "свайго" італьянскага майстра, які выконваў бы праекты культавых і свецкіх пабудоў у еўрапейскім, "модным" духу.

---

* **Стук, сту́ка** (ад італ. *stucco* – гіпс, алебастр, у старажытнарымскім мастацтве – "opus albarium") – мастацкі матэрыял для аздаблення сцен і архітэктурных дэталей. Найвышэйшы гатунак тынкоўкі, якому ўласціва вялікая трываласць. Пасля паліроўкі мае від мармуру. У яго склад уваходзяць вапна, гіпс, мармуровая пудра, а таксама квасцы і клей. Стук – гэта матэрыял, які патрабуе ад майстра вельмі хуткай працы, бо на працягу гадзіны робіцца цвёрдым. Вядомы ўжо ў Старажытным Егіпце, быў пашыраны і ў старажытнарымскай архітэктуры, а пазней (з XV ст.) – у архітэктуры Італіі, Францыі, Германіі, Аўстрыі і Рэчы Паспалітай. У Расіі гэты матэрыял пачынае шырока выкарыстоўвацца толькі ў XVIII ст., а на тэрыторыі Беларусі – з канца XVI ст. Гэты матэрыял найбольш прыдатны для работ па аздабленні інтэр'ераў, таму што дазваляе дасягнуць вельмі складаных пластычных эфектаў.

Напрыклад, Радзівілы запрашаюць да сябе італьянскага архітэктара манаха-езуіта Джавані Марыя Бернардоні (1541 – 1605) для стварэння новай рэзідэнцыі "некаранаваных каралёў" Рэчы Паспалітай і касцёла Божага Цела (будаваўся ў 1587 – 1593 гг.), які з'явіўся першай барочнай пабудовай на тэрыторыі ўсёй Усходняй Еўропы. Для Сапегаў ды Пацаў працаваў ламбардыйскі скульптар П'етра Іаган Перці (1650? – 1728) і яго асістэнт Джавані Марыя Галі (? – ?). Тут варта ўзгадаць сабор Святых Пятра і Паўла ў Вільні – неператыдзены на тэрыторыі ўсёй Рэчы Паспалітай твор перыяду сталага барока, у якім можна заўважыць і свецкія рысы. Тут усхваляюцца подзвігі гетмана ВКЛ М. К. Паца (каля 1624 – 1682), у інтэр'еры налічваецца каля 2000 стукавых скульптур. Яшчэ адным шэдэўрам стукавай пластыкі ў ВКЛ (аўтарства яго прыпісваюць Перці) з'яўляецца аздабленне ўнутранай прасторы касцёла аўгусцінцаў у в. Міхалішкі – былым маёнтку вядомага магнацкага роду Бжастоўскіх [8].

Менавіта пра гэты храм Св. Архангела Міхаіла (в. Міхалішкі, Астравецкі раён Гродзенскай вобласці) пойдзе размова далей. Скульптурна-дэкаратыўны ансамбль касцёла – твор перыяду сталага барока (другая палова XVII – першая трэць XVIII ст.), выкананы са стуку італьянцам П'етра Перці і віленскім скульптарам Мікалаем Жылевічам, што прыехалі сюды ў 1670-я гг. па просьбе Кіпрыяна Паўла Бжастоўскага*, сына Яна Бжастоўскага, палкоўніка войскаў літоўскіх, які першым зрабіў фундацыю на будаўніцтва мураванага касцёла і запрасіў манахаў-аўгусцінцаў у свой маёнтак.

У знойдзеным намі акце фундацыі касцёла 1653 г. гаворыцца, што "яснавяльможны пан Ян Бжастоўскі, рэферэндарый ВКЛ і ваявода трокскі, з пабожнасці сваёй… у маёнтку сваім, Міхалішках, у ваяводстве віленскім, ашмянскім павеце фундаваў касцёл для святых айцоў закону Св. Аўгусціна" [6].

Першапачаткова храм быў нават асвечаны ў гонар Св. Іаана (Яна) Хрысціцеля і Св. Ганны, што падкрэслівае сувязь з Янам Бжастоўскім, першым яго фундатарам.

Пры епіскапе віленскім Канстанцыі Бжастоўскім у 1700 г. касцёл быў перайменаваны ў храм Св. Іаана Хрысціцеля і Архангела Міхаіла, а ўжо з другой паловы XIX ст. вядомы па дакументах толькі як касцёл Св. Архангела Міхаіла.


Будаўніцтва храма ішло на працягу 1653 – 1662 гг. пад кіраўніцтвам бельгійскага архітэктара Яна Пенса (1628? – ?). Архітэктура касцёла вытрымана ў стылі так званага сармацкага барока. Тут арганічна спалучаюцца гатычныя і рэнесансныя рысы, а ўнутранае дэкаратыўнае аздабленне рэзка кантрастуе са знешнім выглядам будынка, для якога характэрны строгасць і лаканічнасць. Для дэкору гэтага унікальнага помніка, выкананага ў 1677 г.**, уласцівы кампазіцыйная цэласнасць, пачуццё меры і вытанчанасць.



**Касцёл Св. Архангела Міхаіла ў в. Міхалішкі.**
1653 – 1662 гг. Інтэр'ер – каля 1677 г.



**Базіліка Сан-Джавані ін Латэрана.**
Пачатак IV ст. – 1735 г. Рым. Італія.




**Кафедральны сабор у г. Кома.**
1396 – 1740 гг. Паўночная Італія.

---

* **Кіпрыян Павел Бжастоўскі** (памёр у 1688 г.) – вядомы дыпламат свайго часу, тройчы быў пасланнікам Рэчы Паспалітай у Маскве: у 1667, 1679 і 1684 гг.


** Некаторыя даследчыкі (М. Каламайская-Саед, А. К. Лявонава, А. Б. Лазука) прытрымліваюцца меркавання, што скульптурна-дэкаратыўны ансамбль касцёла Архангела Міхаіла ў Міхалішках выкананы ў перыяд з 1695 да 1700 г. – *Заўвага рэд.*




***П. І. Перці, М. Жылевіч.*** **Св. Іаан.** Каля 1677 г. Касцёл Св. Архангела Міхаіла ў в. Міхалішкі.



***Ф. К. Бараміні.*** **Св. Іаан.** 1646 – 1650 гг. Базіліка Сан-Джавані ін Латэрана. Рым.




***Невядомы майстар.*** **Св. Іаан.** 1396 – 1740 гг. Кафедральны сабор у г. Кома.

Неабходна памятаць пра тое, што для аздаблення інтэр'ера існавалі пэўныя каноны, у адпаведнасці з якімі ствараліся выявы святых. Кожны біблейскі персанаж меў сваё месца ў прасторы храма, свой атрыбут-сімвал, што дазваляў ідэнтыфікаваць вобраз.

У Міхалішскім касцёле ў рамах, аздобленых раслінымі матывамі, выкананых з белага, ледзь таніраванага стуку, змешчаны фігуры апосталаў. Згодна з Бібліяй, апосталы – гэта вучні Іісуса Хрыста, якія неслі людзям усяго свету яго вучэнне. У хрысціянскай іканаграфіі 12 апосталаў – Іаан, Фадзей, Мацвей, Варфаламей, Сіман, Фама, Філіп, Іакаў Старэйшы і Іакаў Малодшы, Андрэй, Пётр і Павел. У касцёле Міхалішак скульптуры маюць наступную паслядоўнасць: каля галоўнага алтара – Андрэй, Пётр і Павел, Іакаў Старэйшы; каля хора па кутах – Варфаламей, Сіман, Фадзей, Мацвей; на чатырох піляструх – Іакаў Малодшы, Іаан, Фама, Філіп.

Скульптуры апосталаў у гэтым храме – адны з самых дасканалых сярод твораў перыяду стала-га барока Беларусі, якія былі зроблены са стуку і захаваліся да нашых дзён. У каталіцкім касцёле апостальскі рад вельмі часта змяшчаецца ў галоўным нефе храма. Для мастацтва барока ўвогуле ўласціва ўзвышаная эмацыянальнасць, што спрыяла глыбокаму і моцнаму ўздзеянню на пачуцці вернікаў. У інтэр'еры вобразы апосталаў павінны былі нагадваць пра хрысціянскае служэнне, пакуты ў імя вызвалення ўсяго чалавецтва ад грахоў. У касцёле Міхалішак амаль усе святыя паказаны са сваімі сімваламі-атрыбутамі, а часткі інтэр'ера кампазіцыйна звязаны ў адзіны ансамбль. Памеры скульптурных выяў у два разы перавышаюць рост чалавека. Яны паказаны напаўпаварота і звернуты да галоўнага алтара. Дынамічныя складкі плашчоў даюць адчуванне руху ўсіх фігур у прасторы, што стварае своеасаблівае тэатральна-сцэнічнае дзейства, характэрнае для стылю барока.

Відавочна, што адзін з аўтараў вырашэння ўнутранай прасторы касцёла ў Міхалішках П'етра Перці (родам з Ламбардыі) добра ведаў як паўночнаітальянскія, так і рымскія ўзоры скульптуры, бо дакладна вядома, што на тэрыторыю ВКЛ ён прыехаў у 1660-я гг. з Рыма, дзе, хутчэй за ўсё, вывучаў архітэктуру. Так, галоўны і бакавыя алтары касцёла Архангела Міхаіла ўпрыгожаныя вітымі калонамі, якія ўпершыню скарыстаў вялікі італьянскі архітэктар і скульптар Джавані Ларэнца Берніні (1598 – 1680). Акрамя таго, у праекце Міхалішскага храма прасочваецца імкненне да засваення іканаграфічнай схемы галоўнага храма ордэна аўгусцінцаў-канонікаў рэгулярных, ад прыналежнасці да базілікі Сан-Джавані ін Латэрана яны атрымалі назву "латэранскіх"*.

---

* **Аўгусцінцы** (лат. *Augustiniani*) – неафіцыйная назва членаў некалькіх манаскіх ордэнаў і кангрэгацый каталіцкай царквы, якія арыентаваліся на "Статут Святога Аўгусціна", напісаны пасля смерці святога (430 г.). Аўгусцінцы-канонікі рэгулярныя (Canonici Regularis Sancti Augustiniae, CRSA) з'яўляюцца святарамі, жыццю іх уласцівы некаторыя рысы манастырскага ўкладу. Іх адзенне – белы падраснік з воўны, наплечнікі, чорная раса з доўгімі рукавамі, капюшон і скураны пояс.

Разам з тым у мастацтвазнаўчых даследаваннях скульптурна-дэкаратыўнага ансамбля касцёла Архангела Міхаіла сувязь са скульптурамі апосталаў з рымскай базілікі Сан-Джавані ін Латэрана і кафедральнага сабора ў г. Кома (Ламбардыя, Паўночная Італія) дасюль не адзначалася.

Звернем увагу на самыя відавочныя рысы падабенства з італьянскімі аналагамі ў трактоўцы фігур апосталаў.

Выява апостала Андрэя ў Міхалішскім касцёле вельмі падобная да рымскіх – паўтараюцца поза і жэсты. Варта адзначыць, што гэта самая іканаграфічна блізкая да скульптур Сан-Джавані ін Латэрана выява святога.

Апостал Пётр у касцёле Св. Архангела Міхаіла паказаны з двума ключамі, якімі адчыняецца Нябесная Брама, што набліжае скульптуру да іканаграфіі рымскай базілікі.

Постаць св. Паўла ў Міхалішках зроблена скульптарам без традыцыйнага атрыбута (мяча) апостала і нагадвае работу Дж. Л. Берніні "Св. Лангін" у рымскім саборы Св. Пятра.

Вобраз апостала Варфаламея вельмі блізкі да фігуры ў Сан-Джавані ін Латэрана і адпавядае рэлігійна-мастацкай традыцыі паказу з нажом і скурай у руках (прыняў пакутніцкую смерць – з яго знялі скуру нажом). Цікава, што менавіта такі экспрэсіўны вобраз, перададзены з усёй глыбінёй і трагічнасцю, з'яўляецца і распаўсюджваецца ў мастацтве барока. У гатычнай скульптуры кафедральнага сабора ў г. Кома гэты апостал паказаны толькі з Бібліяй у руках.

Стукавая выява апостала Сімана ў Міхалішскім касцёле дапоўнена драўлянай пілой, пафарбаванай у белы колер (згодна з паданнем, святы быў распілаваны).

Фігура апостала Фадзея іканаграфічна вельмі блізкая да скульптуры таго самага святога ў базіліцы Сан-Джавані ін Латэрана.

Апостал Мацвей як евангеліст звычайна паказваецца з анёлам, але ў Міхалішках гэтага сімвала няма – святы трымае крыж і кнігу, у той час як у Сан-Джавані ін Латэрана і кафедральным саборы г. Кома – толькі кнігу.

Апосталу Іаану ў хрысціянскай іканаграфіі адпавядаюць у якасці атрыбутаў келіх і арол, які сімвалізуе высокі палёт багаслоўскай думкі. У Міхалішскім касцёле гэтая скульптура мае найбольшае падабенства з выявай св. Іаана ў саборы Сан-Джавані ін Латэрана.

Апостал Фама паўстае перад гледачом у вобразе пілігрыма – з капелюшом за плячыма, посахам, дарожнай торбай і Бібліяй. У рымскай базіліцы ён паказаны з кап'ём і ў плашчы.

Як і ў кафедральным саборы г. Кома, выбітным помніку ламбардыйскай пластыкі, у Міхалішскім касцёле скульптурныя фігуры размешчаны на пастаментах-кансолях. Аднак гэтыя кансолі маюць не акруглую, а квадратную форму, як у базіліцы Сан-Джавані ін Латэрана.

У інтэр'еры культавай архітэктуры Італіі XVI – XVIII стст. прысутнічаюць сімвалы і атрыбуты фундатараў храма. У помніках барока ВКЛ гэтая традыцыя таксама праяўляецца.

Святы патрон Яна Бжастоўскага – Іаан Хрысціцель – паказаны тройчы ў галоўным і бакавым алтарах, а таксама ў апостальскім радзе. Картуш з гербам Бжастоўскіх трымае ў кіпцюрах разны арол, змешчаны пад амбонам.

Такім чынам, дзякуючы фундацыі Бжастоўскіх для стварэння стукавага дэкору ў Міхалішкі былі запрошаны італьянскі майстар П'етра Іаган Перці і мясцовы скульптар (хутчэй за ўсё, разьбяр) Мікалай Жылевіч, які актыўна ўспрыняў высокія мастацкія дасягненні рымскай і ламбардыйскай школ. У далейшым гэта спрыяла стварэнню мясцовага варыянта барока, дзе адначасова з засваеннем заходнееўрапейскай барочнай стылістыкі захоўваюцца і мясцовыя візантыйскія традыцыі.

**Спіс літаратуры**

1. **Высоцкая, Н. Ф.** Пластыка Беларусі XII – XVIII стст. / Н. Ф. Высоцкая. – Мінск : Беларусь, 1983. – 230 с.

2. **Высоцкая, Н. Ф.** Сакральная живопись Беларуси XV – XVIII веков / Н. Ф. Высоцкая. – Минск : Беларусь, 2007. – 216 с.

3. **Габрусь, Т. В.** Мураваныя харалы : Сакральная архітэктура беларускага барока / Т. В. Габрусь. – Мінск : Ураджай, 2001. – 287 с.

4. **Кулагін, А. М.** Каталіцкія храмы на Беларусі. Энцыклапедычны даведнік / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2000. – 216 с.

5. **Лазука, Б. А.** Гісторыя беларускага мастацтва : у 2 т. / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2007. – Т. 1. – 252 с.

6. **Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў** (LVIA). – F. SA. – Ap.31. – L. I – III.

7. **Лявонава, А. К.** Старажытнабеларуская скульптура / А. К. Лявонава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 341 с.

8. **Пыко, А. В.** Итальянский скульптор Пьетро Иоганн Перти (1650? – 1728) и искусство Беларуси / А. В. Пыко // Паведамленні Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Выпуск 5. – Мінск : ТАА "Белпрынт", 2007. – С. 153.

9. **Encyklopedia Katolicka** / pod red. F. Gryglewicza, Z. Sułowskiego. – Lublin : Towarystwo Naukowe KUL, 1995. – T. 1. – 1312 s.

10. **Drema, W.** Materiały do historii sztuki WKL : Jan Krzystof Glaubiczs, Jan Hedel Jan Melich // Biuletyn Historii sztuki. – 1980. – № 1. – s. 63 – 75.

11. **Kałamajska-Saeed, M.** Materiały do dzejów sztuki sakralnej. Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego woewodstwa wileńskiego. – Kraków, 2005. – T. I.

12. **Ostrowski, J. Hr.** Księga Herbowa Rodów Polskich / J. Hr. Ostrowski. – Warszawa, 1897. – 620 s.

13. **Samuolene, S.** Kai kurié XVII a. antrosios pusés stiuko lipdybos bruožai Lietuvoje / S. Samuolene. – Vilnius, 1983. – 76 s.

14. **Słównik geograficzny królewstwa Polskiego I innych krajów słowiańskich** / pod red. B. Chlebowskiego, W. Walewskiego. – Warszawa, 1885. – T. IV. – 963 s.

**Аляксандр ПЫКО,**
аспірант БДАМ, малодшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

*Артыкул рэкамендаваны да друку кафедрай этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ.*

Віктар КАРАМАЗАЎ

# БЯРОЗАВЫ ШЛЯХ

**ЭСЭ***

Аднойчы на выставе, спыніўшыся перад пейзажам разам з яго аўтарам Антонам Бархатковым, я меў неасцярожнасць яму сказаць:

– Цудоўны эцюд.

Ён на мяне імгненна кінуў халодным вокам, быццам я нядобра выказаўся пра яго мастацтва, але змаўчаў.

Калі ж мы адышлі ад пейзажа, Антон Стафанавіч, спыніўшыся, рашуча грукнуў кіем у падлогу і вымавіў, як быццам пра штосьці іншае:

– Эцюд пішаш за адзін сеанс. Убачыў матыў у натуры і пішы. А карціну трэба пражыць, у сэрцы выкалыхаць, як песню.

Прайшлі гады. З намі, жывымі, ужо не было гэтага апантанага жывапісам чалавека. Сінім сакавіком, падобным на той, што на яго карціне, ён пайшоў туды, адкуль ніхто не вяртаецца. Мы з Ігарам, ягоным сынам, таксама мастаком ад Бога, па кроўнай спадчыне, рыхтавалі да выдання кнігу пра Антона Стафанавіча. Яшчэ раз углядаючыся ў яго "Бярозавую дарогу", Ігар у мяне спытаў:

– А ці бачыце вы тут чалавека?

Я зноў угледзеўся ў пейзаж. Дарога, лес, бярозы, снег. А дзе тут чалавек? І раптам удалечыні, там, дзе дарога сыходзілася з небам, на саменькім пачатку сіняй, як усё неба, каляіны, я заўважыў штосьці дробнае, як плямка, мазочак пэндзля, як зярнятка. Там, можа, чалавек? Больш пільна ўгледзеўся: так, – чалавек ідзе. Глянуў ізноў на Ігара – усмешка на яго твары здымала пытанне.

– Але… калі там чалавек, дык вельмі ж малы?

– Бацька і быў нярослы. Хадзіў у школу – зусім дзіця. А шлях – са Шчыглоўкі, ягонай роднай вёскі, у Бялынкавічы. Туды, дзе была школа. Ён яе любіў.

Тады я ўбачыў як бы іншую карціну. Перада мною быў ужо не толькі сонечны вясновы дзень, не проста вясновы шлях у пейзажы, а чалавек у ім, дзіця ў ім са сваёй любоўю і цікаўнасцю да неабдымнага і казачна-загадкавага свету. Я ўспомніў, як мастак казаў мне пра сваё маленства, з якім ён хваляваннем успамінаў яго малюнкі і што ў тых успамінах заўсёды, як сонечны прамень, святлілася ад роднай хаты ў свет дарога. Яна яго, яшчэ зусім малога, аднойчы вывела за вёску, за аколіцу, не далей, пасля прывяла ў лес, у магутныя дубровы ды бары, якія сыпалі яму ў кош грыбы, чарніцы ды суніцы, аднойчы зманіла ў лугавыя краскі, з сямі гадкоў пачаў ганяць сваю кабылу на начную пашу, там убачыў новае жыццё ля вогнішча ў гурме з вясковымі падлеткамі, пачуў начныя галасы і страхі. Шлях з вёскі вывеў на сваё поле, якое ўсёй сям'ёй аралі, засявалі, з якога ў двор везлі і бульбу, і буракі, і збожжа ў снапах. З маці ды айчымам тым шляхам ездзілі на сенажаць, адтуль вазамі везлі сена. Колькі ні хадзіў, ні ездзіў тым сваім шляхам – а ён і сапраўды з маленства быў сваім, як родны дом, – заўсёды была загадка: што далей, куды яшчэ вядзе шлях, што там, за лесам, за полем, за вёскаю, за начнымі, на пашы, вогнішчамі. Аднойчы маці запрэгла кабылу і гэтым шляхам ехалі доўга, пакуль не апынуліся ў вялікай незнаёмай вёсцы. Там была школа, і маці завяла яго ў тую школу. І з таго часу ён шмат гадоў за пяць вёрстаў хадзіў у Бялынкавічы ў школу. Кожны дзень: пяць вёрстаў туды, пяць вёрстаў – назад, у любое надвор'е. Машыны ў той час па дарозе не ездзілі, пад'ехаць на чужым кані даводзілася зрэдку. Ішоў і ў лютыя зімовыя маразы, і пад дажджом асеннім, і ў цемені, як дні кароткія. І ў крыўдзе на свой шлях не быў ніколі. Аднойчы, набраўшы ў лесе суніц, пайшоў з імі далей за школу, каб даведацца, куды ідзе яго дарога, і выйшаў на чыгуначную станцыю. Прадаў суніцы, сеў у цягнік, каб убачыць, куды бягуць сталёвыя рэйкі, што далей, за вялікай вёскай. І апынуўся ажно ў Маскве. А там – ні роднай хаты, ні матулі, ні скарынкі ў кішэні, ні грошай. Прыбавілася ў сталіцы адным бадзягам, беспрытульнікам. Трапіў у міліцыю, адтуль збег, зноў злавілі і апынуўся ўрэшце рэшт у войску. Апранулі ва ўсё вайсковае, па назе падабралі малыя салдацкія боты і зрабілі вясковага падлетка сынам палка. Там спыталі, што ўмее рабіць. Пачаў пералічваць: пасвіць жывёлу, хадзіць за плугам, з сякераю, з пілою, з касою. А яшчэ? Успомніў, што маляваць любіў. То вугалем, то крэйдаю, то цаглінкай. А фарбамі, алоўкамі? Далі і фарбы, якіх яшчэ не бачыў, і алоўкі. Зрабілі пры салдацкім клубе мастаком.

Калі пасля пыталіся ў Антона Бархаткова, як ён прыйшоў у мастацтва, ухмыляўся, але казаў праўду:

– Прывёў у мастацтва шлях бярозавы.

Казаў тое, што сэрцам адчуваў. І тых, што на шляху, бяроз ніколі не забываў. І ў маладыя гады, і ў старыя, апошнія. Жыў у Мінску, а па сваіх бярозках на радзіме, на тым шляху, тужыў. Была магчымасць, наведваўся ў родную Шчыглоўку, у Бялынкавічы, у сваю школу, на свой шлях. Ішоў ці ехаў па ім – спыняўся, пазнаючы адну бярозку, другую, трэцюю. Ім кланяўся. Ставіў на шляху эцюднік – пісаў. Вясною, восенню, зімою. Гэтая дарога з вёскі, бярозы гэтыя шмат на якіх яго карцінах і эцюдах, хоць кожную работу называў па-рознаму: "Бярозавая дарога", "Зі-

* Пачатак эсэ змешчаны на чацвёртай старонцы вокладкі часопіса.

мовая дарога", "Вясновая дарога". Усё жыццё любоўю сплачваў дарозе свае даўгі.

Пісаў сваю любоў як быццам для сябе, як таямніцу, але яна была відаць усім, асабліва ў родным краі. У школе, дзе вучыўся, у Бялынкавічах, падрасталі маладыя таленты, і яны ўжо любілі свой родны край як бы яго любоўю. У гэтым яму, старому мастаку, аднойчы і назаўсёды прызнаўся выдатны наш паэт, выхаванец той самай школы Алесь Пісьмянкоў:

*Зноў словы, словы, словы.*
*Гаючых слоў ужо няма.*
*А на палотнах Бархаткова*
*Стаіць гаючая зіма.*
*Стаіць сасоннік пры дарозе,*
*І санны след*
*Ляціць у свет.*
*Яго бяроза на марозе*
*Зімовы думае санет.*
*Няўмольны час імгненні лічыць.*
*Ды што адлік мне той цяпер:*
*Я ў мастака святла пазычыў,*
*Узяў, як кажуць, на павер.*

Удзячна. Сардэчна. Хораша.

Няўмольны час ужо вылічыў і адлічыў дні і мастака, і паэта. Спыніў свой лік. Але бяжыць, як бегла, дарога праз лес паміж Шчыглоўкай і Бялынкавічамі ў Касцюковіцкім раёне, бяжыць у вечнасць бярозавы шлях Антона Бархаткова, і ўжо беражэ памяць пра свайго мастака, ужо ён яму спявае свой санет.

*Імгненне і вечнасць*

# РЭДКІ ЗДЫМАК ЯДВІГІ БЯГАНСКАЙ



На гэтым здымку – беларуская пісьменніца Ядвіга Бяганская разам з 7-гадовым сынам Уладзіславам і… маленькім белым медзведзянём. На заднім плане бачны заснежаны краявід з невыразнымі пабудовамі. Так, гэта Поўнач, а калі дакладней – Чукотка. Няцяжка здагадацца, што пісьменніца патрапіла туды не па сваёй волі, а раздзяліла лёс тысячаў іншых беларусаў, рэпрэсіраваных сталінскім рэжымам і кінутых за калючы дрот далёка за межамі Радзімы. Многія не вытрымлівалі жорсткіх выпрабаванняў, але некаторыя сапраўды гераічныя людзі нават у такіх нечалавечых умовах знаходзілі ў сабе сілы верыць у лепшае, спадзявацца, кахаць – і выжывалі. Менавіта ў калымскім лагеры і з'явіўся на свет 6 лістапада 1940 г. Уладзіслаў – дзіця лагернага рамана паміж Ядвігай Бяганскай і яшчэ адным выгнаннікам з Беларусі – мастаком Міхаілам Ліберфарбам.

Закаханым было наканавана расстацца праз нейкі час пасля знаёмства: вясною 1940 г. Міхаіла адправілі ў Хабараўск нібыта на перагляд справы, потым ва Уладзівасток, а адтуль – на Чукотку, пазбавіўшы права на перапіску. Вызваліўшыся 17 лістапада 1947 г., мастак атрымаў працу ў Чаўн-Чукоцкім упраўленні Дальбуда. Крыху раней атрымала свабоду і Ядвіга Бяганская, якая забрала з Магадана сына і адправілася разам з ім грузавым самалётам да мужа на Чукотку. Менавіта тады 7-гадовы сын упершыню пазнаёміўся з бацькам. На здымку Міхаіла Ліберфарба няма – ён застаўся за кадрам. А можа, гэта ён і фатаграфаваў?

У мінулым засталіся цесныя халодныя баракі з клапамі ды вошамі, тыфам і дызентэрыяй, прыгнёт і знявагі з боку лагернага начальства і зэкаў-крымінальнікаў, катаржныя будні на лесапавале…

Напарадзе шчаслівае вяртанне на радзіму, доўгачаканая сустрэча з роднымі, сціплае і ўсё яшчэ падгляднае жыццё ў Рэчыцы, марныя спробы ўладкавацца на настаўніцкую працу і як вынік – удалае і плённае самасцвярджэнне ў дзіцячай літаратуры.

Вось як бачыла сваю жыццёвую і творчую задачу сама пісьменніца: *"Зведаўшы ў сваім жыцці столькі несправядлівасці, жорсткасці, хлусні, здзеку, непасільнай працы, голаду і холаду, я імкнулася сваімі творамі выхоўваць у дзецях усе лепшыя якасці чалавечага характару – непрымірымасць да хлусні і несправядлівасці, спагаду да людзей, бескарыслівасць, працавітасць, дабрыню, высакароднасць, любоў да Радзімы".*

**Віктар ЖЫБУЛЬ.**

*Летась у чэрвеньскім нумары "Роднага слова" друкаваўся артыкул Людмілы Карпавай «"Я да канца свайго жыцця буду верыць…": Жыццё і творчасць Ядвігі Бяганскай».*

# ВЫЯВЫ КЛАСІКАЎ АЙЧЫННАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ІХ ТВОРАЎ У ЭСТАМПАХ БЕЛАРУСКІХ ГРАФІКАЎ. 1980-я гг.

Сярод найлепшых узораў беларускай станковай графікі можна вылучыць шматлікія творы, у якіх мастакі звярталіся да вобразаў класікаў айчыннай літаратуры і іх спадчыны. "Літаратурная тэма" на працягу 1980-х гг. стала адной з галоўных тэндэнцый гэтага віду мастацтва графікі.

Зварот да класікі айчыннай літаратуры для беларускага эстампа быў новай з'явай пачынаючы з 1960-х гг. У гэты перыяд на аснове кніжных твораў ствараліся графічныя серыі і цыклы. Паказальныя ў гэтым сэнсе графічныя аркушы Георгія Паплаўскага, Арлена Кашкурэвіча, Людвіга Асецкага, Яўгена Кулікa, Мікалая Рыжыкава і інш.

Але асабліва распаўсюджанай стала гэтая тэма ў 1980-я гг. пад уплывам працэсаў нацыянальна-культурнага адраджэння, пачатых яшчэ на мяжы XIX – XX стст. Натхнёны кардынальнымі пераменамі ў грамадскім і культурным жыцці ў гады перабудовы і галоснасці, беларускі рух ставіў за мэту нацыянальна-культурнае адраджэнне народа. Абуджэнню нацыянальнай свядомасці спрыялі шматлікія публікацыі, прысвечаныя культуры, мове, гісторыі Беларусі. Беларусы імкнуліся самаідэнтыфікаваць сябе як нацыю. У 1980-я гг. у краіне актыўна вывучалася спадчына мінулых часоў. Мастакі часта звярталіся да традыцый народа, імкнуліся творча іх пераасэнсаваць.



***Мікола Купава.*** **З ілюстрацый да кнігі "Паэзія" Цёткі.**
Лінарыт. 1986 г.

Графіцы як мастацтву найбольш масаваму і дэмакратычнаму ў гэты час належала асаблівая роля. Менавіта графікі адны з першых адгукнуліся на актуальныя праблемы беларускай культуры і яе развіцця. Рабіліся першыя спробы надаць ідэйнаму сэнсу нацыянальную форму. Асобныя аўтары выступалі як беларускія мастакі не толькі ў геаграфічным, этнічным, але і ў стылістычным плане, акцэнтуючы ўвагу ў творах на элементах з народнага побыту, этнаграфічных матывах. У гэты перыяд у сучасным беларускім мастацтве графікі адбывалася закладка падмуркаў нацыянальнага стылю, вызначаліся асноўныя тэматычныя, стылістычныя і пластычныя пошукі. На хвалі нацыянальна-культурнага пад'ёму ў асяродку айчынных мастакоў узмацнілася імкненне да звароту да адлюстравання творчасці дзеячаў культурнага адраджэння мяжы XIX – XX стст., якія ў беларускай літаратуры прадстаўленыя імёнамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Цёткі (Алаізы Пашкевіч) і інш.

Яшчэ ў 1970-я гг. склалася традыцыя арганізоўваць выставы ў гонар айчынных асветнікаў, змагароў за свабоду. Першая з іх была прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння беларускай паэткі-рэвалюцыянеркі Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у 1976 г. Міхаіл Баразна адзначыў, што "менавіта на выставе 1976 года была закладзеная новая яскравая тэндэнцыя нацыянальна-культурнага адраджэння ў беларускім выяўленчым мастацтве" [1, с. 70]. У 1980-я гг. працягам гэтай традыцыі сталіся выставы, прымеркаваныя да гадавінаў Максіма Багдановіча (1981), Янкі Купалы і Якуба Коласа (1982, 1992), Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Цёткі (1986).

Грамадзянскі пафас і служэнне народу айчынных барацьбітоў за свабоду, асветнікаў і гуманістаў натхнілі многіх мастакоў краіны на стварэнне шматлікіх твораў у іх гонар, увасобленых у розных жанрах. Згадаем літаграфіі "Янка Купала ў Ляўках" (1983) і "Адам Міцкевіч" (1986) **Сямёна Геруса**, "Мой родны кут" (1982) **Уладзіміра Басалыгі**,

*Маладая даследчыца выяўленчага мастацтва Алена Шычко падрыхтавала для "Роднага слова" яшчэ адзін матэрыял пра беларускі эстамп, у найбліжэйшых нумарах будзе надрукаваны расповед пра фальклорныя матывы ў творчасці айчынных графікаў.*



***Яўген Кулік*. З ілюстрацый да паэмы "Песня пра зубра" Міколы Гусоўскага.** Туш, пяро. 1980 г.

"Максім Багдановіч" (1982) **Антаніны Лапіцкай**, "Якуб Колас і дзеці. 1906" (1982) **Барыса Цітовіча**, каляровую літаграфію "Янка Купала" (1980) **Рыгора Сітніцы**, літаграфічныя партрэты, выкананыя **Міхаілам Басалыгам**, **Мікалаем Селешчуком,** і іншыя.

У межах актуальнасці акрэсленай праблемы варта звярнуцца да творчасці графіка Міколы Купавы, які асталяваўся ў эстампе ў канцы 1970 – пачатку 1980-х гг. як надзвычай своеасаблівы мастак. Творчым крэда яго стала служэнне сваёй дзейнасцю развіццю беларускай культуры. Галоўная яго тэма – гісторыя Беларусі, нацыянальна-культурнае адраджэнне і яго найлепшыя прадстаўнікі. Мастак яскрава раскрыў уласную творчую манеру: ён выкарыстоўвае ўпэўнены штрых у кантрастнай паводле выяўленчых сродкаў тэхніцы лінагравюры, а таксама літаграфіі. Працы ў асноўным манахромныя, маюць знакавы манументальны характар. Гістарызм вобразаў дасягаецца зваротам мастака да духоўных сімвалаў і вобразаў беларускай гісторыі. Ствараючы гістарычныя вобразы, майстар пры неабходнасці робіць рэканструкцыю паводле архіўных дакументаў. Таму творы М. Купавы ўяўляюць з сябе сінтэз мастацкай і навукова-даследчай працы.

Сваю творчую канцэпцыю мастак праводзіць у жанры гістарычнага партрэта. Сярод яго партрэтных прац лінагравюры "Францішак Багушэвіч" (1979), "Вінцэсь Каратынскі" (1981), "Натхненне. Якуб Колас" (1982). Усе яны з'яднаныя беларускай нацыянальнай ідэяй. У іх адчуваюцца роздумы над гістарычнымі лёсамі герояў, захапленне іх яскравым высакародным жыццём, асаблівы рамантызм. Эстампы мастака, прысвечаныя беларускім асветнікам Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу, Францішку Багушэвічу, Максіму Багдановічу, Міколу Гусоўскаму, Алаізе Пашкевіч, сцвярджаюць натхнёнасць, самаўсведамленне асобы – носьбіта сваёй нацыянальнай культуры. У творчасці Міколы Купавы знайшоў адлюстраванне і гістарычны пейзаж у серыях літаграфій "Родны кут" (1982), "Шляхамі Янкі Купалы" (1980), прысвечаных нашым песнярам.

У 1980-я гг. эстэтычнае асэнсаванне нацыянальнай праблематыкі шырока адлюстроўвалася не толькі ў выяўленчым мастацтве, але і ў літаратуры, тэатры, кіно. Асабліва цесна мастацтва беларускага эстампа перагукалася з мастацтвам кніжнай графікі, калі адны і тыя аўтары, што ілюстравалі творы класікаў літаратуры, пазней рабілі станковыя працы паводле матываў гэтых самых твораў, нібы нанова пераасэнсоўваючы і абагульняючы ранейшы набытак. У большасці выпадкаў тэма раскрывалася з дапамогай пэўнай колькасці графічных аркушаў, кожны з якіх з'яўляецца неад'емнай арганічнай часткай серыі або цыкла.

Літаратурная спадчына Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча, Івана Мележа і іншых беларускіх пісьменнікаў знайшла шырокае адлюстраванне ў 1980-я гг., сведчаннем чаму вялікая колькасць тагачасных эстампаў. У гэтым кантэксце трэба адзначыць серыю літаграфій **Віктара Александровіча** паводле твора "Адвечная песня" (1979) Янкі Купалы, серыю каляровых літаграфій **Канстанціна Вашчанкі** "Тры паэмы" (1981), прысвечаную творчасці Максіма Багдановіча, алегарычна-фігуратыўную кампазіцыю **Міколы Купавы** "Лірыка Янкі Купалы" (1982), серыю афортаў **Канстанціна Шаранговіча** "Подых навальніцы" (1980) паводле рамана Івана Мележа, каляровыя літаграфіі **Рыгора Віткоўскага**, прысвечаныя Я. Купалу і Я. Коласу: "Развітанне", "Крыніца любві" (1983), літаграфіі Алега Назаранкі «Паводле кнігі Уладзіміра Караткевіча "Зямля пад белымі крыламі"» (1986), серыю літаграфій **Веры Юрковай** "Паводле твораў Якуба Коласа" (1982), эстампы **Уладзіміра Савіча**, **Юрыя Герасіменкі-Жызнеўскага**, **Яўгена Куліка**, **Васіля Ткачука**, цыкл афортаў паводле паэмы Міхася Чарота "Босыя на вогнішчы" (1978) Анатоля Александровіча і інш.

Творцы розных пакаленняў у серыях эстампаў па-мастацку пераасэнсоўвалі літаратурныя творы, выкарыстоўваючы даволі разнастайныя пластычна-стылістычныя падыходы. Старэйшае і сярэдняе пакаленні ўсё яшчэ залежаць ад прынцыпу дакументальнага адлюстравання сюжэта з апорай на апавядальна-апісальную трактоўку. У творах усё яшчэ эксплуатуецца выяўленчая мова сацыяліс-

тычнага рэалізму. Назіраецца імкненне аўтараў сінтэзаваць падзеі ў вялікія эпічныя аповеды. У якасці прыкладу можна разгледзець серыю лінагравюр **Аляксандра Дзямарына** "Калектывізацыя на Палессі" (1982 – 1983) паводле кнігі "Людзі на балоце" І. Мележа. Увага мастака сканцэнтраваная на жыцці вясковага жыхара. Апяваецца і паэтызуецца праца, уклад жыцця і традыцыі людзей беларускай вёскі. Праца селяніна адлюстроўваецца ў атмасферы народнага свята і лёгкасці. Адчуваецца асабістае стаўленне аўтара да паказу роднай зямлі, людзей, традыцый.

У творчасці некаторых мастакоў сярэдняга пакалення вобразна-пластычнае вырашэнне паступова трансфармуецца. Шлях ад дакументальнай перадачы сюжэта, калі падзеі перадаюцца з пазіцый дакладнага падрабязнага пераказу, ляжыць да ўскладнення мастацкай структуры і псіхалогіі герояў, звароту да выяўленчай метафары. Гэта відаць, напрыклад, у літаграфічным трыпціху "Дзе крыўда адвечная спела" (1982) **Васіля Шаранговіча**. Аўтар выкарыстоўвае спалучэнне асобных элементаў "суровага стылю" і дэкаратыўнай стылістыкі. Фігуры персанажаў літаграфій В. Шаранговіча ўсё яшчэ дастаткова манументальныя і займаюць асноўную прастору аркуша. Сузіральнасць поглядаў дзейных асоб падкрэслівае псіхалагічную глыбіню, засяроджвае ўвагу гледачоў на падтэксце. Аднак фон і адзенне герояў, у адрозненне ад твораў "суровага стылю", напоўненыя дэкаратыўнымі фактурамі, шматлікімі складкамі, стылізаванымі раслінными элементамі.

Маладому пакаленню графікаў у раскрыцці тэмы больш уласцівыя рамантызм і філасофскае асэнсаванне мінуўшчыны і сучаснасці, зварот да фальклору. Асабліва заўважным у тэматычных эстампах стаў рамантычны рух, прадстаўнікі якога смела выкарыстоўваюць сімвал, алегорыю і метафару. Навізна графічнай мовы выяўляецца ў адчувальнай неабходнасці выпрацоўкі новых адэкватных прыёмаў, што адбілася на ўскладненні мастацка-пластычнай формы твораў. Графікі дамагаюцца значнага пашырэння дыяпазону магчымасцяў тэхнік эстампу. Асноўная адметная рыса твораў маладых мастакоў – яскрава выяўлены этнаграфізм. Новыя задачы вырашаюцца аўтарамі з выкарыстаннем дэкаратыўных сродкаў мастацкай выразнасці. Графікі захапляюцца плоскаснымі каляровымі заліўкамі, умоўнасцю, абагульненасцю формаў, выкарыстаннем дэкаратыўных элементаў, што рытмічна чаргуюцца. У эстампах маладых аўтараў у цэлым назіраецца ўзмацненне індывідуальна-эмацыянальнай асновы.

Гістарычна-этнаграфічныя матывы ў спалучэнні з дэкаратыўнымі элементамі прасочваюцца ў творчасці графіка **Рыгора Сітніцы** ў серыі каляровых літаграфій "Вянок пашаны паэту" (1988) паводле твораў М. Багдановіча. Звяртаючыся да народнага мастацтва, творца па-свойму вобразна адлюстроўвае гістарычную памяць народа. Працы выразныя



***Георгій Паплаўскі.* Алесь Адамовіч.** 1987 г.

паводле формы і глыбокія паводле пераасэнсавання нацыянальнага пачатку ў беларускім выяўленчым мастацтве. Сродкі псіхалагічнай характарыстыкі персанажаў робяцца больш складанымі і шматграннымі. Вялікую ролю ў раскрыцці вобразаў аўтар адводзіць графічнай інтэрпрэтацыі народнага строю, трактоўцы сілуэта, колеру, фармальнаму размяшчэнню танальных плямаў. Немалое значэнне надаецца распрацоўцы плоскаснасці, дэкаратыўнасці, стылізацыі элементаў кампазіцыі.

Такім чынам, у 1980-я гг. працягваецца тэндэнцыя звароту да вобразаў класікаў айчыннай літаратуры і іх твораў у серыях і цыклах эстампаў беларускіх графікаў. Спрыяе гэтаму тэндэнцыя нацыянальна-культурнага адраджэння, якая напрыканцы XX стагоддзя прыцягнула шырокую ўвагу да нацыянальнай тэматыкі, да глыбінных працэсаў роднай гісторыі, да асобаў, што пакінулі ў ёй значны след. У асяродку беларускіх мастакоў актуальны зварот да спадчыны мінулага, якое разумеецца як духоўны набытак і мастацкі досвед.

*Пераклад з рускай мовы.*

**Спіс літаратуры**

1. **Баразна, М.** Беларуская кніжная графіка 1960 – 1990-х / М. Баразна. – Мінск : БелЭн, 2001.

2. **Гісторыя беларускага мастацтва** : у 6 т. / рэдкал. : С. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – Т. 5 / В. Жук (рэд. тома) [і інш]. – 375 с.

3. **Шматаў, В.** Беларуская станковая графіка / В. Шматаў. – Мінск : Беларусь, 1978. – 288 с., іл.

4. **Шматаў, В.** Сучасная беларуская графіка 1945 – 1977 гг. / В. Шматаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 128 с., іл.

**Алена ШЫЧКО,**
выкладчыца Інстытута сучасных ведаў імя А. Шырокага.

*Беларускія мудрагелінкі*

# У ЧАКАННІ ВЯЛІКАДНЯ

*Карысны для нас пост цялесны, бо суцішае страсці. Але пост душэўны абавязкова патрэбны, бо і цялесны пост без яго – нішто. Многія посцяцца целам, але не посцяцца душой. Многія прытрымліваюцца посту ў ежы і пітве, але не посцяцца ад злых думак, спраў і слоў. Якая для іх ад гэтага карысць?*

Свц. Ціхан Задонскі.

Вясной да нас прыходзіць самае вялікае свята народнага календара – Вялікдзень. Раней яго святкавалі ў дзень веснавога раўнадзенства. Гэта вельмі старажытнае свята ў гонар сонца, аднаўлення жыцця пасля зімовага сну, пачатку палявых работ. Увесь абрадавы комплекс Вялікадня мае аграрную семантыку. Напрыклад, прыход у кожны двор валачобнікаў з велічальна-віншавальнымі песнямі быў актам магічным, накіраваным на забеспячэнне поспеху ў найважнейшую для селяніна пару, калі згодна з народным мудраслоўем "дзень год корміць".

З прыняццем хрысціянства свята Вялікадня злілося з хрысціянскай Пасхай. У гэты дзень мы ўрачыста вітаем Хрыста Збавіцеля, які дараваў нам вечнае жыццё. Каб адзначыць вялікае свята, трэба да яго падрыхтавацца душой і целам. Вялікі 48-дзённы пост – гэта пост у памяць пра пакутніцкую смерць Ісуса Хрыста і яго выратавальнае Уваскрэсенне.

### НА ВАШ СТОЛ У ВЯЛІКІ ПОСТ

**Салата бульбяная з агуркамі і цыбуляй.** Адвараную і нарэзаную бульбу змяшаць са здробненай зялёнай цыбуляй і салёным агурком, заправіць алеем, перамяшаць (можна дадаць тоўчаны часнок) і выкласці ў салатнік.

*3 бульбіны, 1 салёны агурок, 100 г зялёнай цыбулі, 2 ст. лыжкі алею.*

**Салата бульбяная з яблыкамі і сельдэрэем.** Бульбу адварыць, абабраць, нарэзаць тонкімі лустачкамі. Свежыя яблыкі ачысціць ад насеннай камеры і скуркі, нарэзаць. Пачышчаны корань сельдэрэю нашаткаваць тонкай саломкай або надзерці на буйной тарцы. Усе прадукты змяшаць, заправіць алеем, пасаліць.

*4 бульбіны, 2 яблыкі, 1 корань сельдэрэю, 100 г алею, соль.*

**Салата з яблыкамі і рэдзькай.** Рэдзьку і яблыкі пачысціць, надзерці на буйной тарцы. Дадаць соль і цукар. Калі яблыкі някіслых гатункаў, дадаць лыжку разведзенага воцату. Салату можна заправіць алеем.

*2-3 яблыкі, 1 рэдзька, 50 г алею, соль, цукар.*

**Бульба з буракамі.** Асобна зварыць бульбу ў "мундзірах" і буракі са скуркай, у ахалоджаным выглядзе пачысціць, нарэзаць невялікімі кубікамі. Буракі паліць крыху алеем, дадаць соль, падсмажаную рэпчатую цыбулю і перамяшаць з бульбай.

*4 бульбіны, 1 бурак, 1-2 ст. лыжкі алею, 1 цыбуліна, соль.*

**Салата з рэдзькі з агуркамі.** Рэдзьку пачысціць, надраць на буйной тарцы. Свежыя агуркі нашаткаваць, перамяшаць з рэдзькай, пасаліць, дадаць лімоннай кіслаты або лімоннага соку, пакласці горкай у глыбокую талерку, пасыпаць зялёнай цыбуляй, паліць зверху алеем і пасыпаць дробна нарэзанай пятрушкай, зелянінай кропу.

*2-3 рэдзькі, 1-2 свежыя агуркі, 11-13 г лімоннай кіслаты або 80-100 г лімоннага соку, 18-20 г алею, соль.*

**Суп грыбны з ячнымі крупамі.** Сушаныя грыбы (пажадана белыя) перабраць, старанна прамыць і замачыць у халоднай вадзе на 3-4 гадзіны. Набрынялыя грыбы яшчэ раз прамыць і варыць у вадзе, у якой яны моклі, 1-1,5 гадзіны. Прамытыя ячныя крупы заліць халоднай вадой і замачыць на 2 гадзіны, потым адварыць да няпоўнай гатоўнасці. Адвараныя грыбы адкінуць на рэшата, прамыць і нарэзаць. Крупы і грыбы пакласці ў грыбны адвар і варыць 15-20 хвілін. Тады дадаць соль, нарэзаную кубікамі бульбу, а за 5 хвілін да гатоўнасці пакласці перац, лаўровы ліст, пасераваныя моркву і рэпчатую цыбулю. Гатовы суп заправіць алеем.

*2,5 л вады, 50 г сушаных грыбоў, 4 бульбіны, 4 ст. лыжкі ячных круп, 1 морква, 1 цыбуліна, 20 г алею, перац, лаўровы ліст, соль.*

**Рыба, тушаная ў гаршчочку.** Падрыхтаваную і нарэзаную кавалкамі рыбу пасаліць і пакласці ў гаршчок, дадаць алей, пасераваную цыбулю, лаўровы ліст, перац гарошкам. Шчыльна накрыць накрыўкай або цестам і паставіць у духоўку на 1 гадзіну. Падаць у гаршчочку, на гарнір – звараную бульбу, пасыпаную зелянінай.

*1,2 кг рыбы (судак, акунь і інш.), 80 г алею, 4 цыбуліны, зеляніна, перац, спецыі, соль.*

**Рыба, тушаная з бульбай.** Філе акуня нарэзаць кубікамі, запаніраваць у муцэ і абсмажыць. Абабраную бульбу нарэзаць кубікамі і крыху абсмажыць. У салатнік пакласці слаямі бульбу, прыгатаваную рыбу, смажаную цыбулю, спецыі, зверху – зноў бульбу. Паліць алеем або рыбным булёнам, пасаліць і тушыць да гатоўнасці.

*6 бульбін, 300 г філе акуня, 2 цыбуліны, 2-3 ст. лыжкі алею, 2 ст. лыжкі мукі, зеляніна, спецыі, соль.*

**Бульба з грыбамі.** Бульбу абабраць і зварыць у падсоленай вадзе. Вараныя грыбы здрабніць і падсмажыць. Асобна падсмажыць дробна нарэзаную цыбулю, перамяшаць з грыбамі і адцэджанай бульбай, выкласці ў талерку, пасыпаць нарэзанай зелянінай.

*12-14 бульбін, 500 г вараных грыбоў, 1 цыбуліна, 50 г алею, зеляніна, соль.*

**Грыбы з капустай і морквай.** Нашаткаваць свежую капусту, цыбулю (можна дадаць кабачкі, памідоры, салодкі перац), парэзаць свежыя або сухія і загадзя замочаныя грыбы. Моцна нагрэць жароўню, наліць алей. Пакласці спачатку моркву, потым грыбы і накрыць накрыўкай. Хвіліны паўтары тушыць на моцным агні, потым агонь зменшыць. Праз 5-7 хвілін пакласці капусту і цыбулю. Зноў узмацніць агонь на паўтары хвіліны, праз 20 хвілін страва будзе гатова.

*500 г грыбоў, 300 г капусты, 3 цыбуліны, 3 морквы, 150 г алею, соль.*

**Грыбы з гароднінай.** Абсмажыць на алеі паасобку абвараныя і нарэзаныя грыбы, нарэзаную кубікамі моркву і рэпу, нашаткаваную цыбулю. Потым скласці ў каструлю разам з сырой бульбай, нарэзанай тонкімі скрылікамі, заліць кіпнем, дадаць таматную пасту і тушыць 20-25 хвілін. Пасыпаць кропам, паліць алеем і яшчэ раз пракіпяціць.

*400 г грыбоў, 5-6 бульбін, 2 морквы, 1-2 рэпы, 2 цыбуліны, 50 г таматнай пасты, алей, кроп, соль.*

**Суп з гародніны.** Цыбулю, пятрушку і сельдэрэй парэзаць саломкай і абсмажыць у алеі, заліць вадой, пакласці нарэзаную моркву і нашынкаваную капусту, варыць на малым агні 20-30 хвілін. Прыкладна ў сярэдзіне варкі дабавіць тоўчаны часнок, прыправы; нацёрты яблык пакласці ў самым канцы. Пасыпаць суп нарэзанай зелянінай пры падачы на стол.

*2 цыбуліны, пятрушка, сельдэрэй, 2 ст. лыжкі алею, 1 л вады, 2 морквы, 150 г капусты, долька часнаку, 1 лаўровы ліст, 1 яблык або ½ ч. лыжкі яблычнага пюрэ, соль, зеляніна.*

**Поліўка бульбяная.** Зварыць у падсоленай вадзе нарэзаную цыбулю і бульбу. Спецыі і зеляніну дабавіць за 5 хвілін да гатоўнасці.

*1,5 л вады, 6 бульбін, 1 цыбуліна, 0,5 галоўкі часнаку, лаўровы ліст, кроп, пятрушка, чорны перац.*

**Гарбузовы суп з гарохам.** Сухі гарох замачыць на ноч, потым засыпаць у халодную ваду і варыць да няпоўнай гатоўнасці. Дабавіць нарэзаную кубікамі бульбу, а праз 15 хвілін – абсмажаныя ў алеі зеляніну і нарэзаны кубікамі гарбуз. Пасаліць, варыць яшчэ 5-10 хвілін, пакуль гарбуз не стане паўпразрысты. Замест гарбуза можна выкарыстоўваць цукіні або патысон.

*300 г гарбуза, 2 бульбіны, ½ шклянкі сухога гароху або 1 шклянка кансерваванага, 1 галоўка цыбулі, пятрушка, сельдэрэй, 1 морква, 2 ст. лыжкі алею, 1 л вады, соль, перац, зеляніна.*

**Кісель журавінавы.** Журавіны перабраць, прамыць, працерці праз сіта, адціснуць сок. Жамерыны заліць гарачай вадой у аб'ёме адзін да пяці, давесці да кіпення і працадзіць. Частку адвару астудзіць і развесці ў ім бульбяны крухмал. З другой часткі адвару прыгатаваць цукровы сіроп: пакласці ў яго цукар, давесці да кіпення, уліць крухмал, астудзіць і дадаць адціснуты раней сок.

*100-120 г журавін, 75-100 г цукру, 2-3 ст. лыжкі крухмалу.*

**Кісель з каліны.** Свежыя ці замарожаныя ягады перабраць, прамыць, дадаць вады, шчыльна накрыць і парыць на малым агні на працягу гадзіны. Тады каліну працерці, костачкі выбраць, уліць гарачую ваду, дадаць цукар, перамяшаць і давесці да кіпення. У кіпячы адвар уліць разведзены ў халоднай вадзе крухмал і даць яшчэ раз закіпець.

*100 г каліны, 100 г цукру, 2 ст. лыжкі крухмалу.*

**Кісель з сушанай садавіны.** Плады прамыць, заліць гарачай вадой, паставіць на 15-20 хвілін у цёплае месца для размякчэння, адцадзіць і зварыць на малым агні да няпоўнай гатоўнасці. Потым дадаць разведзены ў халоднай вадзе крухмал, усыпаць цукар і даварыць. У гатовы кісель можна дадаць сок журавін або яблыкаў.

*20-25 г сушанай садавіны, 80 г цукру, 4 ч. лыжкі бульбянога крухмалу, 2 ч. лыжкі соку з садавіны, 1 л вады.*

**Узвар з сушанай садавіны.** Сушаную садавіну прамыць, заліць вадой для размякчэння, варыць да гатоўнасці, потым дадаць мёд.

*200 г сушанай садавіны, 60-80 г мёду, 2 л вады.*

**Яблыкі печаныя з мёдам.** Кісла-салодкія яблыкі памыць, выразаць насенныя камеры. Напоўненыя цукрам яблыкі пакласці на бляху, паліўшы яе крыху вадой, і запячы ў духоўцы.

Перад падачай на стол яблыкі паліць мёдам.

*500 г яблыкаў, 150 г мёду, 50 г цукру.*

**Яблыкі печаныя з брусніцамі.** Са свежых яблыкаў выдаліць насенныя камеры, паглыбленні запоўніць брусніцамі, змешанымі з цукрам, і запячы ў духоўцы на блясе. Каб яблыкі не лопаліся, бляху паліць вадой.

Гатовыя яблыкі пасыпаць цукровай пудрай.

*8 яблыкаў, 1 шклянка брусніц, 50 г цукру, 40 г цукровай пудры.*

### НА ВЯЛІКДЗЕНЬ

**Куліч звычайны.** Амаль усю муку змяшаць з ½ шклянкі малака, заліць дражджамі, разведзенымі ў невялікай колькасці малака, размяшаць і паставіць у цёплае месца. Калі апара паднімецца, дабавіць у яе 20 жаўткоў, расцёртых з адной шклянкай цукру і дзвюма шклянкамі масла, дабавіць крыху солі і мукі да патрэбнай гушчыні цеста, замясіць яго і зноў даць падняцца.

Потым цеста старанна вымешаць і выбіць, пакласці ў форму (запоўніць яе напалову) і даць падняцца, пасля чаго выпякаць.

*7 шклянак мукі, ½ шклянкі малака, 100 г дражджэй, 20 жаўткоў, 1 шклянка цукру, 2 шклянкі растопленага масла і крыху солі.*

**Куліч хатні.** У ½ шклянкі кіпячага малака заварыць 100 *г* мукі, хутка размяшаўшы да эластычнай масы. Дрожджы развесці ў ½ шклянкі цёплага малака і змяшаць са 100 *г* мукі, пакінуўшы на 10 хвілін.

Пасля гэтага злучыць дзве сумесі, накрыць і паставіць для падымання на 1 гадзіну. Тады жаўткі, цукар, соль перацерці ў аднародную масу, узбіць.

У дражджавую сумесь дабавіць узбітую масу і 750 *г* мукі, вымесіць цеста і паставіць на 2 гадзіны для пады-

мання; уліўшы цёплае растопленае масла, даць цесту падысці другі раз. Пасля гэтага цеста асадзіць да яго першапачатковага аб'ёму, дабавіць ⅔ шклянкі разынак, абваляўшы іх у муцэ, і даць цесту падысці ў трэці раз.

Выпякаць у форме 45 хвілін.

*1 кг мукі, 50 г дражджэй, 1,5 шклянкі малака, 10 жаўткоў, 250 г цукру, 200 г масла, 100 г разынак, 1 г солі.*

**Куліч царскі.** Развесці 50 *г* дражджэй у шклянцы вяршкоў і паставіць з іх апару на 600 *г* мукі. Калі апара паднімецца, увесці ў яе расцёртыя з маслам і цукрам жаўткі (масла і цукру па 200 *г*, 15 жаўткоў), дабавіць яшчэ 600 *г* мукі, 2 шклянкі вяршкоў, 1 тоўчаны мускатны арэх, шынкаваны міндаль, нарэзаныя цукаты і разынкі. Добра ўзбіць цеста і пакінуць для падымання. Пасля цеста пакласці ў змазаную маслам і пасыпаную тоўчанымі сухарамі форму. Напоўніць форму напалову, даць цесту зноў падняцца і паставіць у духоўку з нямоцным жарам.

**Пасха з разынкамі.** Тварог працерці праз сіта, расцерці з маслам, усыпаць цукровую пудру, уліць смятану, пакласці разынкі, усё добра размяшаць, пакласці ў форму, засланую знутры вільготнай тонкай тканінай, паставіць пад гнёт на суткі.

*800 г тварагу, 200 г сметанковага масла, ¼ шклянкі цукровай пудры, ½ шклянкі смятаны, ½ шклянкі разынак.*

**Пасха звычайная.** Свежы тварог пакласці на суткі пад гнёт, пасля працерці праз сіта, дадаць паўшклянкі масла, соль, цукар. Усё перамяшаць, пакласці ў форму, засланую знутры тонкай тканінай, паставіць на суткі ў халоднае месца.

*1,5 кг свежага тварагу, ½ шклянкі смятаны, 80 г цёплага масла, 1 ч. лыжка солі, цукар.*

**Пасха царская.** Працерці праз сіта тварог, дабавіць яйкі, масла, смятану. Усё скласці ў каструлю і паставіць на агонь, пастаянна памешваючы, каб не прыгарэла. Даведзеную да кіпення масу зняць з агню, паставіць на лёд і мяшаць, пакуль не астыне. Потым пакласці тоўчаны цукар, ваніль, разынкі. Добра размяшаць, скласці ў форму, засланую знутры тканінай, і паставіць пад гнёт.

*1 кг тварагу, 5 сырых яек, 200 г масла, 400 г смятаны, 200 г цукру, ваніль, разынкі.*

Падрыхтавала **Ірына КАЗАКОВА.**

*Народныя святы*

# *ВЯЛІКДЗЕНЬ* ЦІ *ПАСХА*?

## ДА ПЫТАННЯ АБ НАЙМЕННІ СВЯТАЎ

*Вялікдзень* і *Пасха* – гэта розныя найменні аднаго свята ці назвы святаў розных традыцый (хрысціянскай і язычніцкай)? Супярэчнасці, якія існуюць ва ўжыванні фэстонімаў, выразна праяўляюцца праз жывую мову газетнай паласы.

**Вялікдзень.** Згадкі пра свята Вялікадня, як і пра Каляды, з'яўляюцца на старонках газеты "Звязда" ў 1991 годзе, калі ў друк пачынае трапляць інфармацыя рэлігійнай тэматыкі. Упершыню намінацыя згадваецца ў рубрыцы "Народны каляндар" у наступных формах: *Вялікдзень, Вяліканне, Вялічко* (5.04.1991). У далейшым у "Звяздзе" замацоўваецца толькі першая з трох назваў (*Вялікдзень*), астатнія сустракаюцца зрэдку, форма *Вялічко* змяняецца на адаптаваны да беларускай мовы варыянт з ненаціскным канчаткам *-а*: *свята Вялічка* (30.04.1994), *Святое вялічка – з чырвоным яічкам* (18.04.1998). Другасныя намінацыі свята Вялікдзень не сустракаюцца на старонках выдання.

Этымалагічна назва *Вялікдзень* узыходзіць да словазлучэння *вялікі дзень*, дзе прыметнік падкрэслівае значнасць свята: *адно з самых урачыстых свят беларусаў у мінулым стагоддзі, якое па значнасці прыраўноўвалася да Каляд і Купалля* (05.04.1991). Вялікдзень ставіцца ў адзін шэраг з язычніцкімі святкаваннямі, чым акцэнтуецца яго паходжанне: *Аб дахрысціянскім паходжанні Вялікадня сведчаць шматлікія ўцалелыя абрады…* (18.04.1998).

Аднак у "Звяздзе" сустракаюцца і адваротныя тлумачэнні: *Вялікдзень – старажытнае свята хрысціянскай царквы* (22.04.1995).

У тэксце газеты сустракаецца толькі адзін дэрыват ад наймення дадзенага свята:

– *велікодны* [звязаны з Вялікаднем: *велікодныя дні* (22.04.1995), *велікодная ноч* (22.04.1995), *велікодная радасць* (26.04.2003)].

На месцы аднаго з магчымых дэрыватаў ужываецца слова тэматычнай групы "Вялікдзень":

– *валачобніцтва* [абрад хаджэння па хатах, які суправаджаецца выкананнем песень: *Асаблівасцю беларускага святкавання было валачобніцтва* (18.04.1998)]. Але ў газеце не сустракаецца наймення ўдзельніка дадзенага абраду (*валачобнік, валочнік*), хаця такая назва насамрэч існуе.

Азначальная характарыстыка падзеі выражаецца праз трохчленныя канструкцыі (азначэнне) + *свята Вялікадня*:

*Расповед пра ўжыванне на старонках газеты "Звязда" назваў святаў* ***Наталля Авярчук*** *распачала ў мінулым годзе. Былі надрукаваны артыкулы "Раждаство ці Каляды: Як правільна назваць свята?" (2007, № 12) і "Розныя, але падобныя святы – 23 лютага і 8 сакавіка" (2008, № 2).*

• ***светлае веснавое*** *свята Вялікадня* (10.04.1999);

• ***радаснае*** *свята Вялікадня* (22.04.2000).

Праз прыметнікі канстатуецца час святкавання падзеі (*веснавое*) і станоўчы эмацыянальны фон, звязаны са святам (*светлае*, *радаснае*), аднак больш дакладная ацэнка свята (вызначэнне асобных якасцей, статуса) адсутнічае.

**Пасха.** Найменне пачынае ўжывацца ў газеце "Звязда" з 1992 года (праз год пасля з'яўлення фэстоніма *Вялікдзень*) у выглядзе намінацый *Пасха* і *Уваскрэсенне*. Адразу ж пасля з'яўлення на старонках газеты найменне актыўна пашыраецца, набываючы шэраг варыянтаў, якія адпавядаюць разнастайным сінтаксічным мадэлям (гл. табліцу).

**Першасная намінацыя фэстоніма *Пасха***

| **Найменне з кампанентам *Пасха*** | **Найменне з кампанентам *Уваскрэсенне*** |
|---|---|
| • *Святая* ***Пасха*** (Adj + $N_1$)<br>• *Гасподня* ***Пасха, Пасха*** *Хрыстовая* ($Adj_{прын}$ + $N_1$, магчыма інверсія)<br>• *Дзень Святой* ***Пасхі***<br>• *урачыстасць Святой* ***Пасхі*** [узор намінацыі дзяржаўных святаў: двухслоўнае непадзельнае спалучэнне (*урачыстасць* + Adj + $N_2$)] | • ***Уваскрэсенне*** *Збавіцеля* ($N_1$ + $N_2$)<br>• ***Уваскрэсенне*** *Хрыстовае* [$N_1$ +Adj у значэнні спалучэння $N_1$ + $N_2$ (***Уваскрэсенне*** *Хрыста*)]<br>• ***Уваскрэсення*** *дзень* [узор намінацыі дзяржаўных святаў: двухслоўнае непадзельнае спалучэнне (*Дзень* + $N_2$)] |

Разнастайнасць першаснай намінацыі фэстоніма *Пасха* сведчыць пра з'яўленне варыянтаў, якія адпавядаюць мадэлі намінавання дзяржаўных святаў, што пацвярджае павышэнне статуса свята на дзяржаўным узроўні.

У газеце "Звязда" ўжываецца адзін дэрыват ад фэстоніма *Пасха – пасхальны* [які тычыцца свята Пасхі: *Пасхальнае пасланне* (25.04.1992), *Пасхальнае святло* (18.04.1998), *пасхальныя дні* (14.04.2001)].

Характарыстыка свята Пасхі рэпрэзентуецца праз азначальныя канструкцыі і можа выражацца трохчленным (падобна да Вялікадня) ці двухчленным спалучэннем:

• ***ураставальны*** *дзень Уваскрэсення Хрыстовага* (17.04.1993);

• ***Светлае*** *Свята Уваскрэсення Хрыстова* (30.04.1994);

• ***вечнае*** *свята адраджальнага жыцця* (03.04.1999);

• ***старадаўняе*** *свята Хрысціянскай царквы* (30.04.2005);

• ***свяшчэнная*** *ноч* (30.04.1994);

• ***найвышэйшае, самае радаснае*** *і* ***самае старажытнае*** *хрысціянскае свята* (29.04.2000);

• ***збавіцельныя*** *дні* (29.04.2000);

• ***вялікае*** *свята* (30.04.2005).

Часам азначэнне свята перадаецца праз дзеепрыметны зварот:

• *свята,* ***падтрыманае і царкоўнымі, і свецкімі ўладамі абедзвюх краін*** (26.04.2003).

**Праблема размежавання фэстонімаў *Вялікдзень* і *Пасха* на старонках газеты "Звязда".**

Панаванне ў нашым грамадстве хрысціянскіх і язычніцкіх традыцый – своеасаблівы культурна-рэлігійны феномен, які на сучасным этапе ўскладняе вызначэнне межаў паміж найменнямі *Вялікдзень* і *Пасха*.

У фальклярыстыцы выразна абазначаны статус Вялікадня ў адносінах да Пасхі. Вучоныя сыходзяцца ў меркаванні, што Вялікдзень – старажытнае язычніцкае свята, і толькі ў эпоху хрысціянства "Вялікдзень стаў прымяркоўвацца да ўваскрэсення ўкрыжаванага Хрыста" [1, с. 102]. Аднак "Праваслаўны каляндар – 2007" змяшчае на лістку ад 23 красавіка артыкул пад назвай *"Светлае Хрыстова Уваскрэсенне. Пасха. Вялікдзень"*.

Хрысціянская Пасха "ўвабрала" ў сябе намінацыю язычніцкага Вялікадня разам з характэрнай абраднасцю [*Асаблівасцю беларускага святкавання было валачобніцтва* (18.04.1998)]; атрыбутыкай [*гучаць у дзень Вялікадня словы "Хрыстос Уваскрос!"* (21.04.1998); *Святое вялічка – з чырвоным яічкам* (18.04.1998)]; намінацыяй [*Віншаванне хрысціянам, якія святкуюць Вялікдзень 4 красавіка 1999 года* (03.04.1999)].

Гэтая з'ява адлюстравалася ў сродках масавай інфармацыі (што відаць, у прыватнасці, з газетных публікацый "Звязды"). У выданні фіксуюцца шматлікія выпадкі кантамінацыі хрысціянскіх і язычніцкіх найменняў:

➢ *велікодныя дні Пасхі* (22.04.1995):
*велікодны* (языч.) + *Пасха* (хрысц.);

➢ *хрысціянскі Вялікдзень* (18.04.1998):
*хрысціянскі* (хрысц.) + *Вялікдзень* (языч.);

➢ *Набліжаецца вялікае светлае свята – праваслаўны Вялікдзень* (23.04.2005):
*праваслаўны* (хрысц.) + *Вялікдзень* (языч.)

Кантамінаваныя канструкцыі становяцца нарматыўнымі праз экстралінгвістычныя фактары, што ўплываюць на ўтварэнне назваў святаў.

Такім чынам, фэстонім *Вялікдзень* у выніку моўнага сінтэзу язычніцкіх і хрысціянскіх найменняў стаў паўнапраўным намінантам хрысціянскага свята.

У газеце "Звязда" сэнсавае напаўненне фэстоніма *Пасха (Вялікдзень)* адлюстроўвае высокі статус свята ў рэлігійным [*адно з самых светлых і ўрачыстых святаў праваслаўных хрысціян – Вялікдзень* (30.04.2005)], дзяржаўным [*свята, падтрыманае… свецкімі ўладамі* (26.04.2003)], народна-масавым [*свята "Вялікдзень-98"* (21.04.1998)] жыцці сучаснага грамадства.

**Спіс літаратуры**

1. **Васілевіч, У. А.** Вялікдзень / У. А. Васілевіч // Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімовіч. – Мінск, 2004. – С. 102 – 104.

**Наталля АВЯРЧУК,**
настаўніца беларускай мовы і літаратуры
Яварскай СШ Дзятлаўскага р-на.

*Тыдзень беларускай мовы*

# СВЯТА РОДНАГА СЛОВА

Філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта ўжо даўно мае статус нацыянальнага культурнага цэнтра. Тут вучаць і выхоўваюць тых, хто шануе роднае слова, якое стала для студэнтаў не столькі аб'ектам лінгвістычнага аналізу, колькі сімвалам грамадскага і культурнага жыцця – нацыянальнай прасторы.

Тут жыве, пульсуе беларускае слова. Менавіта яно злучыла і студэнтаў, і выкладчыкаў. Напярэдадні святкавання Міжнароднага дня роднай мовы гэта асабліва адчувалася. Філфакаўцы прапанавалі цікавую, разнастайную праграму, разлічаную на тыдзень – з 18 да 22 лютага.

Сімвалічна, што ў 2008 годзе, абвешчаным Генеральнай асамблеяй ААН Міжнародным годам моў, навукова-культурная імпрэза распачалася з выставы старажытных і рукапісных выданняў, прысвечаных 490-годдзю беларускай кнігі. Паказальна, што чалавек даўно шукаў магчымасці захаваць слова, перадаць яго сваім нашчадкам. "Псалтыр" Францыска Скарыны займае годнае месца ў гісторыі сталення чалавецтва і беларусаў сярод кітайскіх ксілаграфій, чэшскай "Траянскай хронікі", "Бібліі" Гутэнберга, інкунабул Фіёля, "Апостола" Фёдарава, "Азбукі" Зізанія, "Катэхізіса" Буднага…

Супрацоўнікі Фундаментальнай бібліятэкі Белдзяржуніверсітэта парупіліся і прэзентавалі да чытанняў, прысвечаных 220-годдзю з дня нараджэння І. І. Насовіча, цікавыя старадрукі. Мелася магчымасць, напрыклад, пагартаць "Словарь белорусскаго наречія" І. І. Насовіча 1870 г. выдання. Шматлікія слоўнікі больш позняга часу толькі пацвердзілі сталыя традыцыі павагі да кнігі на Беларусі. Пра гэта казалі і ўдзельнікі канферэнцыі, якая распачала інтэлектуальна-культурны марафон.

Сустрэча з аўтарамі новай рэдакцыі правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі яшчэ раз паказала, што родная мова – жывы арганізм, "адкрытая сістэма". Яна чуйна рэагуе на змены ва ўсіх сферах жыцця грамадства. У якой ступені мы, карыстальнікі, маем права змяняць гэтую сістэму? Гэтае і іншыя пытанні сталі падставай для размовы, у якой бралі ўдзел прафесары А. Я. Міхневіч, А. А. Лукашанец, В. І. Іўчанкаў.

У другой частцы сустрэчы рэдактар "Роднага слова" У. І. Куліковіч пазнаёміў усіх прысутных з рэдкалегіяй часопіса, з планамі, якія непарыўна звязаны з папулярызацыяй і беларускага слова, і беларускай культуры. Часопіс павінен стаць інфармацыйнай крыніцай, якая будзе жывіць усіх: выкладчыка, настаўніка, школьніка, яго бацькоў, звычайнага чытача.

"Лінгвістычная гасцёўня", запланаваная на сераду, 20 лютага, пазнаёміла студэнтаў з тымі, каго яны цытуюць на семінарскіх і практычных занятках, на каго спасылаюцца на экзаменах. Некаторых яны і сапраўды бачылі ўпершыню. Напрыклад, вядомага беларускага лексіколага В. К. Шчэрбіна. Дактарант НАН Беларусі, намеснік дырэктара Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў па-добраму пазайздросціў выкладчыкам, якія маюць магчымасць весці дыялог са студэнтам, супастаўляць сутнасць канцэптуальных палажэнняў з канкрэтнымі праяўленнямі сістэмных адносін у мове.

Прафесары В. П. Красней і А. Я. Міхневіч не госці на філфаку. Аднак на гэтай сустрэчы яны раскрыліся для студэнтаў па-іншаму. Відаць, мала хто ведаў, што Арнольд Яфімавіч Міхневіч піша вершы, перакладае з іншых моў. Сціпла назваўшы гэта заняткам у вольны час, ён прапанаваў пераклад вядомага верша Пушкіна "Я вас любил…", праілюстраваўшы неабмежаваныя магчымасці роднага слова.

Дык што такое мова? У чым прыцягальнасць слова? "Слова – рэха вечнасці, рэха несмяротнасці, слова – думка, што помніць мінуласць і гукае наступнасць, лучыць прошласць і прышласць"[1]. Пра гэта гаварылі са студэнтамі на наступны дзень сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі Вячаслаў Рагойша – прафесар, акадэмік Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі, загадчык кафедры тэорыі літаратуры; сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі Іван Чарота – прафесар, загадчык кафедры славянскіх літаратур; сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі Таццяна Кабржыцкая – дацэнт кафедры славянскіх літаратур. Усе яны займаюцца перакладчыцкай дзейнасцю, таму маглі адказаць на пытанне, якое некалі задаў Рыгор Барадулін: хто такі перакладчык, слуга ці пан, патуранец ці надзвычайны і паўнамоцны пасол сваёй мовы? Распачаў гэтую сустрэчу народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч. Аўдыторыя цёпла прымала словы Ніла Сымонавіча пра сутнасць перакладу, з захапленнем слухала паэтычныя пераклады з балгарскай мовы. Спадзяюся, што сярод тых, хто з удзячнасцю апладзіраваў удзельнікам імправізаванага дня беларускага перакладу, былі студэнты, якіх не спужала "падзольная праца" перакладчыка, бо "пераклад суседзіць душы, родніць людзей, спрыяе лагодзе духу"[2].

Забаўляльна-пазнавальная гульня сярод студэнтаў першага курса беларускага аддзялення "Філалогія і Я" завяршала тыдзень роднай мовы на філалагічным факультэце. Нашы выхаванцы паказалі ўсё лепшае, чаму навучыліся за гэты час. І зрабілі гэта з досціпам, паюнацку яскрава. Сапраўдным адкрыццём стаў паэтычны конкурс: глыбока, пранікнёна, таленавіта. Як, з чаго, адкуль?.. Магчыма, як пісаў А. Клышка, "на родных словах цяпло нашых продкаў".

І яго ёсць каму аддаваць.

---


[1] **Барадулін, Р.** Рупіцца пераклад… // Пераклад збліжае народы : Матэрыялы Міжнар. "круглага стала", Мінск, 3 – 4 верасня 2001 г. / Рэдкал. : Р. Барадулін (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2002. – С. 5.

[2] **Тамсама.** С. 6.

**Аляксандр РАДЗЕВІЧ.**

# КАЛЯНДАР НАРОДНЫХ СВЯТАЎ

## КРЫЖАВАНКА



**Па гарызанталі. 3.** …вясны. Першае цудоўнае вясновае свята, якое пачыналі адзначаць з 9 сакавіка. **5.** Вялікая сума грошай (разм.). **9.** Прафесія Антука Крыніцы (сапраўднае прозвішча Ждановіч); сёлета, у красавіку, 110 гадоў з дня яго нараджэння. **10.** Земляроб: *дзе … плача, там жняя скача* (прык.). **11.** Колер поўсці ў жывёл. **14.** Свята, якое прыпадае на 13 мая: *на … грэе люба* (прык.). **16.** Сучасны беларускі кампазітар, аўтар многіх папулярных песень Ігар … . **17.** Рака на Міншчыне і Гомельшчыне, левы прыток Прыпяці. **18.** Чысты … – дзень перадвелікоднага тыдня. **19.** Старажытнае земляробчае свята, якое адзначаецца на сёмы (русальны) тыдзень пасля Вялікадня. Іншыя назвы – Тройца, Зелянец, Зялёныя святкі. **23.** Свята, якое сёлета адбудзецца 18 снежня: *… мосце, а Мікола гвоздзе* (прык.). **24.** *Дождж на Марка* (сёлета – 8 мая), *дык зямля як …* (прык.). **25.** *З кропляў – …, з зерняў – тона* (прык.). **28.** Іншая назва свята Юр'я, якое прэтэндуе на сапраўдны пачатак вясны; сёлета 6 мая. **29.** Прысвятак у беларусаў-каталікаў, які сёлета будзе 26 ліпеня: *святая … снапы кладзе*. **30.** Абазначэнне тэмпературы ніжэй за нуль. **32.** … Вясноўка – вясновае свята, якое сёлета прыпадае на 14 сакавіка. **33.** Імя дзяўчыны, якім названа свята студэнтаў і якое адзначаецца 25 студзеня.

**Па вертыкалі. 1.** Масленіца, Паўраценне, ці … – свята, якое сёлета адзначалася 9 сакавіка; на яго мядзведзь паварочваецца ў бярлозе на другі бок. **2.** Беларускі пісьменнік, адзін з пачынальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры, сёлета 10 мая – 125 гадоў з дня яго нараджэння. **3.** Гульня з выбіваннем драўляных качулак. **4.** Назва каровінага свята ў беларусаў-каталікоў, якое сёлета было 5 лютага: *хлеб і соль святой … не пусцяць бяды да хаты* (прык.). **6.** Свята, якое сёлета адзначаецца 11 лютага: … *грамніцам рад* (прык.). **7.** Свята ў гонар багіні Лялі, дачкі Лады, якое сёлета адзначаецца 5 мая. **8.** Свята, якое сёлета прыйшлося на 9 студзеня: *на святога … вышэй слуга за пана* (прык.). **12.** Жаночае адзенне. **13.** *Свяціла б …, а месячык не сагрэе* (прык.). **15.** Шчыльныя, крытыя зверху вароты. **17.** Свята, якое сёлета адбываецца 28 мая: … *павее цяплом* (прык.). **20.** *Ласка – не …, сеўшы, не паедзеш* (прык.). **21.** … лета – цёплая пара ў верасні ці ў пачатку кастрычніка. **22.** Жыхарка буйнога горада на Віцебшчыне. **26.** Высокае стаячае люстра. **27.** *Сухі …, мокры май – будзе жыта, як гай* (прык.). **30.** *Хто мову і веру міняў, той не толькі сябе, а і … прадаваў* (прык.). **31.** Яблычны … – свята садавіны, якое адзначаецца 19 жніўня: *прыйшоў … – пайшло лета ад нас* (прык.).

**Адказы.**

**Па гарызанталі. 3.** Гуканне. **5.** Капітал. **9.** Акцёр. **10.** Арцель. **11.** Масць. **14.** Жыгалка. **16.** Луганок. **17.** Пціч. **18.** Чацвер. **19.** Сёмуха. **23.** Сава. **24.** Скварка. **25.** Мора. **28.** Юр'е. **29.** Ганна. **30.** Мінус. **32.** Аўдоцця. **33.** Таццяна.

**Па вертыкалі. 1.** Дзед. **2.** Маўр. **3.** Гарадкі. **4.** Агата. **6.** Ігнат. **7.** Лельнік. **8.** Цудзіян. **12.** Сукенка. **13.** Сонейка. **15.** Брама. **17.** Плахом. **20.** Калаская. **21.** Бабіна. **22.** Аршанка. **26.** Турмо. **27.** Марац. **30.** Мадзі. **31.** Спас.

Склаў **Лявон ЦЕЛЕШ.**

Установа «Рэдакцыя часопіса "Роднае слова"». Заснавальнік – Міністэрства адукацыі. Рэгістрацыйны нумар часопіса 346.
220035, г. Мінск, пр. Пераможцаў, 47, кор. 1, пад'езд 2 (уваход з вул. Гвардзейскай, код на ўваходзе: 43 + званок).
Р/р № 3015702170012 у Сталічным аддз. ААТ "Белінвестбанк" г. Мінска, код 739, УНН 190241571, ОКПО 37551965.

*Тэлефоны:* галоўнага рэдактара **(017) 203-35-17**, намесніка галоўнага рэдактара і рэдактараў **(017) 203-34-79**, адказнага сакратара **(017) 203-07-40**, галоўнага бухгалтара і справавода **(017) 203-24-69**. Факс **(017) 203-24-69**.
E-mail: **rodnaje_slova@tut.by**

Падп. да друку 01.04.2008. Фармат 60x84 1/8. Папера афсетная. Гарнітура «Minion Pro». Афсетны друк. Ум.-друк. арк. 13,02. Ум.-фарб. адбіт. 14,07. Ул.-выд. арк. 15,3. Тыраж 3564 экз. Зак. 865.
Надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва "Беларускі Дом друку"». 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

® Роднае слова, 2008